1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ...

Вайна грымела недзе далёка на захадзе, але трывога адчувалася і тут, у пакуль яшчэ далёкім тыле. Ужо ў панядзелак 23 чэрвеня пачалася мабілізацыя. Каля ваенкаматаў у Петрыкаве і ў Капаткевічах ігралі гармонікі, плакалі і смяяліся людзі, адпраўляліся да чыгункі ў Муляраўцы каманды. Ніхто не ведаў, не мог здагадацца і прадбачыць, якія выпрабаванні чакаюць усіх у бліжэйшы час... Двор сярэдняй школы ў Петрыкаве быў перапоўнены мабілізаванымі, вакол тоўпіліся бацькі, родныя, знаёмыя. Адчувалася трывога і напружанасць, але панікі не было. Людзі прагна лавілі навіны, апошнія звесткі з фронту, распытвалі бежанцаў з заходніх абласцей Беларусі, якім давялося перажыць шмат гора, што прынесла вайна. Людзі ішлі на працягу сутак, пешшу, часта з анухшымі нагамі, галодныя, але і тут не затрымліваліся, імкнуліся адысці як мага далей ад пекла вайны, у якім ужо давялося пабываць...

24 чэрвеня ў Петрыкаве праходзіла нарада раённага актыву. У зале Дома культуры сабраліся людзі розных прафесій і ўзростаў, вясковыя жыхары крыху спазніліся. На сцэну падняўся каржакаваты дзядок з ордэнам Чырвонага Сцяга на грудзях.

— Я звяртаюся да вас як стары салдат,— пакаціўся па зале гучны і бадзёры голас.— Абараняйце нашу краіну так, як мы абаранялі яе ў грамадзянскую. Біце фашыстаў усюды. Чуеце? Яны набліжаюцца да Пінска. Паўзуць да нас...

— Гэта ж дзед Талаш,— пранеслася па зале.

Васіль Ісакавіч стаяў не за трыбунай, а перад прэзідыумам. Звяртаўся да прысутных на сваёй паляшуцкай мове, часам узмахваў рукой. Гаварыў проста, зразумела, словы яго краналі душу кожнага, хто прысутнічаў. Здавалася, вось сыйдзе дзед са сцэны і павядзе ўсіх за сабою, як у грамадзянскую вайну...

Увечары адбыўся пленум райкома партыі. Было прынята рашэнне аб стварэнні знішчальнага батальёна з ліку партыйна-савецкага актыву і старых камуністаў, арганізаваны савет па эвакуацыі. Старшынёй яго прызначаны начальнік раённага аддзела НКУС маёр Жукаў, членамі — старшыня гарсавета Яфім Зарэцкі і народны суддзя Сапажынскі. Кіраўнікі калгасаў, МТС, прадпрыемстваў азнаёміліся з планам эвакуацыі матэрыяльных каштоўнасцей і людзей. Эвакуацыя праходзіла з вялікімі цяжкасцямі. Чыгунка была перагружана ваеннымі эшалонамі, над цягнікамі кружыліся фашысцкія сцярвятнікі, бамбілі і расстрэльвалі іх. Усё ж значную колькасць дзяржаўнай маёмасці, жывёлу ўдалося выратаваць. Мікалай Шамрыла, Васіль Налецька, Вольга Налецька з калгаса «Сейбіт» даставілі ў Курскую вобласць 220 галоў жывёлы.

Батальён, створаны сіламі партыйна-савецкіх работнікаў, нёс вартавую службу ў раёне, сачыў за парадкам у го-

радзе, на мабілізацыйным пункце, узяў пад кантроль плаўсродкі на Прыпяці. Усе аўтамашыны былі мабілізаваны для фронту. Каля трыццаці аўтамашын замацавалі за 110-м медсанбатам 75-й стралковай дывізіі. У горадзе была сфарміравана група народнага апалчэння ў колькасці 60 чалавек непрызыўнога ўзросту, у асноўным з ліку рабочых суднаверфі і цагельнага завода. Яны займаліся рамонтам дарог і мастоў па шляху перамяшчэння нашых войск.

Выключную пільнасць у першыя дні вайны праяўлялі работнікі аддзела ўнутраных спраў. На чацвёрты дзень вайны ўвечары ў Петрыкаў прыбыла аўтамашына, у якой ехалі пяць камандзіраў Чырвонай Арміі ў званні ад лейтэнанта да маёра. Аўтамашына спынілася па вуліцы Чырвонаармейскай супраць дома сакратара райкома партыі Варгаўціка. У гэты час патрульную службу нёс лейтэнант міліцыі Семяніцкі. Нешта ў паводзінах вайскоўцаў яму здалося падазроным, і з дапамогай таварышаў ён затрымаў «афіцэраў», якія аказаліся фашысцкімі дыверсантамі.

Баявыя дзеянні ў гэтым раёне Беларусі пачаліся значна пазней, толькі ў другой палове ліпеня, калі ў іншых напрамках нямецка-фашысцкія войскі прарваліся ўжо далёка на ўсход. Гітлераўскія стратэгі яшчэ з часоў першай сусветнай вайны засцерагаліся цяжкапраходных Пінскіх балот, дзе назаўсёды спыніўся фронт імперыялістычнай вайны, і спланавалі свае асноўныя ўдары па поўдзень, галоўным чынам на поўнач ад Палесся, пакінуўшы гэты, як яны лічылі, другарадны ў стратэгічных адносінах раён у сваім глыбокім тыле.

75-я стралковая дывізія 4-й арміі, якой камандаваў генерал-маёр Нядзвігін, з цяжкімі баямі вырваўшыся з акружэння з-пад Брэста, у сярэдзіне ліпеня заняла абарону на лініі Ленін — Жыткавічы — Тураў. Дывізія панесла вялікія страты, тут яе часці папоўніліся людскімі рэзервамі. У рады чырвонаармейцаў стала і больш 120 петрыкаўчан, прызваных у армію па мабілізацыі. На камандныя і палітычныя пасады ў дывізію было накіравана звыш 100 савецкіх і партыйных работнікаў Палескай вобласці.

У ноч на 22 ліпеня пасля жорсткіх баёў за Жыткавічы байцы 115-га стралковага палка і атрад пагранічнікаў у колькасці больш 200 чалавек вымушаны былі адступіць і заняць пазіцыі на чыгуначнай станцыі Капцэвічы. 34-ы стралковы полк, а таксама частка байцоў 68-га артылерыйскага палка з гарматамі ўзялі кірунак на Петрыкаў. 28-ы полк пераправіўся праз Прыпяць і, прайшоўшы з баямі Тураўскі і Лельчыцкі раёны, заняў абарону на тэрыторыі Асавецкага сельсавета.

Заняўшы пазіцыі каля Капцэвіч, чырвонаармейцы рыхтаваліся да бою. Мясцовыя жыхары былі эвакуіраваны ў лес ва ўрочышча Вірок. У чатырох кіламетрах ад станцыі з правага боку ад дарогі Брынёў — Капцэвічы размясціўся заслон пагранічнікаў. Мясцовыя жыхары дапамагалі капаць акопы.

У 18 гадзін фашысты рушылі ў атаку з боку Брынёва. З другога боку яны наступалі ад в. Сялюціч ў напрамку Капцэвіч. Вораг меркаваў адным ударам прарваць лінію абароны і авалодаць чыгуначнай станцыяй. Але іх сустрэў шчыльны кулямётна-вінтовачны агонь воінаў-пехацінцаў і пагранічнікаў. Становішча абаронцаў аблягчалася тым, што абапал іх пазіцый, недалёка ад Капцэвіч, у шасці кіламетрах ад Сялюціч, цягнулася вялікае балота, непраходнае для тэхнікі.

Тры разы хадзілі ў атаку фашысцкія аўтаматчыкі і кожны раз пад шквальным агнём вымушаны былі адступаць. Праціўнік выклікаў авіяцыю. Некалькі самалётаў бамбілі пазіцыі чырвонаармейцаў. У 7 гадзін раніцы 23 ліпеня фашысты зноў пайшлі ў атаку і зноў яна не прынесла поспеху. Усе свае сілы вораг кінуў на пазіцыі, якія ўтрымлівалі пагранічнікі. Тут яны пакінулі дзесяткі сваіх забітых салдат і афіцэраў, але радзелі і рады абаронцаў. Быў

паранены намеснік камандзіра атрада лейтэнант Ніканаў. Мужнасць і адвагу праявіў у гэтых баях шафёр 110-га медсанбата жыхар Капцэвіч Данііла Туравец. Ён дапамагаў выносіць з поля бою параненых, даставіў у медсанбат каля х. Гараваха і Ніканава.

У другой палавіне дня на дапамогу абаронцам на станцыю Капцэвічы з Калінкавіч прыбылі два бронепаязды. Адзін з іх спыніўся непадалёку ад вакзала і прыкрываў агнём пазіцыі 115-га палка, другі стаў каля чыгуначнага маста каля в. Аголіцкая Рудня і падтрымліваў пагранічнікаў. Мінуў яшчэ адзін дзень напружаных крывапралітных баёў.

24 ліпеня фашысты падцягнулі артылерыю і ў 10 гадзін раніцы адкрылі агонь па нашых пазіцыях. У атаку пайшла пяхота. Нягледзячы на мужнае супраціўленне савецкіх байцоў, да канца дня фашыстам удалося пацясніць наш стралковы полк. Чырвонаармейцы пакінулі в. Капцэвічы і занялі абарону на ўскраіне п. Капцэвічы. Фашысты занялі выгадныя пазіцыі, на могілках устанавілі артылерыю.

Вялікую дапамогу абаронцам Капцэвіч аказаў атрад апалчэнцаў з мясцовага насельніцтва пад камандаваннем дырэктара Капцэвіцкага фанернага завода «Звязда» А. Зубрыцкага. Атрад размясціўся паблізу перадавой лініі ў лесе ва ўрочышчы Града. Апалчэнцы хадзілі ў разведку, прыносілі каштоўныя звесткі аб варожых пазіцыях, былі праваднікамі байцоў.

Раніцай 25 ліпеня фашысты адкрылі з могілак ураганны артылерыйскі агонь па пазіцыях 115-га палка і пагранічнікаў. Чырвонаармейцы пры падтрымцы агню бронепаяздоў не адступалі. Але сілы былі няроўнымі. Становішча ўскладнілася тым, што знайшліся здраднікі з мясцовых жыхароў, якія правялі фашыстаў праз балота ў тыл нашых пазіцый. Камандаванне дывізіі рашыла адвесці войскі на загадзя падрыхтаваныя пазіцыі ў раён Аголіцкай і Сярэдняй Рудні, пакінуўшы для прыкрыцця батальён Ярышкіна. З усходняга боку чыгуначнага вакзала гітлераўцы змаглі наблізіцца да браняпоезда, абстраляць яго з мінамётаў і вывесці са строю. Яны чакалі лёгкай нажывы, але своечасова падаспеў на дапамогу другі браняпоезд ад Руднянскага маста.

Фашысты, не здолеўшы авалодаць браняпоездам і не зламаўшы супраціўленне байцоў батальёна Ярышкіна, узмацнілі мінамётна-артылерыйскі агонь. Асноўныя нашы сілы адступілі і занялі новыя пазіцыі. Затым пачаў адступаць і батальён Ярышкіна. Жыхарка Капцэвіч Алена Дзечка вывела байцоў небяспечнай дарогай.

У 22 гадзіны фашысты занялі станцыю Капцэвічы і рушылі па чугунцы ў бок Аголіцкай і Сярэдняй Рудні. Неабходна было спыніць іх, каб паспець прывесці падраздзяленні ў баявы парадак і замацавацца на новых пазіцыях. Такі загад атрымаў 1-ы батальён 115-га палка. Браняпоезд заняў абарону ў 400 м за стрэлкамі Коржаўскага раз'езда. Батарэя 68-га артылерыйскага палка пад камандаваннем лейтэнанта Пятра Насонава, прыданая 115-му палку, заняла агнявыя пазіцыі ў хмызняку за в. Бялынавічы па дарозе на Конкавічы.

Аддзяленне разведкі пад камандаваннем Юсупава вывучыла пазіцыі праціўніка. Гарматы і мінамёты ворага стаялі ў 500 м ад перадавой на ўскрайку лесу ў 300 м ад в. Аголіцкая Рудня. Юсупаў даў сігнал чырвонай ракетай, батарэя лейтэнанта Насонава і браняпоезд адкрылі агонь. Чырвонаармейцы, якія занялі пазіцыі непадалёку ад станцыі Муляраўка ў лесе, прыціхлі ў чаканні каманды ў атаку. Адзін з узводаў узначальваў былы камандзір першага артылерыйскага дывізіёна супрацьтанкавых гармат 115-га палка Веньямін Кудзелін. Пад выбухамі снарадаў ён падняў байцоў у атаку. Пракацілася магутнае «ўра», пяхота пайшла ў наступленне. Фашысты супраціўляліся адчайна, завязаўся рукапашны бой. Гітлераўцы пачалі адступаць, па-

кідаючы забітых і параненых.

Асноўныя сілы стралковага палка і частка пагранічнікаў пасля гэтага бою адышлі да в. Слінкі і занялі абарону з усходняга боку ўрочышчаў Хохла і Азяроднае, дзе ўзвод Кудзеліна падпаліў драўляны мост праз р. Слінка. Фашысты замацаваліся з заходняга боку ва ўрочышчы Зубковае поле па р. Бобрык. Насельніцтва пасёлка было эвакуіравана ў лес.

Да 25 ліпеня палова тэрыторыі раёна была акупіравана фашыстамі. У гэтыя дні ў горад прыбыў камісар 75-й дывізіі І. С. Ткачэнка. Партыйна-савецкі актыў раёна знаходзіўся на казарменным становішчы. У 10 гадзін вечара ў памяшканні райкома партыі сабраліся на нараду прадстаўнікі партыйна-савецкага актыву, камсамольскіх і грамадскіх арганізацый з удзелам камандавання 75-й дывізіі. На ёй былі выпрацаваны сумесныя дзеянні па абароне Петрыкава, вызначаны рубяжы абароны, распрацаваны мерапрыемствы па эвакуацыі дзяржаўнай маёмасці і насельніцтва. Для гэтай мэты быў выдзелены аўтатранспарт дывізіі. Насельніцтва прыцягвалася для капання траншэй і акопаў, праведзена дадатковая мабілізацыя для папаўнення асабовага саставу. Работу па мабілізацыі ўзначаліў ваенком раёна капітан Сергіенка.

Нарада працягвалася да поўначы. Была чутна блізкая артылерыйская канада. У гэтую ноч савецка-партыйныя органы эвакуіраваны з Петрыкава за Прыпяць у в. Асавец.

Паспяхова спраўляўся са сваімі абавязкамі знішчальны батальён, у састаў якога ўваходзілі работнікі міліцыі і НКУС. У прыфрантавым горадзе быў бездакорны парадак, адказнасць за які была ўскладзена на кіраўнікоў раённага аддзела НКУС Жукава і Малчанава.

За некалькі дзён да акупацыі Петрыкава на адным з пасяджэнняў райкома партыі, якое праходзіла ў в. Асавец, было вырашана адправіць частку раённага актыву з сем'ямі і дзяржаўнымі каштоўнасцямі ў тыл краіны. Упраўляючаму аддзялення Дзяржбанка Грошману і бухгалтару Чарнаму даручалася вывесці 400 тысяч рублёў, асабовыя рахункі і іншую дакументацыю. Машыністка райкома партыі Геня Шусцерман павінна была эвакуіраваць у Тамбоў партыйныя, камсамольскія дакументы і Чырвоны сцяг раёна. Для гэтай мэты выдзяляліся дзве аўтамашыны, шафёрамі былі Сяргей Вяргей і Васіль Канонік. Загружаліся ноччу, раніцай 21 ліпеня машыны ўзялі кірунак праз Мазыр у тыл краіны. З Канонікам ехаў хворы старшыня райвыканкома Зобаў. Адказнае заданне было выканана паспяхова. Каштоўнасці, дакументацыя і Чырвоны сцяг раёна былі перададзены ў Тамбоўскі абласны Дзяржаўны банк, абласныя камітэты партыі і камсамола*.



І. С. Ткачэнка

26 ліпеня з Петрыкава эвакуіраваўся шпіталь, які размяшчаўся ў раённай бальніцы. Усіх параненых вывезлі. Большасць медыцынскага персаналу выехала ў Пціч, а частка медыкаў засталася ў горадзе. Медыцынскае абсталяванне было вывезена, астатняе закапана. Эвакуіраваўся і 110-ы медсанбат, які дыслацыраваўся каля х. Гараваха. Ён таксама ўзяў кірунак на чыгуначную станцыю Пціч. Жорсткія баі ў гэты дзень ішлі ў раёне станцыі Муляраўка. Байцы 34-га палка трымалі абарону з

* У жніўні 1944 г. пасля вызвалення Петрыкава ад фашыстаў Тамбоўская кантора абласнога банка вярнула дакументацыю і грошы. Захаваліся партыйныя і камсамольскія дакументы і Чырвоны сцяг раёна.

заходняга боку Петрыкава. Пазіцыі чырвонаармейцаў праходзілі ад могілак праз пасевы жыта калгасаў імя Кірава, «Гігант», у 150 метрах ад в. Белка. Правы фланг упіраўся ў абрыў урочышча Абалонне. Байцы пехаціпы займалі таксама пазіцыі па-над гарой Абалоння, каля цагельнага завода, стадыёна, аптэкі (цяпер РДК), у гарадскім парку. Участкам абароны каля аптэкі і на вуліцы Камунальнай кіраваў ураджэнец Петрыкава малодшы лейтэнант Якаў Ус. Былі арганізаваны засады чырвонаармейцаў з кулямётамі. Пад кулямётным абстрэлам трымаліся скрыжаванні галоўных вуліц горада, з могілак абстрэльвалася вуліца Леніна. З гэтага часу райком партыі стаў падпольным, а знішчальны батальён — партызанскім атрадам.

27 ліпеня ў 7 гадзін немцы пачалі абстрэльваць горад з мінамётаў. Баі ішлі ў прыгарадзе і ў самім Петрыкаве на працягу амаль двух дзён. 29 ліпеня савецкія войскі вымушаны былі пакінуць горад. 1 жніўня значная частка раёна была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Камандаванне дывізіі прыняло рашэнне сіламі 28-га Чырванасцяжнага, 34-га і 115-га стралковых палкоў і Дняпроўскай ваеннай флатыліі на золку 2 жніўня атакаваць праціўніка на ўчастку фронту Майсеевічы — Конкавічы — Коржаўка. Бой пачаўся ў 5 гадзін раніцы, а ў 11 гадзін вызвалены Петрыкаў. Вораг панёс вялікія страты, было забіта больш як 300 салдат. У Петрыкаве адбыўся мітынг, на якім выступілі І. Ткачэнка і сакратар райкома партыі Х. Варгаўцік. У гэты дзень было вызвалена яшчэ некалькі вёсак раёна. Але нядоўгай была радасць вызваленых жыхароў раёна. У той дзень нямецкая авіяцыя бамбіла в. Кашэвічы і станцыю Пціч. Нашы войсковыя часці вымушаны былі адступіць, да 6 жніўня лінія фронту прасунулася да р. Пціч.

Аказваючы ўпартае супраціўленне ворагу, нашы часці адыходзілі на ўсход. Эвакуіравана значная частка маёмасці, а таксама насельніцтва. Вывозілася тэхніка, на ўсход гналі калгасную жывёлу, вязлі збожжа. Што нельга было вывезці, знішчалася або раздавалася жыхарам раёна. Так, быў падпалены фанерны завод «Звязда» ў п. Кашэвічы. Выканаць гэтае заданне даручана камсамолкам Марыі Мялешка і Кацярыне Дубік. Яны спалілі завод, але патрыётак схапілі фашысты і тут жа расстралялі.

У сярэдзіне жніўня 1941 г. тэрыторыя Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў — апошніх на Беларусі — поўнасцю была акупіравана фашысцкімі войскамі.

В. М. Чарнобылец

На грані мірнага жыцця

Яшчэ па мірных рэйках коцілася жыццё неабсяжнай краіны, ціхімі і сонечнымі, не зацягнутымі дымам пажарышчаў былі летнія раніцы, а на заходніх рубяжах даспявалі чорныя гронкі вайны... Да яе спакваля, не верачы, што вайна ўсё-такі ў хуткім часе грымне, рыхтаваліся, многа гаварылі, спрачаліся. Сярод насельніцтва значна актывізавалася абаронча масавая работа, праводзіліся зборы, ваенныя гульні дзяцей і моладзі. Было завершана будаўніцтва дотаў па рэках Прыпяць і Пціч, каля мастоў і чыгуначных станцый, а між тым магутныя жалезабетонныя ўмацаванні на старой польскай граніцы незадоўга да вайны ўзрываліся і засыпаліся зямлёй як непатрэбныя... Папоўніўся новымі сіламі гарнізон, прыбыла спецыяльная сапёрная часць для ўдасканалення абаронных работ і добраўпарадкавання аэрадрома. Адкрыліся два парты на Прыпяці — каля в. Дарашэвічы і ў Петрыкаве, дзе базіраваліся атрады ваенных бранякатэраў.

Жыццё ў Петрыкаве і ў раёне ішло сваім парадкам. У 1940 г. было закончана брукаванне вуліц у цэнтры горада. Вакол парку — любімага месца адпачынку гараджан — узведзена новая прыго-

-ая агароджа. Рабочыя суднаверфі абналявалі танцавальную пляцоўку, а кінатэатр — летнюю эстраду для паказу кінафільмаў. Камсамольцы горада зрабілі баскетбольную і валейбольную спартыўныя пляцоўкі. У парку штодзень праводзілі вольны час жыхары Петрыкава і навакольных вёсак. Увечары чулася музыка духавых аркестраў, іх было ў горадзе пяць. Ігралі лётчыкі, матросы, а таксама гарадскі аркестр. Старэйшыя ішлі ў клуб, да якога нядаўна было прыбудавана новае фае. У ім выстаўлены партрэты перадавікоў вытворчасці раёна, лепшых калгаснікаў.

Непазнавальна змяніўся ў перадваенныя гады горад. На базе дробных уласных кустарных майстэрняў узніклі тэхнічна аснашчаныя прадпрыемствы. Найбольш буйныя з іх — суднаверф, дзе працавала больш 500 рабочых, цагельны завод і іншыя.

...Вестка аб нападзе на нашу краіну фашысцкіх войск маланкай абляцела Петрыкаў. Сонечны нядзельны дзень адразу стаў змрочным. Вуліцы горада былі перапоўнены людзьмі. Праз дзве гадзіны пасля перадачы інфармацыйнага паведамлення на плошчы каля райкома партыі адбыўся агульнагарадскі мітынг. Першы сакратар райкома партыі Х. І. Варгаўцік і старшыня райвыканкома Зобаў выступілі з прамовамі, заклікалі да пільнасці і спакою.

Юнакі і дзяўчаты накіраваліся на стадыён, дзе павінен быў адбыцца футбольны матч паміж гарадской камандай і матросамі. Гарадская каманда была ў форме, трэніравалася на полі і чакала каманду маракоў. Гледачы, яшчэ не да канца ўсвядоміўшы памер небяспекі, якая павісла над народам, займалі месцы балельшчыкаў і чакалі пачатку матча. Раптам ў небе з'явіліся два самалёты, наблізіліся і рэзка пайшлі ўніз. Ад іх аддзяліліся чорныя кропкі, пачуліся моцныя выбухі. З'явіліся чорныя клубы дыму. Самалёты круганулі, страчылі з кулямётаў. Людзі мітусіліся, разбягаліся ў розныя бакі, збіваючы адзін другога, пад стадыёнам стаяў плач, крыкі... Ад бамбёжкі і абстрэлу ў той дзень загінулі чатыры чалавекі, два паранены. Так у Петрыкаў прыйшла вайна...

У. А. Браім

Бой вялі пагранічнікі

Кудзелін Вешьямін Рыгоравіч, лейтэнант, з 20 чэрвеня 1941 г. — камандзір узвода 115 га палка 75-й стралковай дывізіі, удзельнік баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі раёна, з восені 1941 г. — партызан Палескага злучэння. У пасляваенны час — супрацоўнік, затым дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой».

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, баявымі медалямі.

...У другой палове ліпеня 1941 г. 115-ы стралковы полк з баямі пакінуў Жыткавічы і рухаўся ў напрамку станцыі Капцэвічы. Першы батальён выйшаў да раз'езда Старушкі. Выявілася, што чыгуначны шлях перад Капцэвічамі захоплены немцамі. Першай роце батальёна, у складзе якой быў і мой узвод, загадана было рухацца ў напрамку в. Брынёў. На подступах да яе нечакана наткнуліся на варожую засаду. Прыйшлося трымаць бой. Далейшы шлях ляжаў у абход вёскі. Ішлі па лесе, без дарогі. Потым аказалася, што мы апынуліся ў варожым кальцы. У лесе пад Капцэвічамі нечакана сустрэліся з чатырма пагранічнікамі, старшым быў капітан Елкін. Акрамя нагана, што вісеў у кабуры на поясе, капітан быў узброены вінтоўкай са штыком.

Наша з'яўленне для пагранічнікаў было яшчэ больш нечаканым: мы ішлі з боку праціўніка. Пачалі дзейнічаць разам. Яшчэ пры першай сустрэчы я звярнуў увагу на ўпэўненасць і рашучасць капітана Елкіна. Ад яго зыходзіў нейкі спакой, перакананая смеласць. Нават кароткая размова з ім адразу надавала давер і павагу. Я не быў навічком на вайне, з першага дня вайны ад Маларыты мы вялі моцныя баі, але пазайздросціў вытрымцы гэтага чалавека.

Праз некалькі дзён мяне накіравалі для сувязі да пагранічнікаў, якія трымалі пад наглядам чыгунку. Тады вялікае значэнне на нашым участку меў браняпоезд, якога ў тэлефонных размовах умоўна называлі «Барыс Пятровіч», а пагранічнікаў — «казыркамі». Пагранічнікі — гэта зводны пагранполк, аснову якога складалі байцы і камандзіры 18-га Жыткавіцкага атрада. Я звярнуў увагу на высокую дысцыпліну пагранічнікаў, хуткае і дакладнае выкананне імі загадаў. Бязмежнай павагай у іх карыстаўся камандзір, палкоўнік Мацвей Аканін. Адначасова група камандзіраў стаяла на паўночнай ускраіне в. Слабада, калі разгарэлася артылерыйская дуэль паміж браняпоездам і батарэяй праціўніка. Браняпоезд маневраваў па пуцях, гітлераўцам не ўдавалася накрыць яго агнём. Раптам назіральнік, які сядзеў на дрэве, паведаміў, што падраздзяленне пагранічнікаў пад націскам ворага пачало адступаць. Палкоўнік Аканін адразу ўскочыў на аўтамашыну, на якой знаходзілася зенітная ўстаноўка, стаў за кулямёт і загадаў ехаць да перадавой лініі. Машына з ходу ўварвалася на перадавую, развярнулася, і палкоўнік пачаў весці агонь. Варожае наступленне было адбіта, байцы, натхнёныя прыкладам камандзіра, зноў занялі свае акопы.

У другім месцы на ўчастку абароны аддзяленне пагранічнікаў мужна вытрымлівала націск ворага, які значна пераўзыходзіў іх па сілах. Было адбіта ўжо некалькі атак. Да канца дня



К. П. Елкін

становішча ўскладнілася, і тады прынята рашэнне адысці на новы рубеж. Але як перадаць загад аддзяленню, якое трымала абарону далёка наперадзе? Тэлефоннай сувязі не было. Паслалі сувязнога, але ён не дайшоў, загінуў. Толькі позна ўвечары ў цемры ўдалося дабрацца да абарончаў рубяжа. Яны не збіраліся адыходзіць, хоць ведалі, што знаходзяцца амаль у акружэнні: не было загаду.

Запомніліся баі ў раёне раз'езда каля в. Коржаўка. Наш полк знаходзіўся ў двух-трох кіламетрах на ўсход ад Коржаўкі і на поўдзень да в. Конкавічы. Каля ракі абарону трымалі байцы нашай дывізіі. Пагранічнікі, як і раней, абаранялі чыгунку. Гэта была ўжо невялікая група, многія загінулі ці ваявалі на другіх участках фронту. У ноч на 1 жніўня праведзена разведка, на світанку мы пайшлі ў наступленне. Была пастаўлена задача выбіць фашыстаў з раз'езда, а затым, працягваючы наступленне, захапіць в. Коржаўку, дзе размяшчаўся штаб гітлераўскага палка. Артпадрыхтоўку вёў браняпоезд, ён суправаджаў нас у наступленне, пакуль дазваляла чыгуначнае палатно. Многія агнявыя кропкі ворага былі знішчаны яго агнём. У той час у дывізіі амаль не было артылерыі, а ў нашым палку налічвалася ўсяго тры гарматы. Аднак наступленне было імклівым і паспяховым. Я з узводам рухаўся па левым баку чыгункі. Мы выбівалі фашыстаў кароткімі атакамі. З ходу была ўзята Коржаўка, разгромлены штаб варожага палка, захоплены трафеі. У тыя дні два стралковыя палкі, 28-ы Чырванасцяжны і 34-ы, ва ўзаемадзеянні з катэрамі Дняпроўскай ваеннай флатыліі вызвалілі ад ворага раённы цэнтр Петрыкаў.

У баі за Коржаўку капітан Елкін здзейсніў свой апошні подзвіг. Ён з падраздзяленнем пагранічнікаў рухаўся па правым баку чыгункі. На подступах да вёскі шлях перапыніў варожы кулямётчык. Некалькі адчайных спроб знішчыць агнявую кропку ворага не далі поспеху. Гінулі байцы. Тады капі-



Брацкая магіла воінаў Чырвонай Арміі ў Петрыкаве, якія загінулі ў 1941—1945 гг.

тап Елкін дзе кароткімі перабежкамі, дзе паўзком наблізіўся да кулямёта, але ў апошнія хвіліны быў цяжка паранены. Усё ж ён знайшоў сілы, каб падняцца, кінуцца на ворага і штыком прыкончыць кулямётчыка. Шлях наступаўшым быў адкрыты цаной жыцця героя.

...Пасля вайны я доўга шукаў звесткі пра капітана Елкіна — ведаў толькі яго прозвішча і званне. Адказ прыйшоў з Цэнтральнага архіва пагранічных войск, затым з Кастрамы. Стала вядома, што Канстанцін Паўлавіч Елкін быў земляком легендарнага Івана Сусаніна. Нарадзіўся ён у 1907 г. у в. Гульнава Сусанінскага раёна Кастрамской вобласці, з 1927 г. — на вайсковай службе. Кароткім быў яго ўдзел у Айчыннай вайне, але з першага дня яе афіцэр-пагранічнік, як і яго легендарны зямляк, паказаў сябе сапраўдным патрыётам, мужным і адважным воінам.

Медыкі ў баявым страі

У сярэдзіне ліпеня 75-я стралковая дывізія вяла цяжкія баі на Петрыкаўшчыне. Параненых дастаўлялі ў шпіталь, створаны на базе Петрыкаўскай раённай бальніцы. Увесь медыцынскі персанал быў мабілізаваны на выратаванне жыцця нашых воінаў. Самаадданая працавалі ўрачы Духноў, Ракаўшчык, Красільшчык, Шаніра, медработнікі Марыя Кароль, Наташа Лапета, лабарантка Сцепанькова і іншыя работнікі 110-га медсанбата дывізіі.

27 ліпеня каля аперыцыйнай спынілася аўтамашына з параненымі. Шафёр Рыгор Пінчук далажыў, што прывёз цяжкапараненых байцоў 34-га палка. Медсёстры Марыя Кароль і Наташа Лапета пачалі падрыхтоўку да аперацыі, тэрмінова выклікалі хірурга Лапцейку. Першым на аперацыйны стол паклалі цяжкапараненага камандзіра аддзялення Найдзёна, былога старшыню калгаса «Сейбіт». На жаль, выратаваць яго не ўдалося... Ён здзейсніў сапраўдны подзвіг на адным з каналаў рыбгаса «Чырвоная Зорка», дзе воіны сустрэлі фашыстаў агнём. Двойчы гітлераўцы пад прыкрыццём бронетранспарцёра хадзілі ў атаку, але беспаспяхова. Найдзён павёў салдат у контратаку. З гранатай кінуўся да бронетранспарцёра, пачуўся выбух... Пяхота фашыстаў адступіла, але хутка зноў пайшла ў атаку. Камандзір аддзялення атрымаў смяротнае раненне.

Нашы войскі адступалі. Камандзір медсанбата Контараў і камісар Манахаў далі каманду старшыні медслужбы Івану Дубіку рыхтавацца да эвакуацыі. Хірург Іваноў, аперацыйны фельчар Пікалаеў і Мітрафан Семечка рыхтавалі ў гэты час да аперацыі цяжкапараненага капітана Люціна. Раптам пачуўся гул матораў самалётаў. Фашысцкія сцярвятнікі палівалі агнём мірных жыхароў, потым паляцелі на калону аўтамашын з раненымі байцамі, пачалі скідваць бомбы. Адна з іх разарвалася зусім блізка ад аперацыйнай.

Асколкам быў забіты капітан Люцін, хірург Іваноў кантужаны. Мітрафан Семечка паранены асколкамі ў плячо і шыю. Медсанбат у гэты дзень эвакуіраваўся далей на ўсход, у раён хутароў Гараваха.

В. М. Чарнобылец

«Білі і біць будзем!..»

Гамолка Мікалай Іванавіч (н. 11.3.1922 г. у в. Брыцёў) — беларускі пісьменнік, аўтар многіх дзіцячых і фантастычных аповесцей і раманаў. Закончыў філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, у гады вайны — у Чырвонай Арміі. Першыя вершы надрукаваў у 1937 г. Многія творы пісьменніка прысвечаны подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне — аповесці «Лясная крэпасць», «Сокалы-сакаляняты», «Дзяўчына ішла на вайне», «Партызанскія сёстры», аповесці «Лета ў Калінаўцы», «Добры дзень, школа», фантастычны раман «Шосты акіян». Неаднаразова яны выдаваліся на рускай і іншых мовах.

Памёр М. І. Гамолка ў 1992 г.

...У Талашовай хаце, якая двума вокнамі глядзіць на раку, таксама сядзелі без святла, гаманілі ціха, прыглушана. Змітрок, меншы дзедаў сын, вярнуўся з Петрыкова і прыпёс навіны. Але яны былі няўцешныя, горкія, як палынтрава. Змітрок сутыкнуўся там з немцамі.

— Дык, кажаш, іх у гарадку поўна?..— спытаў Талаш, пыхкаючы люльк



В. І. Талаш і сакратар ЦК КПБ Цімох Гарбуноў сярод лётчыкаў

кай. Сядзеў ён за сталом, каля акна, якое глядзелася на Прыпяць, быў у белай кашулі, перахопленай раменьчыкам.

— Бацько, у іх — танкі... Ты не бачыў іх танкаў, во дзе страхоцце. Так што да іх зубоў не вельмі дастанеш.

— Танкаў і ў нас многа...

— А ў нас во тут підзе нямашака.

— Можа, спецыяльна прытрымліваюць. А патом...

— Нешта не верыцца, тато. То чаму ж на глум етым гадам аддаюць нашу зямлю. Чуў у Петрыкове, што Мінска ўжо няма, забралі. Бомбаў насыпалі на яго, гарыць... Могуць і Петрыкоў спаліць. Гітлеру етаму як двойчы два.

Талаш зноў адмоўна пакруціў галавой.

— Не, сыну,— праз хвіліну з глыбокай самотнасцю адказаў ён.— Мінска не спаляць. Бачыў яго, ён увесь каменны. А камень, хлопча, не гарыць. Яго можна хіба што скрышыць.— Памаўчаўшы, зноў загаварыў.— І шчэ скажу: тое, што ты чуў, ето, хлопчэ, плёткі. Нехто хочэ, каб нам было горай, каб мы спудзіліся і пабеглі. А калі чалавека апаноўвае страх і ён бяжыць, спыніць яго ой як цяжка. Ты ж, відаць, чуў: палахліваму і мыш — мядзведзь... Заўтра пайду ў Петрыкоў,— нечакана ціха і рашуча абвясціў дзед.

— Во яно як! — аж усклікнуў Змітрок.— Які там у цябе за клопат?

— Немцаў хачу пабачыць, танкі іхнія.

— Невялікая радасць... Ды яны і самі сюды прыйдуць. Навошта табе ногі свае старыя вярэдзіць? Прыйдуць, ты толькі рыхтуйся. Стажок твой зруйнуюць, як піць даць, у кубел з салам заглянуць, карову адбярушь і вепрука ў прыдачу. Яны спрытныя — на танках і матацыклетках...

На золку, як заўсёды, дзед пайшоў на Прыпяць. На беразе стаяў чалавек і з цікавасцю разглядаў яго.

— Дзеду,— сказаў чалавек, яшчэ зусім малады. На ягоных ботах серабры-

ліся шпоры, і Талаш здагадаўся, што перад ім кавалерыст.— Ты не палохайся. Трэба дапамога...

— А што такое, дзеткі? — дзед скокнуў уніз, апынуўся побач з чырвонаармейцам.

— Патрэбна лодка. Нам трэба туды, на другі бераг...

Пад расахатым старым дубам, які бліжэй за іншыя знаходзіўся ад маяка, сядзела купка вайскоўцаў. Адзін з іх адразу ўстаў, папраўляючы партупею.

— Добры вечар, дзядзька! — выйшаў наперад камандзір.— Нам, дзядзька, патрэбна неадкладная дапамога. Ён, відаць, вам ужо сказаў...

За плячыма камандзіра бачылася яшчэ чацвёра з карабінамі і шашкамі. Адразу кідаліся ў вочы параненыя: у шыракатварага байца забінтавана галава, глядзіць адным вокам, а далей зусім маладзенькі баец падкурчыў правую нагу, пакалыхвае яе, відаць, каб суцішыць боль.

— Пры шашках і шпорах,— заўважыў дзед.— А дзе ж ето вашы коні?

— Пра гэта, дзядзька, потым. Нам трэба пераправіцца цераз раку.

— Перавязу, калі ето так шільно трэба,— пацвердзіў сваю згоду дзед.— Ох, настаў час... І што ж ето такое? Да вума не прыкладу. Вы ўцякаеце нібыто?

— Не ўцякаем, а адступаем, дзядзька. Ты нас вінаваціш? А мы, зразумей, ні ў чым не вінаватыя.

Камандзір махнуў рукой, і байцы, што сядзелі пад дубам, усталі.

— Усе за мной! — прыцішана сказаў камандзір.— Уніз, да ракі! — сам ён крута павярнуўся і, падтрымліваючы шашку, рушыў услед за Талашом.

У лодцы запанавала цішыня. Чырвонаармейцы сумна пазіралі на цёмную раку.

— Калі стакая заварылася каша,— разважаў, вяслуючы, дзед,— мабуць, тут не абыдзецца без мяне. Трэ неяк памагчы... Яны, ворагі, не дачакаюцца, каб Талаш залез на печ і з той печы, шібыта з нейкай гары, назіраў за вайной. Трэ, як і тады, у грамадзянскую, браць ружжо і падавацца ў лес. І з лесу, з засады, лупцаваць гадаў, каб ажно дым каромыслам...

Мікола Гамолка

Хмары над краем

Мая родная вёска Кашэвічы была спалена 2 жніўня 1941 г., калі пра партызан яшчэ і не чулі. Няпраўда, што знішчэнне насельніцтва фашыстамі было справацыравана іх дзейнасцю, быццам нямецка-фашысцкія захопнікі нібы вымушаны былі ажыццяўляць акцыі знішчэння мірнага насельніцтва ў адказ на разгром гітлераўскіх гарнізонаў, падрыў мастоў, пуск пад адхон эшалонаў, пакарапне гаўляйтэра Кубэ і інш.

У той дзень у вёску прыехалі на веласіпедах восем гітлераўцаў з франтавой разведкі. Яны цяжка паранілі чырвонаармейца, які разам з чатырма іншымі байцамі вёў назіранне за палётам самалётаў. Неўзабаве да першай групы немцаў далучылася больш салдат. Раптам з-за высокага чыгуначнага насыпу праз пераезд выскачыў грузавік, а за ім другі. Гэта рухаўся знішчальны атрад лейтэнанта Любацава. Чырвонаармейцы адкрылі агонь з кулямёта і вінтовак па гітлераўцах. Тыя не чакалі нападу, кінуліся ўцякаць, але кулі даганялі іх. Пад нашай прызбай ляжаў забіты немец... Знішчыўшы разведку, машыны ад'ехалі за пераезд, але адна з іх загрузла ў пяску ў канцы вёскі. У гэты час з'явіліся гітлераўцы з перадавога атрада наступаючых войск. Яны адкрылі агонь па чырвонаармейцах. Нямецкі самалёт каршуном кружыў над вёскай. Бой працягваўся некалькі гадзін. Раз'юшаныя фашысты вырашылі пакараць сялян. Яны расстралялі дзесяць ні ў чым не вінаватых жыхароў вёскі, спалілі датла ўсе пабудовы. У чым правініліся мірныя людзі? Гэта ажыццяўляўся генеральны план «Ост», які быў распрацаваны фашысцкімі стратэгамі пасля нападу на Савецкі Саюз. А. Адамовіч, Я. Брыль і У. Калеснік

у кнізе «Я з вогненнай вёскі...» прыводзяць вытрымкі з тых дакументаў. «Згодна з планам прадугледжваецца выселение 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай тэрыторыі... Пад выглядам барацьбы з партызанамі — знішчаць, знішчаць, знішчаць насельніцтва. Каб на потым меней праблы засталося»...

Пакуты жыхароў Кашэвіч і навакольных вёсак на гэтым не скончыліся. Праз вёску рухаліся на ўсход нямецкія войскі, у Яўсеевічах (яго называлі Малое сяло, Кашэвічы — Вялікае сяло) была размешчана камендатура. З усяго раёна па загаду каменданта сюды ішлі рэгістравацца дарослыя мужчыны. Многія з іх не вярнуліся дамоў: за царквой і могілкамі каля чыгуначнага насыпу расстрэльвалі падазроных, савецкіх актывістаў, палонных чырвонаармейцаў. Іх трымалі ў царкве, ператворанай у турму, не дазвалялі выходзіць нават па патрэбе. Кашэвіцкая царква — каштоўны архітэктурны помнік (пабудавана ў 1642 г.) была разрабавана, пакінута на здзек.

Камендатура выдала загад аб перапісу насельніцтва. «Грамадзяне абодвух палаў ад 16 гадоў павінны прайсці прапіску. Тым, хто не мае пашпартоў, атрымаць пасведчанне аб прапісцы з камендатуры. Асобы, затрыманыя без пашпарта ці пасведчання, будуць расстрэльваца»...

Добраахвотна мала хто ішоў на прапіску, толькі па прымусу акупацыйных улад і карнікаў, ад якіх даросла насельніцтва ўцякала ў лес. Сяляне дапамагалі чырвонаармейцам, якія выходзілі з акружэння, прадуктамі, адзеннем. Калгаснік з Лучыцкага сельсавета Л. Ходзька вывеў роту чырвонаармейцаў за лінію фронту[1].

Фашысты жорстка распраўляліся з мірным насельніцтвам, асабліва з савецкімі актывістамі. Яны зверскі закатавалі сакратара Бобрыцкага сельсавета Івана Лаворчыка, старшыню Кашэвіцкага калгаса імя Чапаева Цярэшчанка, забілі старшыню Піцкага сельсавета Аляксея Дуброва разам з сям'ёй і многіх іншых.

Трагічна скончылася жыццё 30-гадовай Алёны Маставой. Яна наведвала царкву, шчыра малілася, верыла ў бессмяротнасць душы, імкнулася жыць па хрысціянскіх запаведзях. Не раз яна гаварыла, што гатова на пакутную смерць за хрысціянскія ідэалы і справядлівасць. Як і яе брат, Віктар Маставы, не сумнявалася ў канчатковай перамозе нашага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Фашысты даведаліся, што Алёна Назараўна аказвала медыцынскую дапамогу раненым чырвонаармейцам, знайшлі ў хаце санітарныя насілкі. Ёй адрэзалі грудзі, білі да страты прытомнасці, патрабавалі выдаць партызан. Аднак жанчына нічога не сказала, яна прыняла пакутлівую смерць...

А. С. Фядосік

Петрыкаўшчына партызанская

Германскія войскі шалёна рваліся на ўсход, Чырвоная Армія ў гарачыя летнія дні 1941 г. вяла жорсткія баі. У савецкім тыле ў тэрміновым парадку спецыяльныя атрады аднаўлялі ўздоўж былой польскай граніцы доты, якія былі ўзарваны і засыпаны зямлёй у 1939 г. як непатрэбныя. Палеская вобласць да часу набліжэння немцаў да яе межаў мела на заходняй граніцы ўмацаваны рубеж, што дало свае станоўчыя вынікі ў час абаронных баёў супраць наступаючага нямецкага 35-га армейскага корпуса. Абарону раёна трымала 75-я стралковая дывізія 4-й арміі пад камандаваннем генерал-маёра С. Нядзвігіна, якая прабілася з акружэння з-пад Брэста, Дняпроўская ваенная флатылія

[1] НГА Беларусі, ф. 3500, воп. 4, с. 221, л. 85.

і знішчальныя атрады. У сярэдзіне ліпеня баі вяліся на заходняй частцы вобласці ўздоўж былой польскай граніцы на тэрыторыі Тураўскага і Жыткавіцкага раёнаў. 18 ліпеня невялікія механізаваныя групы ворага спрабавалі пранікнуць на тэрыторыю Капаткевіцкага раёна, але былі адкінуты часцямі Чырвонай Арміі і знішчальным батальёнам. Перад кіраўніцтвам Капаткевіцкага і Петрыкаўскага раёнаў паўстала задача арганізацыі партызанскіх атрадаў. Яшчэ да акупацыі ў Петрыкаўскім раёне была створана падпольная група на чале з першым сакратаром райкома партыі Х. І. Варгаўцікам, у Капаткевіцкім — пад кіраўніцтвам старшыні райвыканкома А. Ц. Міхайлоўскага.

На захопленай тэрыторыі гітлераўцы адразу пачалі ствараць свой «новы» парадак. Беларусь, якую немцы называлі «генерал-бецырк Беларутэнія», распаласавалі на кавалкі. У заходняй частцы была ўтворана правінцыя Остзюйдпрусэн, усходняя частка называлася вобласцю армейскага тылу, паўднёвая, у тым ліку і Петрыкаўшчына, увайшла ў рэйхскамісарыят Украіны. На гэтай тэрыторыі былі створаны чатыры гебітскамісарыяты: Мазырскі (куды ўваходзіў Капаткевіцкі раён), Васілевіцкі, Ельскі і Петрыкаўскі. У райцэнтрах ствараліся раённыя ўправы, на тэрыторыі сельсаветаў — воласці. З першых дзён вайны акупанты прыступілі да масавага знішчэння людзей, вялася настойлівая антысавецкая прапаганда.

Насельніцтва паўсюдна аказвала супраціўленне новым парадкам, уздымалася на барацьбу з ворагам. Створаны ў ліпені 1941 г. Петрыкаўскі партызанскі атрад прымаў удзел у баявых аперацыях сумесна з 75 й дывізіяй. Пасля адыходу нашых войск атрад ваяваў самастойна. На тэрыторыі акупіраванага раёна па заданню камандавання Заходняга фронту дзейнічала група савецкіх байцоў на чале з сяржантам В. Гардзіенкам, затым групы Х. Варгаўціка і В. Гардзіенкі зліліся ў адзін атрад.



Пасля бою. Партызаны 150-й брыгады імя Ф. М. Яльковіча (стаіць крайні справа начальнік штаба брыгады М. І. Гардзіенка)

Ім былі затоплены два нямецкія катэры на Прыпяці, парушалася тэлефонная і тэлеграфная сувязь, рабіліся напады на ворага з засад. У адной з сутычак з немцамі каля в. Турбінка загінуў сакратар Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б Х. Варгаўцік. У кастрычніку атрад распаўся, частка партызан вярнулася дамоў, некаторыя накіраваліся праз лінію фронту да Чырвонай Арміі, іншыя ўліліся ў атрад Ц. Бумажкова. З 21 кастрычніка перастаў існаваць і Петрыкаўскі падпольны райком партыі.

6 жніўня 1941 г. быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні вышэйшай узнагароды краіны першым героям Вялікай Айчыннай вайны. Першым значыўся былы старшыня Петрыкаўскага райвыканкома Ц. П. Бумажкоў. Лістоўка з Указам выпадкова трапіла ў рукі ста-

рэйшага брата Бумажкова Макара Піменавіча. 121-я стралковая дывізія, у якой ён служыў у Бабруйску, уступіла ў бой з ворагам у першыя дні вайны і была разбіта ў раёне Слоніма, лейтэнант Макар Бумажкоў амаль два месяцы змагаўся ў акружэнні. Даведаўшыся пра лёс брата, ён вырашыў ісці да яго ў Петрыкаўскі раён, куды прыязджаў у госці напярэдадні вайны. Макар Піменавіч знайшоў атрад брата ў Акцябрскім раёне, але самога яго не застаў, Ціхан Піменавіч да гэтага часу быў адазваны ў Маскву, прызначаны начальнікам палітаддзела дывізіі і загінуў у верасні 1941 г. у час пераправы праз р. Сулу ў Палтаўскай вобласці. Макар Піменавіч застаўся ў тыле ворага, група ў 17 чалавек, якую ён узначальваў, вырасла ў партызанскі атрад. Неаднаразова ён змагаўся разам з петрыкаўскімі і капаткевіцкімі партызанамі — у разгроме варожага гарнізона ў Бярозаўцы, узрыве чыгуначнага маста праз Пціч восенню 1942 г. і ў многіх іншых аперацыях і дыверсіях. З атрада М. П. Бумажкова выдзелена ў верасні 1942 г. ініцыятыўная група, якая склала ядро партызанскага атрада І. В. Дубіка.

Створаны 17 жніўня ў Церабаўскім сельсавеце Капаткевіцкі партызанскі атрад з байцоў знішчальнага батальёна пачаў наносіць удары па ворагу з пачатку акупацыі. Першай буйнай аперацыяй было знішчэнне лесапільнага завода і склада боепрыпасаў у в. Філіпавічы, якой кіравалі А. Карнейчык і М. Гардзіенка. У кастрычніку гэты атрад таксама быў расфарміраваны. Партызанскі рух, які ўзнік адразу пасля акупацыі на тэрыторыі раёна, да канца 1941 г. пачаў затухаць. У партызанскіх атрадах было шмат байцоў Чырвонай Арміі, якія з цягам часу накіроўваліся да лініі фронту. У партызан не было вопыту, узбраення, ім супрацьстаяў моцны, добра ўзброены вораг, да таго ж набліжаліся зімовыя халады. Страцілася сувязь з партыйнымі і савецкімі органамі, некаторыя людзі разгубіліся і пакідалі партызанскія атрады. Але знікнуць зусім партызанскі рух не мог, нянавісць да ворага расла і мацнела. Да рашучых баявых дзеянняў партызан супрацьворагаў заклікаў 99-гадовы дзед Талаш, словы якога далёка разносіліся па партызанскай Беларусі. Ужо ў студзені 1942 г. аднавіўся Капаткевіцкі партызанскі атрад, створаны з груп А. Міхайлоўскага, Я. Кліменценкі, А. Жыгара, Стральцова-Юрасава, А. Вырвіча. Ён быў перададзены ў склад «Гарнізона Паўлоўскага» ў Акцябрскі раён. Гэта была буйная баявая адзінка, у лютым 1942 г. «гарнізон» налічваў 1300 чалавек. Ф. Паўлоўскі звязаўся з Цэнтральным штабам партызанскага руху ў Маскве і атрымаў указанне падпарадкавацца Мінскаму абкому партыі на чале з В. Казловым. У 1942 г. з атрадаў «гарнізона» ствараецца брыгада Ф. Паўлоўскага, у склад якой уваходзіў атрад А. Міхайлоўскага. Атрад хутка рос, у ліпені з яго вылучылася група Балотнікава (І. Глушко) у колькасці пяці чалавек і накіравалася ў Петрыкаўскі раён для арганізацыі новага партызанскага атрада. Такі атрад быў арганізаваны ў жніўні 1942 г., штаб яго знаходзіўся ў в. Бобрык. Да студзеня 1943 г. атрад дзейнічаў самастойна, ён налічваў 125 чалавек. У кастрычніку з ініцыятыўнай групы М. Бабкова і І. Дубіка, якая была вылучана ў верасні 1942 г. у колькасці 15 чалавек з атрада Ц. Бумажкова, створаны атрад М. Бабкова. Зонай дзеяння яго былі в. Кашэвічы, Рабка, Церабень, Падоссіе.

Партызанская барацьба нарастала. 15 студзеня 1942 г. атрад Далідовіча разграміў паліцэйскія гарнізоны ў вёсках Камаровічы і Навасёлкі. 17 студзеня нечаканым ударам двух партызанскіх атрадаў — Далідовіча і «Чырвоны Кастрычнік» — быў разбіты гарнізон у Капаткевічах, які налічваў каля 100 немцаў і паліцаяў. Каля 60 з іх было забіта, толькі частцы ўдалося ўцячы на ст. Пціч. Захоплена зброя, 200 скрынак з боепрыпасамі, 100 тон хлеба, 10 бочак мёду. У атрад Міхайлоўскага ўлілося шмат добраахвотнікаў. 17 лютага сумесна з атрадам Паўлоўскага быў разгромлены паліцэйскі гарнізон у в. Васласовічы. У ноч на 23 лютага 1942 г. атрады Міхайлоўскага, Каваленкі, Чырліна і Жулегі пад кіраўніцтвам С. Маханько на ст. Муляраўка знішчылі 29 нямецкіх салдат, 8 здаліся ў палон. Станцыя была спалена. У гэтым баі адзін партызан загінуў і двое было паранена. Гэта быў падарунак партызан да свята 24-й гадавіны Чырвонай Арміі. 22 мая атрад Міхайлоўскага, які дзейнічаў у раёне Петрыкава, нечаканым ударам па ворагу знішчыў 58 фашыстаў, захапіў 2 кулямёты і 30 вінтовак.

У красавіку 1942 г. у г. Петрыкаве створана камсамольска-маладзёжная

падпольная арганізацыя, якой кіраваў Ф. Кляўцоў. У яе ўваходзілі Сцяпан Грабіненка, Лідзія Чарнобылец, Мікалай Каржаноўскі, Іван Сцебуноў, Адольф Уладычанскі, Васіль Чарнобылец, Марыя Петравец, Юрый Бажок. С. Грабіненка прымаў па радыё зводкі Саўінфармбюро, падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі. З восені 1942 г. падполле было цесна звязана з партызанамі і выконвала заданні камандавання атрадаў Балотнікава і Бабкова. У жніўні 1942 г. члены арганізацыі падпалілі лесасклад у Капцэвічах, згарэла і сховішча паліва. 29 студзеня 1943 г. Л. Чарнобылец узарвала гебітскамісарыят у Петрыкаве.

Дыверсійная група партызанскага атрада Балотнікава 8 верасня 1942 г. на ўчастку чыгункі Коржаўка — Пціч падарвала варожы эшалон, 16 вагонаў пайшлі пад адхон. Дыверсійная група В. Вялігіна з Капаткевіцкага атрада 15 кастрычніка ўзарвала чыгуначны састаў на ўчастку Жыткавічы — Старушкі. Паравоз сышоў з рэек, паліна з 35 цыстэрнаў вылілася. 17 кастрычніка на ўчастку Старушкі — Капцэвічы падарваны эшалон з 5 пасажырскіх, 3 таварных вагонаў і 2 платформ. З двух бакоў была ўзарвана чыгунка і сапсава на сувязь. Паміж гітлераўцамі і партызанамі завязаўся бой, які цягнуўся каля гадзіны... Усе аперацыі і дыверсіі партызан на чыгункі цяжка пералічыць. Вялікі ўрон ворагу нанесла дыверсійная група, затым атрад Р. Такуева. Найбольш бліскучай і складанай партызанскай аперацыяй у 1942 г. быў узрыў чыгуначнага моста на р. Пціч, у выніку якога рух па чыгункі ў час напружаных баёў у Сталінградзе спыніўся на 18 сутак. 7 партызан загінула, 12 было паранена, вораг панёс значна большыя страты. Многія ўдзельнікі аперацыі былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі.

У 1942 г. на бок партызан пачалі пераходзіць славацкія салдаты і афіцэры, якіх гітлераўскае камандаванне накіравала для аховы чыгункі на Палессі. Яны адчувалі даўнюю братнюю славянскую дружбу з беларускім народам, спачувалі насельніцтву, часта не перашкаджалі партызанам выконваць баявыя заданні. У Жыткавічах, Старушках, Капцэвічах, Муляраўцы, Пічы, Капаткевічах, Хойніках размясціўся 101-ы полк. Штаб палка знаходзіўся ў Петрыкаве, начальнікам штаба яго быў Ян Налепка (Рэпкін). У чэрвені 1942 г. ён звязаўся з атрадам Міхайлоўскага. Першая група славакаў — 35 чалавек — перайшла да партызан у в. Камаровічы 15 верасня, затым пераход набыў масавы характар. Да лютага 1943 г. у партызанах было ўжо звыш 180 славакаў. У асноўным яны змагаліся ў атрадах Міхайлоўскага і Краўца. Была сфарміравана славацкая рота, якая ўвайшла ў склад Капаткевіцкай брыгады. Разам з народнымі месціцамі славакі грамілі варожыя гарнізоны ў Залессі, Навасёлках, Галоўчыцах, Чалюшчавічах, Праходах, Філатаўцы і іншых вёсках, узарвалі чыгуначны мост на р. Бобрык, нападалі на абозы каля Мышанкі і Міхедавіч, пускалі пад адхоны цягнікі на ўчастку Пціч — Жыткавічы. Каб спыніць пераход славакаў да партызан, нямецкае камандаванне перакінула 101-ы полк на чыгунку Ельск — Корасцень.

15 сакавіка 1943 г. было створана Палескае партызанскае злучэнне, якое аб'яднала 21 атрад, што дыслацыраваліся ў Акцябрскім і Капаткевіцкім раёнах. Узначаліў падпольны абком партыі, створаны ў лютым 1943 г., і партызанскае злучэнне Ф. М. Языковіч. Абком і штаб злучэння размяшчаліся ў в. Камаровічы.

Стварэнне ў 1943 г. чатырох партызанскіх брыгад — 130-й Петрыкаўскай, 120-й і 125-й Капаткевіцкіх і 150-й брыгады імя Ф. М. Языковіча — сведчыць аб тым, што партызанскі рух у раёне насіў масавы характар. Для кіраўніцтва партызанскай і масава-палітычнай работай у красавіку 1943 г. створаны Петрыкаўскі і Капаткевіцкі падпольныя райкомы партыі. Петрыкаўскі райком узначаліў І. Скалабан, Капаткевіцкі — А. Міхайлоўскі. Крыху раней пад кіраўніцтвам сакратара ЦК ЛКСМБ К. Мазурава былі створаны падпольныя райкомы камсамола. Капаткевіцкі падпольны райком ЛКСМБ, які прыступіў да работы 8 кастрычніка 1942 г., знаходзіўся ў 125-й брыгадзе. Узначаліў райком Франц Плавінскі. Петрыкаўскі падпольны райком ЛКСМБ прыступіў да работы 1 студзеня 1943 г.



Камандаванне 125-й Капаткевіцкай партызанскай брыгады

У пачатку вясны 1943 г. у в. Старына сакратар ЦК КП(б)Б М. Аўхімовіч правёў нараду з работнікамі падпольнага друку. Пачалі выдавацца падпольныя раённыя газеты — Петрыкаўская «Сталінская праўда» (рэдактар А. Курапаценка) і Капаткевіцкая «Бальшавік» (рэдактар Т. Ганусевіч). У раёне друкавалася таксама падпольная абласная газета «Бальшавік Палесся».

Партызаны часта выратоўвалі мірнае насельніцтва. 7 сакавіка 1943 г. на дарозе Грабаў — Вятчын разведкай з атрада Балотнікава было вызвалена мірнае насельніцтва, якое акупанты гналі для вывазу ў Германію. 5 немцаў было забіта, людзі ўцяклі ў лес. Партызаны брыгады А. Жыгара ў пачатку сакавіка 1943 г. не дапусцілі знішчэння вёсак Міхедавічы і Бобрык. 26—27 мая атрад Балотнікава яшчэ раз адстаяў Міхедавічы ад знішчэння карным атрадам, які налічваў 300 салдат і афіцэраў. У час бою было знішчана 35 гітлераўцаў.

Новым этапам партызанскага руху стала рэйкавая вайна. Сіламі 125-й Капаткевіцкай брыгады ў адну ноч на 7 жніўня 1943 г. на ўчастку чыгункі Жыткавічы — Калінкавічы было перабіта 63 рэйкі, а з 3 па 7 жніўня на гэтым участку — 186 рэек. На ўчастку чыгункі Старушкі — Бабруйск (гэтая чыгунка не аднавілася) было разбурана 5860 м чыгуначнага палатна. Усяго брыгадай за жнівень 1943 г. было ўзарвана 734 рэйкі і пушчаны пад адхон цягнік. Пасля масіраваных удараў па чыгунцы у немцаў не хапала ні матэрыялаў, ні рабочай сілы на яе аднаўленне. Рух на ўчастку Жыткавічы — Калінкавічы быў паралізаваны, а чыгунка Бабруйск — Старушкі да канца жніўня 1943 г. была поўнасцю выведзена са строю.

Другі этап рэйкавай вайны пад кодавай назвай «Канцэрт» пачаўся з 19 верасня да лістапада 1943 г. Толькі 130-й Петрыкаўскай брыгадай за кастрычнік 1943 г. было знішчана 44 немцы і 14 паліцэйскіх, пушчана пад адхон 20 эшалонаў, разбіта 109 вагонаў і 34 платформы, сапсавана 18 паравозаў, знішчана 10 танкаў, спалена 11 цыстэрн паліва, перабіта 144 рэйкі, парвана 4 км тэлеграфнай сувязі, спалена 23 масты.

Насельніцтва з акупіраваных вёсак



Камандаванне 150-й партызанскай брыгады імя Ф. М. Языковіча

Набліжаўся 1944 год. Чырвоная Армія падыходзіла да граніц Петрыкаўшчыны. У звароце Палескага абкома КП(б)Б з выпадку 25-годдзя стварэння БССР да партызан і ўсіх жыхароў вобласці, які быў надрукаваны ў газеце «Балыпавік Палесся» 1 студзеня 1944 г., гаварылася: «Паглядзіце на наша Палессе! Здаецца, няма жывога кутка на гэтай квітнеўшай пры Савецкай уладзе зямлі. У зону пустынь ператварылі фашысцкія душагубы... Акцябрскі, Капаткевіцкі, Петрыкаўскі раёны... Па ўсёй вобласці, з краю ў край рэхам разносяцца стогны і енкі абяздоленых немцамі людзей. Яшчэ стогне пад фашысцкай пятой наш абласны цэнтр — г. Мазыр. Яшчэ плачуць абяздоленыя гітлераўскімі душагубамі жанчыны і дзеці ў Петрыкаве, у Тураве і ў Жыткавічах. Яшчэ палыхае агонь пажараў... у Капаткевіцкім раёне... У імя поўнага вызвалення нашай зямлі, у імя нашага шчасця, светлай будучыні нашых дзяцей — мацней агонь па гітлераўскаму зверу!»

ішло ў лес з маёмасцю і жывёлай. Так паступілі жыхары Сотніч, Аголіцкай Рудні, Коржаўкі і іншых вёсак. Сяляне в. Палессе і Барычаў разбурылі тры масты, выкапалі равы і зрабілі завалы на дарогах. Тое ж было зроблена ў Міхедавічах, Бабунічах, Курыцічах.

У студзені 1944 г. 136-ы атрад А. Трухановіча (264 чалавекі) і 138-ы І. В. Дубіка (221 чалавек) злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі. У красавіку 1944 г. загінуў І. Скалабан, 130-ю брыгаду ўзначаліў М. Волкаў.

Да сярэдзіны студзеня 1944 г. былі вызвалены першыя населеныя пункты Петрыкаўскага раёна па левым беразе р. Пціч — в. Кацуры, Беседкі, Баянаў, Багрыманічы і іншыя. Камандаванне Палескага злучэння паставіла перад партызанскімі брыгадамі і атрадамі задачу перакрыць шляхі адыходу ворага і ўсімі сіламі перашкаджаць яго адступленню.

Канцэнтрацыя варожых войск павялічвалася. Яны размяшчаліся не толькі ў населеных пунктах, але і ў лясах.



І. І. Маставы

Становішча партызан ускладнялася, весці баявыя аперацыі ў прыфрантавой зоне станавілася ўсё цяжэй. Вораг насядаў на партызанскую зону, прымяняючы авіяцыю, завязаліся жорсткія баі. Зімой карнікі пачалі блакаду 125-й Капаткевіцкай брыгады, яна вяла цяжкія баі да дня вызвалення. Партызаны актыўна вялі разведку варожай арміі. Прыбліжэнне фронту садзейнічала таму, што паліцэйскія гарнізоны пачалі разлагацца, шмат паліцэйскіх пераходзіла да партызан.

Да летняга наступлення Чырвонай Арміі ў чэрвені 1944 г. лінія абароны ворага праходзіла па правым беразе Пцічы, паварочвала на захад і ішла па левым беразе Прыпяці, а ў раёне Навасёлак Петрыкаўскага сельсавета і Петрыкава пераходзіла на правы бераг. Гітлераўскія войскі мелі добра падрыхтаваныя доты, у раёне Петрыкава і Дарашэвіч створаны ўмацаваныя апорныя пункты. Ім супрацьстаяла 61-я армія (генерал-лейтэнант П. Бялоў) і частка сіл 28-й арміі (генерал-лейтэнант А. Лучынскі).

Значную дапамогу пры вызваленні Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў аказвалі партызаны. З пачаткам летняга наступлення Чырвонай Арміі партызанскія атрады накіраваліся на знішчэнне чыгуначнага палатна па адрэзку дарогі Калінкавічы — Жыткавічы. Рэйкі ўзрывалі, адкручвалі гайкі і расцягвалі іх. Паспяховыя аперацыі былі праведзены пад Курыцічамі, каля ст. Пціч. Атрад Бабкова разграміў вялікую групу гітлераўцаў з Кащэвіцкага і Петрыкаўскага гарнізонаў. Атрад Мядзведзева напаў на варожы абоз па дарозе Грабаў — Сялюцічы і вызваліў ад угону ў Германію больш за 150 хлопцаў і дзяўчат. Атрад Арцюха рашуча дзейнічаў каля Муляраўкі і Смятаніч. Партызаны на заключным этапе сваёй гераічнай барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі ўнеслі значны ўклад у іх выгнанне з тэрыторыі раёна, у канчатковы разгром ворага.

У. А. Браім

З першых дзён вайны

Для арганізацыі барацьбы з акупантамі ў тыле ворага з першых дзён вайны пачалі стварацца падпольныя групы і партызанскія атрады. На акупіраванай тэрыторыі было пакінута 45 чалавек — членаў КП(б)Б і савецкіх работнікаў, спіс якіх быў зацверджаны на бюро Палескага абкома партыі. Зацверджаны таксама Петрыкаўскі падпольны РК КП(б)Б. У яго ўвайшлі першы сакратар райкома партыі Х. І. Варгаўцік, другі сакратар І. К. Талкачоў, рэдактар раённай газеты І. І. Альшэўскі, начальнік райаддзела міліцыі А. П. Жукаў і намеснік начальніка райаддзела Малчанаў. Для арганізацыі падпольнай работы ў тыле ворага і падрыхтоўкі матэрыяльнай базы партызанскіх атрадаў створана тройка, у склад якой увайшлі Варгаўцік, Жукаў і Малчанаў. Я быў прызначаны камандзірам партызанскага атрада, камісарам зацверджаны старшыня райвыканкома І. Г. Зобаў. Хутка ён захварэў і быў эвакуіраваны, а камісарам прызначаны С. І. Сакалоўскі. У жніўні 1941 г. І. І. Альшэўскі быў камандзіраваны ў раён Мазыра для вываду групы афіцэраў і салдат-акружэнцаў з мэтай злучэння з рэгулярнымі часцямі. Ён выбыў са складу падпольнага райкома партыі, членам райкома замест яго зацверджаны камісар партызанскага атрада С. І. Сакалоўскі. Партыйныя білеты камуністаў, якія заставаліся змагацца з ворагам на акупіраванай тэрыторыі, былі адабраны на захаванне ў партархіў ЦК КП(б)Б.



В. І. Гардзіенка



М. Ф. Бабкоў

Да ядра будучага партызанскага атрада далучаліся камсамольцы і беспартыйныя, работнікі савецкіх органаў і актывісты, супрацоўнікі НКУС і міліцыі. Хутка ў ім налічвалася каля 100 чалавек, потым улілася група чырвонаармейцаў, салдат і афіцэраў, якія выходзілі з акружэння. Да атрада далучыліся таксама група аператыўных работнікаў з раёнаў Заходняй Беларусі, а таксама група з Жыткавіцкага раёна пад камандаваннем Кавалеўскага. Партызанскі атрад дыслацыраваўся ва ўрочышчы Зялёны мох, ля леснічоўкі непадалёку ад в. Асавец і Снядзін. У загадзя падрыхтаваныя сховішчы былі завезены прадукты харчавання і вопратка, а таксама зброя. Наступала восень, народныя мсціўцы рыхтаваліся да сур'ёзнай барацьбы з ворагам.

Першыя баявыя аперацыі — разведка і засады на дарогах. Было выкрыта і ліквідавана некалькі здраднікаў. Партызаны рабілі налёты на варожыя гарнізоны ў Глінішчах, Снядзіне, Майсеевічах, Асаўцы. У канцы лета атрад перабраўся праз р. Прыпяць каля в. Ляскавічы і рушыў у напрамку Капцэвіч. Гэта нарабіла нямала перапалоху сярод гітлераўцаў. Сілы партызан былі значна перабольшаны, акупанты пацінулі Петрыкаў, Капцэвічы і Канаткевічы.

Нямецкія акупацыйныя ўлады першачарговай задачай ставілі ўзнаўленне камунікацый, сродкаў сувязі, руху параходаў на Прыпяці і Дняпры. Партызаны знішчылі ўсю маёмасць на Прыпяці ад Мазыра да Турава — паромы і катэры, лодкі і бакены. А ў Петрыкаве была разгромлена суднаверф. На берагах ракі рабілі засады, з якіх абстрэльвалі варожыя караблі і баржы. Усяго было знішчана 14 катэраў, разбурана 16 мастоў, парушана звыш 100 км тэлефоннай сувязі.

Найбольш значная аперацыя была праведзена на Прыпяці ў пачатку верасня 1941 г. У сямі кіламетрах ад Петрыкава партызаны зрабілі на беразе засаду. Раніцай паказаўся буксірны катэр з баржай, уся палуба яе была застаўлена бочкамі з палівам. З засады партызаны адкрылі агонь з усіх відаў зброі. Бочкі загарэліся і хутка ўся баржа была ахоплена полымем. Не ўратаваўся і буксірны катэр. Усяго загінула каля 40 ворагаў, знішчана вялікая колькасць ваеннай маёмасці і боепрыпасаў.

У зводцы Саўінфармбюро 17 лістапада 1941 г. паведамлялася: «Партызанскі атрад пад камандаваннем Г., які ўзнік яшчэ ў ліпені, працягвае весці паспяховую барацьбу з нямецкімі акупантамі... У час бою з карным атрадам ворага партызаны знішчылі 12 немцаў. У другім баі было забіта 16 і паранена 10 гітлераўцаў. Партызаны ўзарвалі і патапілі нямецкі параход з ваенным грузам...»

У склад партызанскага атрада ўваходзілі тры ўзводы. Першым узводам камандаваў Яворскі, былы старшыня Грабаўскага сельскага савета. Ён загінуў у баі з ворагамі ў канцы снежня 1941 г. Камандзірам другога ўзвода быў былы дырэктар Капцэвіцкага фанерна га завода «Звязда» А. Зубрыцкі, трэцім узводам камандаваў былы старшыня Петрыкаўскага гарсавета Я. Зарэцкі. Гаспадарчую групу ўзначальваў Я. Палтаран.

У сярэдзіне кастрычніка вораг сабраў значныя сілы, каля 600 гітлераўцаў і паліцаяў. У атрадзе на той час налічвалася 120 чалавек. Пасля цяжкага бою каля в. Турбінка ворагу ўдалося часткова разграміць атрад, захапіць харчовую базу і склад боепрыпасаў. У тым баі загінуў першы сакратар пад-

польнага райкома КП(б)Б Х. Варгаўцік.

Тыя, хто выйшаў з бою, сабраліся 20 кастрычніка на агульны партыйны сход. Для лепшага манеўравання і забеспячэння прадуктамі і боепрыпасамі было вырашана раздзяліць атрад на тры асобныя групы і дзейнічаць кожнай з іх самастойна. Камандзірам першай групы быў зацверджаны Яворскі, другой — А. Зубрыцкі, трэцяй — я. У нашай групе застаўся і камісар атрада С. Сакалоўскі. Яна накіравалася ў бок лініі фронту на тэрыторыі Пінскай і Чарнігаўскай абласцей, дзве астатнія засталіся змагацца з ворагам у Петрыкаўскім раёне.

Цяжкім быў шлях нашай групы на занятай ворагам роднай зямлі. Частымі былі сутычкі з ворагам, даводзілася весці пяроўныя баі, адступаць. Тры партызаны загінулі, было шмат параненых. Позняй восенню ў Дабранскім раёне Чарнігаўскай вобласці сустрэлі разведку ўкраінскага партызанскага атрада, далучыліся да яго і на працягу месяца дзейнічалі разам. Амаль штодня даводзілася адбіваць атакі карнікаў, і мы вымушаны былі перабрацца ў Лоеўскі раён. Там атрад зноў раздзяліўся, наша група перайшла ў лясы Парычскага, затым Хойнікскага раёнаў, дзе дзейнічала да лютага 1942 г. Праз некаторы час яна ўлілася ў атрад імя Суворава Палескага партызанскага злучэння, які 12 снежня 1943 г. злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

* * *

Арганізатары партызанскага руху і байцы, якія найбольш вызначыліся ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі з першых дзён акупацыі: Х. І. Варгаўцік, першы сакратар падпольнага РК КП(б)Б; І. К. Талкачоў, другі сакратар, С. І. Сакалоўскі, камісар атрада, А. І. Малчанаў, А. П. Жукаў, І. І. Альшэўскі — члены падпольнага РК КП(б)Б; Яворскі, А. Зарэцкі, А. К. Зубрыцкі — камандзіры ўзводаў, Я. М. Палтарап — начальнік гаспадарчай часткі, партызанскія разведчыкі Т. І. Арцюх, М. В. Корж, А. Піскун, Г. Шусцерман, партызаны А. С. Булаў, М. М. Галіцкі, А. М. Бычкоўскі, І. Т. Сугрэй, Д. Андрук, М. П. Ільіч, А. І. Барабаш, Бажок (загінуў у 1942 г.), Кананчук, А. Калакін (загінуў у Петрыкаве), Л. Жукавец — партызанка, прыйшла ў атрад разам з бацькам, які загінуў у адным з баёў, Афанасьеў, акружэнец, загінуў у баі ў Дабранскім раёне на Украіне.

В. І. Гардзіенка

З верай у перамогу

Міхайлоўскі Анатоль Цімафеевіч (н. у 1898 г.) напярададні вайны працаваў старшынёй Капаткевіцкага райвыканкома. Пасля акупацыі раёна — камандзір партызанскага атрада, сакратар Капаткевіцкага падпольнага райкома партыі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., Чырвонага Сцяга.

У Капаткевіцкім раёне партызанскі атрад у колькасці каля пяцідзесяці чалавек быў створаны яшчэ да прыходу гітлераўцаў. 30 ліпеня атрад, якім камандаваў М. І. Гардзіенка, пайшоў на загадзя падрыхтаваную лясную базу. Не ва ўсіх была зброя, неабходныя рэчы для суровых умоў жыцця, але ўсе былі поўныя рашучасці змагацца з ворагам і разграміць яго. Збіралі зброю і боепрыпасы, сустракалі акупантаў з засад, грамілі ваенныя ўправы і паліцэйскія ўчасткі, праводзілі масава-палі-



А. Ц. Міхайлоўскі

тычную работу сярод насельніцтва. Атрад пастаянна папаўняўся з ліку патрыётаў — мясцовых жыхароў, чырвонаармейцаў-акружэнцаў.

21 жніўня 1941 г. у в. Навасёлкі партызаны адабралі ў ворага 125 галоў буйной рагатай жывёлы і пераправілі яе праз лінію фронту для Чырвонай Арміі. Праз нскалькі дзён яны ўзарвалі склад боепрыпасаў ворага, знішчылі аўтамашыну і кухню, у перастрэлцы было забіта больш 10 акупантаў. З кожным днём рос аўтарытэт партызан у насельніцтва. Партызанскі рух станавіўся ўсё больш масавым. Атрады раслі колькасна, мацнела іх матэрыяльная і баявая база. Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б, сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі Р. Н. Мачульскі ў канцы 1942 г. дакладваў у запісцы ў ЦК партыі: «Амаль поўнасцю пайшло ў партызаны насельніцтва вёсак Міхедавічы і Бобрыкі Петрыкаўскага раёна...»

16 студзеня 1942 г. народныя мсціўцы на чале з Героем Савецкага Саюза Ф. І. Паўлоўскім разграмілі варожы гарнізон у Капаткевічах. З гэтага дня я стаў камандзірам партызанскага атрада. Першае яго баявое хрышчэнне — — налёт на в. Пціч, дзе размяшчаўся гарнізон гітлераўцаў. Тады было забіта сем немцаў, у якасці трафеяў мы ўзялі кулямёт, 13 вінтовак і шмат боепрыпасаў. У далейшым здзейснілі некалькі ўдачных аперацый у Акцябрскім раёне, разграмілі паліцэйскія ўчасткі ў в. Міхедавічы, Савічы. Вялікую работу па арганізацыі партызанскай барацьбы, падполля на занятай ворагам тэрыторыі праводзілі С. І. Боеў, Ф. А. Плавінскі, І. І. Кацько, В. А. Перфільеў, Л. Л. Федаровіч.

У лютым 1943 г. на Палессе прыбыў сакратар Палескага абкома КП(б)Б і камандзір партызанскага злучэння Ф. М. Языковіч. Пад яго кіраўніцтвам на акупіраванай тэрыторыі пачалі стварацца падпольныя райкомы партыі. У красавіку 1943 г. быў створаны Капаткевіцкі падпольны райком КП(б)Б, я быў прызначаны яго сакратаром. Пачалася новая старонка барацьбы партызан. Мацнелі рады народных мсціўцаў, актывізаваліся іх баявыя дзеянні. У студзені 1943 г. была створана 125-я Капаткевіцкая брыгада, у ліпені — 130-я Петрыкаўская. У 125-й Капаткевіцкай брыгадзе 1 жніўня 1943 г. налічвалася сем партыйных арганізацый. Мужнымі байцамі зарэкамендавалі сябе многія патрыёты, сярод якіх асабліва вызначыліся У. І. Кулак, А. І. Цалко, В. У. Ключнік, Ф. І. Самбук і многія іншыя.

Не скарыліся ворагу

Волкаў Міхаіл Адамавіч (н. у 1905 г. у в. Сялюцічы) — член Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б, камандзір партызанскага атрада, затым — 130-й Петрыкаўскай партызанскай брыгады. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны М. А. Волкаў выбраны старшынёй Петрыкаўскага райвыканкома, затым працаваў у саўгасе «Галубіцкі».

Памёр у 1974 г.

...У сярэдзіне жніўня 1941 г. мы пайшлі ў снядзінскія лясы. Сюды павінна было прыбыць кіраўніцтва Свяцілавіцкага райкома партыі і камандаванне ўтвараемага партызанскага атрада. Але ішоў час, ніхто не з'яўляўся. Настрой у людзей падаў, частка партызан накіравалася да лініі фронту, іншыя разышліся па дамах.

Наша невялікая група рухалася ў бок Бранска. Спадзяваліся сустрэць партызан і дзейнічаць разам. Ішлі з вялікай перасцярогай, рызыкуючы наткнуцца на гітлераўцаў. Так і здары-



М. А. Волкаў

лася ў лістападзе 1941 г. у адной невялікай вёсцы ў Арлоўскай вобласці. Уцякаць позна, схавацца няма куды. Прывезлі ў Гомель, у лагер ваеннапалонных, адтуль – у Бабруйск. Увесь час не пакідала думка аб уцёках. Такая магчымасць з'явілася толькі восенню 1942 г. Пасля доўгіх блуканняў па лясах я трапіў да партызан 125-га атрада, які дыслацыраваўся ў в. Заполле Капаткевіцкага раёна. Мяне накіравалі ў разведгрупу, якой камандаваў А. І. Трухановіч, затым я ўзначальваў дыверсійную групу. Першай буйной аперацыяй, у якой мне давялося ўдзельнічаць, быў узрыў чыгуначнага маста праз р. Бобрык паміж станцыямі Капцэвічы – Муляраўка, у выніку якога рух варожых цягнікоў быў спынены больш як на суткі. Шмат у чым нам дапамагалі мясцовыя жыхары — дзяліліся харчаваннем і вопраткай, перадавалі разведданыя. Надзейныя людзі былі амаль ва ўсіх вёсках раёна.

Калі ў ліпені 1943 г. была створана 130-я Петрыкаўская партызанская брыгада, камісарам якой прызначаны камандзір пашага атрада І. Н. Глушко, мяне зацвердзілі камандзірам 125-га атрада. Я быў таксама членам Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б.

Атрад на працягу ўсяго часу існавання быў моцнай баяздольнай і арганізаванай баявой адзінкай. Не раз вызначыліся ў баях з ворагам пры правядзенні аперацый і дыверсій партызаны П. І. Арцюх, І. А. Мялешка, В. І. Чарнобылец, Р. І. Яновіч і многія іншыя. У лістападзе 1943 г. у нашым атрадзе на працягу трох дзён знаходзіўся сакратар абкома партыі М. І. Малінін. Ен гутарыў з байцамі, цікавіўся баявымі аперацыямі, умовамі жыцця і быту.

У пачатку 1944 г. гітлераўцы, рыхтуючыся да абароны, пачалі глыбокую блакаду партызанскай зоны на тэрыторыі Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў. Мы адыходзілі ў напрамку Чорнага балота і востраваў Зыслаў Любанскага раёна. Карнікі насядалі, народныя мсціўцы мужна стрымлівалі націск добра ўзброенага, падрыхтаванага да наступлення ворага. У красавіку гітлераўцы буйнымі сіламі пры падтрымцы танкаў і артылерыі пачалі штурм нашых умацаванняў на астравах Чорнага балота. Сілы былі няроўнымі, баі ішлі вельмі цяжкія. З вялікімі стратамі партызанам удалося вырвацца з вогненнага кольца, бесперапынныя баі і сутычкі з ворагам не спыняліся да самага дня злучэння з часцямі Чырвонай Арміі. У час прарыву блакады без весткі прапаў І. В. Скалабан, які перад гэтым быў праведзены ў штаб Палескага партызанскага злучэння, я быў прызначаны камандзірам 130-й брыгады.

Адгрымела вайна на тэрыторыі Петрыкаўскага раёна, усё далей на Захад пакаціўся яе вогненны вал. Каля ста былых партызан было пакінута ў тыле для ўзнаўлення разбуранай гаспадаркі. Мяне прызначылі старшынёй Петрыкаўскага райвыканкома, і работы, што дзённых, часта амаль невыканальных клопатаў было столькі, што тут, у тыле, пасля вызвалення было ніколькі не лягчэй, чым у партызанах. Трэба было жыць, працаваць, дапамагаць каваць Перамогу...

Падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанскія брыгады і атрады, якія былі створаны і дзейнічалі на тэрыторыі раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны

ПЕТРЫКАЎСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

18.8.1941 г. — 21.10.1941 г., 4.1943 — 6.7.1944 г.

Пасля акупацыі ворагам Петрыкаўскага раёна (18 жніўня 1941 г.) райком КП(б)Б застаўся ў тыле ворага ў складзе: першы сакратар Х. І. Варгаўцік, другі сакратар І. К. Талкачоў, а таксама члены райкома А. П. Жукаў і І. І. Альшэўскі. Разам з райкомам застаўся партызанскі атрад пад камандаваннем В. І. Гардзіенкі. У кастрычніку 1941 г. пачаліся цяжкія баі з карнымі часцямі акупантаў. 19 кастрычніка ў в. Турбінка загінуў першы сакратар райкома КП(б)Б Х. І. Варгаўцік.

Па загаду партыйнага сходу партыйная арганізацыя атрада 21 кастрычніка і частка асабовага складу перайшла на нелегальнае становішча, астатнім было дазволена ісці праз лінію фронту.

Падпольны райком зноў быў утвораны Палескім абкомам партыі ў красавіку 1943 г. 4 жніўня 1943 г. падпольны абком павялічыў склад райкома да 5 чалавек. Сакратаром райкома быў зацверджаны І. В. Скалабан.

Райком базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 130 (камбрыг І. В. Скалабан, з сакавіка 1944 г. М. А. Волкаў; камісар І. Н. Глушко).

Склад падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратары: Варгаўцік Х. І. (18.8—21.10.1941 г.), Талкачоў І. К. (18.8—21.10.1941 г.), Скалабан І. В. (4.1943—4.1944 г.);

члены райкома: Жукаў А. П. (18.8—21.10.1941 г.), Альшэўскі І. І. (18.8—21.10.1941 г.), Глушко І. Н. (4.8.1943—6.7.1944 г.), Курбатоўскі І. М. (4.8.1943—6.7.1944 г.), Волкаў М. А. (4.8.1943—6.7.1944 г.), Шабалтас А. І. (4.8.1943—6.7.1944 г.).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Сталінская праўда». Рэдактар — Курапаенка А. К.

КАПАТКЕВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

(4.1943 — 29.6.1944 г.)

Утвораны Палескім падпольным абкомам КП(б)Б у красавіку 1943 г. Сакратаром райкома партыі зацверджаны А. Ц. Міхайлоўскі. Базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 125.

Склад падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратар — Міхайлоўскі А. Ц. (4.1943—29.6.1944 г.);

члены райкома: Жыгар А. А. (4.1943—3.1944 г.), Кудравец Ф. Д. (4.1943—29.6.1944 г.), Горбач С. Р. (4.8.1943—29.6.1944 г.), Цалко А. І. (4.8.1943—2.1944 г.), Цагельнік А. Р. (19.6—29.6.1944 г.), Тарасевіч Р. Л. (19.6—29.6.1944 г.).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Большавік». Рэдактары: Каплан Г. Л., Ганусевіч І. Р.

Падпольныя партыйныя органы Кампартыі Беларусі, 1975 г.

ПЕТРЫКАЎСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

(1.1.1943—6.7.1944 г.)

У кастрычніку 1942 г. сакратар ЦК ЛКСМБ К. Т. Мазураў накіраваў у Петрыкаўскі раён упаўнаважаным ЦК ЛКСМБ П. Г. Скачкова і яго памочнікам А. П. Кебеца. У канцы 1942 г. імі быў створаны падпольны райком камсамола, які пачаў працаваць 1 студзеня 1943 г. Яго асноўная база знаходзілася ў 130-й партызанскай брыгадзе ў Петрыкаўскім раёне.

Склад падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары: Скачкоў П. Г. (1.1—30.11.1943 г.), Ключнік В. У. (30.11.1943—6.7.1944 г.), Кебец А. П. (па прапагандзе) (1.1—10.5.1943 г.);

члены райкома: Кебец А. П. (10.5.1943—5.2.1944 г.), Ключнік В. У. (1.1 — 30.11.1943 г.), Данілаў К. В. (1.1.1943—6.7.1944 г.).

КАПАТКЕВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

(8.10.1942—29.6.1944 г.)

Да стварэння падпольнага райкома работу па арганізацыі камсамольска-маладзёжнага падполля ў раёне праводзілі Ф. Д. Кудравец, С. І. Боеў, Ф. А. Плавінскі, камсамольцы В. А. Парфільеў, І. І. Каліцька, Л. Л. Федаровіч і інш.

Падпольны райком пачаў працаваць 8 кастрычніка 1942 г. Яго асноўная база знаходзілася ў 125-й партызанскай брыгадзе ў Капаткевіцкім раёне.

Склад падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары: Плавінскі Ф. А. (8.10.1942—29.6.1944 г.), Боеў С. І. (па прапагандзе) (8.10.1942—29.6.1944 г.);

члены райкома: Каліцька І. І. (8.10.1942—29.6.1944 г.), Кудравец Ф. Д. (8.10.1942—14.9.1943 г.), Парфільеў В. А. (14.9.1943—23.4.1944 г.), Федаровіч Л. Л. (14.9.1943—29.6.1944 г.).

Падпольныя камсамольскія органы Беларусі, 1976 г.

* * *

У вёсцы Камаровічы зімой і ў пачатку вясны 1943 г. размяшчаліся Палескі падпольны абком КП(б)Б і штаб партызанскага злучэння Палескай вобласці.

Падпольны абком (створаны 9.2.1943 г.) узначальваў першы сакратар Ф. М. Языковіч. Партызанскае злучэнне, якім камандаваў Ф. М. Языковіч, створана 15.3.1943 г. Яго аснову склалі партызанскія атрады, што дзейнічалі на поўначы Палескай вобласці.

У 1983 г. на месцы дыслакацыі Палескага падпольнага абкома КП(б)Б і штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

У падмурак перамогі

У в. Камень Асавецкага сельсавета, які да 1962 г. уваходзіў у склад Петрыкаўскага раёна, пахаваны першы сакратар райкома КП(б)Б Хаім Ізраілевіч Варгаўчык. Ён загінуў у няроўным баі з фашысцкімі акупантамі 21 кастрычніка 1941 г.

Х. І. Варгаўчык нарадзіўся ў 1902 г., у 16 гадоў пачаў сваю працоўную біяграфію. Кадры ў тыя неспакойныя гады раслі хутка, гэтак жа, як хутка і бяслед на знікалі, і Хаім Ізраілевіч з 1932 г. займаў адказныя пасады на савецкай рабоце ў Мазырскім раёне, а ў сакавіку 1940 г. прызначаны першым сакратаром Петрыкаўскага райкома партыі. Грымнула вайна, Х. І. Варгаўчык застаўся ў раёне для арганізацыі партызанскай барацьбы з ворагам.



Х. І. Варгаўчык

Атрад, створаны ім, базіраваўся ў непраходных лясах каля в. Турбінка, на мяжы з Мазырскім раёнам. У атрадзе, якім камандаваў В. І. Гардзіенка, налічвалася каля 100 чалавек, гэта была сур'ёзная сіла. Ужо ў жніўні партызаны пачалі ваенныя дзеянні, знішчалі асобныя групы ворага, разганялі паліцэйскія ўправы, разбуралі масты, рабілі засады і дыверсіі, парушалі тэлефонную сувязь. На Прыпяці быў знішчаны параход са зброяй і палівам.

У верасні — кастрычніку 1941 г. нямецкія акупанты арганізавалі першую карную экспедыцыю супраць партызан, якія ўсё больш даваліся ў знакі за-

хопнікам. Пачаліся цяжкія, крывапралітныя баі дрэнна ўзброеных партызан з моцным, загартаваным працаўнікам. Частка іх пайшла праз лінію фронту на злучэнне з Чырвонай Арміяй. Тыя, што засталіся, стрымлівалі адну за другой атакі ворага каля в. Турбінка. 21 кастрычніка пасля мінамётнай падрыхтоўкі немцы зноў пайшлі на пазіцыі партызан. Варожая куля абарвала жыццё партызанскага важака, мужнага і адважнага чалавека Х. І. Варгаўціка.

Атрад вырваўся з акружэння, пекалькі дзён, адступаючы ўглыб лясоў, адбіваў напады ворагаў, пакуль не далучыўся да партызан Чарнігаўскай вобласці. А ў маі 1943 г. у гэтых месцах быў створаны новы партызанскі атрад 130-й Петрыкаўскай брыгады, які вёў баявыя дзеянні да апошняга дня акупацыі.

М. Л. Капач

125-я Капаткевіцкая брыгада

Створана ў студзені 1943 г. у адпаведнасці з загадам па партызанскаму злучэнню Мінскай і Палескай абласцей на базе асобных атрадаў Капаткевіцкага, І. Н. Глушко (Балотнікава), М. Ф. Бабкова, Г. І. Краўца, А. Г. Волкава (пазней 39-ы) і 2-га Капаткевіцкага. Да 15 сакавіка 1943 г. брыгада ўваходзіла ў састаў партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей, пасля яго рэарганізацыі — у састаў злучэння Палескай вобласці. У сакавіку 1943 г. атрад Р. І. Краўца выдзелены для стварэння 210-й брыгады; у чэрвені 1943 г. Капаткевіцкі атрад раздзелены на атрады Ф. Д. Кудраўца (пазней 17-ы) і В. А. Вялігіна (27-ы ім. Ленінскага камсамола); 2 і Капаткевіцкі атрад дзейнічаў у саставе брыгады да 5 чэрвеня 1943 г., затым выдзелены ў самастойны і вызначаны штабным. 27 ліпеня 1943 г. атрады Балотнікава і М. Ф. Бабкова перадыслацыраваны ў Петрыкаўскі раён для арганізацыі 130-й Петрыкаўскай брыгады. У маі — верасні 1943 г. у брыгадзе арганізаваны новыя атрады: А. С. Вырвіча (45-ы ім. І. І. Маставога), М. Х. Семка (пазней 55-ы), Р. А. Такуева (78-ы), А. Д. Сарочыка; 7 снежня 1943 г. у яе састаў уключаны асобны 25-ы атрад. Да верасня 1943 г. атрады брыгады называліся па прозвішчах сваіх камандзіраў, затым ім прысвоены нумарныя абазначэнні. 4 снежня 1943 г. у адпаведнасці з загадам штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе атрадаў 17-га, 27-га ім. Ленінскага камсамола і 39-га арганізавана 150-я брыгада ім. Ф. М. Языковіча. Камандзірам 78-га атрада Р. А. Такуеву і дыверсійнай групы гэтага атрада Ф. А. Малышаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Капаткевіцкім і Петрыкаўскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г. агульнай колькасцю 372 партызаны.

Камандзіры брыгады: Жыгар А. А. (студзень 1843 — сакавік 1944 г.), Куранаў М. Д. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Скалабан І. В. (студзень — ліпень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (ліпень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень — лістапад 1943 г.), Вялігін В. А. (лістапад — снежань 1943 г.), Асокін А. А. (снежань 1943 — люты 1944 г.), Юрасаў І. П. (люты — чэрвень 1944 г.).

Капаткевіцкі атрад

Утвораны 17 жніўня 1941 г. у Церабаўскім сельсавеце Капаткевіцкага раёна з байцоў знішчальнага батальёна. Дзейнічаў да 23 кастрычніка 1941 г., затым раздзяліўся на групы. У студзені 1942 г. на ўказанні Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б быў адноўлены на базе груп А. Ц. Міхайлоўскага, Я. Г. Кліменценкі, А. С. Вырвіча, А. А. Жыгара, Стральцова — І. П. Юрасава. Са студзеня па красавік 1942 г. уваходзіў у састаў «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага», затым дзейнічаў самастойна. 7 чэрвеня 1943 г. на яго аснове сфарміраваны атрады Ф. Д. Кудраўца і В. А. Вялігіна.

Камандзіры атрада: Гардзіенка М. І. (жнівень 1941 — кастрычнік 1941 г.), Міхайлоўскі А. Ц. (студзень 1942 г.), Жыгар А. А. (люты 1942 — студзень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (студзень — чэрвень 1943 г.).

Камісары: Жыгар А. А. (жнівень — кастрычнік 1941 г.), Кудравец Ф. Д. (кастрычнік 1942 — студзень 1943 г.), Горбач С. Р. (студзень — красавік 1943 г.), Курбатоўскі І. М. (красавік — чэрвень 1943 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень 1942 — студзень 1943 г.), Маставы І. І. (студзень — чэрвень 1943 г.).

хошнікам. Пачаліся цяжкія, крывапралітныя баі дрэнна ўзброеных партызан з моцным, загартаваным працаўнікам. Частка іх пайшла праз лінію фронту на злучэнне з Чырвонай Арміяй. Тыя, што засталіся, стрымлівалі адну за другой атакі ворага каля в. Турбінка. 21 кастрычніка пасля мінамётнай падрыхтоўкі немцы зноў пайшлі на пазіцыі партызан. Варожая куля абарвала жыццё партызанскага важака, мужнага і адважнага чалавека Х. І. Варгаўцика.

Атрад вырваўся з акружэння, некалькі дзён, адступаючы ўглыб лясоў, адбіваў напады ворагаў, пакуль не далучыўся да партызан Чарнігаўскай вобласці. А ў маі 1943 г. у гэтых месцах быў створаны новы партызанскі атрад 130-й Петрыкаўскай брыгады, які вёў баявыя дзеянні да апошняга дня акупацыі.

М. А. Капач

125-я Капаткевіцкая брыгада

Створана ў студзені 1943 г. у адпаведнасці з загадам па партызанскаму злучэнню Мінскай і Палескай абласцей на базе асобных атрадаў Капаткевіцкага, І. Н. Глушко (Балотнікава), М. Ф. Бабкова, Г. І. Краўца, А. Г. Волкава (пазней 39-ы) і 2-га Капаткевіцкага. Да 15 сакавіка 1943 г. брыгада ўваходзіла ў састаў партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей, пасля яго рэарганізацыі — у састаў злучэння Палескай вобласці. У сакавіку 1943 г. атрад Р. І. Краўца выдзелены для стварэння 210-й брыгады; у чэрвені 1943 г. Капаткевіцкі атрад раздзелены на атрады Ф. Д. Кудраўца (пазней 17-ы) і В. А. Вялігіна (27-ы ім. Ленінскага камсамола); 2-і Капаткевіцкі атрад дзейнічаў у саставе брыгады да 5 чэрвеня 1943 г., затым выдзелены ў самастойны і вызначаны штабным. 27 ліпеня 1943 г. атрады Балотнікава і М. Ф. Бабкова перадыслацыраваны ў Петрыкаўскі раён для арганізацыі 130-й Петрыкаўскай брыгады. У маі — верасні 1943 г. у брыгадзе арганізаваны новыя атрады: А. С. Вырвіча (45-ы ім. І. І. Маставога), М. Х. Семка (пазней 55-ы), Р. А. Такуева (78-ы), А. Д. Сарочыка; 7 снежня 1943 г. у яе састаў уключаны асобны 25-ы атрад. Да верасня 1943 г. атрады брыгады называліся па прозвішчах сваіх камандзіраў, затым ім прысвоены нумарныя абазначэнні. 4 снежня 1943 г. у адпаведнасці з загадам штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе атрадаў 17-га, 27-га ім. Ленінскага камсамола і 39-га арганізавана 150-я брыгада ім. Ф. М. Языковіча. Камандзірам 78-га атрада Р. А. Такуеву і дывэрсійнай групы гэтага атрада Ф. А. Малышаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Капаткевіцкім і Петрыкаўскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г. агульнай колькасцю 372 партызаны.

Камандзіры брыгады: Жыгар А. А. (студзень 1843 — сакавік 1944 г.), Куранаў М. Д. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Скалабан І. В. (студзень — ліпень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (ліпень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень — лістапад 1943 г.), Вялігін В. А. (лістапад — снежань 1943 г.), Асокін А. А. (снежань 1943 — люты 1944 г.), Юрасаў І. П. (люты — чэрвень 1944 г.).

Капаткевіцкі атрад

Утвораны 17 жніўня 1941 г. у Церабаўскім сельсавеце Капаткевіцкага раёна з байцоў знішчальнага батальёна. Дзейнічаў да 23 кастрычніка 1941 г., затым раздзяліўся на групы. У студзені 1942 г. па ўказанні Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б быў аднаўлены на базе груп А. Ц. Міхайлоўскага, Я. Г. Клименценкі, А. С. Вырвіча, А. А. Жыгара, Стральцова — І. П. Юрасава. Са студзеня па красавік 1942 г. уваходзіў у састаў «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага», затым дзейнічаў самастойна. 7 чэрвеня 1943 г. на яго аснове сфарміраваны атрады Ф. Д. Кудраўца і В. А. Вялігіна.

Камандзіры атрада: Гардзіенка М. І. (жнівень 1941 — кастрычнік 1941 г.), Міхайлоўскі А. Ц. (студзень 1942 г.), Жыгар А. А. (люты 1942 — студзень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (студзень — чэрвень 1943 г.).

Камісары: Жыгар А. А. (жнівень — кастрычнік 1941 г.), Кудравец Ф. Д. (кастрычнік 1942 — студзень 1943 г.), Горбач С. Р. (студзень — красавік 1943 г.), Курбатоўскі І. М. (красавік — чэрвень 1943 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень 1942 — студзень 1943 г.), Мастаны І. І. (студзень — чэрвень 1943 г.).



У. І. Кулак



І. Н. Глушко



В. А. Вялігін



А. А. Жытар

45-ы атрад імя І. І. Маставога

Сфарміраваны 1 мая 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы А. С. Вырвіча, выдзеленай Капаткевіцкім атрадам у сакавіку 1943 г. 12 сакавіка 1944 г. названы імем камандзіра атрада І. І. Маставога, які загінуў 11 сакавіка 1944 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 117 партызан.

Камандзіры атрада: Вырвіч А. С. (май — снежань 1943 г.), Маставы І. І. (снежань 1943 — сакавік 1944 г.), Алексіевіч Т. А. (сакавік — чэрвень 1944 г.), Жыльскі М. Д. (чэрвень 1944 г.).

Камісары: Аўсіевіч В. Д. (май 1943 г.), Цалка А. І. (май 1943 — люты 1944 г.), Ходзька Я. А. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Начальнік штаба — Алексіевіч І. І. (жнівень 1943 — чэрвень 1944 г.).

78-ы дыверсійны атрад

Арганізаваны ў жніўні 1943 г. на падставе рашэння Палескага падпольнага абкома КП(б)Б з партызан, выдзеленых 125-й Капаткевіцкай і 225-й партызанскімі брыгадамі. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 135 партызан.

Камандзіры атрада: Герой Савецкага Саюза Такуеў Р. А. (жнівень 1943 — сакавік 1944 г.), Петухоў У. А. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісар — Цагельнік А. Ф. (жнівень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Петухоў У. А. (жнівень 1943 — сакавік 1944 г.), Якаўлеў М. Ф. (сакавік 1944 — чэрвень 1944 г.).

55-ы атрад

Утвораны ў верасні 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы М. Х. Семка — С. К. Дашкевіча, выдзеленай брыгадай у жніўні 1943 г. і з жыхароў вв. Іванкавічы, 1-я Слабодка, Гарадзішча, Церабаў Капаткевіцкага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 22 лютага 1944 г. налічвалася 55 партызан.

Камандзір атрада — Семка М. Х. (верасень 1943 — люты 1944 г.).

Камісары: Дашкевіч С. К. (верасень — снежань 1943 г.), Герасіменка І. К. (снежань 1943 — люты 1944 г.).

Начальнік штаба — Гайчук Ц. М. (кастрычнік 1943 — люты 1944 г.).

25-ы атрад

Сфарміраваны ў верасні 1943 г. па распараджэнню Капаткевіцкага падпольнага райкома КП(б)Б на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай брыгадай. Да 7 снежня 1943 г. атрад дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 84 партызаны.

Камандзіры атрада: Куранаў М. Д. (снежань 1943 — сакавік 1944 г.), Лук'янчыкаў Д. Е. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Зелянко Б. К. (верасень 1943 — сакавік 1944 г.), Рыжанкоў П. В. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Гусараў А. Я. (верасень 1943 — студзень 1944 г.), Марціноўскі Ф. Р. (студзень — чэрвень 1944 г.).

Атрад А. Д. Сарочыка

Арганізаваны ў кастрычніку 1943 г., у сакавіку 1944 г. расфарміраваны, яго асабовы састаў размеркаваны па іншых атрадах.

Камандзір атрада — Сарочык А. Д. (кастрычнік 1943 — сакавік 1944 г.).

Камісары: Пераходскі Т. Я. (кастрычнік — снежань 1943 г.), Тарасевіч Р. Л. (снежань 1943 — сакавік 1944 г.).

Начальнікі штаба: Алексіевіч Т. А. (кастрычнік 1943 — сакавік 1944 г.), Каліцька П. З. (сакавік 1944 г.).

Баявыя аперацыі партызаны праводзілі на чыгуначным участку Лунінец — Гомель, на шашэйных і грунтавых дарогах Мазыр — Петрыкаў, Капаткевічы — Пціч, Капаткевічы — Акцябрскі. У жніўні 1943 г. падарвалі больш за 1,7 тыс. рэек, у ноч на 21.6.1944 г. на ўчастку Старушкі — Бабруйск больш за 270 рэек. У сакавіку і чэрвені 1943 г. і першай палове 1944 г. правялі баі супраць карнікаў, абаранялі мясцовае насельніцтва ад знішчэння і вывазу на катаржныя работы ў Германію.

130-я Петрыкаўская брыгада

Створана 27 ліпеня 1943 г. на загаду штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе атрадаў І. Н. Глушко (Балотнікава, пазней 125-ы), М. Ф. Бабкова (пазней 135-ы), выдзеленых 125-й Капаткевіцкай брыгадай, і атрада Р. І. Краўца (пазней 132-і), які дзейнічаў да ліпеня 1943 г. у саставе 210-й Капаткевіцкай брыгады.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі: 136-ы і 138-ы атрады — у студзені 1944 г., 132, 125, 135 і 133-і — 6 ліпеня 1944 г. Агульная колькасць партызан — 1215.

Камандзіры брыгад: Скалабан І. В. (ліпень 1943 — сакавік 1944 г.), Волкаў М. А. (сакавік 1944 — ліпень 1944 г.).

Камісар — Глушко І. Н.

Начальнік штаба — Кулак У. І. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

132-і атрад

Арганізаваны ў верасні 1941 г. у в. Залужжа Старадарожскага раёна. Да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым перадыслацыраваўся ў Петрыкаўскі і Капаткевіцкі раёны, дзе ў студзені 1943 г. уключаны ў склад 125-й Капаткевіцкай брыгады. У сакавіку 1943 г. выдзелены для арганізацыі 210-й брыгады.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 192 партызаны.

Камандзіры атрада: Кравец Р. І. (жнівень 1942 — сакавік 1944 г.), Астапчук П. М. (сакавік — ліпень 1944 г.).



М. Д. Куранаў



Ф. Д. Кудравец



І. В. Дубік



М. І. Гардзіенка

Камісары: Ульяшоў Ц. Ц. (верасень 1941 — май 1942 г.), Тарасаў А. А. (май — лістапад 1942 г.), Рэва Рыгор Якаўлевіч (лістапад 1942 — сакавік 1943 г.), Шыманец К. К. (сакавік — май 1943 г.), Макейчык А. М. (май — ліпень 1943 г.), Курбатоўскі І. М. (ліпень 1943 — чэрвень 1944 г.), Лапо М. І. (чэрвень — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Ульяшоў Ц. Ц. (май — кастрычнік 1942 г.), Астапчук П. М. (кастрычнік 1942 — сакавік 1944), Старцаў П. Ф. (сакавік — ліпень 1944 г.).

125-ы атрад

Утвораны ў жніўні 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы І. Н. Глушко (Балотніказа), выдзеленай у ліпені 1942 г. Капаткевіцкім атрадам. Да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым — у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 160 партызан.

Камандзіры атрада: Глушко І. Н. (жнівень 1942 — ліпень 1943 г.), Волкаў М. А. (ліпень 1943 — сакавік 1944 г.), Мядзведзеў Ф. Е. (сакавік — ліпень 1944 г.).

Камісары: Курбатоўскі І. М. (кастрычнік 1942 — красавік 1943 г.), Волкаў М. А. (красавік — ліпень 1943 г.), Мядзведзеў Ф. Е. (ліпень 1943 — сакавік 1944 г.), Ільіч М. П. (сакавік — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Багравец М. П. (жнівень 1942 г.), Кулак У. І. (верасень 1942 — ліпень 1943 г.), Мялешка І. А. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

135-ы атрад

Створаны ў кастрычніку 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы М. Ф. Бабкова — І. В. Дубіка, выдзеленай у верасні атрадам М. П. Бумажкова 225-й партызанскай брыгады. Да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым — у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 260 партызан.

Камандзіры атрада: Бабкоў М. Ф. (кастрычнік 1942 — лістапад 1943 г.), Глебаў М. Г. (лістапад 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Дубік І. В. (кастрычнік 1942 — жнівень 1943 г.), Мутерман М. Н. (жнівень 1943 — сакавік 1944 г.), Куранцова А. К. (сакавік — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Мутерман М. Н. (кастрычнік 1942 — студзень 1943 г.), Кабановіч А. П. (люты 1943 — ліпень 1943 г.), Яновіч Р. І. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

136-ы атрад

Арганізаваны 7 жніўня 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы А. І. Трухановіча — А. І. Шабалтаса, выдзеленай у маі 1943 г. 125-м атрадам. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 25 студзеня 1944 г. налічвалася 250 партызан.

Камандзір атрада — Трухановіч А. І.

Камісар — Шабалтас А. І.

Начальнік штаба — Палознік Ф. Д. (жнівень 1943 — студзень 1944 г.).

138-ы атрад

Утвораны 7 жніўня 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай у маі 1943 г. 135-м атрадам. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 19 студзеня 1944 г. налічвалася 208 партызан.

Камандзір атрада — Дубік І. В.

Камісар — Амельчанка М. М.

Начальнік штаба — Кудзелін В. Р. (жнівень 1943 — студзень 1944 г.).

133-і атрад

Сфарміраваны 20 кастрычніка 1943 г. з асабовага саставу 3-й роты 125-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 110 партызан.

Камандзір атрада — Аршох П. І.

Камісар — Ярыга І. П.

Начальнік штаба — Данілаў К. В. (кастрычнік 1943 — ліпень 1944 г.).

Партызаны наносілі ўдары па камунікацыях ворага, знішчалі яго жывую сілу і тэхніку. У лістападзе — снежні 1942 г. удзельнічалі ў падрыве мастоў на р. Пціч і Бобрык. Вялі шматлікія баі, у тым ліку каля в. Міхедавічы (22.2.1943 г.), в. Бабунічы (26—27.5.1943 г.), Асавец (28.7 і 2.8.1943 г.) Петрыкаўскага раёна, на дарозе Конкавічы — Балажэвічы (24.8.1943 г.). У сакавіку 1943 г. замініравалі дарогу каля в. Кашцэвічы, падарвалі некалькі машын з жывой сілай ворага. 21.8.1943 г. разгромілі гарнізон праціўніка, які ахоўваў чыгуначны ўчастак Муляраўка — Коржаўка. У жніўні — верасні 1943 г. у аперацыі «райкавая вайна» на чыгуначных участках Лунінец — Жыткавічы — Калінкавічы падарвалі звыш 2 тыс. рэек.

210-я Капаткевіцкая брыгада

Створана ў сакавіку 1943 г. на падставе загаду штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе асобных атрадаў П. Е. Ігуменава, І. С. Губіна, А. Ф. Сарафанава, І. А. Бабіча і атрада Р. І. Краўца, выдзеленага 125-й Капаткевіцкай брыгадай. 18 чэрвеня 1943 г. у саставе брыгады арганізаваны атрад Е. Г. Гулевіча. Брыгада ў канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1943 г. была расфарміравана. Атрад Р. І. Краўца перададзены 130-й Петрыкаўскай брыгадзе, атрад Е. Г. Гулевіча — 99-й Калінкавіцкай, атрады П. Е. Ігуменава, І. А. Бабіча, І. С. Губіна і А. Ф. Сарафанава выдзелены ў самастойныя.

Камандзір брыгады — Кулікоўскі І. М. (сакавік 1943 — ліпень 1943 г.).

Камісары: Пінчук К. Ф. (сакавік — красавік 1943 г.), Плыткевіч І. П. (красавік — ліпень 1943 г.).

Начальнік штаба — Васільеў В. М. (сакавік — ліпень 1943 г.).

Асобны петрыкаўскі атрад

Утвораны ў ліпені 1941 г. на падставе пастановы Палескага абкома КП(б)Б ад 23 ліпеня 1941 г. У кастрычніку 1941 г. атрад быў акружаны карнікамі. Па рашэнню партыйнага сходу атрад разбіўся на групы і выйшаў за лінію фронту.

Камандзір атрада — Гардзіенка В. І.

Камісар — Сакалоўскі С. І.

Начальнік штаба — Яворскі.



Ф. А. Бажок, Тараканаў, Ф. А. Плавінскі, А. Д. Сарочык



У. С. Лесюкоў, намеснік камандзіра 130-й партызанскай брыгады



І. І. Арцюх, намеснік камандзіра 45-га партызанскага атрада



В. В. Цылько, намеснік камандзіра атрада



Ц. Ц. Ульяшоў

Асобны штабны атрад

Утвораны ў студзені 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай атрадам ім. А. В. Суворава 225-й брыгады. Да 5 чэрвеня 1943 г. атрад дзейнічаў у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады, затым — самастойна як штабны атрад.

Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 27 чэрвеня 1944 г. ў складзе 116 партызан.

Камандзір атрада — Бар'яш Р. І. (верасень 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Лапо М. І. (студзень 1943 — сакавік 1944 г.), Самбук Ф. І. (сакавік — чэрвень 1944 г.), Сабецкі І. С. (чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Неўскі А. І. (студзень — май 1943 г., верасень 1943 — чэрвень 1944 г.), Фасоль А. І. (май — верасень 1943 г.), Волкаў А. Р. (чэрвень 1944 г.), Шумідуб А. Т. (чэрвень 1944 г.).

Атрад ім М. І. Калініна

Арганізаваны 1 студзеня 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай атрадам «За Савецкую Радзіму». З сакавіка па ліпень 1943 г. дзейнічаў у саставе 210-й Капаткевіцкай брыгады, затым — самастойна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 89 партызан.

Камандзір атрада — Бабіч І. А. (студзень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Чарнушын П. Р. (май 1943 — люты 1944 г.), Макейчык А. Р. (люты — красавік 1944 г.), Рынейскі Б. В. (красавік — чэрвень 1944 г.).

Начальнік штаба — Паточын Я. Г. (студзень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Атрад «За Савецкую Радзіму»

Арганізаваны ў студзені 1942 г. на базе партызанскай групы А. Г. Балахонава, якая дзейнічала з 1941 г. Да красавіка 1942 г. уваходзіў у састаў «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага», затым дзейнічаў самастойна. 8 студзеня 1943 г. уключаны ў 3-ю брыгаду Мінскай вобласці, у сакавіку 1943 г. перададзены 210-й Капаткевіцкай, у саставе якой знаходзіўся да ліпеня 1943 г. У сувязі з расфарміраваннем 210-й Капаткевіцкай брыгады атрад у ліпені 1943 г. вылучаны ў самастойную баявую адзінку.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваўся 141 партызан.

Камандзіры атрада: Балахонаў А. Г. (студзень — красавік 1942 г.), Праходскі М. Л. (красавік — верасень 1942 г.), Ігуменаў П. Я. (верасень 1942 — верасень 1943 г.), Бабіч В. П. (верасень — снежань 1943, чэрвень 1944 г.), Юневіч П. М. (снежань 1943 — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Цыкоўскі З. М. (студзень — ліпень 1942 г.), Караблін В. П. (студзень — ліпень 1943 г.), Плыткевіч І. П. (ліпень — кастрычнік 1943 г.), Пінчук К. Ф. (кастрычнік 1943 — студзень 1944 г.), Захарынскі І. І. (студзень — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Бабіч В. П. (студзень 1942 — верасень 1943 г.), Кусяшкоў М. Ц. (верасень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Асобны атрад А. Ф. Сарафанава

У лістападзе 1941 г. у г. Бабруйску па ініцыятыве А. Ф. Сарафанава з ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне, і падпольшчыкаў арганізавана партызанская група. З 28 снежня 1941 г. па 17 студзеня 1942 г. дзейнічала ў саставе асобнага атрада І. С. Губіна, затым уліцася ў атрад І. Г. Жулегі 123-й брыгады. 15 мая 1942 г. група выдзелілася і была аформлена ў атрад. Да сакавіка 1943 г. ён дзейнічаў у саставе 123 й імя 25 годдзя БССР брыгады, затым перададзены 210-й Капаткевіцкай брыгадзе, у ліпені 1943 г. вылучаны ў самастойную баявую адзінку.

Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 3 ліпеня 1944 г. у саставе 68 партызан.

Камандзіры атрада: Сарафанаў А. Ф. (май 1942 — чэрвень 1943 г.), Карнілаў Д. Я. (чэрвень — ліпень 1943 г.), Васільеў В. М. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Рудэнка А. І. (май 1942 — красавік 1943 г.), Шарыкалаў К. У. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Бушуеў М. В. (кастрычнік 1942 — красавік 1943 г.), Шарыкалаў К. У. (чэрвень — ліпень 1943 г.), Карнілаў Д. Я. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

150-я брыгада імя Ф. М. Языковіча

У снежні 1943 г. загадам па партызанскаму злучэнню Палескай вобласці з атрадаў 17-га, 27-га імя Ленінскага камсамола і 39-га, вылучаных 125-й Капаткевіцкай брыгадай, створана 150-я партызанская брыгада, якой было прысвоена імя сакратара Палескага падпольнага абкома КП(б)Б Ф. М. Языковіча, які загінуў у баі 7 красавіка 1943 г. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 30 сакавіка 1944 г. Расфарміравана 23 красавіка 1944 г. На дзень расфарміравання налічваўся 541 партызан.

Камандзір брыгады — Вялігін В. А.

Камісар — Падута С. М.

Начальнік штаба — Гардзіенка М. І. (снежань 1943 — красавік 1944 г.).

17-ы атрад

Утвораны 7 чэрвеня 1943 г. у складзе 125-й Капаткевіцкай брыгады Палескай вобласці з асабовага саставу 1-й і 2-й рот Капаткевіцкага атрада. На дзень расфарміравання налічваўся 151 партызан.

Камандзіры атрада: Кудравец Ф. Д. (чэрвень 1943 г.), Падута С. М. (ліпень — снежань 1943 г.), Малінец С. І. (снежань 1943 — красавік 1944 г.).

Камісары: Курбатоўскі І. М. (чэрвень — ліпень 1943 г.), Тарасевіч Р. Л. (ліпень 1943 г.), Боеў С. І. (снежань 1943 — красавік 1944 г.).

Начальнікі штаба: Маставы І. І. (чэрвень — снежань 1943 г.), Сакалоў І. А. (снежань 1943 — красавік 1944 г.).

27-ы атрад імя Ленінскага камсамола

Сфарміраваны 7 чэрвеня 1943 г. у складзе 125-й Капаткевіцкай брыгады Палескай вобласці з асабовага саставу 3-й і 4-й рот Капаткевіцкага атрада. У час расфарміравання налічвалася 185 партызан.

Камандзіры атрада: Вялігін В. А. (чэрвень — лістапад 1943 г.), Гардзіенка М. І. (лістапад — снежань 1943 г.), Чырлін Э. Я. (снежань 1943 — красавік 1944 г.).

Камісары: Падута С. М. (чэрвень — ліпень 1943 г.), Ганчароў М. А. (ліпень 1943 — студзень 1944 г.), Тарасевіч У. С. (студзень — красавік 1944 г.).

Начальнікі штаба: Ахрамёнка К. М. (чэрвень — верасень 1943 г.), Чырлін Э. Я. (верасень — снежань 1943 г.), Тарасевіч У. С. (снежань 1943 — студзень 1944 г.), Бажко Ф. С. (студзень — красавік 1944 г.).

39-ы атрад імя В. Н. Бажэнкі

Арганізаваны ў лістападзе 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы А. Р. Волкава, выдзеленай атрадам «За Радзіму» і з жыхароў в. Навасёлкі Капаткевіцкага раёна. З 9 верасня 1943 г. — 39-ы атрад, у лютым 1944 г. названы імем героя грамадзянскай вайны В. Н. Бажэнкі. Дзейнічаў самастойна, са студзеня па 7 снежня 1943 г. — у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады.

У час расфарміравання налічваўся 71 партызан.

Камандзіры атрада: Волкаў А. Р. (лістапад 1942 — студзень 1944 г.), Кліменценка Я. Р. (студзень — красавік 1944 г.).

Камісары: Патапенка А. Т. (лістапад 1942 — студзень 1944 г.), Ганчароў М. А. (студзень — красавік 1944 г.).

Начальнікі штаба: Курчыпкі М. С. (лістапад 1942 — красавік 1943 г.), Гардзіенка М. І. (май — лістапад 1943 г.), Маёрчык С. Я. (лістапад 1943 — красавік 1944 г.).

Петрыкаўская падпольная патрыятычная група

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да студзеня 1943 г. у Петрыкаве. Аб'ядноўвала 9 чалавек. Кіраўнік — Ф. В. Кляўцоў. З восені 1942 г. выконвала заданні партызанскіх атрадаў Балотнікава (І. Н. Глушко) і М. Ф. Бабкова.

Падпольшчыкі вялі палітычную агітацыю сярод насельніцтва, прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, здабывалі нямецкія пропускі, спісы жыхароў, прызначаных для вывазу на катаргу ў Германію, звесткі пра варожы гарнізон, карныя экспедыцыі, фашысцкую агентуру. 29.1.1943 г. падарвалі будынак гебітскамісарыята, знішчылі 12 рухавікоў для бранятаграў, 3 аўтамашыны, сапсавалі 2 зенітныя гарматы.

У Петрыкаве ў гонар падпольшчыкаў устаноўлена мемарыяльная дошка.

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, 1983 г.

Партызанскі «падарунак»

Першая вясновая зіма была марознай і снежнай. У замець гітлераўцы з чыгуначнага гарнізона Муляраўка нікуды не выязджалі. У вакзале, пераабсталяваным пад казарму, было холадна — дроў ніхто не прывозіў. Гебітскамісар Петрыкаўскай акругі генерал Рэдке загадаў начальнікам паліцэйскіх управаў забяспечыць палівам гарадскую жандармерыю, прамкамбінат лесапрамыслоўцы Крамера і чыгуначныя гарнізоны ў Капцэвічах, Муляраўцы, Жыткавічах. Але загад Рэдке не заўсёды ўдавалася выканаць. У сялян знаходзілася нямала прычын, каб не ехаць у лес.

Партызаны «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага» (аб'яднанне партызанскіх атрадаў, створанае ў студзені 1942 г. для абароны Акцябрскага раёна) вырашылі да свята 24-й гадавіны Чырвонай Арміі зрабіць «падарунак» гітлераўцам — прывезці дроў у Муляраўку. Камандаваў аперацыяй камісар гарнізона С. В. Маханько.

...Ноч на 23 лютага выдалася асабліва марознай, месячнай. Партызаны пад выглядам сялян увечары прывезлі на станцыю дровы. Пад імі была зброя.

На ганку стаяў вартавы. Сідар Мельнік наблізіўся да яго і запытаў:

— Куды згружаць дровы?

Немец махнуў рукой у вугал двара і хутка знік у памяшканні — вельмі ціснуў мароз

— Скідвай дровы. Ціпэй...

Пачалі разгружаць дровы. Напружанне, нібы падагрэтае зіхатлівым святлом месяца, нарастала.

— У вокны — гранатамі! — дае каманду С. В. Маханько. Зазвінела разбітае шкло, з будынку завухала, задрыжалі сцены. Калі языкі полымя шуганулі вышэй даху, у неба ўзнялася зялёная ракета — адыход! Збор быў прызначаны ў сасоннику па курыцінкай дарозе.

— Малайцы, хлопцы, — прастуджаным голасам сказаў камісар. — Так заўсёды трэба дзейнічаць.

Праз суткі з Петрыкаўскага падполля паступіла паведамленне: «29 чалавек з муляраўскага гарнізона забіты. Трое ў адной бялізне прыбеглі ў Петрыкаў з абмарожанымі нагамі...»

За дзёрзкую аперацыю па разгрому гарнізона ворага ў Муляраўцы Сямёну Маханько, Сідару Мельніку, Дзмітрыю Царанкову, Уладзіміру Лесюкову партызанскім камандаваннем была аб'яўлена падзяка. У. С. Лесюкоў прайшоў усю вайну, узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны І і ІІ ступені.

М. П. Шамрыла

Ад гонану бароў

Цяжка перажываў Васіль Ісакавіч Талаш, які дзякуючы Я. Коласу стаў сапраўдным народным героем, новую навалу на нашу краіну. Жніўеньскім днём, калі дзед быў дома адзін (сын у той дзень пасвіў кароў), наляцелі ворагі ў Навасёлкі, і адразу да Талаша. Дапытвалі, пагражалі расстрэлам, адабралі ордэн Леніна. Потым забралі ў турму, у Петрыкаў. Яму ўдалося выкруціцца, сказаўшы, што ў мінулую вайну ён змагаўся не з немцамі, а з палякамі, палякі тады і з немцамі не мірыліся... Дзед таіў вялікую крыўду на няпрошаных гасцей і пры першым зручным выпадку падаўся да партызан. Зрабіў гэта, як заўсёды, кемліва. Перад тым як падацца ў лес, расказваюць, узяў сякеру, пайшоў на Прыпяць, высек у лёдзе пельку. Потым склаў каля яе адзенне і задам, ступаючы ў свае сляды, выйшаў на дарогу... Разнеслася чутка, што дзед не вытрымаў абразы і знявагі ворагаў і ўтапіўся.

Талаш трапіў у Мінскае партызанскае злучэнне Р. Н. Мачульскага. Вопытны чалавек і стары партызан, ён стаў дарадцам камандзіраў і настаўнікам маладых партызан. 31 снежня 1942 г. прыняў партызанскую прысягу. А потым камандаванне вырашыла паслаць дзеда Талаша ў Маскву хадайнічаць па партызанскіх, народных справах. На самалёце з вострава Зыслаў у студзені ён паляцеў у сталіцу.

Жыў у Маскве ў гасцініцы «Якар», сустракаўся з маскоўскімі рабочымі, выступаў перад воінамі Чырвонай Арміі. І ніколі не скідаў з плеч свайго рудога кажушка. Любіў пахваліцца перад сустрэчнымі: «Вы чыталі коласаву «Дрыгву»? Я той самы Талаш...»

Пабываў у Крамлі, сустрэўся з М. І. Калініным, які з цікавасцю слухаў легендарнага дзеда. Тады ж пачаў хадайнічаць аб выдачы новага ордэна замест адабранага немцамі, і хутка атрымаў дублікат яго. Неаднаразова сустракаўся ў гасцініцы з Я. Коласам,



Г. П. Матавілаў уручае В. І. Талашу Ганаровую грамату і Памятны знак «За шматгадовую і бездакорную службу ў дзяржаўнай лесаахове СССР». Студзень 1945 г.

палоўгу гутарыў з ім, і пісьменнік з цеплынёй адзываўся аб тых сустрэчах. Выступаў В. І. Талаш па радыё з палымянымі заклікамі да партызан мацней біць ворага, набліжаць светлы дзень перамогі.

Перадачу рыхтаваў журналіст Васіль Бурносаў. Ён успамінаў:

— Я паехаў да Талаша ў гасцініцу. Прапанову выступіць па радыё ён прыняў з ахвотай. «А скажы мпе, голубе, ці пачуюць мяне петрыкаўцы?» Атрымаўшы станоўчы адказ, дзед захваляваўся: «А хлопцы, што ў пушчы?» Я сказаў, што і яны пачуюць. «Дык няўжо ўся Беларусь?.. Калі пачынаць?»

І вось дзед Талаш на радыё. Дыктар дае яму слова. Васіль Ісакавіч не спяшаючыся, з уласцівай яму разважнасцю пачынае:

— Сказаць — не грэх. Галоўнае, каб пачулі... Дарагія мае землякі! Слова маё ідзе да вас аж з самай Масквы. Тут ведаюць пра вас і ў бядзе не пакінуць. І на фашыста прыйдзе пагібель, верце мне... Многа паганцаў квапілася на нашу зямлю, ды ніводнаму не ўдалося паланіць нас...

КАБ ПРЫЙШЛО ХУТЧЭЙ НА НАШУ ЗЯМЛЮ СВЯТА — ЗАБІ НЕМЦА КАТА

Паслухайце, што скажа стары прыяцель ваш, партызан дзед Талаш.

Дарагія мае браточкі, любыя сыны і дочкі, партызаны і партызанкі, хлопцы-прыгажуны і дзяўчаты-вясняшкі, дзеці Беларусі роднай — усе, хто хоча жыць свабодна.

Жыву я на свеце не мала і не многа... Паспытаў у жыцці ўсялякіх прысмакаў. Быў і ў полымі, і ў агні, і пад канём, і на кані. Жыў часам з квасам, а парою з вадою. Але ў маладосці і мядзведзю паламаў бы косці.

А ў васемнаццатым годзе многа я ворагам нашым нашкодзіў. Вадзіў я сваіх партызанаў-сынкоў на акупантаў-ваўкоў.

А пры ладзе савецкім жыў я, як і вы, жыццём радасным, маладзецкім.

Бачыў я на віку сваім слізняў і вужак розпай народы, і з-пад пня і з-над калоды, і доўгіх і каратказатых, і шэрых і паласатых, але гадзюкі такога заводу, што прыйшла на Беларусь з Берліна, не бачыў ні я сам, і ніхто з маёй Радзімы.

Такой пакуты, што прынёс нам Гітлер люты, — слёз мора і крыві рэкі — крыніцы — не бачыла яшчэ ніколі наша беларуская зямліца.

Ужо нашых людзей каля мільёна знішчыў немец шалёны. А той, хто застаўся жывым, жыве жыццём жабрацкім — старэнькая маці горкімі слязамі плача.

А на месцы, дзе стаялі будынкі светлыя, дзе звінелі галасы радасныя і ветлівыя, зараз чорныя папялішчы, і над імі вецер хаўтурную песню свішча. Там, дзе быў чуцен на гасціпцы задумлівы шум ліп і дубоў, — гоняць немцы-чужынцы беларусаў на катаргу, як рабоў.

Гляньце, што робіцца ў Мінску, дзе немцы гаспадараць па-свінску. Тое, што было любе нашаму люду, немец апагаціць хоча брудам. У нашым парку, дзе заўсёды гарэлі агні ярка, дзе можна было павесяліцца, выпіць чарку, наш парк, які людзі любілі змалку, немец паганы ператварыў у смешавую звалку. І ў гэтым смецці капошацца беларускія дзеці. Яны, нашы дзеткі, нашы кветкі родныя, па віне немца праклятага, абшарпаныя, халодныя і галодныя, страшэнныя з віду, шукаюць хоць пляснелую скарыначку сярод адкідаў. Яны, як бязгнёздыя птахі, забіваюцца ноччу пад дахі, туляцца ў падзямеллях і норах — гэта іх туды загнаў немец, наш смяротны вораг. Фашыст іх прымушае быць жывёламі-рабамі, ляскаць ад холаду і голаду зубамі...

Дык хіба можна цярпець такія пакуты, каб беларус быў у няволю закуты, раздзеты і разуты, а немцы-шакалы каб елі наш хлеб і сала?

Даражэнькія мае ўнукі, бярыце мацней зброю ў рукі, і выганім хутчэй нямецкага гада з нашага светлага сада.

Каб хутчэй прыкончыць немца да канца, не шкадуй яму ў сэрца свінца.

Чуе душа старога Талаша, што недалёка гібель нямецкага ката, што хутка будзе і на нашай вуліцы свята.

А як зробім немцу крышку, адбудуем свае сёлы і гарады, умацуем гаспадарку, збярэмся на вялікую бяседу — выпьем па кілішку. І па-нашаму, па-беларуску — на стол бліны і сала на закуску. Ну, а там, дзе вып'ем па шклянцы, — і музыка і танцы. І мы, старыкі, падтрымаем звычай такі. І песні-весялухі падхопяць нашы старухі. А вы, маладыя, сустрэнецеся са сваімі каханымі, мілымі, доўгачаканымі.

Дык вось, дзеткі, каб хутчэй настаў радасны час гэткі, каб хутчэй прыйшло наша светлае свята — біце смяртэльна нямецкага ката.

«Савецкая Беларусь», 19 снежня 1942 г.

Узрыў на Пцічы

З успамінаў былога партызана М. П. Шамрылы

Улетку 1942 г. чыгунка Брэст — Гомель набыла асабліва вялікае стратэгічнае значэнне для ворага. У суткі па ёй праходзіла іншы раз да 40 эшалонаў. Яе ўзмоцнена ахоўвалі, на кожным пяўстанку былі размешчаны гарнізоны, пабудаваны дзоты. Асабліва моцнай была ахова чыгуначнага маста праз р. Пціч. Неабходна было ўзарваць яго, вывесці са строю магістраль. Адказным за рацыю быў прызначаны Р. Н. Мачульскі, камандзір Мінскага партызанскага злучэння.

З Вялікай зямлі атрымалі каля 20 пудоў толу. Група падрыўнікоў Казіміра Пушчына рыхтавала толавыя зарады, выпрацоўвала план аперацыі. Яна назначалася на ноч 31 кастрычніка 1942 г. Увечары рушылі ў паход. 11 партызанскіх атрадаў расцягнуліся па лясных дарогах. За суткі трэба прайсці не менш 50 кіламетраў. Асенняя ноч выдалася вельмі цёмнай, у лесе нічога не відаць. Дарога нібы растварылася ў гэтай цемры. Часта даводзілася рабіць прыпынкі. Набліжалася раніца. Мачульскі разумеў, што выканаць аперацыю ў тэрмін не ўдасца і рашыў перанесці яе на наступную ноч.

Увечары 31 кастрычніка атрады зноў рушылі ў дарогу. Макар Бумажкоў пайшоў да раз'езда Коржаўка з задачай пашкодзіць чыгунку, каб немцы не падкінулі падмацавання з Капцэвіч і Жыткавіч. Паўлоўскі павёў атрад улева, над Мышанку. Атрады Анатоля Міхайлоўскага, Іосіфа Глушко (Балотнікава) і Краўца рухаліся лясным дарогамі паўз Пціч. Туды накіраваліся таксама групы падрыўнікоў Пушчына і Кулака, якія павінны былі дастаніць узрыўчатку. Ім адводзілася самая адказная, небяспечная задача па ўзрыву маста.

Пярэднія атрады выйшлі на рубеж, заляглі. Да іх асцярожна падыходзілі новыя групы партызан... Адчулі немцы небяспеку ці выпадковае супадзенне, але тры ракеты прарэзалі туман, і не паспелі яны згаснуць, як доўгая кулямётная чарга паласнула па хмызняку. Кулі прасвісталі над галовамі партызан. Сціснуўшы зубы, нехта ціха застагнаў і, перасільваючы боль, скурчыўся пад альховым камлём, прыціх, можа, назаўсёды...

Разведка выявіла варожыя агнявыя кропкі і дзоты. Атрад Краўца атрымаў загад з пачаткам штурму абрушыцца на варожыя пасты.

Да 5 гадзін раніцы атрады занялі пазіцыі. Цішыня... Толькі час ад часу над ракой уздымаюцца ракеты і з шыпеннем нікнуць над вадой. На ўсходзе святлее, сівая заслона туману пачала рассейвацца.

Раптам з-пад Мышанкі, а потым справа, з-пад Коржаўкі, данесліся глухія выбухі. Гэта партызаны Бумажкова і Паўлоўскага ўзарвалі чыгунку. Мост адрэзаны з абодвух бакоў. У неба ўзляцела ракета.

І ажыло балота. Стрэлы і ўзрывы зліліся ў суцэльны гул. Спераду глуха прагрымела — звязка гранат, якую кінуў Міця Сяргееў, развярнула галоўны дзот. Затым узляцелі ў паветра адзін, другі дзот за чыгункай. Іван Сыцька пераносіць агонь кулямёта ўглыб, б'е па станцыі...

Наперад вырваліся падрыўнікі. Пушчын і Кулак ужо на месце, даставілі туды ўзрыўчатку. Жыхар в. Пціч Герасіменка правёў групу міма пастоў і дзотаў. А каля станцыі, відаць, завязаўся бой, вылучаецца тахканне буйнакаліберных кулямётаў. Падрыўнікі мініруюць мост, падвязваюць толавыя зарады да бэлек ферм і злучаюць іх бікфордавым шнурам. А даўжыня моста — 150 метраў...

Немцы ачухаліся, узмацнілі агонь. Па месце ўжо б'юць артылерыя, мінамёты. Міны і снарады кладуцца то на беразе, то ў ваду. Партызаны заляглі. Мачульскі загадаў узмацніць удар па станцыі.

— Наперад! За Радзіму! — чуецца гучны голас Івана Скалабана.

Нясецца працяглае «ура!», і партызанская армія коціцца наперад. Падрыўнікі тым часам заканчваюць работу. Ужо ўсё падрыхтавана. Камандзір дакладвае аб гатоўнасці. Над мастом узнімаецца белая ракета — адыход!

...Асляпляльнае полымя ўспыхнула ззаду. Цяжка ўздрыганулася зямля, рэха магутнага выбуху далёка пранеслася над лясамі. Яно яшчэ не заціхла, як над ракой зноў пракацілася дружнае партызанскае «ура!» ад радасці. Уверх паляцелі шапкі... Быццам і не было небяспекі і смяротнай рызыкі, бяссоннай ночы, зморанасці...

Вакол маста партызаны заклалі каля 200 мін замаруджанага дзеяння. Немцы доўга не адважваліся падысці да месца ўзрыву.

Назаўтра ў Камаровічах хавалі баявых сяброў. У тым баю загінула 11 партызан. Але і вораг не далічыўся 30 сваіх салдат і афіцэраў. На 18 сутак спыніўся рух цягнікоў на магістралі, ваенныя эшалоны стаялі ў Капцэвічах, Жыткавічах, чакаючы адпраўкі на Сталінград... 7 лістапада 1942 г. камандаванне партызанскім рухам у Маскве горача віншавала народных мсціўцаў з 25-годдзем Вялікага Кастрычніка і слаўнай перамогай у гонар юбілею, узрывам моста праз Пціч.

У 1957 г. у гонар аперацыі па ўзрыву моста на Пцічы, якая насіла кодавую назву «Рэха на Палессі», на будынку чыгуначнай станцыі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

* * *

У газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» ў лютым 1943 г. быў змешчаны верш Я. Пясоцкага, прысвечаны гэтай смелай аперацыі.

БЯЛЬМО

Ёсць рэчка Пціч, і на Пцічы —
Мост, быццам тоніца ў гразі...
Нібы бяльмо на воку нам
Той мост, што праз раку...
І толу трыста кілаграм
Падсунуў партызан к бычку.
Маланка бліснула, і гром
Ударыў грозна ў берагі.
І ад маста жалезяны лом
За мілю апісаў кругі.
Быў мост, цяпер яго няма...
Хвала байцу-падрыўніку!

Партызанскі ўрач

Напярэдадні вайны Аляксандр Рымша вучыўся ў Мінскім медыцынскім інстытуце, у 1941 г. быў на трэцім курсе. У тое лета яго накіравалі на практыку ў Петрыкаўскую раённую бальніцу. З першых дзён вайны А. А. Рымша па распараджэнню Петрыкаўскага райваенкамата застаўся ў бальніцы на пасадзе малодшага хірурга. У час крывапралітных баёў каля Петрыкава тут быў арганізаваны шпіталь 75-й стралковай дывізіі. Са 110-га медсанбата паступалі ў шпіталь раненыя байцы. Пасля цяжкіх баёў фашысцкія войскі пацяснулі дывізію і занялі ваколіцы Петрыкава. Давялося спешна эвакуіраваць ранепых. Машын не хапала, трэба было шукаць фурманкі. Аляксандр Арцёмавіч забег у бальніцу — ці не застаўся хто з параненых. Фашысты з артылерыі абстрэльвалі цэнтр і ўсходнюю частку горада. Калі выйшаў з бальніцы, фурманкі былі ўжо далёка. Напрасткі, праз агароды, кінуўся даганяць сваіх — і раптам у некалькіх крокаў разарваўся снарад...

Ачнуўся ноччу. Збоку нешта гарэла, недзе стралялі... Двое сутак дабіраўся Аляксандр да Бабуніч. Змучанага, галоднага, ледзь жывога падабралі яго аднавяскоўцы.



А. А. Рымша

Праз некаторы час А. А. Рымша сустрэўся з кіраўніком мясцовай падпольнай групы лейтэнантам Аляксандрам Ткачуком. Устанавіў сувязь з членамі групы Мікалаем Амельчанкам, Мікалаем Цішкевічам, Антонам Крукоўскім з Барычана. Абмяркоўвалі планы будучых дзеянняў, сувязь з партызанскімі атрадамі і славакамі на Руднянскім чыгуначным пераездзе.

У канцы красавіка 1942 г. былі арыштаваны А. С. Ткачук і яго таварышы. Іх адправілі ў Петрыкаўскую жандармерыю, адтуль падпольшчыкі не вярнуліся. Навісла пагроза правалу групы. Па патрабаванню Аляксандра Рымшы і Мікалая Цішкевіча ўдзельнікі падполля пайшлі ў партызанскі атрад Бабкова. Аляксандр Арцёмавіч быў прызначаны галоўным урачом атрада. Ён падабраў медыцынскі персанал, вучыў іх аказваць раненым кваліфікаваную дапамогу. Актыўнымі памочнікамі ўрача сталі Надзя Сцяпанок, Ганна Палтаран і Лідзія Чарнобылец.

Вясной 1943 г. у сасновым бары сярод балот непадалёку ад Міхедавіч, на астраўку Залаткова, пачаў дзейнічаць стацыянарны партызанскі шпіталь. Не хапала інструментаў, медыкаментаў, перавязачнага матэрыялу. Прыток хворых у шпіталь асабліва ўзрос з восені 1943 г., калі сярод насельніцтва і партызан з'явіўся сыпны тыф. Прыйшлося пашырыць шпіталь, будаваць новыя памяшканні для тыфозных хворых. Да таго ж не было ніякіх сродкаў, не хапала солі. Хвойны настой ужывалі супраць цынгі, варылі з раслін мазь для хворых каростай...

Аляксандр Рымша з начальнікам разведкі атрада Сцяпанам Дубікам прабіраліся ў Капцэвіцкі гарнізон і ў мясцовага насельніцтва, у славакаў даставалі медыкаменты, перавязачныя матэрыялы, соль. З дапамогай Канстанціна Невяркевіча Рымша рыхтаваў прэпараты з чыстацелу, насення льну, хвоі. У ліпені 1943 г. у час бою на чыгунцы каля пераезда Коржаўка быў цяжка паранены партызан Міхаіл Малчанаў. Яго вынесла Лідзія Чарнобылец. Пачалася гангрэна. Аляксандр Рымша ў складаных умовах ампутаваў нагу, вярнуў да жыцця партызана.

У жніўні 1943 г. фашысты занялі партызанскія вёскі Падканаплішча і Бабунічы. Іх ударная група наступала на партызанскі лагер. А. Рымша толькі што прыняў цяжкія роды ў маладой партызанкі Вольгі Красоўскай і неадкладна прыступіў да эвакуацыі раненых і хворых. Немцы ўжо выявілі лагер, адкрылі кулямётны агонь. Вольга з дзяўчынкай на руках кінулася ў лес, але тут жа ўпала. Гэта заўважыў урач. Разам з партызанам Віктарам Кавальчуком яны падпаўзлі да жанчыны, выцягнулі яе ў бяспечнае месца.

Раніцай 20 чэрвеня 1944 г. група партызан атрада Бабкова трапіла пад бамбёжку. Некалькі партызан загінула, многія былі паранены. У лесе, пад прыкрыццём ялін, медыкі хутка раскінулі палаткі, знеслі раненых. Рымша і Чарнобылец перавязвалі раны... А праз некалькі дзён прыйшло доўгачаканае выратаванне.

...Закончылася вайна, але ніколі не забываліся яе суровыя будні. На працягу амаль сарака гадоў Аляксандр Рымша ўзначальваў інфекцыйнае аддзяленне ў абласной бальніцы ў Мазыры. Не раз звярталіся да яго за дапамогай петрыкаўцы, тыя, з кім ваяваў і каго выратоўваў у гады вайны партызанскі ўрач. І кожны гаварыў яму шчырыя словы ўдзячнасці.

Памёр Аляксандр Арцёмавіч Рымша ў 1991 г.

М. П. Шамрыла

Чырвоны абоз

Восенню 1943 г. сяляне сабралі ўраджай, большую частку якога ўдалося захаваць ад нямецка-фашысцкіх рабаўнікоў. Частку збожжа абмалацілі ў лясах, частку склалі ў стагі. Набліжаўся доўгачаканы час вызвалення. Змучаныя акупацыяй людзі вырашылі падзяліц-

ца апошнім і паслаць насустрач наступаўшым часцям Чырвонай Арміі падарунак, своеасаблівы хлеб-соль — абоз з хлебам. У навакольных вёсках сабралі 25 падвод мукі, зерня, сухароў, здабылі павозкі і коней. Позняй восенню абоз праз партызанскія вароты ў Акцябрскім раёне з в. Міхедавічы накіраваўся на ўсход. Яго суправаджалі У. Сасноўскі, Р. Дарагун, К. Ліпкевіч, М. Мазуркевіч, М. Ярмаліцкі, І. Беластоцкі і іншыя сяляне. Ехалі непраходнымі, глухімі дарогамі, наладжвалі пераправы праз Арэсу і Пціч. На трэція суткі пасланцы сустрэлі нашы войскі. З вялікай удзячнасцю прынялі чырвонаармейцы партызанскі падарунак. Узамен камандаванне выдзеліла зброю і боепрыпасы, якія сяляне пагрузілі на падводы і даставілі партызанам.

В. П. Мазуркевіч

ИЗ ОТЧЕТА ОБ ОРГАНИЗАЦИИ И НАЧАЛЕ БОЕВОЙ И ДИВЕРСИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТРЯДА БОЛОТНИКОВА С 8 ИЮЛЯ 1942 Г. ПО 1 ЯНВАРЯ 1943 Г.

5 января 1943 г.

Организатором существующего отряда является инициативная группа из 8 человек во главе с т. Глушко И. Н. (Болотников). В нее вошли Багровец М. П., Купрацевич С. А., Стрельченя, Жогаль, Шаманец, Цукров Т. С., Рапопорт М. Из отряда т. Михайловского 8 июля 42 г. группа по собственной инициативе и по согласованию с главштабом вышла на территорию Петриковского района для организации отряда. Инициативная группа во главе с Глушко И. Н. проработала несколько дней на территории фашистского района и некоторые члены группы как не справившиеся с работой (Стрельченя, Жогаль, Шаманец) были отправлены обратно в отряд Михайловского. Группа пополнена из отряда Михайловского (Кулак, Медведев, Быковский и Розов).

В основу организации отряда положен принцип мобилизации из числа коммунистов и комсомольцев, дальше отряд формировался из числа добровольцев, военнообязанных красноармейцев и командиров РККА. Отряд рос за счет деревень Селютичи, Михедовичи, Куритичи и др.

В результате принятых мероприятий (засылка своих людей в учреждения немцев, обработка полиции) деревни стали партизанскими (Михедовичи, Селютичи, Куритичи, Грабов, Бабуничи, Борычев, Подозбин, Рябка и др.). Отряд с 8 на 1.9.42 г. вырос до 80 чел.

Из членов инициативной группы в бою в сентябре 42 г. около Курятич погиб Багровец М. П., нач. штаба. В боях погибли Деттярь М. А., Трихапкин Н.

По состоянию на 1.1.43 г. отряд вырос до 300 человек. Проводились операции по разгрому полиции и немецких учреждений, волостей, молочных пунктов. Разгромлены волости: Грабов, Бабуничи, Куритичи и др. ... Проводилась операция по приобретению оружия на территории Петриковского и других районов. Уничтожено 4 эшелона, осуществлена операция по подрыву Птичского моста (1.11.43 г.). Взорван ж.-д. мост около д. Рудня и 3 шоссейных моста. Больше половины района освобождено от немцев...

3 августа 1942 г. была налажена связь со словаками.

Командир отряда *Болотников*

НИА Беларуси, ф. 3500, оп. 4, од. 221, лл. 4–6.

ОТЧЕТ КОМАНДОВАНИЯ ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА № 135 КОМАНДОВАНИЮ БРИГАДЫ № 130 ПОЛЕССКОЙ ОБЛ. О БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ЗА ФЕВРАЛЬ 1943 Г.

28 февраля 1943 г.

Отрядом уничтожено 34, взято в плен 2, ранено 3 гитлеровца. Захвачены трофеи: 2 винтовки, 7 дисков к ручному пулемету. Уничтожен гитлеровский шпион, староста дер. Слинки. Систематически производится разведка Оголич, Кощевич, Муляровки, Коржевки. Пущено под откос 3 ж.-д. состава, выведено из строя: 3 паровоза, 18 вагонов, 7 платформ. Разгромлена волостная управа дер. Свидин, уничтожены документы лесхоза, разбит сливочно-сепараторный пункт. Уничтожены речные мачты по связи Киев — Пинск.

Командир отряда *Бобков*
Комиссар отряда *Дубик*

ДОНЕСЕНИЕ КОМАНДОВАНИЯ ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА Ф. Д. КУДРЯВЦА КОМАНДИРУ БРИГАДЫ № 125 А. А. ЖИГАРЮ ПОЛЕССКОЙ ОБЛ. О БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТРЯДА И ОКАЗАНИИ ПОМОЩИ НАСЕЛЕНИЮ В АПРЕЛЕ 1943 Г.

Дер. Ванкжичи 1 мая 1943 г.

1. Основной своей целью отряд ставил нанести чувствительные удары по фашистам и коммуникациям противника:

а) нашими агентами на ст. Корженка была положена в вагон электромина. В результате взрыва сгорело 64 вагона, идущих на восток с техникой и боеприпасами; б) отряд участвовал в операции при нападении на ж.-д. состав, убито до 150 немцев, выведен из строя паровоз и простреляны вагоны; в) группы из засад уничтожили 10 гитлеровцев, поймали 1 полицейского в районе дер. Колки; г) группы все время старались рвать путь и тормозить передвижение фашистских эшелонов; д) произведено 54 взрыва, повреждено рельсов 120 шт., выведено из строя 12 км ж.-д. полотна.

2. Велась глубокая разведка гарнизонов противника Птичь, Мышанка, Коржевка. Налажена связь с мест. Птичь...

3. Отряд оказывал реальную помощь в весенней посевной кампании на месте, а также выезжал в мест. Копаткевичи и работал с 19 по 21 апреля 1943 г., выработав по 360 конно-дней. Проводилась агитационная работа, сбор средств на построение танковой колонны «Большевик Полесья».

Командир отряда *Кудрявец*
Комиссар отряда *Курбатовский*
Нач. штаба *Мостовой*

Всенародное партизанское движение... Т. 2, кн. 1, с. 310.

ПОЛИТИЧЕСКИЙ ОТЧЕТ О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА ТОВ. ЖИГАРЯ ЗА 1941—1942 ГГ.

...Партизанский отряд Копаткевичского района начал свои боевые действия с 15 июля 1941 г. в количестве 42 человек. Копаткевичский райком партии руководство отрядом возложил на т. Жигаря. Отряд существовал и выполнял боевые задачи до 28 октября 1941 г., затем по решению партийной организации отряда все члены отряда ушли в подполье. При переходе отряда в подполье все оружие — 45 винтовок, 1 ручной пулемет, 15 000 патронов были спрятаны.

Тов. Корнейчик А. П. (ныне начальник штаба отряда) был послан работать в Копаткевичскую комендатуру... Руководство района — председатель РИКа т. Михайловский, секретарь РК КП(б)Б т. Шейн при оккупации немцами района никакого указания и руководства отряду не дали, забрав с собой всех ответственных работников района (нач. НКВД, нач. милиции и других, которые ушли за Красной Армией).

В конце ноября в район прибыл из плена бывший председатель РИКа т. Михайловский.

В период подполья велась подготовительная работа для организации отряда и срыва всяких заготовок, проводимых немецкими властями... Полиция была разложена, в результате чего хлеб... полиция отказалась сопровождать, за исключением двух полицейских, которые расстреляны.

...16 января 1942 г. отрядами Павловского и Далидовича была разбита полиция в Копаткевичах, хлеб, собранный немецкими властями, роздан населению. Был вновь организован партизанский отряд в количестве 42 человек... Инициативная группа, возглавляемая т. Вырвичем А. С., в количестве 17 человек, в январе 1942 г., разбив полицию в д. Копевичи и Лучицы, соединилась с нашим отрядом, который оказал большую помощь и содействие в вооружении отряда...

На 1.1.43 г. отряд насчитывает 531 человек... За время существования отряда в 1941 г., который состоял из 42 человек, многие члены отряда ушли к своим семьям, отдельные скрылись; группа, присланная ЦК КП(б)Б, — 10 человек работников западных областей Белоруссии под командованием т. Лехтина — 17 сентября ушла к фронту.

К 23 октября из 42 членов отряда осталось 13 человек — Жигарь, Корнейчик, Гарбач С., Гордиенко, Кудрявец П., Мухин Л., Гырлин, Фельдман, Перехоцкий, Геверовский, Стенко и другие... На 16.1.42 г. отряд в количестве 42 человек вышел открыто для борьбы с врагом.

Командир отряда *Жигарь*

Комиссар отряда *Кудрявец*

Начальник штаба *Корнейчик*

ИЗ ПРИКАЗА 130-й ПЕТРИКОВСКОЙ ПАРТИЗАНСКОЙ БРИГАДЫ

25 августа 1943 г.

Во исполнение приказа штаба соединения партизанских отрядов Полесской области «О нанесении массированных ударов в рельсовой войне по железнодорожной магистрали Калинковичи — Лунинец»

Приказываю:

1. Произвести операцию с 27.8.43 г. на 28.8.43 г. на участке железнодорожной станции Коржевка — Птичь в составе бригады (3 отрядов: Волкова 100 чел., Бобкова — 70, Кравца — 80 чел.)...
3. Сбор отрядов — ур. Смоловка к 17.00 27.8.43 г. Отряду Кравца прибыть к 9.00 27.8.43 г. в д. Забродье...
5. Отрядам прибыть в район хутора Дуброва к 24.00 27.8.43 г. для соединения с бригадой 125...
10. Взрывов произвести 300, из них отряду Волкова — 80, отряду Кравца — 130, отряду Бобкова — 90...
12. Время наступления — 2 зеленые ракеты в 5.00 28.8.43 г.
13. Сигнал поджигания шнуров зарядов — 1 зеленая ракета...
15. КП штаба бригады — высота 121,2. Пункт медицинской помощи — х. Рог.
16. Пропуск на время действия: «Пинск», «Принять».

Командир операции — Сколобан, заместители — Глушко, Кулак.

Командир бригады *Сколобан*

НИА Беларуси, ф. 3500, оп. 4, д. 222, лл. 107—108.

Рэліквія партызанскай славы

У красавіку 1943 г. было прынята рашэнне аб стварэнні баявога сцяга партызанскага атрада № 135 130-й брыгады. Адказная і ганаровая работа даручана партызанкам Ганне Палтаран, Марыі Дубовік, Валянціне Дзяржымішцы, Лідзіі Чарнобылец і Надзеі Сцішонак. Дзмітрый Сыцько атрымаў заданне пайсці ў Кащэвіцкі гарнізон і праз сувязных здабыць чырвоны матэрыял ці фарбу.

Удалося здабыць чырвоную фарбу. Лідзія Чарнобылец прапанавала для сцяга белую прасціну. Яе пафарбавалі і ва ўрочышчы Залаткова, паблізу в. Міхедавічы, у зямлянцы атраднага шпіталю дзяўчаты пачалі вышываць сцяг. Начальнік медыка-санітарнай



Баявы сцяг 135-га партызанскага атрада 130-й Петрыкаўскай брыгады

службы А. А. Рымша нікога не пускаў у зямлянку, сцяг рабіўся ў вялікай тайне. На ім былі вышыты зорачка, перакрыжаваныя вінтоўка і аўтамат, словы «Партызанскі 135-ы атрад 130-й брыгады», а на адваротным баку — «Смерць нямецким акупантам».

Хутка сцяг быў гатовы. Камандзір аддзялення Іван Латашынскі зрабіў дрэўка, на ім умацаваў шпіль з зорачкай, на які пайшла нямецкая біклага. Партызаны з нецярпеннем чакалі ўрачыстага моманту ўручэння сцяга атраду.

У жніўні 1943 г. была гадавіна з дня арганізацыі атрада № 135. Партызаны адзначалі гэтую знамянальную дату актыўнымі баявымі справамі. У баявым лістку паведамлялася аб лепшых падрыўніках Антону Кабановічу, Мікалаю Баранаву і іншых. Быў падрыхтаваны канцэрт мастацкай самадзейнасці пад кіраўніцтвам Сазонція Палтарана з в. Сотнічы. Актыўны ўдзел у ім прынялі Ганна Палтаран, Сцяпан Баран, рэдактар падпольнай раённай газеты «Сталінская праўда» А. К. Курапаценка.

На ўрачыстасць прыбыло камандаванне 130-й брыгады на чале з камандзірам брыгады І. В. Скалабанам. Большая частка байцоў атрада была вызвалена ад баявых дзеянняў для ўрачыстай цырымоніі і з выпадку ўручэння сцяга атраду.

І вось сцяганосец Антон Кабановіч у суправаджэнні асістэнтаў, партызан Мікалая Марозькі і Мітрафана Стракача, вынеслі зачахлёны сцяг. Адкрыўся ўрачысты мітынг. Камісар атрада І. В. Дубік дае слова камандзіру брыгады І. В. Скалабану.

— Сёння спаўняецца гадавіна з дня арганізацыі атрада, — сказаў ён. — За баявыя заслугі атраду прысвоены нумар і ўручаецца баявы чырвоны сцяг. Я цвёрда ўпэўнены, што пад ім байцы 135-га атрада з яшчэ большай нянавісцю будуць біць фашысцкіх захопнікаў...

Камбрыг перадаў сцяг камісару атрада І. В. Дубіку. Ён і ўвесь строй байцоў схіліўся над баявой святыняй.

З гэтым сцягам атрад змагаўся да ліпеня 1944 г., пакуль не злучыўся ў Петрыкаве з войскамі Чырвонай Арміі.

Цяпер сцяг 135-га партызанскага атрада захоўваецца ў музеі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

В. М. Чарнобылец

Слова прыраўноўвалася да кулі

Першы нумар петрыкаўскай раённай газеты «Калгаснік Петрыкаўшчыны», якую рэдагаваў Дамброўскі, выйшаў у маі 1931 г. Гэта была важная падзея ў грамадска-палітычным жыцці працоўных раёна. Газета сваімі вострымі, злабадзённымі матэрыяламі заваявала вялікі аўтарытэт у насельніцтва. Калектывізацыя, будаўніцтва сацыялістычнага ладу ў вёсцы, выкананне народнагаспадарчых планаў, культурнае жыццё, навіны сельскага і гарадскога жыцця — усё знаходзіла адлюстраванне на яе старонках.

У Капаткевіцкім раёне такім баявым органам была раённая газета «Бальшавік».


БОЛЬШЭВІК

На фронтах Айчыннай вайны



Сталінская ПРАЎДА

Не спынілі сваю дзейнасць раённыя газеты і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Петрыкаўская падпольная газета пад назвай «Сталінская праўда», рэдактарам якой райкомам КП(б)Б быў зацверджаны А. К. Куранаценка, заклікала народ на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У ёй змяшчаліся публікацыі аб партызанскай барацьбе, аб становішчы на фронце і ў савецкім тыле.

3 сакавіка 1943 г. у размяшчэнні 125-й партызанскай брыгады пачала выходзіць Капаткевіцкая раённая газета «Бальшавік», якую рэдагаваў Г. Л. Каплан, а потым І. Р. Ганусевіч. Перыядычнасць газеты — 3—5 разоў у месяц, тыраж — 100—200 экземпляраў. Набіралі яе вопытныя наборшчыцы Я. Аўгустоўская і Т. Кузьміч. Карэспандэнтам быў партызан С. Шарамет, які змясціў на старонках газеты не адзін дзесятак дасціпных, вострых матэрыялаў. Друкаром працаваў І. Жыгар. Друкаваліся раённыя газеты на базе абласной у вёсках Старына, Філатаўка, Праходы, у зямлянцы ў размяшчэнні 130-й партызанскай брыгады. Часта прыносілі свае матэрыялы партызаны Уладзімір Ткач, Рыгор Цімко, Іван Каліцька, Сяргей Шаўчук, Уладзімір Пінчук, Георгій Кітус.

Падпольныя раённыя газеты «Бальшавік» і «Сталінская праўда» распаўсюджваліся разведчыкамі і сувязнымі па атрадах, сярод насельніцтва, траплялі ў паліцэйскія і нямецкія гарнізоны. Яны ўздымалі маральны дух у людзей, усялялі ў іх веру ў перамогу над ворагам, білі яго так, як і партызанская зброя...

М. К. Селех



Абласная канферэнцыя падпольных камсамольскіх арганізацый ў лесе каля Навасёлак. У другім радзе другі справа — А. К. Куранаценка. 27 мая 1943 г.

У ПЕТРЫКАВЕ ПРЫПЯКАЕ

Дрыжыць петрыкаўскі гебітскамісар. Запёрся ў кабінеце, сем замкоў павесіў, вартавых у дзвярах паставіў. Уцякаць збіраўся, ды шляхі закрыліся. Не толькі шляхі, нават сцежкі ад дома да дома, праз панурыя вуліцы Петрыкава. Усюды міны, усюды смерць. Кожны вугал страшней чорта. Каб выйсці на вуліцу, патрэбна перакарпаць доўгім кіем усю зямлю, каб часам не выйшла чаго «дрэннага», каб часам не расквітацца з уласнай скурай.

Як жа не страшна гебітсу? Не паспеў яго памочнік выехаць за горад, як здарылася несусветнае, нечаканае. Яшчэ і зараз вецер раздувае клочча яго вопраткі на тэлефонным дроце.

Усюды даўно пачаліся «непарадкі»... Узарваліся ў гаражы гебітса 6 аўтаманаў. За адну ноч з горада знікла больш сотні жыхароў. Так, занадта прыпякае ў Петрыкаве.

Вось і паявілася ад страху для заспакойвання «Аб'ява петрыкаўскага гебітскамісара», у якой указваецца: «Супакойцеся! Нямецкая армія не адступае, а адыходзіць к новым рубяжам».

Але чаму ж гомельскія, рэчыцкія паны і падпанкі, згубіўшы ўласныя штаны, прыбеглі ў Петрыкаў? Хіба ж тут «назначаныя рубяжы?»

Усё ясна. Пад ударамі Чырвонай Арміі нямецкія акупанты бягуць на захад. Паны і падпанкі трасуцца ў жывёльным страху перад насцігаючай народнай карай. Народ выпес ужо прысуд гэтым двуногім фашысцкім звярам і ён прыводзіцца ў выкананне.

М. Б.

«Сталінская праўда», *2 кастрычніка 1943 г.*

НАД БЕЛАРУССЮ ЎЗЫШЛА ЗАРА ВЫЗВАЛЕННЯ

«Партызаны і партызанкі! Працоўныя Петрыкаўшчыны! Дастойна сустрэнем нашу вызваліцельніцу — Чырвоную Армію. Мацней будзем грамаціць ворага, не дадзім ні праходу, ні праезду гітлераўцам да фронту. Будзем знішчаць варожую тэхніку, разбураць сродкі сувязі».

«Сталінская праўда»,
26 кастрычніка 1943 г.

Уважаемый Михаил Иванович!

От Вашего знакомого и друга... Браима Филиппа Максимовича

Товарищеское письмо

Т. Калинин, Вы вождь нашей страны, я старик, колхозник, в деревне состою в партизанском отряде т. Дубика. Отряд действует в Южно-Припятской зоне на Полесье (Белоруссия). Для решительной и успешной борьбы с врагом мы нуждаемся в оружии. Прошу, т. Калинин, распорядиться о высылке нашему отряду оружия и взрывчатых веществ.

С почтением к Вам Ваш знакомый

Браим

12 сентября 1943 г.

Резолюция: Нет возможности, так как нет связи. 13.10.43 г.

Генерал-лейтенанту тов. Пономаренко

от командира отряда *т. Токуева*,
комиссара отряда *т. Цегельника*

Шлем Вам, товарищ генерал-лейтенант, горячий, пламенный боевой привет от командиров, бойцов и политработников нашего отряда.

Товарищ генерал-лейтенант, сегодня исполняется два месяца со дня организации нашего отряда. На боевом счету отряда 15 спущенных под откос вражеских эшелонов, из них больше половины с живой силой, остальные с техникой и боеприпасами, 22 паровоза противника выведены из строя путем обстрела из ПТР, группами нашего отряда уничтожено 280 рельсов ж. д. полотна.

В нашем отряде насчитывается 70 чел., из них вооруженных 34, вооружены только оружием, которое командиром отряда было привезено от Вас. До прихода нашей доблестной Красной Армии мы обязуемся еще сильнее наносить удары по коммуникациям врага.

Ждем Вашего ответа и указаний в дальнейшей работе.

С комсомольским приветом

командир отряда *Токуев*
комиссар отряда *Цегельник*
20.10.43.

Резолюция. Тов. Галенко. Прошу иметь в виду помощь т. Токуеву.

Пономаренко.

Тов. Ковтун. В составлении резолюций т. Пономаренко прошу включить в план первоочередной заброски груза.

Галенко

З кагорты мужных

У 1905 г. Ціт Цукраў служыў на крэйсеры «Пацёмкін». Гэта пра яго і сяброў-маракоў зняты сусветна вядомы фільм Эйзенштэйна, пра іх да гэтага часу ходзяць легенды... Цукрава тады прысудзілі да шасці гадоў катаржных работ. Па шляху да месца зняволення яму ўдалося збегчы. Дабраўся да родных мясцін у Бобрык, але жандармы высачылі бунтаўшчыка, арыштавалі і накіравалі зноў на катаргу, дабавіўшы два гады.

Толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Ціт Цукраў змог прыехаць у Бобрык. Прыбыў ён туды з мандатам партыі бальшавікоў для ўстанаўлення савецкай улады. Узначальваў Камаровіцкую воласць, у 1922 г. быў выбраны старшынёй Бобрыцкага сельскага савета. Усю сваю энергію і сілы Ціт Сямёнавіч аддаваў справе арганізацыі калектыўных гаспадарак, узначальваў адзін з першых у раёне калгас «Бальшавік». Ц. С. Цукраў з'яўляўся членам ЦВК БССР, быў абраны членам бюджэтнай камісіі. Прэзідыум ЦВК накіраваў яго на работу ў народны камісарыят земляробства.



Ц. С. Цукраў

У 1941 г. Ц. С. Цукраву было 60 гадоў, але ён не застаўся ўбаку ад сняшчэннай барацьбы з ворагам. У лютым 1942 г. разам з сынам Пятром і дачкой Лідай ён пайшоў у партызанскі атрад. Карыстаючыся былой славай і аўтарытэтам, ездзіў па вёсках, выступаў перад насельніцтвам, прызываў народ да барацьбы з акупантамі, уздымаў веру ў перамогу, збіраў зброю і перадаваў яе партызанам, нарыхтоўваў прадукты. Пасля ўзрыву партызанамі чыгуначнага маста на р. Пціч у лістападзе 1942 г. Ц. С. Цукраў дапамагаў вывозіць з поля бою параненых і дастаўляў іх у партызанскі шпіталь. Актыўна ўдзельнічаў у разгроме нямецкага гарнізона на станцыі Коржаўка.

У канцы 1943 г. Ціт Сямёнавіч знаходзіўся ў куранях у лесе. Перад гэтым у баі каля в. Грабаў ён быў паранены. Фашысты ў час карнай экспедыцыі схапілі старога партызана з дачкой Лідай, прывезлі ў Навасёлкі. Патрыёта жорстка катавалі, дапытваліся, дзе знаходзяцца партызаны. Ціт Сямёнавіч упарта маўчаў. Да апошняй хвіліны жыцця ён усміхаўся ў твар катаў...

Ліду пасля цяжкіх пабояў адправілі ў Германію.

З КНІГ І. Д. ВЕТРАВА «БРАТЫ ПА ЗБРОІ»

Трэба сказаць некалькі добрых слоў пра сям'ю партызан Цукравых — Ціта, яго сыноў Пятра і Уладзіміра. Ціт Цукраў на працягу 14 гадоў з'яўляўся членам ЦВК БССР. Калі пачалася вайна, са зброяй у руках пайшоў абараняць Радзіму. Аднойчы ворагам удалося схапіць яго. Патрыёта па-зверску катавалі, выкалалі вочы, адрэзалі вушы, знявечылі ўсё цела і, нічога не дабіўшыся, расстралялі... Ён да канца застаўся верным, слаўным сынам беларускага народа.

На змену бацьку прыйшлі сыны Ціта — палескія партызаны Пятро і Уладзімір Цукравы...

ИЗ ИСТОРИИ ПАРТИЗАНСКОЙ БРИГАДЫ № 130 ПОЛЕССКОЙ ОБЛ.

Не ранее 6 июля 1944 г.

...26 мая 1943 г. противник, обозленный активными диверсионными действиями на ж. д. Мудяровка — Старушки со стороны партизан бригады, совершил нападение на д. Бабуничи в количестве 300 солдат и офицеров с вооружением: 1 пушка, 2 батальонных миномета и 9 пулеметов. Находившаяся в деревне застава партизан в количестве 20 чел. с 1 ручным пулеметом из отряда Болотникова приняла бой, но в силу превосходящих сил противника отошла. По шляху Бабуничи — Михедовичи, в 3 км от Бабуничи, партизаны сделали засаду и сообщили об этом командованию отряда в Михедовичах. Противник к 9.00 утра 26 июня 1943 г. занял д. Бабуничи, которую на 50 проц. сжег. Мы получили данные от уцравшего жителя Бабунич Примака Саввы, который сообщил, что противник имеет цель сжечь д. Михедовичи и уничтожить партизанский отряд им. Болотникова...

Командир отряда им. Болотникова Глушко И. Н., комиссар Волков М. А., нач. штаба Кулак В. И. подтянули отряд вплотную к д. Бабуничи в количестве 85 чел. с вооружением: 4 ручных пулемета, 6 автоматов, 2 ротных миномета, остальные винтовки, чтобы разбить противника при его выходе из Бабунич и не дать возможности достигнуть д. Михедовичи... Противник узнал, что отряд прибыл в д. Бабуничи, поэтому не решился наступать на Михедовичи. Командир отряда вместе с комиссаром и нач. штаба к вечеру отряд от деревни оттянули в сторону Смеловского Брода, где расположились на ночлег.

Наблюдатели к 8 час. вечера донесли штабу отряда, что агенты противника производили разведку шляха, что идет из Бабунич на д. Михедовичи. Разведчики противника углубились в лес по шляху на 3 км и возвратились обратно в Бабуничи, доложив командованию, что партизан нет. К 7.00 27 мая 1943 г. наблюдатели донесли в штаб отряда, что разведка противника опять проверяла шлях и возвратились обратно в гарнизон Бабуничи. В это время на шляху засады партизанской не было. Получив данные от разведки (Трубчика, Козловича, Баранова), командир отряда поднял отряд... Засада была сделана на опушке леса по дороге Бабуничи — Михедовичи. Отряд разбился на 3 группы: 1-я расположилась непосредственно на шляху и имела задачу — бить противника в лоб; 2 я и 3 я группы находились по сторонам дороги в 200 м от первой группы и в 70 м от шляха. Фланговыми группами наносился основной удар. Засаду отряд занял к 8.00 27 мая 1943 г. В 9.00 27 мая противник силою в 200 чел. без разведки двигался по шляху Бабуничи — Михедовичи. В д. Бабуничи противник оставил резерв в количестве 100 солдат и офицеров. Подпустив противника в центр засады, по команде командира отряда Глушко открыли огонь по противнику с флангов справа и слева. Противник начал поворачивать вдоль дороги, в то время лобовая группа открыла огонь вдоль дороги. В результате боя противник имел убитыми 32 солдата и 3 офицера, ранеными 21 солдата. Со стороны партизан — убит 1 и 2 ранено...

Командир бригады № 130 *М. Волков*

Комиссар бригады № 130 *И. Глушко*

Нач. штаба бригады № 130 *В. Кулак*

Всенародное партизанское движение... Т. 2, кн. 2, с. 582—583.

У векапомныя дні

З успамінаў былога партызана 130-й Петрыкаўскай брыгады У. В. Налецькі

Вайна адкацілася далёка на ўсход, на месцы баёў заставалася нямала зброі і боепрыпасаў. Мы з сябрам Адамам Шабалтасам збіралі іх і хавалі да часу — ведалі, што спатрэбіцца. І калі позняй восенню 1941 г. сустрэлі ў лесе каля Міхедавіч партызан і папрасілі ўзяць з сабой у атрад — (нам было тады па 18 гадоў), мы былі ўжо ўзброеныя.

У атрадзе нас накіравалі ў групу падрыўнікоў. Уладзімір Кулак, кадравы афіцэр, у будучым — начальнік штаба 130-й брыгады, абучыў нас з Ада-

мам сапёрнай справе. Баявым і энергічным быў камандзір нашай групы Георгій Быкоўскі. Ён увесь час шукаў новыя метады дыверсій на чыгункі. Калі ўсе падыходы да яе гітлераўцы замініравалі, мы падбілі каля Муляраўкі два варожыя паравозы з супрацьтанкавага ружжа.

У час карнай экспедыцыі немцы расстралялі разам з іншымі мірнымі жыхарамі ў Кащэвічах двух маіх братоў, Івана і Міхаіла, маці Адама Шабалтаса. Мы накляліся адпомсціць гітлераўцам і з яшчэ большай непрымірымасцю рабілі дыверсіі, знішчалі ворагаў з засад і ў баях. Цёмнай поччу ў канцы 1942 г. напалі на паліцэйскі гарнізон у Кащэвічах. Удалося падысці непрыкметна, бясшумна зняць ахову. Нямецкія прыхвасні пасля чарговай п'янкі моцна спалі. Мы планавалі закідаць будынак гранатамі, але на месцы выратавалі ўзяць здраднікаў жывымі. Так і прывялі 12 паліцэйскіх у атрад...

Немцы і паліцаі часта ездзілі з Пётрыкава праз Сотнічы. Месцы тут бязлесныя, зрабіць засаду ці абстраляць ворага немагчыма. З таварышамі па зброі мы замаскіравалі поччу каля дарогі авіябомбу, каля яе заклалі толавы зарад і працягнулі доўгую вяроўку — уся вёска віла яе... Калі гітлераўцы параўняліся з бомбай, раздаўся магутны выбух. Каля 30 варожых салдат на заўсёды засталіся там.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях і шматлікіх дыверсійных аперацыях у барацьбе з акупантамі, Георгій Быкоўскі быў узнагароджаны ордэнам Леніна, Адам Шабалтас — ордэнам Чырвонага Сцяга, мне ўручаны ордэн Айчыннай Вайны II ст. Камандзір брыгады А. Волкаў выдаў мне характарыстыку, у якой указваўся ўдзел ва ўзрыве шасці варожых эшалонаў, разгроме двух гарнізонаў, знішчэнні чыгуначнага маста на р. Бобрык, падрыве аўтамашын і ў іншых баявых аперацыях... Тыя гераічныя дні запомніліся назаўсёды.

Дружба, скрепленная кровью

26 августа 1942 г. между Копцевичами и Селютичами состоялась первая встреча словаков из 101-го словацкого охранного полка, которые хотели перейти к партизанам, с представителем их командования. Установили пароль: с партизанской стороны — «Тот самый», со словацкой — «Репкин». Разведчики изучили местность, для охраны места встречи было выделено 60 партизан — опасались провокации.

Ночью выехали из д. Комаровичи, ранним утром были уже на месте. Выставили дозоры, разведчики заняли свои места... В 11 часов на дороге показались четыре всадника в словацкой форме. Пятого — «Репкина», то есть, как стало известно, поручика Яна Налепки не было, он получил срочное задание немецких властей. Все словаки хорошо говорили по-русски. Встреча была радостной и сердечной... Словаки рассказывали, что Ян Налепка давно ищет встречи с партизанами, но подходящего случая не было. А время не терпит. Немцы не доверяют словакам и в любой день полк могут передислоцировать. Они уже не охраняют железную дорогу, ждут новых распоряжений.

Решили, что как только Налепка вернется, установят день перехода к партизанам, а пока необходимо готовиться,



І. Д. Ветраў з ад'ютантам І. Р. Чаусам. Вёска Старына, дзе знаходзіўся штаб Палескага партызанскага злучэння. 1943 г.



Група партызан-славакаў у 125-й партызанскай брыгадзе

собирать оружие и боеприпасы. Прошло несколько дней, от словаков не было никаких вестей... Как потом стало известно, среди них нашлись предатели: о замысле патриотов стало известно немцам и они установили жесткий контроль, офицеров перевели в другие гарнизоны. И все же первая группа словаков под командованием Андрея Оровца вскоре сумела перейти к партизанам. Через некоторое время Андрей Подимак и Алоиз Круликовский скрыто навестили своих друзей, земляков. Все были согласны идти к партизанам, надо было только подобрать удобный момент. Договорились, что первой совместной операцией будет взрыв моста и разрушение железнодорожного полотна около деревни Оголичская Рудня. Операция не удалась, фашисты арестовали многих словаков. Их допрашивали, били, потом всех разослали в разные гарнизоны. Некоторые стали отказываться идти к партизанам и уговаривали не делать этого других. Чувствуя, что ареста не избежать, Йозеф Бугай, Андрей Слатинчак, Юрай Широхман забрали оружие и отправились к партизанам. У деревни Оголичская Рудня они встретили офицера Йозефа Машкулиака, который также искал встречи с партизанами. Это были «первые ласточки», вскоре начался массовый переход словаков на сторону партизан. Все они направлялись в Копаткевичскую бригаду, где участие в боях уже принимали Ян Микула, Йозеф Баян, Густав Лазарь, Рудольф Врански, Антон Коломбус, Павел Паргач, Ян Беднар и многие другие словаки. К концу 1942 г. перешла значительная часть 101-го полка. О переходе словацких солдат и офицеров на сторону партизан не раз передавало в своих сводках Совинформбюро. 1-го января 1943 г. в д. Фастовичи словаки приняли присягу белорусского партизана, в которой говорилось, что они не выпустят из рук оружия, пока СССР и Чехословакия не будут освобождены от фашистских оккупантов.

Чехословацкие воины вписали в историю белорусского партизанского дви-

жения немало незабываемых страниц. Большинство их воевало в двух партизанских отрядах — под командованием А. Т. Михайловского и в отряде Кранца на территории Копаткевичского и Петриковского районов. В борьбе с фашистскими захватчиками чехословацкие товарищи не жалели ни сил, ни самой жизни, наравне со всеми переносили тяготы и невзгоды партизанских будней, были стойкими, боеспособными солдатами. Они участвовали во всех крупнейших операциях партизан.

Одним из первых совместных боев был бой за д. Грабов в начале 1943 г. Эта большая деревня находилась на краю партизанской зоны, недалеко от железной дороги. Отсюда вели дороги вглубь партизанского края — на Комаровичи, Фастовичи — важные базы полесских партизан и далее в Любанский район. Грабов был передним краем партизанского фронта. Немцам было очень важно овладеть этим пунктом, чтобы помешать доступу партизан к железной дороге. В Грабове часто размещались партизанские штабы, отсюда осуществлялось непосредственное руководство операциями.

В этом бою особенно отличилась рота словаков под командованием Андрека и соединенная рота во главе с М. Гончаровым. Немцы вели наступление крупными силами со стороны Житкович и ст. Старушки. Своей целью они ставили занять Грабов и окрестные деревни, достигнуть Фастович и Комарович, чтобы уничтожить штабы партизанских отрядов и соединений. Об этом стало известно партизанам. Они на всех путях следования гитлеровцев устроили засады. Сильный бой завязался неподалеку от Грабова. По мере его развертывания партизаны вводили новые силы. Словацкая рота начала бой в самый напряженный момент, когда защитники Грабова, весь день отбивая непрерывные атаки, были обессилены, кончались боеприпасы, а гитлеровцы пустили в ход артиллерию и минометы.

Уже вечерело, когда словацкая рота вместе с подразделениями партизан, которыми командовали Митрофан Гончаров, Владимир Дулейчик, Сергей Падуто, Петр Цукров, Алексей Голубь, Владимир Тарасевич, прибыли на место боя. Деревня горела, бой не затихал. Словаки вклинились в оборону на правом фланге, замышляя прорваться в тыл противника и оттуда нанести удар. Полицейские и власовцы бросились наперерез им, несмотря ни на какие потери. Словаки держались стойко и мужественно. Группа под командованием командира роты Владимира Дулейчика и словацких командиров Яна Микулы и Густава Лазаря уже почти достигла Грабова. Но в это время у основных сил партизан кончились боеприпасы, они начали отходить. Деревню на этот раз захватили гитлеровцы.

Фашисты открыли ураганный огонь по словакам, которые приближались к деревне. Пулеметы не давали поднять голову. Был тяжело ранен Ян Микула. Начали отходить. Понесли еще одну тяжелую потерю, убит командир роты Андрек. Только месяц он пробыл в отряде, сумел организовать сильную боевую группу, не раз отличался в боях... В этом бою отличились многие белорусские и словацкие партизаны — Максим Баранов, Григорий Ганусевич, Семен и Иосиф Бойко, Алексей Ляхов, Иван Костаев, командиры рот Сергей Падуто и Митрофан Гончаров, командиры взводов Петр Цукров, Василий Козубович, Голубь.

Фашисты понесли большие потери. Встретив упорное сопротивление, они так и не смогли продвинуться дальше Грабова. Сожгли деревню, а также Михедовичи, Замостье, награбили немало имущества крестьян и вернулись в свои гарнизоны.

Особенно сцементировали дружбу белорусских и словацких партизан крупнейшие операции — взрыв железнодорожных мостов на реках Птичь и Бобрик осенью 1942 г.

И. Д. Ветров

За вашу і нашу свабоду

Налепка Ян (н. 21.12.1912 г. ва Усходняй Славакіі) — начальнік штаба 101-га ахоўнага палка акупантаў, які дыслацыраваўся ў Капаткевічах. Стварыў антыфашысцкую арганізацыю, якая наладзіла сувязь з партызанамі, і ў маі 1943 г. разам з групай патрыятычна настроеных славакаў перайшоў да партызан. Камандаваў атрадам, удзельнічаў у баях за вызваленне населеных пунктаў у Беларусі і на Украіне. Загінуў 17 лістапада 1943 г.

У 1945 г. Яну Налепку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

...Пасля партызанскіх дыверсій улетку 1942 г. немцы вырашылі правесці карную экспедыцыю. Фашысты загадалі славакам 101-га палка, у якім служыў Налепка, акружыць вёску Аголічы і арганізаваць экзекуцыю — расстраляць, спаліць...

Ян Налепка выклікаў старасту вёскі Васіля Шлягу, загадаў яму адабраць з ліку жыхароў некалькі старых, найбольш паважаных людзей, і паехаў з імі ў Петрыкаў. Ім удалося даказаць, што жыхары Аголіч да партызанскіх дзеянняў адносін не маюць. Ні адзін чалавек не загінуў, вёска была выратавана.

Праз некалькі дзён каля Аголіч партызаны падарвалі нямецкую машыну. Зноў фашысты арганізавалі карную экспедыцыю. Настаўнік Аголіцкай школы М. А. Стракач успамінае:

— Салдаты з групы Налепкі — Павел Пергач, Андрэй Крашэк, Цыпцыяр панярэдзілі, каб мы хутчэй уцякалі ў лес. Але ўсіх жыхароў абвясціць не паспелі. Тых, хто застаўся ў вёсцы, славакі загналі ў калгасны хлеў, нацэлілі кулямёты. Ян Налепка рабіў выгляд, што выконвае загад фашыстаў. У адным з дамоў выбілі шыбіны, з некаторых павыносілі маёмасць. Дзве хаты без жыхароў падпалілі, а людзей адпусцілі. Жыхары Аголіч пасля гэтага ўсе да аднаго падаліся ў лес.

Фашысты западозрылі Яна Налепку ў сувязі з партызанамі, полк зняслі з аховы і замянілі яго нямецкай часцю. У маі 1943 г. з групай славакаў Налепка перайшоў да партызан. Яму даручалася фарміраванне чэхаславацкага атрада. Нямала ўдала праведзеных баявых аперацый на яго рахунку. Ян Налепка ўлетку 1943 г. атрымаў першую баявую ўзнагароду — медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ст.

...У лістападзе 1943 г. войскі Чырвонай Арміі падышлі да Оўруча. За горад ішлі жорсткія баі. Сабураў рашыў узяць важны пункт абароны ворага да прыходу нашых рэгулярных часцей. Атрад Налепкі штурмаваў будынак вакзала. Крок за крокам набліжаліся партызаны да мэты. І калі ўжо засталося зусім нямнога, каб авалодаць вакзалам, адважны партызан загінуў.

Оўруч быў узяты партызанамі, а праз два дні ў горад уступілі часці Чырвонай Арміі. 20 лістапада ў гарадскім парку воіны чэхаславацкага партызанскага атрада разам з байцамі злучэння Сабурава хавалі Яна Налепку і яго мужных таварышаў...

В. М. Чарнобылец



Ян Налепка

З сябрамі па зброі

З успамінаў былога партызана 125-й брыгады І. І. Арцюха

Марознай снежаньскай ноччу 1942 г. група партызан, у якую ўваходзілі славакі, падышла да чыгуначнага маста ў раёне вёскі Аголіцкая Рудня. Заляглі. На мосце, наставіўшы каўнер, праходжваўся вартавы.

Выбраўшы зручны момант, партыза-



Ян Мікула



Р. Вранскі

пы пакінуліся на вартавога. У некалькі секунд усё было закончана. Толькі пачалі закладваць міну, як паказаўся патруль. Раздумваць некалі. Славакі-партызаны адкрылі агонь. Завязалася перастрэлка. Адыходзячы ў лес, славакі адвялі ўвагу ворагаў ад моста, мінёры закончылі сваю справу і таксама кінуліся ў лес. Праз некалькі хвілін раздаўся аглушальны выбух — і мост рухнуў.

Адбегшыся ў лес, партызаны спыніліся, перавялі дух. А на чыгунцы яшчэ доўгі час траскацелі нямецкія кулямёты і аўтаматы. Як потым паведаміла разведка, пасля падрыву моста рух на чыгунцы спыніўся на некалькі сутак.

Многа слаўных подзвігаў зрабілі славакі-падрыўнікі Эміль Медзігорскі, Густаў Лазар, Ян Меер, Мацей Ганка, Павал Клунда, Андрэй Сінкуліч, Павал Галік і іншыя. Пры іх удзеле не адзін варожы эшалон з тэхнікай і жывой сілай паляцеў пад адхон.

У ліпені 1943 г. падрыўнікі-славакі Павал Клунда, Ян Меер, Андрэй Сінкуліч на чале з Віктарам Прысадам атрымалі заданне ўзарваць эшалон у раёне ст. Коржаўка. Калі наступіў змрок, падрыўнікі толькі ім вядомымі лясным сцежкамі дабраліся да чыгуначнага насыпу і падклалі пад рэйку міну. Праз некаторы час прагрымеў выбух. Скрыгочучы, леэлі адзін па другі вагоны з тэхнікай і жывой сілай...

ЛІСТ СА СЛАВАКІІ

...Вы не можаце сабе ўявіць, таварыш Кудравец, які я быў рады, калі мяне наведаў Міхаіл Тубіш і сказаў, што звязаўся з вамі і атрымаў пісьмо. Маім найвялікшым жаданнем пасля доўгіх гадоў было наладзіць сувязь с вамі, і калі даведаўся ад сваіх сяброў, што вы і ваша сям'я, нашы камандзіры Міхайлоўскі і Жыгар і іншыя жывыя, вельмі ўзрадаваўся.

Я пачаў шукаць вас адразу пасля вайны. Быў у Ленінградзе, Маскве, адзін дзень у Кіеве, але звязацца з вамі не ўдалося. Я вельмі часта ўспамінаю вас, усіх баявых сяброў, нашы партызанскія аперацыі. Успамінаю капітана Наленку, як мы пісалі лістоўкі да славацкіх салдат, а потым я падбіў іх да пераходу ў партызанскі атрад, як нас падбадзёрвалі радыёперадачы аб падзеях на фронце і ўмацоўвалі веру ў перамогу...

...Некалькі слоў пра сябе. Калі фашысцкі славацкі ўрад паслаў мяне на фронт, я ішоў з думкай перайсці на ваш бок. Хутка пасля прыходу ў Беларусь я звязаўся з партызанамі і 11 лістапада 1942 г. арганізаваў пераход усяго каравула. Далей мы былі разам, вы ўсё ведаеце. Памятаеце, як у бай ў в. Грабаў я быў паранены чаргой з кулямёта. Кулі перабілі нагу, мяне ўзялі немцы ў палон. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося збегчы з шпіталю і вярнуцца на радзіму. Там, карыстаючыся вопытам беларускіх партызан, я стаў актыўным членам партызанскай брыгады імя генерала Штэфаніка. За ўдзел у вызваленчым руху атрымаў шмат падзяк.

Дарагі таварыш Кудравец, мае беларускія сябры па зброі! Усё, што я вам напісаў, малая частка таго, што я мог бы расказаць асабіста. Усе мы былі б вельмі рады сустрэцца з вамі. Са свайго боку я прыкладу ўсе сілы, каб сустрэцца з вамі і іншымі партызанамі. Я жанаты, у мяне трое дзяцей: хлопчык і дзве дачушкі. Служу ў дзяржаўным інстытуце па праектаванню заводаў у г. Трэнчын. Тут жывуць таксама нашы баявыя сябры Лазар Густаў і Эміль Медзігорскі.

...Я прашу перадаць сардэчнае прывітанне нашым камандзірам Міхайлоўскаму, Жыгару, Мачульскаму і ўсім сябрам-саратнікам і грамадзянам, якія так цёпла нас прымалі, аказвалі дапамогу, з якімі мы разам змагаліся за свабоду нашых народаў.

Ян Мікула

Славакія, г. Трэнчын. 1961 г.

Жыхары раёна, якія змагаліся з ворагам у партызанскіх атрадах, удзельнікі антыфашысцкага падполля, загінуўшыя і прапаўшыя без весткі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

БАБУНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАБУНІЧЫ

ГЛУШКО Аляксандра Аляксееўна, н. 5.1. 1926 г., закатавана ў 1943 г.

Саша Глушко перад самай вайной з пахвальным лістом закончыла сямігодку. Наперадзе, здавалася ёй, такое вялікае, цікавае жыццё... Вайна перакрэсліла ўсе мары. Над краем навіслі чорныя хмары.

Разам з іншымі юнакамі і дзяўчатамі Сашу ўключылі ў спісы рабоў, якіх накіроўвалі на катаржныя работы ў Германію. Па дарозе ўдалося збегчы. Саша вярнулася ў родную вёску, але дома заставацца ёй было нельга. Шлях лежаў у партызанскі атрад.

Адважную, рашучую дзяўчыну камандаванне ўключыла ў склад дыверсійнай падрыўной групы. Не раз яна разам





Д. С. Ражалюк



А. С. Ткачук

з іншымі партызанамі хадзіла на чыгунку, удзельнічала ў дыверсіях.

Пасля адной з такіх аперацый восенню 1943 г. падрыўнікі вярталіся ў размяшчэнне атрада. Каля в. Ляскавічы натыкнуліся на групу немцаў і паліцаяў, якія кіраваліся ў Петрыкаў. Завязалася перастрэлка. Сашу параніла, у непрытомным стане яе схапілі ворагі.

Доўга дапытвалі 17-гадовую партызанку. Як маглі, здзекаваліся над ёю вылюдкі. Катавалі, білі, патрабавалі, каб яна ўказала размяшчэнне партызанскага атрада. Саша маўчала... Нічога не дабіўшыся, ворагі цёмнай ноччу вывелі патрыётку на расстрал...

КАРДАШ Мікалай Іванавіч, н. у 1920 г., з мая 1940 г. у Чырвонай Арміі, затым партызан 130-й брыгады, загінуў 7.1.1944 г. каля в. Курыцічы.

НАЛЕЦЬКА Дзям'ян Іванавіч, н. у 1913 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў 24.10. 1943 г.

НАЛТАРАН Максім Пракопавіч, н. у 1895 г., загінуў у 1943 г. каля в. Сялюцічы.

ПРЫМАК Іван Пятровіч, н. у 1900 г., загінуў 17.2.1943 г. на чыгунцы каля ст. Капцэвічы.

РАЖАЛЮК Даніла Сямёнавіч, н. у 1922 г., загінуў 25.5.1944 г. каля в. Вятчын Жыткавіцкага р.

СТРАКАЧ Нікіфар Мікалаевіч, н. у 1897 г., удзельнік грамадзянскай вайны, баец Першай коннай арміі, загінуў 3.1.1944 г. на в. Быслаў.

ТКАЧУК Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1918 г., настаўнік, кіраўнік падпольнай маладзёжнай групы, расстраляны 16.8.1942 г. у г. Петрыкаў.

ТКАЧУК Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1925 г., загінуў 3.7.1943 г. у час дыверсіі на чыгунцы на перагоне Кашэвічы — Старушкі.

ВЁСКА КАСІШЧА

ПАЛТАРАН Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1913 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў у 1943 г. каля ст. Старушкі Жыткавіцкага р.

ВЁСКА МІХЕДАВІЧЫ

ГАНЦЭВІЧ Пётр Якаўлевіч, н. у 1895 г., загінуў 23.3.1944 г. непадалёку ад в. Міхедавічы.

ГАНЦЭВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1906 г., загінуў 15.4.1943 г.

ГЛУШКО Іван Уласавіч, н. у 1914 г., загінуў у чэрвені 1943 г. каля в. Міхедавічы.

ГЛУШКО Яфім Нікіфаравіч, н. у 1898 г., загінуў 14.1.1944 г. у в. Замосце.

КАЛЕСНІКАЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1919 г., з чэрвеня 1939 г. у Чырвонай Арміі, ст. сяржант, з чэрвеня 1942 г. — партызан 130-й брыгады, камандзір узвода, загінуў у красавіку 1944 г. у в. Людзвіноў.

КРУТ Іван Адамавіч, н. у 1910 г., загінуў 16.4.1944 г. непадалёку ад в. Міхедавічы.

НАЙДЗЁН Ігнат Міхайлавіч, н. у 1923 г., загінуў 21.12.1943 г. каля в. Таргашын.

САСНОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1902 г., загінуў 23.4.1944 г. каля Аголіч.

СОКАЛ Сільвестр Іванавіч, н. у 1897 г., загінуў 3.3.1944 г. непадалёку ад в. Міхедавічы.

ВЁСКА ПАДОЗБІН

ШАБАЛТАС Андрэй Цімафеевіч, н. у 1913 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, з кастрычніка 1943 г. — партызан 130-й брыгады, загінуў 26.6. 1944 г. каля в. Міхедавічы.

ВЁСКА САСНАВЕЦ

НЕКРАШЭВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1924 г., у красавіку 1944 г. быў цяжка паранены ў баі каля ст. Старушкі, памёр ад ран.

ВЁСКА СОТНІЧЫ

ПАЛТАРАН Аляксандр Васільевіч, н. у 1925 г., загінуў 20.10.1943 г. на чыгунцы каля в. Аголіцкая Рудня.

ПАЛТАРАН Аляксей Рыгоравіч, н. у 1901 г., старшыня калгаса «Сейбіт», затым старшыня Ляскавіцкага сельсавета. З чэрвеня 1941 г. да кастрычніка 1941 г. — партызан атрада Гардзіенкі, потым член падпольнай патрыятычнай групы, расстраляны 18.2.1942 г. у Петрыкаве.

ГАЛУБІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЫШАЛАЎ

КАБАНОВІЧ Антон Іванавіч, н. у 1914 г., камандзір дыверсійнай групы 135-га атрада, загінуў 18.7.1943 г. каля в. Смятанічы, пахаваны ў в. Камаровічы.

МАРОЗЬКА Гаўрыл Іванавіч, н. у 1905 г., старшыня калгаса «Чырвоны будаўнік», пакінуты Петрыкаўскім райкомам КП(б)Б для падпольнай работы, расстраляны ў студзені 1942 г. у Петрыкаве.

МАРОЗЬКА Пётр Іванавіч, н. у 1916 г., трактарыст Муляраўскай МТС, загінуў у верасні 1943 г. пры мініраванні чыгункі каля ст. Коржаўка.

МАРЦЫНКЕВІЧ Ананій Уладзіміравіч, н. у 1925 г., партызан украінскага злучэння, загінуў у ліпені 1943 г. каля г. Тульчын Вінніцкай вобл.

ВЁСКА ГАЛУБІЦА

ЖУКАВЕЦ Яфім Данілавіч, н. у 1915 г., механік Муляраўскай МТС, загінуў 18.11.1942 г. у час мініравання чыгункі каля в. Аголіцкая Рудня.

ПАШУК Іван Яўхімавіч, н. у 1918 г., партызан атрада імя Молатава Вінніцкага злучэння, загінуў 15.8.1943 г. каля ст. Крывін Камянец-Падольскага р.

ШНЧУК Мікалай Іванавіч, інспектар Асаавіяхіма, пакінуты Петрыкаўскім райкомам КП(б)Б для падпольнай работы, расстраляны ў студзені 1942 г. у Петрыкаве.

ВЁСКА СЛАВІНСК

АЛЕЙНІКАЎ Адам Маісеевіч, н. у 1912 г., загінуў у студзені 1943 г. каля ст. Старушкі Жыткавіцкага р.



А. Р. Палтараш



А. І. Кабановіч

БЕРАЗОЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1924 г., партызан Малдаўскага злучэння, загінуў у верасні 1944 г. у Камянец-Падольскім р.

ВЁСКА ТУРОК

ЖУКАВЕЦ Аляксандр Лявонавіч, н. у 1923 г.,
ЖУКАВЕЦ Васіль Іванавіч, н. у 1924 г., партызаны Чарнігаўскага злучэння Фёдарава, загінулі ў кастрычніку 1943 г. каля г. Ковель.
ЖУКАВЕЦ Іван Каленікавіч, н. у 1914 г.,
ЖУКАВЕЦ Парфірый Данілавіч, н. у 1914 г., партызаны Чарнігаўскага злучэння Фёдарава, загінулі ў ліпені 1943 г. у Брасцкай вобл.
КУРЛОВІЧ Уладзімір Данісавіч, н. у 1923 г., загінуў 5.11.1943 г. каля г. Ківерцы Валынскай вобл.
ШЛЕЦКІ Ніканор Маісеевіч, н. у 1918 г., партызан 130-й брыгады, загінуў у 1943 г. пры мініраванні чыгункі каля ст. Муляраўка.
ЯСТРЭМСКІ Васілій Кірылавіч, н. у 1923 г., загінуў у лістападзе 1943 г. каля г. Роўна.
ЯСТРЭМСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у кастрычніку 1943 г. каля г. п. Рожышча Валынскай вобл.
ЯСТРЭМСКІ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1923 г., загінуў у верасні 1942 г. пад Ковелем.

ГРАБАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГРАБАЎ

АКСЁНЧЫК Пётр Сцяпанавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г. у в. Белы Пераезд.
БАРАН Вера Данілаўна, н. у 1922 г., загінула ў 1943 г., у в. Фаставічы.
ГРЫНЬКО Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1926 г., загінуў у 1944 г. у в. Навасёлкі.
ГРЫНЬКО Уладзімір Пілімонавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г. каля в. Грабаў.
ДЗЯГЦЯР Дзмітрый Мінавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1943 г. у Акцябрскім р.
КЕБЕЦ Мікалай Васільевіч, н. у 1916 г., загінуў 26.2.1943 г. у в. Грабаў.
КЛБАС Аляксандр Мінавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г. у в. Бярозаўка.
КОТ Дзям'ян Пятровіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г. у в. Грабаў.
КОТ Сямён Кузьміч, н. у 1909 г., загінуў 12.1.1944 г. у в. Грабаў.
КОТ Трафім Андрэевіч, н. у 1923 г., загінуў 19.4.1943 г. у в. Кашэвічы.
НАВІЧЭНКА Салавей Паўлавіч, н. у 1910 г., загінуў 10.5.1944 г.
ПАЦЯРАЙЛА Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1922 г., настаўнік, загінуў 10.10.1943 г. у в. Грабаў.
ПАЦЯРАЙЛА Іван Яўстратавіч, н. у 1904 г., загінуў 3.12.1943 г. у в. Мышанка.
ПАЦЯРАЙЛА Канстанцін Васільевіч, н. у 1909 г., загінуў 26.4.1943 г. у в. Грабаў.
ПАЦЯРАЙЛА Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г. у в. Бярозаўка.
ПЕЧУЛІС Аляксандр Вікенцьевіч, н. у 1908 г., загінуў 17.4.1944 г. у в. Навасёлкі.
ЧЫЖЫК Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.
ШАРУБА Мікалай Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў 8.1.1943 г. у в. Грабаў.
ЯВОРСКІ Мікалай Станіслававіч, н. у 1901 г., старшыня калгаса, загінуў у 1942 г. у Жыткавіцкім р.

ВЁСКІ ВЯЛІКІЯ І МАЛЫЯ СЯЛЮЦІЧЫ

БАРАНАЎ Васілій Фаміч, н. у 1912 г., загінуў 8.5.1943 г. у в. Малыя Сялюцічы.
БАРАНАЎ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1923 г., супрацоўнік раённай газеты, загінуў у 1942 г.
БАРАНАЎ Сцяпан Максімавіч, н. у 1920 г., загінуў 15.5.1943 г.
БАРОДЗІЧ Аляксандр Раманавіч, н. у 1918 г., загінуў 6.11.1943 г. у Жыткавіцкім р.
ДАРАГУН Мікалай Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў 15.2.1944 г. у Акцябрскім р.
ДЗЯГЦЯР Дамітрый Мінавіч, н. у 1923 г., загінуў 15.4.1944 г. у Акцябрскім р.
ДЗЯГЦЯР Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1916 г., загінуў 6.9. 1942 г. у в. Камаровічы.
ЖОГАЛЬ Васіль Афанасьевіч, н. у 1924 г., загінуў 21.2.1944 г. у в. М. Сялюцічы.
КАКОРА Аляксандр Пятровіч, н. у 1912 г., загінуў 5.4.1944 г.
КАКОРА Мікалай Фёдаравіч, н. у 1912 г., загінуў 13.3.1944 г. у в. Камаровічы.
КЕБЕЦ Уладзімір Лук'янавіч, н. у 1926 г., загінуў у 1943 г. у Ельскім р.
НАСЕКА Савелій Фёдаравіч, н. у 1915 г., загінуў 10.3.1943 г.
ПАРХІМОВІЧ Валянцін Іванавіч, н. у 1915 г., загінуў у кастрычніку 1943 г.
ПІНЧУК Пётр Міронавіч, н. у 1912 г., загінуў 16.3.1944 г.
САВАСЦЕНЯ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1903 г., загінуў 4.4.1943 г. у в. М. Сялюцічы.
УЛАГУН Іван Аляксандравіч, н. у 1908 г., загінуў 5.1.1944 г.
ЧМЫХУН Кірыл Пятровіч, н. у 1904 г., загінуў у сакавіку 1944 г.
ЧЫЖЫК Мікалай Фёдаравіч, н. у 1905 г., загінуў 15.12.1943 г.

КАМАРОВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЕЛЫ ПЕРАЕЗД

БАЯРЫП Сцяпан Пятровіч, н. у 1910 г., загінуў у красавіку 1943 г.
СІНІЦКІ Мітрафан Сцяпанавіч, н. у 1912 г., загінуў у маі 1944 г.
СІНІЦКІ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1925 г., загінуў у красавіку 1944 г.



Магілы партызан на могілках у в. Сялюцічы

ВЁСКА БОБРЫК

ГЕВЯРОЎСКІ Адам Нікадзімавіч, н. у 1923 г., расстраляны ў 1942 г.

ДАНІЛЮКІ Мікалай Адамавіч, н. у 1921 г., загінуў у лютым 1944 г.

ДУДКО Фёдар Рыгоравіч, н. у 1915 г., загінуў у 1943 г.

ІВАШКЕВІЧ Серафім Басылкавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1944 г.

КАРНЕЙЧЫК Адам Якаўлевіч, загінуў у 1944 г.

КАРНЕЙЧЫК Рыгор Рыгоравіч, н. у 1914 г., загінуў у 1943 г.

КАСІЦЕЎ Іван Міронавіч, н. у 1909 г., загінуў у маі 1942 г.

КРУКОЎСКІ Сямён Міхайлавіч, н. у 1910 г., загінуў у маі 1944 г.

МАЙСЮК Дамітрый Якаўлевіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

МАКЕЙЧЫК Антон Емяльянавіч, н. у 1915 г., загінуў у 1944 г.

РАМАНЧУК Прохар Мартынавіч, н. у 1890 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ЗАМОСЦЕ

БОБЕР Аркадзій Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

ГАПАНОВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1907 г., загінуў у 1944 г.

ЛАБАНОВІЧ Юльян Аляксандравіч, н. у 1900 г., загінуў у студзені 1942 г.

ПЛЫШЭЎСКІ Сцяпан Аляксандравіч, н. у 1921 г., загінуў у лютым 1944 г.

СІНІЦКІ Юстын Варфаламеевіч, н. у 1911 г., загінуў у лістападзе 1942 г.

ВЁСКА КАМАРОВІЧЫ

БАЙКОЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1918 г., загінуў у сакавіку 1943 г.

ДУБІНА Ігарыёк Данілавіч, н. у 1910 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ІВАНЕНКА Фёдар Міхайлавіч, н. у 1921 г., загінуў 8.4.1944 г. на в. Зыслаў.

КАРНЕЙЧЫК Васіль Рыгоравіч, н. у 1925 г., загінуў у красавіку 1943 г.

ЛАПЦЕЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1920 г., загінуў у сакавіку 1943 г.

МАЖАР Сямён Васільевіч, н. у 1918 г., загінуў у 1943 г.

МАЗУРКЕВІЧ Пётр Аляксеевіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г.

МАКЕЙЧЫК Аляксандр Іванавіч, н. у 1924 г., загінуў у лютым 1943 г.

МАКЕЙЧЫК Мацвей Іванавіч, н. у 1913 г., загінуў у лютым 1943 г.



А. Н. Гевяроўскі



М. М. Дворак

МАКЕЙЧЫК Назар Андрэевіч, н. у 1910 г., загінуў 3.3.1944 г.

МАЛЫШАЎ Сцяпан Аляксеевіч, н. у 1910 г., старшыня калгаса, загінуў у сакавіку 1944 г.

МАРЦІНОЎСКІ Антон Рыгоравіч, н. у 1903 г., старшыня калгаса, загінуў 18.5.1944 г.

НІКІЦІН Пётр Васільевіч, н. у 1915 г., закатаваны фашыстамі ў 1943 г.

СТАНКЕВІЧ Ігнат Міхайлавіч, закатаваны фашыстамі ў сакавіку 1944 г.

ТУРУЦІН Пётр Уласавіч, н. у 1907 г., загінуў 25.1.1944 г.

УРЭЦКІ Ёсель, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г. у Акцябрскім р.

ШЫШЛАЎ Васіль Данілавіч, н. у 1918 г., прапаў без вестак у красавіку 1944 г.

•

ВЁСКА ФАСТАВІЧЫ

ЧЫЧЫКАЙЛА Аляксандр Яўменавіч, н. у 1918 г., загінуў у 1943 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Дзмітрый Рыгоравіч, н. у 1898 г., загінуў у 1943 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Захар Якаўлевіч, н. у 1911 г., загінуў у 1943 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1903 г., загінуў у 1944 г.

ЯКАВЕЦ Фёдар Апікеевіч, загінуў у лютым 1944 г.

КАПАТКЕВІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА ГАРАДЗІШЧА

РЫБАК Іван Усцінавіч, загінуў у студзені 1944 г.

ВЁСКА ІВАШКАВІЧЫ

ДВОРАК Маркіян Мікалаевіч, н. у 1903 г., старшыня калгаса, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў чэрвені 1942 г.

КІЗЮК Сяргей Васільевіч, н. у 1908 г., сувязны партызанскага атрада, загінуў у чэрвені 1942 г.

КОЗІНЕЦ Алена Іванаўна, н. у 1922 г., загінула ў 1944 г.

СЕМКА Фёдар Клімавіч, н. у 1922 г., сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1943 г.

ФЯСЮК Іван Сідаравіч, н. у 1927 г., загінуў у лістападзе 1943 г.

ФЯСЮК Фёдар Сідаравіч, н. у 1926 г., загінуў у 1944 г.

г. п. КАПАТКЕВІЧЫ

АДАМОЎСКІ Мікалай Піліпавіч, н. у 1924 г., загінуў у сакавіку 1944 г. у Любанскім р.

ЗМУШКА Мікалай Фёдаравіч, н. у 1910 г.

КАЛІШЬКА Лявон Пятровіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.



А. А. Лазарчык

КАЛЯДА Архіп Якаўлевіч, н. у 1910 г., загінуў у лютым 1944 г.

КРАСОЎСКІ Неафіл Фёдаравіч, н. у 1905 г., загінуў у 1943 г.

КРУПА Іван Іванавіч, н. у 1922 г., закатаваны ў 1943 г.

ЛАЗАРЧЫК Анатолій Аксентавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1942 г. у в. Ванюжычы.

Анатоль Лазарчык да вайны паспеў закончыць школу. У ліпені 1941 г. па даручэнню старшыні Капаткевіцкага сельскага савета Е. М. Кузьміча разам з іншымі вясковымі хлопцамі і дзяўчатамі — Надзяй Лысовай, Вольгай Хартаноўскай, Іванам Цылько, Пятром Агейчыкам, Рыгорам Цылько адганялі ў тыл краіны калгасны статак. А ў пачатку 1942 г. ён стаў партызанам Капаткевіцкага атрада, якім камандаваў А. І. Міхайлоўскі.

Праз некалькі месяцаў, у пачатку вясны, група партызан была накіравана ў в. Ванюжычы з заданнем адрамантаваць у вясковай кузні зброю. На ўскраіне вёскі паставілі пост — Анатоля Лазарчыка.

Раптам партызаны ў кузні пачулі стрэлы. Страляў вартавы — немцы і паліцаі ўвайшлі ў вёску не ад краю яе, а па завулку, збоку. Лазарчык заўважыў іх і адразу адкрыў агонь, каб папярэдзіць партызан, якія знаходзіліся ў кузні, выклікаць агонь на сябе. Ворагі кінуліся да яго, юны партызан быў паранены ў нагу, затым у руку... Адна з куль, якія роем раз'юшаных вос праносіліся міма, аказалася смяротнай...

МАКАРЭЦКІ Пётр Міхайлавіч, н. у 1890 г., удзельнік грамадзянскай вайны, партызан 125-й брыгады, загінуў у 1943 г.

МІНЧУК Мікалай Паўлавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

ШЫЛЕЎСКІ Георгій Савіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.

ШЫЛЕЎСКІ Сава Аляксандравіч, н. у 1900 г., удзельнік грамадзянскай вайны, загінуў у 1943 г.

ПРАКАПЕНКА Іван Сідаравіч, н. у 1902 г., загінуў у 1942 г.

ПУНДЗІК Мікалай Нічыпаравіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

УЛІЦІК Пётр Лук'янавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1943 г.

ФЁДАРЭНКА Мікалай, н. у 1927 г., расстраляны ў 1943 г.

ЦАРУН Лявон Максімавіч, н. у 1890 г., загінуў у 1943 г.

ЦЫЛЬКО Іван Аркадзьевіч, н. у 1923 г., рахункавод райсабеса, загінуў у ліпені 1943 г. у в. Ванюжычы.

ЧАЎНАВІЧ Мікалай Васільевіч, н. у 1879 г., загінуў у лютым 1942 г.

ШАЎЧУК Павел Паўлавіч, н. у 1896 г., загінуў у 1944 г.

ЯЗЭПАЎ Лявон Мікітавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ПЕРШАЯ СЛАБОДКА

БУЖАН Мікалай Ігнатавіч, н. у 1918 г., будаўнік, загінуў у ліпені 1944 г.

ВІННІК Піліп Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў у жніўні 1941 г.

КАЗЫРЭЎСКІ Ермалай Мікітавіч, н. у 1889 г., старшыня калгаса «Чырвоны партызан», удзельнік грамадзянскай вайны, закатаваны ў верасні 1942 г.

КАПЦЭВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ПАСЁЛАК КАПЦЭВІЧЫ

БУЛАВА Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1911 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ДУБІК Піліп Канстанцінавіч, н. у 1911 г., загінуў 11.3.1944 г.

ДУСЬ Ільля Іванавіч, н. у 1914 г., закатаваны ў красавіку 1943 г.

ЗАЙЧЫКАЎ Пётр Аляксандравіч, н. у 1913 г., дырэктар Капцэвіцкай сярэдняй школы, загінуў 11.3.1944 г.

ЛЕЙФМАН Маісей Лейбавіч, н. у 1909 г., загінуў у ліпені 1942 г.

ЛЯШКЕВІЧ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1901 г., загінуў 24.1.1944 г.

МАЦЮК Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1920 г., загінуў 11.3.1944 г.

СЫЦЬКА Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1923 г., загінуў у красавіку 1944 г.

СЫЦЬКА Дзмітрый Андрэевіч, н. у 1889 г., загінуў у красавіку 1944 г.

СЫЦЬКА Іван Пятровіч, н. у 1923 г., загінуў у лютым 1943 г.

ЧЫЖЫК Мікалай Фёдаравіч, загінуў у студзені 1944 г.

ЯВОРСКІ Пётр Паўлавіч, прапаў без вестак у красавіку 1944 г.

ВЁСКА КАПЦЭВІЧЫ

БРАІМ Іван Пятровіч, н. у 1903 г., загінуў 22.2.1942 г.

ВОЛКАЎ Уладзімір Захаравіч, н. у 1927 г., загінуў у лютым 1944 г. у в. Заполле Мінскай вобл.

ЕЎСЯЕВІЧ Алеся Цімафееўна, н. у 1915 г., загінула ў маі 1943 г.

КАЗЛОВІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1943 г.

КАЗЛОВІЧ Валянцін Паўлавіч, н. у 1927 г., загінуў у лютым 1944 г. каля г. п. Капаткевічы.

КАЗЛОВІЧ Павел Якаўлевіч, н. у 1902 г., загінуў у жніўні 1943 г. каля в. Церабень.

КАЗЛОВІЧ Рыгор Пятровіч, н. у 1902 г., загінуў у 1944 г.

ЛІНЧЭЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў 5.7.1944 г.

МЯЛЕШКА Іван Макаравіч, н. у 1926 г., загінуў у жніўні 1943 г. каля в. Церабень.

ПЕТРАВЕЦ Марыя Гаўрылаўна, н. у 1924 г., закатавана ў Петрыкаве ў 1943 г.

ТРУХАНОВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1912 г., загінуў 7.3.1943 г. у в. Заполле Мінскай вобл.

КОЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БРАДЫ

БАРДЗІЛОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1922 г., прапаў без вестак.

ГАРБАЧЭЎСКІ Георгій Аляксандравіч, н. у 1922 г., прапаў без вестак.

СТРАКАЧ Леанід Фёдаравіч, н. у 1926 г., прапаў без вестак.

ВЁСКА ДУБРОВА

ДАНЛОВІЧ Уладзімір Антонавіч, н. у 1926 г., загінуў 17.8.1943 г.



М. Г. Петравец

ВЁСКА ЗУБЛІШЧА

ПРАХОЦКАЯ Любоў Ігнатаўна, н. у 1919 г., медсястра 125-й партызанскай брыгады, загінула 20.1.1944 г. у в. Слабада Акцябрскага р.

ВЁСКА КОЛКІ

БАНДАРЭНКА Валянцін Пятровіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г. у Брэсцкай вобл.

БАНДАРЭНКА Яўген Пятровіч, н. у 1927 г., загінуў у 1944 г. у Брэсцкай вобл.

БОХАН Васіль Фядосавіч, н. у 1919 г., загінуў у красавіку 1942 г.

БОХАН Клаўдзія Паўлаўна, н. у 1923 г., загінула ў студзені 1943 г. у в. Савічы Калінкавіцкага р.

БОХАН Ніла Сямёнаўна, н. у 1925 г., медсястра 125-й партызанскай брыгады, загінула 3.3.1944 г.

ГАЛЕЦКІ Міхаіл Трафімавіч, н. у 1925 г., загінуў у сакавіку 1944 г. каля в. Сасноўка Акцябрскага р.

РАВУЦКАЯ Марыя Васільеўна, н. у 1919 г., загінула ў студзені 1943 г. у в. Савічы Калінкавіцкага р.

РАВУЦКІ Мікалай Аркадзьевіч, н. у 1927 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА СЯКЕРЫЧЫ

БАЛЮС Адам Францавіч, н. у 1906 г., загінуў у сакавіку 1942 г.

ШУЛЯРЭНКА Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1924 г., прапаў без вестак.

КОНКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АКРЫЁНЫ

БЛЎКАЛА Аляксандр Іванавіч, н. у 1929 г., загінуў у 1943 г.

БЛЎКАЛА Уладзімір Іванавіч, н. у 1927 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА АЦІРКІ

ШЭВЕЛЬ Іван Мікалаевіч, н. у 1903 г., загінуў 5.5.1943 г. у в. Міцуры.

ВЁСКА КОНКАВІЧЫ

ДЫБА Васіль Іосіфавіч, н. у 1916 г., супрацоўнік міліцыі, загінуў 15.12.1941 г. у в. Шастовічы.

ЛУЧЫЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ДЗЕМЕНКА

АЎСІЕВІЧ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1917 г., загінуў у 1943 г. каля в. Церабаў.

МІНІЧ Мечаслаў Васільевіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА КАПЦЭВІЧЫ

АРЦЮХ Сцяпан, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

ПРАХОЦКІ Васіль Міхайлавіч, н. у 1924 г., загінуў 19.1.1944 г.

ЦЯРЭШЧАНКА Рыгор Кузьміч, н. у 1902 г., загінуў 5.5.1942 г. у в. Кашэвічы.

ВЁСКА КАШЭВІЧЫ

БАРБУЦЬКА Васіль Якімавіч, н. у 1906 г., загінуў 1.7.1943 г.

ЗІЗЮК Іван Андрэевіч, н. у 1923 г., загінуў 13.11. 1943 г.

ЗІЗЮК Яфім Лявонцьевіч, н. у 1914 г., старшыня сельсавета, загінуў 28.1.1942 г.

КУНІЧЫК Якаў Мікалаевіч, загінуў у 1943 г.

КУРЧЫЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1925 г., загінуў у лютым 1943 г.



МІНІЧ Вячаслаў Васільевіч, н. у 1922 г., загінуў у лютым 1943 г.
ФЯДОСІК Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА ЛУЧЫЦЫ

КОРШАК Васіль Адамавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1944 г.
ЛУГАЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.
СЕВІЗДРАЛ Іван Фёдаравіч, н. у 1923 г., загінуў 7.4.1943 г.
ШЭЦКА Рыгор Аляксандравіч, н. у 1920 г., загінуў у 1943 г. у в. Кашэвічы.

ВЁСКА СТАРЫНА

ШУТ Павел Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў 19.3.1944 г.
ЧАУС Рыгор Кірылавіч, н. у 1898 г., дэпутат сельскага савета, партызанскі сувязны, закатаваны ў маі 1944 г.

ВЁСКА ХВОЙНЯ

БУРМА Сафрон Максімавіч, загінуў 6.10. 1943 г. у г. п. Акцябрскі.

ВЁСКА ЯЎСЕЕВІЧЫ

МАСТАВЫ Іван Іонавіч, н. у 1910 г., камандзір партызанскага атрада, загінуў у 1944 г.
САХОЎСКІ Рыгор Яфімавіч, н. у 1920 г., загінуў 20.3.1942 г. у в. Кашэвічы.

ЛЯСКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГЛІНКА

БАРАНІЧ Уладзімір Іванавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1943 г. каля в. Хлуцін Тураўскага р.

ВЁСКА ДАРАШЭВІЧЫ

АДАМЕНКА Андрэй Юр'евіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.
ШЫЧУК Ціт Піліпавіч, н. у 1915 г., загінуў 23.3.1944 г. каля в. Снядзін.

ВЁСКА ЛЯСКАВІЧЫ

РЫБАЛКА Анастасія Андрэеўна, н. у 1910 г., загінула ў 1943 г. каля в. Ляскавічы.
РЫБАЛКА Іван Андрэевіч, н. у 1906 г., загінуў у 1944 г.



А. Д. Хаменя



З. І. Радзейка

МУЛЯРАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

БАЎСУН Васіль Мікалаевіч, н. у 1905 г., загінуў у маі 1944 г.
ФАЛЕЕЎ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1913 г., загінуў 19.1.1944 г.
ХАМЕНЯ Аляксей Дзмітрыевіч, н. у 1912 г., загінуў 15.5.1944 г. у в. Міхедавічы.

ВЁСКА КОРЖАЎКА

ГАЛЕНЯ Адам Міхайлавіч, н. у 1925 г., загінуў 18.3.1943 г. пры падрыве эшалона на ст. Муляраўка.
ГАЛЕНЯ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.
ЛІСОЎСКІ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1924 г., загінуў 5.12.1943 г.

ВЁСКА КУРЫЦІЧЫ

БАЯРЧУК Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1923 г., загінуў 20.10.1942 г.
ГРЭСЬКА Павел Апанасавіч, н. у 1913 г., загінуў 14.10.1943 г. у в. Бобрык.
КАВАЛЬЧУК Іван Іванавіч, н. у 1923 г., загінуў у красавіку 1944 г.
КАВАЛЬЧУК Рыгор Мінавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.
КАРАСЬ Іван Фёдаравіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.
КАРТЫННІК Аляксандр Фядосавіч, н. у 1910 г., загінуў 7.6.1944 г.
КАРТЫННІК Сцяпан Юркавіч, н. у 1908 г., загінуў у 1942 г.
КАРТЫННІК Фёдар Якаўлевіч, н. у 1909 г., прапаў без вестак у красавіку 1944 г.
НАЛЕЦЬКА Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1910 г., загінуў 30.12.1942 г.
НАЛЕЦЬКА Мікалай Цітавіч, н. у 1914 г., загінуў 25.8.1942 г.

НАЛЕЦЬКА Пётр Мікалаевіч, н. у 1908 г., загінуў 5.10.1944 г.

РАДЗЕЙКА Захар Іванавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г. каля в. Людзвіноў.

РАДЗЕЙКА Мікалай Іванавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1944 г. каля в. Людзвіноў.

РУДАЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1913 г., загінуў 14.10.1943 г. у в. Бабунічы.

СЕМЯНІЦКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1922 г., загінуў у лютым 1944 г. у в. Бобрык.

СЕМЯНІЦКІ Ігнат Іванавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1944 г. у в. Міхедавічы.

СІТНІЦА Віктар Васільевіч, н. у 1927 г., закатаваны фашыстамі ў маі 1944 г.

Жыве памяць

У далёкім Ціхім акіяне плавае карабель, на высокім борце якога нашсана: «Віця Сітніца»... Імя сялянскага хлапчука з в. Курыцічы, які ў суровыя гады выпрабаванняў для радзімы са зброяй у руках стаў на яе абарону і аддаў сваё маладое жыццё, каб наблізіць Перамогу, вядома далёка за межамі рабна.

Віці было чатырнаццаць гадоў, калі пачалася вайна. З першых яе дзён хлапчук трымаў сувязь з партызанамі. Маленькі, непрыкметны з выгляду, ён быў выдатным разведчыкам. А ў ліпені 1942 г. разам са старэйшым братам Іванам пайшоў у партызанскі атрад, якім камандаваў М. Волкаў. Там была створана дыверсійная група, якая потым выросла ў атрад № 78 пад камандаваннем Р. А. Такуева. Не раз прымаў удзел у дыверсіях на чыгункы юны падрыўнік. Герой Савецкага Саюза Р. А. Такуеў успамінае: «Віця быў смелым, не па гадах кемлівым байцом. Не губляўся ў цяжкіх становішчах, заўсёды знаходзіў выхад... Ён быў сціплым і добрым таварышам, на якога заўсёды можна пакласціся».

...Быў май 1944 г. Віця па справах накіраваўся ў Курышічы. Вось і знаёмая вуліца. Раптам хлопец уздрыгнуў ад нечаканасці: зусім блізка стаялі незнаёмыя людзі, з выгляду партызаны, на шапках чырвоныя зоркі. «Нашы... Але адкуль, хто яны?» — ускалыхнулася трывожная думка.

Незнаёмцы таксама заўважылі юнага партызана, накіраваліся да Віці.

— Дзе твае сябры, дзе астатнія партызаны? Заві іх хутчэй сюды!

Усё ў выглядзе гэтых людзей, іх мова, паводзіны падказвала Віцю, што гэта — чужыя, ворагі... І тут ён заўважыў пад шынялём аднаго з незнаёмых зялёны мундзір. «Немцы!..»

Віця адбег убок, зрываючы з пляча аўтамат. Даў доўгую чаргу па ворагах. Некалькі з іх упала, астатнія адкрылі ўслед партызану агонь. Куля моцна штурхнула Віцю, ён упаў, выпусціў з рук аўтамат. Хацеў прыўзняцца і зноў узяць зброю, але на яго наваліліся, скруцілі...

Віцю прывезлі ў Смятанічы, у камендатуру. Доўга дапытвалі, катавалі: «Дзе партызаны, хто з мясцовых жыхароў звязаны з імі? Дзе знаходзіцца партызанскі атрад?»

Віця маўчаў, нягледзячы на пякучы боль раны, на здзекі і адмысловыя катаванні. Ён нікога не выдаў, як ні лютавалі над ім ворагі. Нічога не дабіўшыся, гітлераўцы расстралялі Віцю Сітніцу...

Ён пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны I ст. Землякі, жыхары Курыціч не забываюць Віцю Сітніцу, шануюць памяць аб ім.

В. Р. Фёрана

ХАМЕНЯ Антон Ільіч, н. у 1908 г., загінуў 10.1.1944 г.

ШАБАЛТАС Рыгор Сямёнавіч, н. у 1902 г., загінуў 20.3.1944 г. у в. Замосце.

ШЭЛЕГ Іван Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў у лютым 1944 г. у Калінкавіцкім р.

ЯСТРЭМСКІ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1903 г., загінуў 1.5. 1943 г. у в. Курыцічы.

ВЁСКА ЛЮДЗВІНОЎ

БОНДАР Мікалай Фёдаравіч, н. у 1921 г., загінуў у 1942 г. у п. Муляраўка.

ДУБІНА Адам Антонавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г. у в. Навасёлкі.

ДУБІНА Антон Напумавіч, н. у 1888 г., старшыня калгаса, загінуў 5.4.1944 г. каля в. Млынок.

ЗУБАР Іван Трафімавіч, н. у 1898 г., загінуў у 1942 г. у в. Камаровічы.



М. П. Корж

ЗУБАР Мікалай Якаўлевіч, н. у 1905 г., загінуў у 1943 г. каля в. Курыцічы.

ЗУБАР Сцяпан Паўлавіч, н. у 1920 г., загінуў у 1942 г. у п. Муляраўка.

КОРЖ Мікалай Пятровіч, н. у 1922 г., сакратар раённага народнага суда, загінуў 10.8.1943 г. у в. Курыцічы.

КОРЖ Міхаіл Пятровіч, н. у 1911 г., загінуў 7.1.1944 г. у в. Бобрык.

КРЭС Міхаіл Адамавіч, н. у 1923 г., загінуў 21.9.1943 г. пры мініраванні чыгункі каля ст. Муляраўка.

ПАЛЕЦЬКА Дам'ян Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г. у в. Міхедавічы.

ЦІМАШЫШЫН Мікалай Раманавіч, н. у 1923 г., настаўнік, расстраляны ў 1943 г. за сувязь з партызанамі.

ЧАРНОБЫЛЕЦ Аляксандр Максімавіч, н. у 1893 г., загінуў у 1943 г. у в. Курыцічы.

ЧАРНОБЫЛЕЦ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1927 г., загінуў 22.2.1943 г. каля в. Курыцічы.

ЧАРНОБЫЛЕЦ Іван Фёдаравіч, н. у 1908 г., перпы старшыня калгаса, старшыня Смятанінскага сельскага савета, расстраляны ў 1942 г. у г. Петрыкаў.

ЯЦКО Міхаіл Ісакавіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г. каля в. Смятанічы.

ВЁСКА СЯРЭДНЯЯ РУДНЯ

ЖУРАЎСКІ Лук'ян Іванавіч, н. у 1912 г., закатаваны ў 1942 г.

ПЛІПЕЦ Дамітрый Раманавіч, н. у 1912 г.

ЯНКОЎСКІ Юзік, н. у 1917 г., закатаваны ў 1943 г.

МЫШАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАЯНАЎ

ГРАМОВІЧ Пётр Кандратавіч, н. у 1902 г., загінуў у лютым 1942 г.

ВЁСКА БЕСЕДКІ

Загінулі ў кастрычніку 1941 г.

ДАШКЕВІЧ Павел Ільіч (1920 г.)
ДАШКЕВІЧ Міхаіл Андрэевіч (1924 г.)
ВЯРАКСІЧ Антон Антонавіч (1923 г.)
КУЦЬКО Міхаіл Ільіч (1903 г.)
ШЭЎКА Аляксандр Якаўлевіч (1905 г.)
ШЭЎКА Іван Фёдаравіч (1903 г.)

ВЁСКА МЫШАНКА

ДАРОШКА Аляксей Іосіфавіч, н. у 1918 г., загінуў у лютым 1943 г.

УРЭЦКІ Айзік Лахманавіч, н. у 1925 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ВЁСКА НОВЫЯ КАЦУРЫ

ПАДДУБНЫ Сафрон Іванавіч, н. у 1913 г., загінуў у лютым 1942 г. у Калінкавіцкім р.

РАГАВІК Мікалай Пятровіч, н. у 1910 г., загінуў у студзені 1944 г.

РАГАВІК Эмілій Аляксандравіч, н. у 1924 г., загінуў у 1942 г.

НАВАСЁЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АНОСАВІЧЫ

БЕЛЬСКІ Мікалай, н. у 1924 г., загінуў у маі 1943 г. у в. Сасноўка Акцябрскага р.

ТАРАСЕВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1914 г., брыгадзір калгаса, загінуў у 1944 г. у г. Гродна.

ВЁСКА ВАНЮЖЫЧЫ

КУДРАВЕЦ Віктар Цімафеевіч, н. у 1905 г., палітрук роты, загінуў 27.3.1944 г. у Бросцкай вобл.

СЕРАДА Васіль Савіч, н. у 1909 г., загінуў у сакавіку 1943 г.

ФУРМАН Фёдар Апанъевіч, н. у 1911 г., шафёр, загінуў у 1943 г. пры мініраванні чыгункі на перагоне Муляраўка — Капцявічы.

ВЁСКА ГРАБНІКІ

КАПУСЦІН Аляксей Акімавіч, н. у 1918 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ВЁСКА ЗАБРОДЗЬЕ

БУЛЫГА Адам Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.

ВАЛЫНЕЦ Антон Цімафеевіч, н. у 1912 г., загінуў 15.1.1944 г. каля в. Бобрык.

ЗАГОРАЦ Якаў Сямёнавіч, н. у 1910 г., загінуў 13.2.1944 г. каля в. Забродзе.

ВЁСКА КЛЯСАЎ

ІСКРЫЦКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1918 г., загінуў у чэрвені 1943 г. каля в. Акрыёны.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

ГАРБАЧ Харытон Радзівонавіч, н. у 1912 г., старшыня Навасёлкаўскага сельсавета, загінуў у 1942 г. пры падрыве чыгуначнага моста на р. Пціч.

ДУБІНА Андрэй Самойлавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

ДУБІНА Арсеній Андрэевіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г.

ДУБІНА Іван Канстанцінавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1944 г.

ДУБІНА Купрэй Мікалаевіч, н. у 1918 г., загінуў 25.6.1944 г. каля в. Старына.

ДУБІНА Пілін Яўгенавіч, н. у 1924 г., загінуў 28.3.1944 г.

ДУБІНА Ягор Рыгоравіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ЖУДРО Апанас Емяльянавіч, н. у 1890 г., загінуў у ліпені 1943 г.

ЖУДРО Фёдар Данілавіч, н. у 1923 г., загінуў 28.7.1944 г.

КАСЦЕЕЎ Іван Самойлавіч, н. у 1915 г., загінуў 27.3.1944 г.

КОЗІК Іван Рыгоравіч, н. у 1912 г., загінуў 21.3.1942 г.

КОЗІК Міна Васільевіч, н. у 1907 г., чыгуначнік, загінуў у 1944 г.

ШВАВАР Антон Фёдаравіч, н. у 1914 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

РЫМША Міхаіл Антонавіч, н. у 1925 г., загінуў у лютым 1944 г.

ФУРМАН Васіль Іванавіч, н. у 1911 г., чыгуначнік, загінуў 27.4.1944 г.

ФУРМАН Якаў Ільіч, н. у 1915 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ПРАХОДЫ

РАДЗІВОНАЎ Кірыл Андрэевіч, н. у 1915 г., загінуў у 1943 г.

ХОДЗЬКА Фадзей Мікалаевіч, н. у 1920 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА РЭКОРД

АЛЕКСА Андрэй Апанасавіч, н. у 1921 г., рабочы лесправгаса, загінуў пры падрыве чыгункі на перагоне Старушкі — Жыткавічы.

ГОЛІК Ісак, н. у 1914 г., рабочы лесправгаса, загінуў у студзені 1944 г. у в. Рэпін Акцябрскага р.

ГРЫШКОЎ Сцяпан Радзівонавіч, н. у 1901 г., удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, загінуў у 1943 г.

КАЛАДЗЕЙ Уладзімір, н. у 1911 г., загінуў у 1942 г.

СТАТКЕВІЧ Андрэй Іванавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1943 г.

ТУРАВЕЦ Іван Паўлавіч, н. у 1911 г., загінуў у 1942 г.

ЯНОВІЧ Віктар Міхайлавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1942 г.

ВЁСКА СТАРЫЯ ГАЛОЎЧЫЦЫ

КІРБАЛЬ Емяльян Карнеевіч, н. у 1909 г., загінуў 5.6.1944 г.

КІРБАЛЬ Міхаіл Карнеевіч, н. у 1915 г., загінуў у ліпені 1944 г.

КРЫВАЛАП Аляксей Фёдаравіч, н. у 1927 г., загінуў у 1944 г.

КРЫВАЛАП Пётр Іванавіч, н. у 1912 г., загінуў у верасні 1944 г.

МУХІН Уладзімір Лук'янавіч, н. у 1922 г., настаўнік, загінуў у ліпені 1943 г. у Брагінскім р.

ТАЛЕЦКІ Аляксей Пятровіч, н. у 1925 г., сувязны партызанскага атрада, загінуў у верасні 1943 г.

г. ПЕТРЫКАЎ

БЕРДНІК Антон Антонавіч, н. у 1912 г., загінуў у кастрычніку 1941 г. каля г. Петрыкаў.

БУДОВІЧ Максім Сямёнавіч, н. у 1921 г., загінуў 28.12.1943 г. у в. Вышалаў.

БУДОВІЧ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1923 г., загінуў у лютым 1944 г. у Валынскай вобл.

Чатыры сыны і мужа забрала вайна ў Домны Трафімаўны Будовіч... Адзін за другім паглынала іх вайна — у родным Петрыкаве і ў партызанскіх атрадах, у кровапралітных баях на франтах. Старэйшы, Пятро Будовіч, пайшоў добраахвотна абараняць Петрыкаў у ліпені 1941 г., быў санінструктарам. Ён вынес з поля бою звыш 10 параненых байцоў. Потым было горкае адступленне з роднай Беларусі. Паранены, каля Канатопа трапіў у палон і быў закатаваны ў няволі... У партызанскім атрадзе ў баі каля Ковеля загінуў муж, Сямён Андрэевіч Будовіч, у мірны час — марак Верхнедняпроўскага параходства. Вайна патрабавала новых ахвяр... Пад Сталінградам варожая куля абарвала жыццё другога сына Домны Трафімаўны —

Рыгора. Аб гэтым яна даведалася толькі пасля вайны. Жанчына ў гэты час разам з двума малодшымі сынамі і дачкой Аляксандрай знаходзілася ў партызанскім атрадзе Трухановіча. Максім быў байцом гэтага атрада. У лістападзе 1943 г. у баі каля в. Галубіца ён загінуў. А самы малодшы, Міхаіл, змагаўся з ворагамі на Украіне, у партызанскім злучэнні Сабурава. Скласці галаву яму давялося дзесьці ў Заходняй Украіне...

Пакуль жыла Домна Рыгораўна, у сэрцы яе ніколі не згасаў боль аб загінуўшых сынах, аб мужу...

БУДОВІЧ Сямён Андрэевіч, н. у 1872 г., загінуў у 1942 г. пад Чарнігавам.

ВІЛЬМАШ венгр, загінуў у верасні 1943 г. пры падрыве чыгункі каля в. Коржаўка.

ВАРГАЎЦІК Хаім Іаіравіч, н. у 1912 г., першы сакратар райкома КПБ.

ІМРЭ венгр, загінуў у кастрычніку 1943 г. пры падрыве чугункі каля в. Аголіцкая Рудня.

КАЛЕНІК Уладзімір Пятровіч, н. у 1910 г., загінуў у 1943 г.

КАЛЕНІК Аванас Пятровіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г.

КУЛАК Пётр Андрэевіч, н. у 1894 г., расстраляны ў 1942 г.

КУРЧЫЦКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1912 г., загінуў у 1943 г. каля в. Старушкі.

ПАУЛЬ венгр, загінуў у верасні 1943 г. пры падрыве чыгункі каля в. Коржаўка.

ПРЫСАДА Браніслаў Антонавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г.

РУДЗЬКО Мацвей Іосіфавіч, н. у 1898 г., закатаваны ў 1942 г. у Петрыкаве.

РУТА Андрэй Пятровіч, н. у 1913 г., участковы ўпаўнаважаны, закатаваны ў 1942 г. у Петрыкаве.

УЛАДЫЧАНСКІ Адольф Мікалаевіч, н. у 1917 г., шафёр, загінуў у 1943 г. у в. Забродзе.



А. П. Рута



С. А. Будовіч

ПЕТРЫКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АГОЛІЦКАЯ РУДНЯ

СЕРАДА Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1921 г., у Чырвонай Арміі з мая 1941 г., затым партызан 125-й брыгады. Закатаваны ў 1942 г. у Петрыкаве.

ВЁСКА АГОЛІЧЫ

БУЛАВА Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1913 г., загінуў 14.6.1943 г.

ДУБІК Андрэй Якаўлевіч, н. у 1914 г., загінуў у сакавіку 1943 г.

ДУБІК Сцяпан Андрэевіч, н. у 1908 г., начальнік камандзіра 135-га партызанскага атрада, закатаваны ў красавіку 1944 г.

КУР'ЯНОВІЧ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1923 г., загінуў 23.2.1943 г.

СУМАР Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1918 г., загінуў у 1943 г. у Петрыкаве.

ВЁСКА БЯЛАНАВІЧЫ

БЕРДНІК Арсеній Іванавіч, н. у 1914 г., супрацоўнік райваенкамата. У Чырвонай Арміі з ліпеня 1941 г., затым партызан 130-й брыгады, закатаваны 27.9.1943 г. у Петрыкаве.

ВЁСКА МАКАРЫЧЫ

МАКАРЭВІЧ Таццяна Трафімаўна, н. у 1921 г., закатавана 14.7.1943 г. у Петрыкаве.

У чэрвені 1943 г. у атрад імя Калініна, які дзейнічаў на тэрыторыі Лельчыцкага раёна, прыйшла з в. Макарычы 20-гадовая дзяўчына Таня Макарэвіч. Яна хацела стаць партызанкай, помсціць ворагу за здзекі, якія ён чыніў на роднай зямлі. Камандаванне атрада вырашыла інакш, Тане было дадзена заданне вярнуцца ў Петрыкаў, уладкавацца на работу ва ўправу і збіраць разведданыя аб ворагу.

Здабытыя звесткі аб планах і намерах гітлераўцаў, дыслакацыі часцей і іх перамяшчэнні Таня перадавала партызанам ва ўмоўленыя месцы. Часта за імі прыходзіў камандзір узвода І. І. Рэут.

Позняй восенню з атрада дызерціравалі два чалавекі. Яны прыйшлі ў Петрыкаў і, каб выслужыцца перад аку-



Таня Макарэвіч (справа) з сястрой Дуняй

пантамі, выдалі Таню Макарэвіч. Яе арыштавалі. На допытах патрабавалі выдачы партызанскіх сувязных і іх сем'яў. Таня трывала нечалавечыя мукі, зверскія катаванні, але маўчала. Раздзетай і босай яе вадзілі па снегу, заганялі пад пазногці іголкі, палілі раскаленым жалезам... Таня Макарэвіч прыняла пакутніцкую смерць, але нікога не выдала.

В. Р. Феранц

ЩЩКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЩЩЧ

ТАРАСЕВІЧ Мікалай Васільевіч, н. у 1917 г., загінуў у 1942 г.

ТАРАСЕВІЧ Васіль Міхайлавіч, н. у 1885 г., загінуў у сакавіку 1944 г. у Акцябрскім р.

ВЁСКА БАБРЭЧЧА

БУЖАН Адам Яфімавіч, н. у 1904 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА РАДКАЎ

АРЫНОВІЧ Аляксандр Архіпавіч, н. у 1909 г., закатаваны ў 1944 г.

ВЁСКА РОГ

ГЕРАСІМЕНКА Захар Рыгоравіч, н. у 1915 г., закатаваны ў 1943 г.

ГЕРАСІМЕНКА Ілья Аляксеевіч, н. у 1913 г., загінуў у 1943 г.

ГЕРАСІМЕНКА Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1916 г., закатаваны ў снежні 1943 г.

ПЫРКО Мікалай Фокавіч, н. у 1927 г., загінуў у 1943 г.

ПЫРКО Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г.

ВЁСКА ХУСНАЕ

ПОЛЯК Сяргей Анікеевіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.

ПОЛЯК Уладзімір Ісакавіч, н. у 1922 г., прапаў без вестак у 1943 г.

СЦЯПУК Васіль Трыфанавіч, н. у 1921 г., закатаваны ў 1943 г. у Мазыры.

СЯМЁНАВА Марыя Васільеўна, н. у 1922 г., загінула ў 1943 г.

СНЯДЗІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЕЛІН

ХАЛЬЧЭНЯ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1924 г., загінуў у 1943 г. у Камянец-Падольскай вобл.



С. С. Пырко



В. Т. Сцяпук

ВЁСКА МАРДЗВІН

ЯЎЛАШ Уладзімір Піліпавіч, н. у 1923 г., загінуў у 1944 г.

ВЁСКА СНЯДЗІН

ДАМАСЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1922 г., загінуў у 1943 г.
ЗАНКЕВІЧ Мікалай Пятровіч, н. у 1924 г., загінуў 12.7.1944 г.
ЗАНКЕВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1903 г., загінуў 21.1.1944 г.
РУЦКІ Яўген Пятровіч, н. у 1915 г., загінуў у маі 1943 г.

ВЁСКА СУДЗІБАР

ГРАЛЬКА Станіслаў Фёдаравіч, н. у 1923 г., загінуў у 1943 г.
ПАШУК Міхаіл Фролавіч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г.
ЯЦКО Андрэй Рыгоравіч, н. у 1919 г., загінуў у 1944 г.

ЧАЛЮШЧАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЕ ПОЛЕ

КУЛАКОЎСКІ Мікалай Паўлавіч, н. у 1878 г., загінуў 1.1.1944 г.
МАЧУК Дзмітрый Мікалаевіч, н. у 1906 г., загінуў 22.2.1944 г.
ПРАХОЦКІ Павел Андрэевіч, н. у 1914 г., загінуў у лютым 1944 г. каля в. Навасёлкі.
ЦІСАВЕЦ Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1906 г., загінуў у лютым 1944 г. каля в. Навасёлкі.

ВЁСКА ДРУГАЯ СЛАБОДКА

МАЧУК Андрэй Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў у 1944 г. у Акцябрскім р.
ПАЎЛЮЧОК Павел Аляксеевіч, н. у 1913 г., загінуў 13.2.1944 г.

ВЁСКА ДУБРОВА

ДЗЕГЯЛЕВІЧ Ілья Рыгоравіч, н. у 1906 г., загінуў у лютым 1944 г. у в. Рэпін Акцябрскага р.

ВЁСКА ЗАЛЕССЕ

ЛСАЦКІ Адам Сямёнавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1943 г.

ЛСТРЭЙКА Рыгор Аляксандравіч, н. у 1910 г., загінуў у 1944 г. у Калінкавіцкім р.
МІХНЕВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1924 г., настаўнік Навасёлкаўскай школы, загінуў у Даманавіцкім р.

ВЁСКА ПЕРАБІТАЯ ГАРА

ТАРАСЕВІЧ Аркадзій Міхайлавіч, н. у 1888 г., загінуў у 1942 г. у в. Кацлічы Калінкавіцкага р.

ВЁСКА ЧАЛЮШЧАВІЧЫ

АЛЕСІК Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1925 г., загінуў у 1944 г. у Акцябрскім р.
ВАРАНЧУК Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1901 г., загінуў у 1943 г. у в. Рэпін Акцябрскага р.
ЖУКОЎСКІ Андрэй Паўлавіч, н. у 1909 г., загінуў 24.3.1943 г.
ЗАЯЦ Міна Ільіч, н. у 1914 г., загінуў 3.5.1944 г.
КАЛЯДА Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1901 г., загінуў 13.4.1944 г.
КАРОТКІ Пашфрат Апанасавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1943 г. каля в. Хуснае.
МАЗАЙ Аксэнт Сцяпанавіч, н. у 1908 г., загінуў 24.3.1944 г.
МАЗАЙ Апанас Сцяпанавіч, н. у 1911 г., загінуў 18.3.1944 г.
МАЗАЙ Дзмітрый Цімафеевіч, н. у 1907 г., загінуў 12.3.1944 г.
МАЗАЙ Іван Іосіфавіч, н. у 1891 г., загінуў у сакавіку 1944 г.
МАЗАЙ Кірыл Іванавіч, н. у 1909 г., загінуў 24.3.1944 г.
МАЗАЙ Мяфодзій Сцяпанавіч, н. у 1913 г., загінуў 26.3.1944 г.
МАЗАЙ Цярэнцій Кузьміч, н. у 1903 г., аграном, загінуў у 1943 г.
ХАНЧЭЎСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў 22.2.1944 г.
ХАНЧЭЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1886 г., рэпрэсіраваны, у час вайны вярнуўся дадому, партызан 125-й брыгады, загінуў у 1944 г. у в. Вялікае Поле.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ ГОРКА

КРАЎЧАНКА Ігнат Ігнатавіч, н. у 1907 г., камандзір узвода 125-й брыгады, загінуў 20.5.1944 г.
РАДАМАН Вінцусь Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў 5.2.1944 г. у Брэсцкай вобл.
РАДАМАН Фёдар Іванавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1942 г. пад Мінскам.

Пад каваным ботам акупантаў

Фашысты з першых дзён акупацыі горада і раёна пачалі ўстанаўліваць свой «новы парадак». Забівалі мірных жыхароў, гвалтавалі жанчын, рабавалі... Схапілі паважанага чалавека, загадчыка аптэкі 70 гадовага Арона Файнштэйна, прывязалі вяроўкамі за ногі і цягалі канём па вуліцы, пакуль стары не памёр. Гітлераўскія вылюдкі спалілі пяцігадовую Фаню – дачку настаўніцы Клары Кустановіч. Яны патрабавалі ў маці расказаць, дзе знаходзяцца савецкія салдаты і афіцэры, якія выходзілі з акружэння. Патрыётка палічыла за лепшае смерць, чым здраду. Гітлераўцы расстралялі К. М. Кустановіч. Пасмяротна яна была ўзнагароджана медалём «За баявыя заслугі».

У адным з цэхаў цагельнага завода гітлераўцы знайшлі хворую дзяўчынку Іну Фацееву. Яе згвалтавалі, а потым расстралялі і кінулі з гары ў затоку... А праз некалькі дзён пад націскам падраздзяленняў Чырвонай Арміі фашысты вымушаны былі пакінуць горад. 2 жніўня Петрыкаў быў вызвалены, узноўлена савецкая ўлада. У горад зноў увайшлі чырвонаармейцы, партызаны атрада Варгаўціка. Сюды перабраўся падпольны райком. Прыступіў да выканання сваіх абавязкаў старшыня гарсавета Я. Зарэцкі. Начальнік аддзела НКУС маёр Жукаў і начальнік міліцыі Малчанаў арганізавалі ахову горада. Работнікі ваенкамата, ваенком лейтэнант Рошчын, начальнік 2-й часці Міхаіл Багінскі, афіцэры Васкевіч і Міхаіл Галёнка прыступілі да мабілізацыі насельніцтва ў рады Чырвонай Арміі. Разам з ваеннаабавязанымі добраахвотна ішлі ў ваенкамат камсамольцы непрызыўнога ўзросту. Выказалі жаданне пайсці ў дзеючую армію больш 50 юнакоў і дзяўчат. Сярод добраахвотнікаў былі Пётр Фурсікаў, Лідзія Занкевіч, Пётр Дрыга, Ірыней Дзечка і іншыя. Многія з іх прайшлі вогненнымі дарогамі ўсю вайну, атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды. Пётр Фурсікаў, напрыклад, быў узнагароджаны одрэнам Аляксандра Неўскага. З 2 па 19 жніўня 1941 г. мабілізавана ў рады Чырвонай Арміі больш 300 чалавек.

5 жніўня па рашэнню райкома партыі насельніцтва ўбрала пераспеўшыя пасевы калгаснага жыта, абмалаціла яго і надзейна захавала. Такое рашэнне было прынята і наконт бульбы. 9 жніўня праведзена эвакуацыя насельніцтва ў тыл краіны. Райком партыі ў кароткі тэрмін здолеў арганізаваць рабочых суднаверфі, якія паднялі з затокі Бычок дзве затопленыя баржы. На іх у Мазыр вывезлі больш пяцідзесяці сямей.

11 жніўня ў другой палове дня прыляцеў самалёт, ён даставіў пошту, газеты і доўгачаканыя пісьмы. У газеце «Правда» быў змешчаны артыкул «Убитые, встаньте!», у якім расказвалася аб геройскім учынку і смерці савецкай патрыёткі Кустановіч з в. Галубіца.

Фашысцкія войскі пайшлі ў абход раёна ў напрамку да Мазыра. 19 жніўня райком партыі пакінуў Петрыкаў, пераправіўся праз Прыпяць у лес і зноў перайшоў на падпольную работу. Пачаліся нялёгкія, трывожныя партызанскія будні.

З верасня група партызан з атрада Варгаўціка арганізавала засаду на р. Прыпяць, насупраць в. Бяланавічы. З кулямётаў і вінтовак яны абстралялі катэр з палівам і жывой сілай ворага. Полымя ахапіла палубу. Толькі двум гітлераўцам удалося дабрацца да берага.

Трывога не пакідала жыхароў. 14 верасня быў цёплы сонечны дзень. Людзі каналі бульбу на агародах. У 3 гадзіны дня па беразе Прыпяці, недалёка ад в. Макарычы, з бранякатэра і баржы высадзіўся карны атрад, больш 100 чалавек. Ворагі ўварваліся ў Петрыкаў. Яны рабавалі і гвалтавалі мірнае насельніцтва, чуліся стрэлы. Асабліва пакутавалі петрыкаўчане яўрэі. Ворагі

дамагаліся ў Блюмы Герцулінай, былой работніцы амбулаторыі, паказаць, дзе яна хавае каштоўнасці. Ніякіх каштоўнасцей у яе не было, жанчыну расстралялі. На вуліцы К. Лібкнехта быў забіты дзесяцікласнік Борух Герцулін. Дарослых і дзяцей па 30—40 чалавек гналі на прыстань да Прыпяці. На беразе затокі Бычок людзей прымушалі класціся тварам у гразь. На іх былі накіраваны кулямёты бранякатэра. Паверх галоў раз-пораз стралялі, ніхто не мог узняцца. На гэтым пякельным месцы ўсё большала людзей. Калі на беразе сабралася больш 400 чалавек, карнікі загадалі ўсім распрануцца, голых людзей пачалі заганяць у ваду. Яўрэі пад ударамі прыкладаў рухаліся на глыбіню, пярэднія ўжо танулі. Чуўся жудасны гул, крыкі, плач. Гітлераўцы палівалі пакутнікаў свінцом. Забітыя і параненыя хаваліся пад вадой. Потым дабівалі параненых...

Сярод асуджаных на смерць яўрэяў была трыццаціпасцігадовая Гінда Гутман. Лёс дараваў ёй жыццё. Яна ўспамінае: «Мяне схапілі карнікі і павялі па вуліцы Карла Лібкнехта да цэнтра горада. Каля сквера паказалася група людзей, каля 30 чалавек. Мяне штурханулі да іх. З вуліцы Андрэева рухалася другая група яўрэяў, голых, акруаваўленых. Сярод іх была Люба Янюк з чатырма дзецьмі, Яўсей Шпітальнік з пераламанай нагой, яго вялі пад рукі, Нахім Грэнадзёр і іншыя. Нас прыгналі да затокі Бычок. Там было сапраўднае пекла...

Апынуўшыся пад мёртвымі целамі, Гутман засталася жывой. Карнікі палічылі яе нежывой. Некалькі разоў жанчына траціла прытомнасць, зноў прыходзіла ў сябе, але не ўставала. Калі карнікі пайшлі, Гінда Навумаўна выбралася з-пад трупаў, папаўзла па беразе, дабралася да лесапільнага завода. Потым здолела дайсці да хаты Верашчакова ў Петрыкаве. У агародзе праляжала ўвесь наступны дзень. Галодная, распухшая, яна прабралася ў в. Бяланавічы, а затым за Прыпяць. Праз некалькі тыдняў жанчына аказалася ў в. Макараўка Кіеўскай вобласці, дзе жыло многа палякаў. Валодаючы польскай мовай, яна выдала сябе за палячку і пад прозвішчам Сцефаніды Бяняк пражыла там да мая 1942 г. Разам з мясцовымі жыхарамі гітлераўцы вывезлі яе на работу ў Германію.

Не абышлося без помсты гэтае зверства і для карнікаў. Партызан Рыгор Крупа, які да вайны працаваў начальнікам пажарнай каманды на цагельным заводзе, у той дзень пёс у горадзе варту службу і знаходзіўся на гарышчы аднаго з дамоў. Калі да берага прыстаў катэр з баржай, ён узяў на мушку вінтоўкі паліцая. Стрэл — і той паваліўся. За ім асунуўся на палубу яшчэ адзін фашыст, у якога трапіла другая куля Крупы.

Карнікі ў адказ таксама адкрылі агонь, потым падпаўзлі да дома і кінулі некалькі гранат. Крупа злез з гарышча і, адстрэльваючыся, кінуўся ў напрамку сада школы № 1. Адчуў рэзкі боль у назе, упаў. Да параненага падбеглі паліцаі і тут жа расстралялі.

15 верасня карнікі працягвалі зверствы ў горадзе. Забівалі людзей на вуліцах, падпальвалі дамы, у якіх гінулі дарослыя і дзеці. У гэты дзень было спалена 35 хат на вуліцы III Інтэрнацыянала і 17 — каля прыстані.

Жыхары Петрыкава і раёна не скарыліся ворагу. Павел Гарошка да вайны працаваў у бытавой майстэрні, а з прыходам гітлераўцаў — дома, каб пракарміць траіх дзяцей, жонку і маці. Да яго прыносілі ў рамонт простыя бытавыя рэчы не толькі мясцовыя жыхары, але і фашысты. Яны патрабавалі яшчэ і самагон.

Гарошка, частуючы ворагаў, дабываў патрэбныя звесткі аб намерах і планах карнікаў, становішчы на франтах. Расказваў аб пачутым савецкім людзям, настройваў іх на зрыў фашысцкіх задум, заклікаў да сабатажу. Але ў ліпені 1941 г. П. С. Гарошка быў выданы правакатарам і расстраляны разам з сям'ёй.

У Петрыкаве — цэнтры гебітскамісарыята — быў асабліва жорсткі акупацыйны рэжым. Гітлераўцы прыдавалі гораду асаблівае значэнне. Блізасць чыгункі, водны шлях па Прыпяці і Дняпру адкрывалі прамы шлях на Украіну, каб вывозіць хлеб і іншае народнае дабро. Акупанты трымалі ў Петрыкаве гарнізон, у якім налічвалася больш за тысячу салдат і паліцаяў.

У будынку райкома партыі была размешчана жандармерыя, тут была турма. Свая турма мелася і ў памяшканні паліцыі. На вуліцы Валадарскага абаснавалася СД са следчым апаратам. У будынку былой аптэкі на вуліцы Андрэева звіў гняздо зондэрштаб «Р» пад шыльдай дапаможнага аддзела гебітскамісарыята. У в. Белка каля Петрыкава размясцілася армейская разведка «Абвер». На прыстані Прыпяці знаходзілася сапёрная часць, у распараджэнні якой былі дзве 46-міліметровыя гарматы і шэсць бранякатэраў для патрулявання на раце. У горадзе быў уведзены каменданцкі час. На многіх вуліцах і на ўскраінах пабудаваны доты і дзоты, з усходняга боку Петрыкава на беразе ракі віліся траншэі ў поўны рост, па якіх праходжваліся патрулі. Горад быў напоўнены фашысцкімі агентамі. Для жыхароў уведзены пропускі.

У адміністрацыйным дзяленні Петрыкаўскі, Жыткавіцкі і Тураўскі раёны Палескай вобласці ўваходзілі ў Петрыкаўскую акругу-гебіт, якія былі ў складзе Жытомірскай генеральнай акругі. Гебітскамісарам быў прызначаны генерал Рэдке, які размяшчаўся са сваім штабам у двухпавярховым памяшканні гасцініцы на вуліцы Камунальнай. Улетку 1942 г. былі выпушчаны ў абарот украінскія рэйхскарбованцы.

У падначаленні Петрыкаўскага гебітскамісарыята функцыяніраваў аддзел ландвертаў (афіцэраў — начальнікаў сельскіх раёнаў), які ўзначальваў гаўптман Коўкель. У памяшканні музычнай школы размяшчалася біржа працы, якой кіраваў лейтэнант Крайзер. Яна займалася ўлікам не толькі ўсяго дарослага насельніцтва, але і падлеткаў, якія нараўне з дарослымі выкарыстоўваліся на цяжкіх работах — капанні траншэй, узвядзенні абаронных збудаванняў, нарыхтоўцы лесу. Тут адбіралі здаровых грамадзян, у асноўным юнакоў і дзяўчат, для адпраўкі на работу ў Германію, а дзяцей ад 8 да 14 гадоў — у спецыяльныя лагеры, дзе ў іх забіралі кроў для параненых салдат. Быў пашпартны стол, начальнікам якога з'яўляўся падслепаваты на левае вока Аляксандр Галін. Гэты душагуб пашпартызаваў пры наяўнасці савецкіх пашпартоў насельніцтва горада, выдаваў «аўсвайсы». У каго не аказвалася пашпарта, накіроўваўся на катаржныя работы. На вуліцы Камунальнай размяшчаўся лясгас з вялікім службовым апаратам. Узначальваў лясгас лесапрамысловец маёр Крамер.

Нізавыя грамадзянскія органы ўлады гарадскога ўпраўлення камплектаваліся з мясцовага насельніцтва, незадаволенага савецкай уладай, розпага роду крымінальных элементаў і поўнасцю падпарадкоўваліся гебітскамісарыяту. У вёсках ствараліся паліцэйскія ўчасткі і гарнізоны, прызначаліся старасты. Паліцэйскія гарнізоны былі ў Ляскавічах, Кащэвічах, Снядзіне, Бабунічах, Смятанічах і іншых населеных пунктах. У пачатку лістапада 1941 г. петрыкаўскія паліцаі, не падзяліўшы нарабаванае дабро, у сталоўцы напіліся і ўчынілі бойку. Адзін з паліцаяў застрэліў свайго шэфа — начальніка паліцыі Рыгора Канавальчука. Пахаванне яго гітлераўцы выкарысталі для правакацыі, прыпісаўшы смерць ката камуністам і яўрэям, якім абяцана была помста. Гэта былі не проста словы. Былі схоплены і расстраляны старшыні Ляскавіцкага і Смятаніцкага сельскіх саветаў Андрэй Палтаран і Мікалай Яворскі, старшыня калгаса в. Снядзін Мікалай Туравец і іншыя мірныя жыхары.

Зіма 1941—1942 гг. выдалася снежнай і халоднай, у снежні маразы даходзілі да 35 градусаў. У горадзе не было дроў і прадуктаў харчавання, людзі пакутавалі ад холаду і голаду, асабліва яўрэйскае насельніцтва, якога ў горадзе заставалася больш за 300 чалавек. Жылі яны ў гета, маглі выходзіць на вуліцу толькі ноччу. Фашысты канфіскавалі іх жыллё, сагналі ўсіх на вуліцу Дзяржынскага і размясцілі па 15—20 чалавек у двух дзесятках хат, у многіх з якіх не было вокнаў і дзвярэй. З абодвух канцоў вуліцы — агароджа з калючага дроту, стаялі пасты з кулямётамі. На вопратцы яўрэяў напярэдзе і на спіне былі прышыты жоўтыя шасцікутныя зоркі. У шэсць гадзін раніцы людзей выганялі з хат і пад канвоем вадзілі ў лес, дзе да 8 гадзін вечара яны нарыхтоўвалі драўніну, або на расчыстку вуліц. Знясіленыя ад голаду і холаду, людзі падалі ў снег, іх бязлітасна збівалі... Прадуктаў харчавання не было ніякіх, дзеці і старыя паміралі з голаду. Хаваць нябожчыкаў-яўрэяў на могілках забаранялася. Не дазвалялі хадзіць з хаты ў хату. Адной чы стары Зайвель Пясчанскі хацеў прайсці да суседа, каб папрасіць які-небудзь харч. Вартавы заўважыў яго, прагучаў стрэл — на вачах насельнікаў гета Пясчанскі ўпаў на зямлю мёртвым. Удалося прабрацца ў свой дом на вуліцы К. Лібкнехта Бранцу, і тут ён знайшоў сваю смерць. Была забіта ў гета настаўніца Фаіна Раскіна і многія іншыя.

Днём 15 лютага 1942 г. па загаду Рэдке фашысты з мясцовымі паліцаямі ўварваліся ў гета. Яўрэі хаваліся хто дзе мог: у снезе, пад падлогай, у сене. Пашчаслівілася нямногім, выпадкі хавалі ўсіх, каго сустракалі, гучалі стралы. У той дзень загінула каля 200 чалавек. А ў красавіку ва ўрочышчы Дварэц каля в. Белка расстралялі апошніх насельнікаў гета. Усяго ў Петрыкаве за гады акупацыі загінула 770 яўрэяў.

Знішчаліся цалыя вёскі з жыхарамі — Сялюцічы, Хвойня, Нівы. Акупанты забіралі ў насельніцтва хлеб, цёплае адзенне, абкладвалі непасільнымі падаткамі. Нават уладальнікі сабак плацілі падатак. Праводзіліся натуральныя паборы. З кожнай гаспадаркі бралася 80 кілаграмаў мяса, 600 літраў малака з каровы за год, па 25—30 яек ад кожнай курыцы, па 18—20 кілаграмаў воўны, а таксама зерне і бульба. Пачалі з'яўляцца і замолнікі, звычайна здраднікі і паліцаі, якія атрымлівалі ад нямецкіх улад лепшыя надзелы зямлі.

На базе Петрыкаўскага калгаса «Чырвоны агароднік» акупанты арганізавалі абшчыну, сабралі сельскагаспадарчы інвентар, жывёлу. У абшчыне, якую імкнуліся зрабіць паказальнай, прымусовая работа была арганізавана па прынцыпу калектыўнай гаспадаркі, але вынікі былі мізэрныя. У горадзе адкрыты пункты і склады па прыёму сельскагаспадарчай прадукцыі. У царкве прымалі зерне, каля гарадскіх могілак — бульбу. Працавалі маслазавод, бойня і каўбасны цэх. Сельскае насельніцтва як магло сабаціравала здачу прадуктаў, не плаціла падаткаў.

Акупацыйны рэжым рабіўся ўсё больш жорсткім, гітлераўцы прымалі новыя захады для барацьбы з партызанамі. Каля горада на полі была пасадачная пляцоўка для самалетаў, будавалася дарога да прыстані па вуліцы Піянерскай, павялічыўся паліцэйскі гарнізон. За невыкананне загаду аб каменданцкім часе ўведзена пакаранне смерцю. У жандармерыі праводзілася рэгістрацыя камуністаў і савецкіх работнікаў. Тых, хто быў зарэгістраваны, як правіла, праз некаторы час расстрэльвалі.

Акупанты імкнуліся ўзнавіць мясцовую прамысловасць, былі пушчаны два лесапільныя заводы — стары і новы. Па рацэ Прыпяць арганізаваны сплаў драўніны. Прыкладваліся ўсе намаганні для таго, каб пусціць суднарамонтныя майстэрні, наладзіць транспарціроўку ваенных грузаў і нарабаванага дабра па Прыпяці. Дырэктарам суднарамонтных майстэрняў быў прызначаны немец з Гамбурга Гайдэман, інжынерам — Бавер. Фашысты развесілі загад за подпісам Рэдке, у якім пад пагрозай расстрэлу рабочым загадвалася выходзіць на работу. На суднаверфі ўведзена жорсткая працоўная дысцыпліна, рабочы дзень працягваўся 10 гадзін. Зарплата — 5—6 акупацыйных марак у дзень, а пуд зерня каштаваў 2 тысячы марак. За спазненне ці нявыхад на работу рабочыя лесазавода, суднаверфі, цагельнага завода падвяргаліся пакаранню, некаторыя былі адпраўлены ў Германію. На цяжкіх работах выкарыстоўваліся не толькі дарослыя, але і непаўналетнія дзеці, рабочы дзень якіх працягваўся нараўне з дарослымі. У каральскім цэху суднабудаўнічай верфі малатабойцамі працавалі малалетнія



Л. М. Чарнобылец каля гебітскамісарыята, які праз некаторы час быў ёю ўзарваны. 1942 г.

Вера Іванова, Дарафей Братка і іншыя.

Інжынер-механік лесапільных заводаў Мікалай Кацюбінскі дакладваў дырэктару завода Арэнсу, што абсталяванне для эксплуатацыі непрыгоднае. Арэнс загадаў інжынеру ехаць у Капцэвічы і агледзець на згарэўшым заводзе «Звязда» лакамабіль, знайсці спецыялістаў і даставіць яго ў горад. Кацюбінскі сустрэўся з Пятром Дзечка, які да вайны працаваў на заводзе, яны зняслі з машыны і схавалі найбольш каштоўныя дэталі. На васьмі парах валоў адцягнулі лакамабіль далей ад пасёлка, і Кацюбінскі далажыў начальству, што на заводзе яго няма. Але машыну знайшлі, Рэдке паслаў у Капцэвічы бургамістра Белакура. Лакамабіль пагрузілі на дзве вузкакалейныя платформы і даставілі ў Дарашэвічы на прыстань. Пакуль яго рыхтавалі для пагрузкі на баржу, Белакур пайшоў у адзін з дамоў распіць бутэльку самагонкі. Кіраваць пагрузкай ён пакінуў Кацюбінскага. Дзечка з Кацюбінскім паслабілі канаты ад прыпарамка, і калі прыступілі да пагрузкі, баржа адышла ад прыпарамка і лакамабіль апынуўся ў вадзе. П'яны бургамістр Белакур, прыехаўшы да месца пагрузкі, кінуўся з пісталетам да Кацюбінскага і Дзечкі. Іх арыштавалі, збілі ў жандармерыі.

Станкі на лесазаводах працавалі з перабоямі, працякалі трубы старога лакамабіля, ламаліся цыркулярныя пілы... Быў адменены абедзенны перапынак, рабочых збівалі за ўсякую правіннасць. Пацярпелі механік Васіль Бірка, рабочыя Лука Занкевіч, Сцяпан Міцкевіч, Цімафей Каленік і іншыя. І ўсё ж прадукцыі з кожным днём выпускалася ўсё менш. Фашысты вымушаны былі дадаткова стварыць каманду паліцыі для аховы заводаў і суднаверфі. Для работы прыцягвалі немцаў з сапёрнага батальёна.

...Замерлі, прыціхлі завулкі і вуліцы горада і вёсак. Жыхары стараліся менш выходзіць з дому. Амаль кожны дзень фашысты рабілі аблавы, арыштоўвалі людзей. Штодзень за горадам гучалі стрэлы, гітлераўцы расстрэльвалі мірных жыхароў. Петрыкаўчане не трывалі моўчкі здзекі, ішлі ў партызанскія атрады, арганізоўвалі падпольную барацьбу з акупантамі, рабілі ўсё магчымае, каб хутчэй развеяць чорныя хмары над краем, наблізіць радаснае свята Перамогі.

В. М. Чарнобылец

Жыццё ў няволі

...У спякотны ліпеньскі дзень 1941 г. удалечыні заклубіўся пыл. Нямецкая перадавая калона на матацыклах і веласіпедах пракацілася праз вёску, не спыняючыся, і падалася ў бок Капаткевіч. Так мы ўпершыню ўбачылі заваёўнікаў. А на другі дзень яны прыехалі як гаспадары, прызначылі старасту, аб'явілі парадак новага жыцця. Праз некалькі дзён у Старыну прыбеглі коні, на лузе ўдалечыні пасвіліся чужыя каровы. Гэта немцы, устанаўліваючы «новы парадак», спалілі суседнюю вёску Хвойню разам з людзьмі. Загінула каля 50 чалавек, жывёла разбеглася...

З гэтага часу ў вёсцы трывала пасялілася трывога і страх. Ноччу з'яўляліся незнаёмыя — акружэнцы, партызаны, днём гаспадарылі акупанты.

Бацька звязаўся з партызанамі, перадаваў вопратку і ежу, расказваў аб перамяшчэннях ворагаў. А напрадвесні знік з дому старэйшы брат Іван. Бацька гаварыў, што ён паехаў у госці да бабулі Яўгеніі ў Парэчча, але мы хутка даведаліся, што Іван падаўся ў партызаны. Маці перажывала, плакала, хадзіла ў лес шукаць той атрад, але не знайшла, вярнулася ні з чым, набіўшы ногі. Потым мы даведаліся, што Іван быў ад'ютантам у камандзіра Палескага партызанскага злучэння І. Д. Ветрава.

Вайна вайною, але трэба было жыць і карміцца, не толькі самім, але і дзяліцца з партызанамі. Аралі зямлю сяктак і сеялі збажыну, бульбу. Плошчы было даволі, толькі б сілы, каб апрацаваць, засеяць, убрать ураджай і захаваць яго, таму што ў любую хвіліну маглі наляцець, як гурганы, акупанты і забрать вырашчаны ўраджай... А сіл якраз і не было. Пакуль бацька быў дома, разам з намі, старэйшымі дочкамі, мы рабілі, што маглі, па гаспадарцы. Але яго часта выклікалі партызаны і ён хадзіў некуды з імі, часта ноччу, а то і некалькі сутак прападаў, вадзіў партызанскія групы на заданні, а толькі вернецца, стараста пасылае з возам у абоз... Так і жылі паміж двума агнямі. Маці прала і ткала палатно, шыла вопратку. Нават дзеці не заставаліся ўбаку. Аднойчы Ніна праводзіла ў Грабаў партызан. Расказвала, што ішлі туды з песнямі, а каля вёскі адбыўся вялікі бой, шмат партызан загінула, у тым ліку і іх камандзір, якога ўсе клікалі, Ніна запомніла, Васем...

Улетку мы пайшлі ў лес на ягады. Да нас падышоў незнаёмы, стомлены, у рванай вопратцы. Распытаў, адкуль мы, дзе немцы. Папрасіў, каб мы дапамаглі яму перайсці чыгунку. А як?.. У гэты час пайшоў дождж. Маці накрыла ўсіх нас, дзяцей, посцілкай, рашылася ўзяць з сабою і незнаёмага. Падыходзім да чыгункі. Вартавы наставіў зброю: «Хто, куды?» Маці тлумачыць: вось з мужам і дзецьмі хадзілі па ягады, застаў дождж і вяртаемся дахаты. Немец не верыць, не апускае зброю. Тады мама адна падышла з кошыкам да вартавога, высыпала амаль усе ягады, што мы назбіралі за дзень. Той змягчыўся, паказаў: праходзьце хутчэй...

У двары Кашэвіцкай царквы пакутавалі нашы палонныя салдаты. Жанчыны падыходзілі да агароджы, кідалі ім хлеб і бульбу. Немцы не перашкаджалі, таму што яны не кармілі палонных. Іншы раз дазвалялі жанчынам зайсці ў двор царквы. Маці першы раз зайшла туды, убачыла вельмі знямоглага чалавека, расплакалася і пачала тлумачыць немцам, што гэта яе муж, прасіць, каб адпусцілі яго... І тыя згадзіліся. Так маці яшчэ двойчы выратоўвала людзей, рабілі тое ж і іншыя жанчыны.

Неспакойна і трывожна было ў вёсцы. Немцы з кожным днём усё больш лютавалі. Не лепшым чынам паводзілі сябе і партызаны. Аднойчы нехта з вяскоўцаў сказаў ім, быццам Мітрафан, наш сусед, прыслугоўвае немцам. Партызаны — ці яны толькі так называліся, доўга не разбіраючыся, схапілі хлопца, як той ні прасіўся, вывелі на ўскраіну і расстралялі... У партызанах у гэты час знаходзіліся славакі, якія перайшлі на наш бок. Гэта былі добрыя, вясёлыя хлопцы. Тры чалавекі іх жылі неяк у нашай хаце. Ужо ўбралі збажыну і капалі раней часу бульбу, спяшаліся. З лесу прыйшлі партызаны па сваіх справах да нашых «кватарантаў» і між іншым сказалі бацьку: «Не варта і табе з сям'ёю заставацца ў вёсцы, прыйдуць немцы, яны не даруюць дружбу з намі»...

Бацька запрог каня, пагрузілі сякітакі скарб, прывязалі карову да воза і падаліся ў лес, да партызан... Спыніліся за Арэсай, у гушчары, зрабілі будан з галін. На агні варылі ежу — парылі жыта, мёрзлую бульбу, спалі на

сене ў будане. Так і жылі... Больш за ўсё баяліся аблавы немцаў. Тады хаваліся ў гушчары, ворагі іншы раз праходзілі так блізка, што мы чулі размову і бачылі іх праз лісце хмызняку. Частымі гасцямі ў нашым будане былі партызаны. Маці частавала іх, чым магла, латала вопратку. Оля і Ніна вязалі рукавіцы з парашутнага шоўку, хадзілі ў вёску, малолі муку, з якой пяклі хлеб для партызан.

Да Івана ў злучэнні І. Д. Ветрава дайшлі чуткі, што сям'ю — усіх нас — расстралялі. Адпрасіўся ў камандзіра, прыбег... Выпадкова натрапіў на наш будан, увайшоў, чыркнуў запалку — мы ўсе пераналохаліся, думалі, немцы. Радаснай была сустрэча... Але Іван папярэдзіў: заразз жа збірайцеся і ўцякайце адсюль, заўтра немцы пачынаюць карную экспедыцыю. Падаліся мы за раку, на Чорнае балота. Гэта была сапраўдная багна, толькі ў адным месцы зроблена грэбля, і мы спадзяваліся, што немцы сюды не дабяруцца. І сапраўды, два месяцы пражылі спакойна. Але напрадвесні, на Вербную нядзелю, карнікі акружылі балота, ля граблі з'явіліся танкі. І вось гітлераўцы каля нашага будана. Адзін з карнікаў нагой перакуліў закопчаны чыгунок, у якім варыўся крупнік. Абстралялі будан, мы ў гэты час ляжалі на зямлі, кулі нікога не зачапілі. Заглянулі ў будан — дзеці, бачаць, ды маці старая. «Дзе партызаны?» «Не ведаем, даўно іх не бачылі». Пагналі нас у Слабаду, зачынілі разам з іншымі людзьмі ў хаце — яблыку няма дзе ўпасці. Прасядзелі так у цеснаце, каля печы і пад ёю, усю ноч. Думалі — тут нам і канец будзе. Але раніцай выгналі ўсіх і пачалі сартаваць: мужчын у адзін бок, дзяўчат і маладых жанчын — у другі, старых — асобна, сюды ж кідалі, сілаю аддзіраючы ад жанчын, дзяцей. Мужчын пагрузілі ў машыну і павезлі некуды, дзяўчат і жанчын — на другую машыну. Туды трапілі і Оля з Пінай. Крыкі і плач стаялі над вёскай. Карнікі не звярталі на гэта ніякай увагі.

Усе думалі, што тых, хто застаўся, расстраляюць ці спаляць жывымі, як гэта было ў іншых вёсках. Але нас накіравалі ў Ляскавічы, запіхнулі за калючы дрот, што быў нацягнуты вакол царквы. Там ужо знаходзіліся сотні людзей, многія з якіх былі падобны на здані. Пятро прасіць: «Піць». Маці падышла да вартавога, папрасіла пайсці па ваду. Немец паказвае: ідзі, але адна, без дзіцяці. Пятро ўчапіўся за спадніцу, не пускае. Вартавы схапіў штык і накіраваў яго ў жывот дзіцяці. Маці разам з Пятром кінуліся назад у натоўп людзей, так і не набраўшы вады. Людзі паспачувалі, далі хлопчыку вады, усе гаварылі — добра, што нагул жывымі засталіся... Маці доўга плакала, не магла супакоіцца. Так прайшла ноч у царкве. Раніцай адчыніліся вароты, людзей пачалі зноў дзяліць — маладых і старых з малымі паасобку. На гэты раз адбіралі ўсіх хлопчыкаў гадоў 6—7. Забралі і сямігадовага суседскага хлопчыка Славу. Мы не ведалі, што дзяцей адбіраюць, каб браць з іх кроў, але разумелі, што іх чакае нешта страшнае. Як выратаваць Славу? Маці скінула з сябе адну спадніцу, зняла хустку і сказала мне: прабярыся непрыкметна да групы хлопчыкаў, хай Слава пераапранецца, быццам ён дзяўчынка, і бяжыце сюды. Так і зрабілі, пабег Славы з групы асуджаных на смерць дзяцей удаўся.

Нас пагналі да калгасных будынкаў, першую частку людзей запіхнулі ў хлеў. Мы не трапілі ў тую групу. «Усё, — падумалася, — тут нас і спаляць жывымі»... Ужо і дым з'явіўся, будынак загарэўся. У ім у страшэнных пакутах загінулі тыя, каму лёсам было наканавана трапіць у пачатак калоны. А нас адпусцілі... Можа, выратавала ікона «Непалімая купіна», якую маці несла з сабою і ўвесь час малілася за выратаванне?.. Гэтая ікона адна засталася ў нас з усяго даваеннага нажытку.

Наступіў Вялікдзень. На ўсю вёску пафарбавалі адно яйка і раздавалі па

маленькаму кавалачку. А ў лесе працягвалася карная экспедыцыя. Здалёку былі бачны клубы дыму над Чорным балотам. Партызаны вялі бой, недзе там і наш Іван...

Пятро захварэў на тыф. Маці ўзяла яго на плечы, і ўсе мы накіраваліся ў в. Харомцы. Там жыў брат маці, дзядзька Валодзя. Мы ішлі і баяліся — раптам яго няма, вакол жа лютавалі карнікі... Але калі пастукалі ў акно, нам адчыніла цётка Аляксандра, выглянуў і дзядзька Валодзя. Як мы ўзрадаваліся, і цётка з дзядзькам былі рады, што мы жывыя... Маці, Пятро і я засталіся ў іх жыць, але хутка захварэла тыфам і я. У маці сэрца аблівалася крывёю. Мы абодва хворыя, ледзь жывыя. А дзе Оля з Нінай, дзе бацька з Іванам?..

А хутка немцы выгналі ўсіх людзей з хат і падпалілі вёску. Засталіся цэлымі лічаныя будынкі і царква. У ёй гітлераўцы зрабілі шпіталь. Некалькі вясковых жанчын працавалі ў ім, прыносілі цётцы і маці лекі, бінты. Мы пакрыху папраўляліся.

Неяк пад вечар немцы вывелі на двор жанчыну, бежанку са Смаленска, яе звалі Фрося, разам з дзіцём на руках, прыгатавалі зброю... Маці кінулася да іх: не страляйце! Тады немец адпусціў Фросю, замест яе паставіў маці. Я падбегла і ўчапілася за аўтамат, адводзячы яго ўбок. Маці крычыць: «Уцякай, Аня, і цябе паставяць да мяне!» А я трымаюся за зброю, якая ў любы момант можа пачаць выкідваць смерць. Немец ударыў са злосцю маці прыкладам, павярнуўся і пайшоў. Так блізка прайшла ад нас смерць!.. Пухліна ад удару не прайшла ў маці да самага яе скону.

Неўзабаве пасля гэтага, вясной 1944 г., нас знайшоў бацька. Паведаміў, што захварэў Іван. Забраць нас да сябе ў партызаны ён не мог, прасіў здабыць палатна для перавязкі параненых, лепш бінтоў з нямецкага шпіталю. Ён пайшоў назад у атрад, і больш бацьку мы не бачылі.

Прайшло шмат часу, калі мы даведаліся, што здарылася з бацькам. На ляснoй дарозе ён сустрэў немцаў. Бацька растлумачыў, што вязе ў мяшку насенне для сяўбы, якое раздабыў у суседняй вёсцы. Тыя паверылі, адпусцілі. Але нехта падказаў ім, што адпусцілі дарма, гэта партызан... Немцы вярнуліся, схапілі мех з медыкаментамі і ўспаролі яго. Знайшлі партызанскі пропуск, тытунь... Пачалі біць, прывязалі да воза і пацягнулі да вёскі. Потым некуды адправілі, людзі гаварылі, што бачылі яго перад вызваленнем у лагеры ў Бабруйску. Невядома, дзе ён загінуў...

Чырвоная Армія была ўжо блізка, чутны гарматныя стрэлы, ноччу на ўсходзе відны зарыва і водбліскі бою. Змучаныя гадамі няволі, людзі з дня на дзень чакалі вызвалення. У адзін з летніх дзён фашысты пагналі ўсіх нас, жанчын, старых, дзяцей, у поле. Спачатку мы не зразумелі, у чым справа, але калі тут і там пачалі рвацца міны, на іх узляталі ў паветра целы, здагадаліся, што пагналі нас на міннае поле, каб абяскшкодзіць яго. Лёс быў міласцівым для нас і на гэты раз. У другім баку ў гэты час узнялася страляніна, мы ўбачылі салдат — сваіх, родных, доўгачаканых... Гітлераўцы, якія хацелі прарвацца праз міннае поле, кінуліся ў другі бок, у Бунеўскае балота, многія знайшлі ў ім свой бясслаўны канец.

Прыйшло, нарэшце, вызваленне. Людзі абдымалі, цалавалі сваіх збавіцеляў, маці плакала — ад радасці і адначасовага гора. Пра лёс бацькі і старэйшых дзяцей на-ранейшаму пічога не было вядома. Мы тады атрымалі ад салдат найсалодзейшы гасцінец — па драбку цукру, смак якога даўно забылі.

Стала вядома, што вызвалена і Старына. Мы забралі свой сціплы скарб і пайшлі дамоў. Пераначавалі ў Парэччы. Ваду даводзілася браць з рэчкі, калодзежы былі забіты людскімі целамі. Тут нас сфатаграфаваў карэспандэнт каля спаленай хаты, ад якой доўгім пальцам тырчаў у неба толькі комін.

Маці адмаўлялася — у парванай вопратцы, брудныя, але карэспандэнт настойваў: так і трэба, партызанская сям'я вяртаецца да роднага папялішча...

Да гэтага часу памятаю тую дарогу: усюды сляды пядаўняга бою, зранены, пасечаны снарадамі лес, разбомблены мост праз рэчку, прабіраюцца вымушаны былі па палях. Трупы людзей і забітых коней навокал...

Дабраліся, нарэшце, да вёскі. Хата наша згарэла, адзін калодзеж застаўся насярэдзіне двара. Дзе жыць?.. Не ўсе хаты ў вёсцы былі знішчаны, людзей уцалела вельмі мала, былі і пустыя будынкі. Мы пасяліліся ў адным з іх, дзе былі голыя сцены, напалову гнілая падлога, але, галоўнае, быў дах над галавой. Праз некаторы час нашаткала вялікая радасць — вярнуліся з палону Оля з Нінай. Ім удалося збегчы з прымусовых работ, услед стралялі, вопратку некалькі разоў прашывалі кулі, але, на шчасце, дзяўчаты засталіся жывымі.

Прыйшоў дамоў і Іван, узнагароджаны некалькімі баявымі медалямі. У армію яго не ўзялі, пасля нядаўна перанесенага тыфу ён быў вельмі слабы, ледзь хадзіў. Худы, страшэнны, у парванай вопратцы, на якой блішчаць медалі...

Выпадкова знайшлі ў сховішчы закапаную мінулай восенню бульбу. Маці парэзала яе на маленькія скрылікі, па адным вочку на кожным, мы ўсе ўпраліся ў плуг, пасадзілі бульбу. Ужо была надзея не памерці з голаду ў будучую зіму. Праз некаторы час Івана прызначылі старшынёй калгаса. На ўсю гаспадарку быў адзін хворы конь, але і ён хутка здох. Уся цяглавая сіла — жанчыны і дзеці. І зноў вярнуўся тыф. Я захварэла, а таксама Пятро, галоўнае, злегла маці. Ляжым усе ў чужой хаце, на саломе, нават накрыцца няма чым. Оля, Ніна і Іван увесь час на калгаснай рабоце. Прыбягуць, дадуць вады, лыжку-другую заціркі, і зноў у поле. Аднойчы прыехалі з Капаткевіч санітары. Суседзі, якія баяліся заходзіць у хату, каб не заразіцца, сказалі ім, што там ляжаць хворыя жанчыны, напэўна, ужо нежывыя, толькі хлопчык, здаецца, варушыцца яшчэ. Як нас выносілі, ні я, ні маці не памяталі. А потым захварэлі і Оля з Нінай, а там і Іван... Яго забралі ў шпіталь у Бабруйск, і маці, сама пасля нядаўняй хваробы, пешшу хадзіла туды, каб праведаць сына. Вярнулася знямоглая, з апухшымі нагамі, не ела, увесь час толькі піла ваду.

А тут новая бяда: высяляюць з хаты, хоць яна і не наша, чужая — у ёй будзе дзіцячы дом. Пусціла жыць да сябе суседка, удава, якая засталася адна з дачкой. Оля пасхала вучыцца ў школу ФЗН у Пінск. Ніна падалася разам з ёю ў Заходнюю Беларусь на заробкі. На адным з хутароў знайшлі работу ў гаспадара, у якога жонка была гультайка, — жаць жыта. Гаспадар не верыў, што гэтыя слабыя дзяўчынкі могуць жаць, але яны так завіхаліся, што з другіх хутароў прыходзілі паглядзець... Зарабілі жыта, Ніна вярнулася дамоў, запрагла карову і прывезла яго ў Старыну. У калгасе ў той год нічога не далі на працадні, а мы змаглі восенню пасеяць азімую збажыну...

Г. Р. Вільчанка

Была вёска...

Доўгія Нівы — звычайная палеская вёска сярод лясоў і палёў. У ёй налічвалася 36 двароў, насельніцтва — звыш 100 чалавек. Была ў вёсцы пачатковая школа, вясковая крама. У 1928 г. сяляне арганізавалі калгас «Доўгія Нівы» — адзін з першых у Капаткевіцкім раёне. Звычайная вёска, звычайныя людзі са сваімі радасцямі, горам, марамі і спадзяваннямі...

Бяда прыйшла 29 сакавіка 1942 г. Тады асабліва лютавалі ў раёне карныя атрады. За тое, што жыхары Доўгіх Ніў аказвалі дапамогу партызанам, што многія жыхары вёскі знаходзіліся ў партызанскіх атрадах, што тут у пачатку 1942 г. знаходзіўся штаб атрада А. Міхайлоўскага, за тое, што славя-

не, што жывуць, што дыхаюць... Светлым вясенніім днём карнікі датла спалілі вёску разам з жыхарамі. У той дзень палала шматнаселеная суседняя Хвойня і іншыя вёскі, якія ў пасляваенныя гады змаглі ўзняцца з папялішча намаганнямі некалькіх дзесяткаў уцалелых жыхароў.

А лёс Доўгіх Ніў быў трагічным — параслі хмызняком і лесам грады, папялішчы, вуліца... Вёска знікла з твару зямлі, як легендарная Хатынь. Толькі, у адрозненне ад Хатыні, Доўгія Нівы засталіся забытымі, і нават не ўсе прозвішчы тых больш як 60 пакутнікаў, прах якіх пакоіцца ў Хвойні, удалося ўстанавіць...

А. В. Бічан

Нельга забыць...

Доўгія, трывожныя дні фашысцкай акупацыі. З суседняга Канаткевіцкага раёна даходзілі чуткі аб дзеяннях партызан. Летам 1942 г. за сувязь з імі былі арыштаваны жыхары в. Таргашын Апанас Руцкі і яго сын Мікалай. Неўзабаве схапілі і павезлі ў Петрыкаў яго брата Яўгена. У Лобчы ў час пераправы праз Прыпяць ён кінуўся з парома ў раку і ўцёк. Апанаса Пятровіча Руцкага расстралялі, а Мікалая адпусцілі. У пачатку 1943 г. ён стаў партызанам атрада Бабіча.

Восенню яшчэ большая трывога і неспакой авалодалі жыхарамі сяла. Страшныя чуткі ішлі аб вёсках Людзвіпоў, Беразнякі, Сялюцічы, якія фашысты спалілі разам з людзьмі. Жыхарам Снядзіна зімой у 1943 г. некалькі разоў давялося ўцякаць з сем'ямі ў лясы.

Летам 1942 г. жыхар Снядзіна Андрэй Хамлюк сустракаўся з партызанамі і згадзіўся стаць іх сувязным. Праз некаторы час немцы і паліцаі прыбылі ў Снядзін, каб расправіцца з ім — ворагам стала вядома пра дзейнасць патрыёта. Андрэй Максімавіч працаваў у гэты час у полі. Устрывожаны шумам у сяле, схаваў каня і накіраваўся дадому. Яго спыніў паліцай і спытаў прозвішча. Андрэй Максімавіч назваўся чужым імем. Паліцай запытаўся, дзе знайсці Андрэя Хамлюка. Той згадзіўся «паказаць» і пры зручным выпадку ўцёк...

На наступны дзень Канстанцін Хамлюк, яго браты Яўхім, Васіль, Піліп, Андрэй, а таксама Яўхім Масла з сынам Мікалаем, Міхаіл Цімашэня разам з сем'ямі накіраваліся ў партызанскі атрад Дамброўскага, потым вярнуліся ў свае мясціны і былі прыняты ў атрад Трухановіча 130-й Петрыкаўскай брыгады.

Праз некаторы час другая група ў складзе 12 чалавек пад старшынствам Аляксея Руцкага накіравалася да ўкраінскіх партызан генерала Фёдарава. Снядзін стаў зыходнай кропкай партызанскага краю, адкуль партызаны адпраўляліся на баявыя заданні. Немцы не пакідалі вёску ў спакоі, падыходзілі на бранякатэрах па рацэ і абстрэльвалі. У час такога абстрэлу разграмілі і спалілі Снядзінскую царкву, некалькі іншых будынкаў. Людзі пакідалі хаты і ратаваліся ў лесе. У небе ляталі нямецкія самалёты.

Ноччу 30 чэрвеня я начаваў дома. На змяркапні выйшаў на вуліцу. Насустрач ішлі двое партызан. Адзін з іх, Мікалай Масла, загадаў мне неадкладна ісці ў лес і сказаць усім, каго пабачу, каб ніхто заўтра не прыходзіў у вёску, бо немцы збіраюцца спаліць яе разам з людзьмі. Мы ў той час жылі на востраве на балоце Гала, кіламетры два ад вёскі. Паведамленню аб заўтрашняй расправе ніхто не паверыў, усе жылі надзеяй вярпуцца ў свае хаты.

Назаўтра я прачнуўся зацемна. Птушкі, вітаючы світанак, поўнілі лес галасамі. Раптам неба разарвалі мінамётныя выбухі, аўтаматная і кулямётная страляніна. Людзі мігам усхапіліся і накіраваліся ўглыб лесу. Зусім побач, з паўночнага боку, узнялася страляніна. Я падаўся ў балота. Там сустрэў бабку Мікалаіху. Яна галасіла: «Ой, унучак, я бачыла страшны суд. Немцы

забівалі і палілі людзей. Што яны, праклятыя людаеды, нарабілі...» Калі бабуля крыху супакоілася, я спытаў: «Што гэта так моцна гуло ў тым баку?» «Гэта, унучак, шумеў пажар, усё сяло згарэла... Я ўратавалася ў пограбе...»

На другі дзень снядзінцы хавалі ахвяр тэрору. Іх было многа. Апускалі забітых і спаленых, абвугленых людзей у ямы, закручваючы ў посцілкі. У садзе, раскінуўшы рукі, ляжаў Сцяпан Каржаноўскі, непадалёку ад яго васемнаццацігадовая суседская дзяўчына Валянціна Занкевіч. У пограбе знайшлі сям'ю Пятра Руцкага — яго жонку Надзею Пятроўну, сына Аліка. Паліцай гаварыў немцу: «Там яшчэ людзі ёсць, давай паглядзім у засеку». Схаваўшыся за бочкай, у пограбе сапраўды сядзеў Уладзімір Дамасевіч, але немец загадаў ісці далей. Забілі маці чатырох маленькіх дзяцей Лідзію Дамасевіч. Спалілі жывым дзеда Алеся — Аляксандра Навака, застрэлілі яго суседку Марту Ястрэмскую з пяцігадовым унучкам Валодзем. У лесе злавілі Пятра Траяноўскага, яго жонку Арыну Рыгораўну, суседку Арыну Траяноўскую і пятнаццацігадовага Косціка Дамасевіча, прывялі ў вёску і тут расстралялі. Забілі нават старэйшую жыхарку Снядзіна 105-гадовую Аксенню Траяноўскую.

Адначасова са Снядзінам фашысты знішчылі Белін і Мардзвіп. Белінцы хаваліся ў зарасніках лазы непадалёку ад вёскі. Сяргей Ладзінскі чуў, як фашысты катавалі яго дзядзьку, Івана Фёдаравіча Ладзінскага, кідалі ў агонь, ён выскакваў, крычаў. Фашысты смяяліся. На другой вуліцы Беліна чынілі зверскую расправу над сям'ёй Адама Корзуна. Фашысты расстралялі яго маці, старэйшую сястру Марфу з чатырма дзецьмі, 24-гадовую сястру Маню і пятнаццацігадовую Ніну. Былі забіты Рэма Гудульская з маленькай дачкой, Ганна Масла з дачкой і многія іншыя. З сям'і Корзунаў уратаваліся толькі васемнаццацігадовы Уладзімір, які быў у партызанскім атрадзе Мельніка на Украіне, і трынаццацігадовы Коля, якому пашанцавала ўцячы ў лес і схавацца.

Нечалавечай лютасцю і звярствам вызначыліся фашысты ў Мардзвіне. Пра тую страшную трагедыю расказвае Капырына Мікалаеўна Пінчук. «З грудным сынам і свякрухай мы былі дома. На досвітку я выйшла на ганак. Над Снядзінам стаяла зарыва. Я сказала свякрусе: здаецца, гарыць Снядзін. Мы хацелі бегчы ў лес, але адкуль не вазьміся з'явіўся немец, пагнаў нас на вуліцу. Там стаяла запражаная павозка. Якаў Кліменка хацеў схаць з сям'ёю ў лес, але не паспеў. Нас пасадзілі на воз, дзе сядзелі жонка Якава і іх двое маленькіх дзяцей. Лавілі ўсіх мардзвінцаў, малых саджалі на воз, астатніх гналі пешшу. Я сядзела з немаўляткам на руках, з вачэй цяклі слёзы. Раптам адзін з немцаў загадаў мне злезці з воза. Я падумала, што мяне першую расстраляюць, перадала дзіця свякрусе. Немец штурхнуў мяне за плот і загадаў свякрусе адпаць дзіця. Яна паімкнулася сама пералезці праз плот, але немец піхнуў яе зноў на воз. Я схавалася ў просе і сядзела там да позняга вечара, баялася галаву ўзняць...»

Людзей спынілі ў цэнтры вёскі каля калодзежа. Пачалі кідаць у яго і маленькіх, і дарослых. Падняўся страшэнны крык, па тых, хто спрабаваў уцякаць, стралялі. Якаў Кліменка супраціўляўся, чапляўся рукамі за сценкі калодзежа, фашысты прыкладамі перабілі яму рукі, пакуль небарака не ўпаў у ваду. Дачцэ Якава Кліменкі, Еве, нейкім цудам пашчасціла схавацца і ўратавацца. Там, ля калодзежа, забілі і свякруху Капырыны Пінчук. Ва ўрочышчы Кульцёб фашысты захапілі некалькі сямей — больш дваццаці чалавек, паставілі іх на калені і пачалі расстрэльваць. Удалося ўратавацца толькі адной дзяўчынцы, Еве Буракевіч, яна апынулася пад кучай забітых людзей. Куды 6 ні беглі людзі, усюды іх сустракалі карнікі або даганялі кулі. Толькі адзін немец не чапаў і напраўляў іх да Прыпяці, дзе праход быў свабодны. Тады ў Мардзвіне расстралялі дзевяноста чалавек, у Снядзіне больш чым пяцьдзесят...

Тыя, хто ўцалеў пасля страшнага пабоішча, жылі ў лесе. Партызаны ўстаноўлівалі пасты ў месцах магчымага з'яўлення немцаў. Будавалі зямлянкі, цёплыя курані, а некаторыя і невялікія хаткі. Узнікалі цэлыя лясныя пасёлкі — Жырынкі, Любянец, Мокрае, Сялецкае, Казёл, Магільск, Баркі, Лясны Луг. На Барках жылі сяляне з вёскі Славінск.

У сярэдзіне лістапада пачалі з'яўляцца адступаючыя мадзьярскія часці. Партызаны атрадаў Трухановіча, Дубіка і тураўскага атрада Прасолава сустрэлі мадзьяр у снядзінскіх лясах. З'явіліся і немцы. Над лясамі гулі самалёты. Наступілі вельмі цяжкія дні. Увесь ураджай, які з такой цяжкасцю ўдалося сабраць, аказаўся ў ворага. Надзея была толькі на бульбу, па якую хадзілі ноччу, абыходзячы шматлікія нямецкія заставы. Фашысты зрабілі налёт на пасёлак Казёл і захапілі большую частку людзей. Потым тое ж здарылася ў белінскім лесе. Заміравалілясны пасёлак Сялецкае, там падарваліся Ганна Масла і Піліп Марцынкевіч, быў пакалечаны Пятро Масла.

З пачатку 1944 г. немцы часта прачэсвалі лясы. Мы начавалі ля вогнішча ў лесе, на дзень ішлі ў балота. Кароў трымалі ў самых непраходных пушчах. Трывога людзей перадавалася і жывёле: ні адна, якой бы галоднай ні была, нават не падасць голасу, а калі прыходзілася ўцякаць, каровы беглі наперадзе людзей...

У час аднаго з налётаў карнікі забілі Засіму Хальчэню, астатнія, дарослыя і дзеці, паспелі схавацца ў балоце. Карпікі ні на дзень не спынялі вайну з мірнымі жыхарамі, паляванне на людзей...

19 студзеня 1944 г. наш лясны лагер правёў ноч на востраве Зарэцкі. Раптам з боку ўрочышча Ясовае пачуліся стрэлы, адтуль беглі людзі з крыкамі: «Немцы!» Лагер мігам падхапіўся, мы кінуліся ўглыб балота. Мокры снег, халодны дождж, усе прамоклі, замерзлі, а касцёр раскласці нельга, дым выдасць.

Доўга сядзелі ў балоце. Трываць больш было нельга, рашылі выйсці. Было ціха, стрэлаў не чуваць. Не прайшлі і паўкіламетра, як наперадзе паказалася група партызан. Спыталі нас пра немцаў. Мы нічога не ведалі, партызаны пабеглі далей. Хутка ў тым баку пачаўся бой, кароткі і жорсткі. Тады загінулі Уладзімір Занкевіч і самы малады партызан са Снядзіна 16-гадовы Рыгор Занкевіч.

На тым небяспечным і цяжкім шляху нямала загінула землякоў – мірных жыхароў. Неяк ноччу наляцелі немцы, забілі дзяўчат у в. Таргашын – Наталлю і Валянціну Дарынскіх, Ніну Дубчэўскую. Загінула ў агні і маленькае дзіця Івана Ястрэмскага...

В. К. Навак

МУЖНАСЦЬ

...Сярэдзіна ліпеня сорак першага года. Трывога адчуваецца ўсюды... Людзі насцярожаныя, прыціхлыя, асабліва калі з'яўляецца незнаёмы чалавек. Вечарамі, сабраўшыся групкамі, шапіху гамоняць і пільна ўслухоўваюцца ў выбухі, што даносяцца ад Пцічы: там, каля Хвойні, як расказваюць бежанцы, ідуць баі.

Ужо некалькі разоў над Петрыкавам праляталі самалёты з чорнымі крыжамі. Праўда, пакуль не бамбілі, але нагнаялі страху аднастайным гулам. З трывогай углядалася ў неба, дзе кружылі чужыя самалёты, і Ліда Чарнобылец.

А праз два дні ў Петрыкаў уступілі нямецкія часці...

Захопнікі, заняўшы Петрыкаў, размяшчаліся як дома. З'явіліся ваенныя і грамадскія ведамствы і ўстановы. Аднекуль прыехаў лесапрамысловец обер-маёр Крамер, які арганізаваў работу суднаверфі, пусціў два лесапільныя камбінаты. У былой гасцініцы размясціўся гебітскамісарыят. Часта можна было бачыць, як адтуль выходзіў тоўсты гітлераўец у форме генерала. Гэта быў гебітскамісар Радке — начальнік Петрыкаўскай акругі.

...Беглі дні, падобныя і не падобныя адзін на адзін. Аднойчы ў сакавіку 1942 г. у двор да Чарнобыльцаў заехала падвода. На возе, на мяшку з бульбай, сядзеў пажылы мужчына ў паношаным кажушку і шапцы-аблавушцы. Доўгая густая барада спускалася на грудзі, толькі вочы іскрыліся молада і хітравата.

— А божа ж мой! — першай усклікнула Дар'я. Але мужчына прыклаў да рота палец, і яна змоўкла. І толькі ў хаце дала волю сваім пачуццям.— Фама, ты адкуль, якім чынам?! — абдымаючы мужа, пыталася яна.







Ф. В. Кляўцоў

Л. М. Чарнобылец (Данцова)

В. М. Чарнобылец

— Усяму свой час, Дар'я,— ціха адказаў ён.

Не мог ён, былы чэкіст Фама Кляўцоў, вось так проста і адразу сказаць нават жонцы, адкуль і па якой справе з'явіўся тут, у Петрыкаве. Ён прабіваўся з Беластока, удзельнічаў у абароне Магілёва, а потым трапіў, як і іншыя акружэнцы, у партызанскі атрад. Зараз яго цікавіла, што робіцца ў Петрыкаве, якія намеры фашыстаў.

Сувязь з Петрыкавам была неабходна партызанам. Аб гэтым ішла размова і ў камісара 135-га партызанскага атрада Івана Дубіка. Тады і прапанаваў свой план Фама Кляўцоў. Родам ён быў з вёскі Сотнічы, дзе і цяпер жылі яго бацькі. Немалаважна было і тое, што старастам у Сотнічах быў свой чалавек, які мог забяспечыць неабходнымі дакументамі для паездкі ў горад.

— Заданне адказнае,— гаварыў на развітанне камісар,— і, сам ведаеш, небяспечнае. Таму будзь асцярожны.

Даведаўшыся, што Васіль часта бавіць час з шафёрамі лесапрамыслоўца, Кляўцоў зазначыў:

— Добра было б, Васіль, каб ты яшчэ больш пасябраваў з імі, заваяваў іх давер.

У знак згоды той кіўнуў галавой.

— Добра, пастараюся.

Калі, здавалася, усё было перагаворана, Фама Васільевіч адвёў Ліду ўбок, пасадзіў насупраць сябе і сказаў:

— Табе, Ліда, асобае заданне: паспрабуй уладкавацца на работу ў гебітскамісарыят.

— Што вы, Фама Васільевіч, як жа можна? — вырвалася ў дзяўчыны.

— Не толькі можна, а і патрэбна,— сказаў Кляўцоў.— Расцэньвай гэта, як адказнае даручэнне...

Гэтак жа нечакана, як і з'явіўся, Кляўцоў пачаў збірацца ў дарогу.

... Аднаго разу, вяртаючыся з работы, Ліда прачытала аб'яву, што ў гебітскамісарыят патрабуюцца прыбіральшчыцы. А праз некалькі дзён разам з Верай Шпак і Палінай Карасёвай яна ўжо завіхалася ў кабінетах і калідорах былой гасцініцы. Працавала так, як вучыў Кляўцоў. Старанасць яе і працавітасць хутка заўважылі акупанты. Лідзе даручылі прыбіраць у кабінеце гебітскамісара генерала Рэдке.

Лейтэнант Гільзе дакладваў шэфу жандармерыі обер-лейтэнанту Карлу Беттэ:

— Зноў лістоўкі,— і ён паклаў перад шэфам паперкі.— Расклеены былі на рынку, а вось гэта вісела на гебітскамісарыяце.

— Глядзі ты, якая дасведчанасць аб падзеях на фронце... Дарэчы, вы праверылі, ці выкананы загад аб тым, каб усе радыёпрыёмнікі, якія маюцца ў насельніцтва, былі здадзены?

— Так точна!

— І ўсё ж сувязь з Масквой у іх існуе. Як спыніць яе — над гэтым зараз трэба думаць...

Падпольшчыкі сапраўды слухалі Маскву. Аднойчы Ліда Чарнобылец паведаміла сваім сябрам, што ў адной з баковак гебітскамісарыята ляжаць зваленыя ў кучу радыёпрыёмнікі, адабраныя ў насельніцтва.

— Вось бы нам хоць адзін! — усклікнуў Уладзічанскі.— Слухалі б паведамленні з Масквы, запісвалі б іх і распаўсюджвалі...

Ліда расказала пра свой план. Кожны, хто працаваў у гебітскамісарыяце, атрымліваў так званы месячны паёк — шаснаццаць кілаграмаў мукі. А што, калі ў мяшок з мукой непрыкметна пакласці радыёпрыёмнік? Немцы-вартавыя ў дзень выдачы пайка звычайна не правяралі пакункі супрацоўнікаў гебітскамісарыята. Так і вырашылі зрабіць. Дамовіліся, што ў гэты дзень да камісарыята пад'едзе на машыне Грабяненка. Ён як механік гаража карыстаўся ў немцаў даверам.

У вызначаны дзень і час Ліда выйшла на вуліцу са сваім пакункам. Яна ўсміхнулася немцу-вартавому, што стаяў ля ўвахода. У гэты час побач спыніўся аўтамабіль, за рулём якога сядзеў Грабяненка.

— Сядай, падвязу дахаты! — расчыніўшы дзверцы, запрасіў ён Ліду.

Тая махнула рукой вартавому, машына рванула з месца.

Прыёмнік «РПК-9» аказаўся старым, трохлямпавым, але пад умелымі рукамі Грабяненкі ажыў. Знайшлі і месца, дзе яго ўстанавіць. Яшчэ да вайны каля Уваскрасенскай царквы, непадалёку ад гаража, быў прабіты артэзіянскі калодзеж. Вада па трубе падымалася да купала, дзе была ўстаноўлена вялізная бочка. Там і ўстанавілі прыёмнік, каб слухаць Маскву. А назаўтра лістоўкі-паведамленні аб апошніх падзеях на фронце можна было прачытаць на тэлефонных слупах, на платах, а то і на сценах памяшкання гебітскамісарыята.

Нябачнымі для ворага ніцямі былі звязаны падпольшчыкі з партызанамі, у асноўным праз сувязных, адным з якіх быў Васіль Чарнобылец. Яму, амаль хлопчыку, лягчэй было пакінуць горад, дабрацца да вёскі Сотнічы, дзе жыў васьмідзесяцігадовы бацька Кляўцова, і перадаць усё неабходнае. Часта за патрэбнымі звесткамі даводзілася звяртацца да самога старасты па прозвішчы Канёк. Наведваўся час ад часу ў Петрыкаў і Фама Васільевіч. Дом нумар тры па вуліцы Гогаля стаў пастаяннай яшчэ кватэрай.

Неяк жнівеньскай раніцай 1942 г. Сцяпан Грабяненка забег на кватэру да Чарнобыльцаў, адвёў Васіля ўбок і сказаў:

— Нам загадалі рыхтаваць назаўтра машыны. Ад шафёра гебітскамісара Навадскага я даведаўся, што рыхтуецца карная экспедыцыя ў Шастовічы. Карнікі збіраюцца з коранем вынішчыць партызанскае гняздо. Твая задача — неадкладна паведаміць аб гэтым каму трэба.

— Будзе зроблена,— запэўніў юнак.

Назаўтра каля вёскі Глінішча, на паўдарозе да Шастовіч, карнікі былі спынены агнём.

Не паспелі фашысты апамятацца ад гэтай няўдачы, як была спалена машына, якая везла ў гарнізон зброю.

Для патрулявання па Прыпяці ў Петрыкаў прыбылі бранякатэры.

— Такое суседства нам не пажадана,— перадалі з лесу. За адну ноч усе маторы на бранякатэрах былі размарожаны, хоць абслугоўвалі іх немцы.

Усе гэтыя і шмат іншыя аперацыі не на жарт устрывожылі фашыстаў. Яны вырашылі паслаць у лес да партызан сваіх людзей. Падрыхтоўку такіх людзей ускладлі на зондэрштаб «Р». Гэта арганізацыя для адводу вачэй займалася выпадам бы нарыхтоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны, а на справе рыхтавала шпіёнаў для засылкі ў лес.

Ліда Чарнобылец выпадкова пазнаёмілася з супрацоўніцай гэтай арганізацыі Марыяй Ланска. Тая паведаміла, што ў хуткім часе наладзяць цесную сувязь з партызанамі.

— Якім жа гэта чынам? — пацікавілася Ліда, хоць добра зразумела, аб чым ідзе гаворка.

— Праз сваіх людзей,— самазадаволена адказала Марыя.

З гэтага часу Ліда пачала больш увагі ўдзяляць сваёй новай «сяброўцы». А неўзабаве падпольшчыца даведалася, што ў атрад Бабкова засылаецца правакатар — нехта Міранович. І калі той прыбыў, там яго ўжо чакалі.

Хутка партызаны атрымалі з Петрыкава яшчэ адну важную вестку. Да гэтага ўсе меркавалі, што ў вёсцы Белка стаіць нямецкі гарнізон. Але, як высветлілі падпольшчыкі, гарнізон там быў не зусім звычайны — армейская разведка. Аб гэтым было паведамлена ў цэнтр.

Раніцай Ліда дастала з куфра святочную спадніцу і кофту. Затым узяла два лязы і паклала іх у манжэты кофты. Вырашыла: калі што — жывой не давацца. Апранула жакет, на галаву завязала чырвоную матчыну хустку...

Ішла на работу як звычайна. Перад уваходам у гебітскамісарыят ветліва павіталася з вартавым. Той, усміхнуўшыся, адказаў ёй: ён ведаў прыбіральшчыцу гебітскамісара. Але калі прынялася за працу, рабіла ўсё неяк машынальна.

— Чаго ты носішся як угарэлая? — здзівілася Паліна Карасёва.

— Спяшаюся, каб паспець да прыходу генерала,— адказала Ліда, а сама сабе загадала: «Супакойся, не мітуйся без справы, не прыцягвай да сябе ўвагі»... Калі з'явіўся генерал Рэдке, Ліда як звычайна сустрэла яго ў прыёмнай і нізка пакланілася.

— Гутэн морген, гутэн морген,— павітаўся генерал і схаваўся за дзвярыма свайго кабінета.

Час ішоў пакутліва, марудна. Стралкі гадзінніка, што вісеў на сцяне ў прыёмнай, нібы прыраслі да цыферблата і зусім не рухаліся. Нарэшце, калі малая стралка пачала набліжацца да лічбы «11», Ліда выглянула на вуліцу. З процілеглага боку да гебітскамісарыята набліжаўся Іван Сцебуноў. Убачыўшы Чарнобылец, ён невыказна ўзрадаваўся, заўсміхаўся, пачаў махаць ёй рукой.

— Добры дзень, Лідачка. Удзялі хоць адну хвіліначку мне, скрась маё халасцяцкае жыццё,— гукнуў ён.

— Вось яшчэ выдумаў! — адмахнулася Ліда, скасіўшы позірк на вартавога.

Таго, відаць, мала займала гэтая сцэна, і ён пайшоў за вугал дома.

— Дык, можа, хоць шнапсу нам раздабудзеш? — не сунімаўся Сцебуноў.

Калі вартавы знік з вачэй, Іван Сцебуноў наблізіўся да Ліды і непрыкметна перадаў ёй дзве невялікія магнітныя міны. Дзяўчына гэтак жа непрыкметна схавала іх пад кофту.

— Пастаўлены на гадзіну дня,— шапнуў ён і ўжо гучна дадаў: — Дык, можа, дастанеш шнапсу?

— Што з вамі зробіш? Пастараюся...

— Ну, дык мы цябе чакаем,— сказаў Іван Сцебуноў і, насвістваючы, падаўся ад гебітскамісарыята.

Ліда праводзіла яго позіркам, а сама цікавала за партавым. Не, ён, пэўна, нічога не заўважыў. Ну, чаго ж ты стаіш? Ідзі... Але ногі не слухаліся. Яна адчувала смяротны груз, што пакуль спакойна ляжаў у яе пад кофтай, але ўжо адлічваў мінуты, секунды...

У калідоры Ліда, на шчасце, не сустрэла нікога. Крыху перавяла дух толькі тады, калі апынулася ў бакоўцы, дзе захоўваліся няхітрыя прылады прыбіральшчыц. Дастаўшы міны, яна загарнула іх у анучу і паклала ў вядро. А палове дванаццатай, Рэдке павінен быў ісці ў казіно. Але здарылася непрадбачанае: мінут за дзесяць да гэтага зайшоў лесапрамысловец маёр Крамер. Гутарка зацягнулася. Прайшло дзесяць, дванаццаць мінут, а яны ўсё яшчэ не пакідалі кабінета.

Стрэлкі гадзінніка набліжаліся да дванаццаці. Ліду агарнуў адчай... Але вось дзверы кабінета расчыніліся, на парозе з'явіўся Крамер, а затым Рэдке. Ліда заспяшалася ў бакоўку. З вядром у руках накіравалася ў кабінет шэфа. Шчыльна зачыніўшы дзверы, кінулася да канапы, на якой часта адпачываў гебітскамісар, прыўзняла сядзенне і паклала адну міну. Другую прымацавала пад пісьмовым сталом. Галоўнае зроблена... Выцягнула шуфляду стала. На вочы трапіў пісталет. Дзяўчына забрала зброю і паклала яе ў папяровы мяшок, у якім звычайна выносіла смецце. Затым забегла ў другі пакой — спальню. Каля гардэроба заўважыла аўтамат. Не раздумваючы, і яго ўпіхнула ў папяровы мяшок.

Каля выхаду пачакала, пакуль вартавы зайшоў за вугал дома, выйшла на вуліцу і накіравалася ў процілеглы бок. Кінула позірк на казіно. Адтуль выходзіў генерал Рэдке. Зараз ён сядзе за стол у кабінеце. «Папрацуеш сёння»,— падумала Ліда і павярнула на другую вуліцу. Крокаў за дзесяць наперадзе ўбачыла аўтамабіль, каля якога, падняўшы капот, корпаліся Уладзічанскі, Сцебуноў, Грабянюка і Васіль.

— Хлопцы, падвяжіце да краўца! — параўняўшыся з імі, гучна папрасіла Ліда.

Уладзічанскі завёў матор, машына пранеслася па вуліцах Петрыкава і выскачыла на кацэвіцкую дарогу.

— Эх, хоць бы пісталет які, а то затрымаюць, дык і адбівацца не будзе чым,— прагаварыў нехта.

— Есць нават аўтамат,— сказала Ліда і раздала сваім спадарожнікам зброю.

Пасты на выездзе з горада прасхалі спакойна, ніхто не спыніў. Па баках мільгалі заснежаныя палі, наперадзе ляжала ўкатаная дарога. Павярнулі направа, але праз некалькі метраў машына забуксавала — начная завіруха замяла дарогу. Самае страшнае засталося ззаду. Насустрач з прыдарожнага ляску беглі партызаны з атрадаў Балотнікава і Бабкова.

Не паспелі яны абняць падпольшчыкаў, як з боку Петрыкава пачуліся выбухі...

* * *

Лідзія Міхайлаўна Чарнобылец (Данцова) пасля вайны вярнулася да сваёй мірнай прафесіі, працавала медсястрой у Брэсцкай абласной бальніцы. Яна памерла ў 1989 г. На заслужаным адпачынку Васіль Міхайлавіч Чарнобылец. Партызанскі разведчык-падрыўнік стаў інспектарам аддзела крымінальнага вышуку. Ён жыве ў Петрыкаве.

Многія не дажылі да дня вызвалення. Сярод іх Фама Васільевіч Каляўцоў і Адольф Лявонавіч Уладзічанскі. Памяць аб іх захоўваюць удзячныя нашчадкі...

У. Р. Правасуд

З кнігі «Маўклівая пушча»

Кроў дзяцей

У в. Свабода і непадалёку ад п. Капаткевічы нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі спецыяльныя лагеры для дзяцей. У жудасных, нечалавечых умовах там утрымліваліся сотні хлопчыкаў і дзяўчынак. Многія з іх загінулі, частка была вывезена для збору крыві, якая патрабавалася для лячэння недабітых гітлераўскіх ваяк...

За калючы дрот у двух бараках на ўскраіне в. Свабода гітлераўцы сагналі больш 300 дзяцей з Петрыкава і навакольных вёсак. Там былі 7-гадовая Надзя Малашкевіч, 11-гадовая Оля Доўбня, 12-гадовы Косця Мейлах, Марыя і Ліда Берднік з Петрыкава, навасёлкаўскія дзеці Феня Новік, Паліна і Марыя Ярыга і многія іншыя. Тыя, хто застаўся жывымі, успаміналі, як дзве сястры, Валя і Галя, прасілі хлеба ў немцаў. Фашысты наздзекаваліся над дзяўчынкамі, парэзалі іх нажамі і акрываўленыя трупы павесілі. Федзя Філіпец не хацеў адпраўляцца ў лагер, супраціўляўся. Фашысты да паўсмерці

збілі яго, зламалі нагу, вывіхнулі рукі, укінулі ў машыну. Хлопчык на ўсё жыццё застаўся інвалідам. Жудасна было слухаць расказ Валодзі Калеціка, якому ўдалося збегчы з лагера. 20 мая 1944 г. у барак уварваліся фашысты. 40 хлопчыкаў і дзяўчынак загналі ў машыну, адвезлі ў в. Скабароўка ў Мінскай вобласці. Рабяты ведалі, што іх вязуць, каб узяць кроў для параненых нямецкіх салдат. Выкарыстаўшы зручны момант, Коля Паповіч, Ваня Паповіч і Валодзя Калеснік уцяклі, астатнія прапалі невядома дзе.

Пасля вызвалення ў былым лагеры для дзяцей знаходзілі пісьмы і запіскі: «Дарагія бацькі! Нас завезлі за Капаткевічы, за калючы дрот. Там такіх дзяцей вельмі многа. Кажуць, нас павязуць у Брэст. Вельмі цяжка падумаць, што я вас больш не пабачу. Я, відаць, не вытрымаю, я загіну... Цалуйце за мяне ўсіх: Я больш вас не пабачу. Ларыса».

Ларысе Чачот якраз пашанцавала выжыць. Яна была вызвалена з лагера савецкімі воінамі і вярнулася дамоў. Знайшла франтавую газету, у якой было надрукавана яе пісьмо. Але такіх шчаслівых дзяцей было нямнога. Большасць з іх чакала доўгая і пакутлівая смерць. Вылюдкі не шкадавалі нікога...

Кароткае пісьмо Надзі Лашкевіч: «Мамачка і татачка! Я жыць не буду, бывайце! Надзя»...

Вось яшчэ адно пісьмо, поўнае жаху і трывогі: «Горад Петрыкаў. Трудавая, 30, Кароль Дзяміду. Загорская М. Дарагія бацькі! Усіх нас, каго забралі разам са мной у Петрыкаве, прывезлі ў Капаткевічы. Сюды прывезлі многа такіх няшчасных, як і я. Размясцілі за вялікім плотам, абгароджаным калючым дротам. Ёсць чуткі, што ўсіх нас адправяць у Германію. Страшна падумаць, што я вас больш не пабачу. Цяжка мне ў няволі. Я не вытрымаю гэтых пакут, не хопіць сіл. Загіну! Усіх маіх сястрычак цалуйце за мяне. Бывайце. Скажыце ўсім, што я вас ужо больш не пабачу...»

З успамінаў жыхара в. Беседы К. І. Зборыша

9 чэрвеня 1944 г. у вёску прыехалі на машынах гітлераўцы. На гэты раз — па нас, дзяцей. Хапалі ў хатах, на вуліцы, сілай вырывалі ад маці, кідалі ў грузавікі. Вёска напоўнілася крыкам, слязамі. Нагрузілі тры машыны, а колькі было нас усіх, дзяцей, сказаць цяжка. Пад аховай павезлі па дарозе на Капцэвічы. Другую Слабодку, Чалюшчавічы, Навасёлкі. Спыніліся ў Гурынах. Галодных і халодных уціснулі ўсіх у гумно, за калючы дрот. Потым перагналі ў памяшканне Навасёлкаўскага клуба. Не лепш было і там. Ні ежы, ні вады. Затым дзяцей з васьмі да дзесяці гадоў павезлі ў Бабруйск, дзе ў іх, як мы даведаліся пазней, забіралі кроў. А пас, старэйшых, пагрузілі ў таварныя вагоны і адправілі ў Германію. Праз пяць сутак мы былі ў лагеры. Разам са мной былі Марыя Апанасевіч і яе брат Міша, Ядзя Пякарская, Антон і Геня Зборыны — з Беседзі, Леанід Веранчук з Чалюшчавіч і многія іншыя хлопчыкі і дзяўчынкі.

* * *

На правым беразе Прыпяці Чырвоная Армія ўжо вызваліла Мазыр, недалёка было доўгачаканае свята і на Петрыкаўшчыне. Ганну Палтаран разам з дзяўчатамі-аднагодкамі і крыху старэйшымі — Вольгай Міцура, Ганнай Несцярчук, Таццянай Дыба, Ганнай Фока, Клаўдзіяй Аскерка, Любоўю Дыба, Марыяй Амельчанка, Вольгай Несцярчук і іншымі ўкінулі ў «чорны воран» і павезлі з Конкавіч, з роднага дому. У Навасёлках уціснулі ў свіран, у якога ад даху засталіся толькі латы. Іплі халодныя вясеннія дажджы. Спачатку дазвалялі сустракацца з маці, але калі аднойчы адзін падлетак збег, сустрэчы забаранілі.

— Нас мецілі, як жывёлу, — успамінае Ганна Андрэеўна. — Чырвонай фарбай рабілі рысу на ілбе — такіх везлі ў Германію. Тых, у каго быў намаляваны

крыж, адпраўлялі ў Бабруйск. У хлопца з нашай вёскі Аляксея Кнігі быў агрызак чырвонага алоўка, ён падмаляваў крыжык Васілю Несцярчуку. Той трапіў у Бабруйск і праз месяц быў вызвалены. А мяне адправілі ў Нямеччыну. У канцлагеры каля горада Дахау мы працавалі на заводзе, выразалі нейкія металічныя дэталі. Мне дасталася складаная і цяжкая аперацыя, я не спраўлялася з ёю. Гэта заўважыў майстар-немец. Аднойчы мы ўбачылі ў яго руках малаток, а раней тым жа малатком майстар ударам па галаве забіў хлопчыка, які не спраўляўся з работай. Тое ж пагражала і мне. Ганна Несцярчук, калі немец вяртаўся з цяжкім малатком, паказала па язык і папрасіла паклікаць перакладчыка. Той паслухаў. «Пан, дайце мне гэтую работу, я спраўлюся», — сказала яна, і майстар згадзіўся. Так я была выратавана...

Вызвалілі Ганну Палтаран і яе сяброў па няшчасці амерыканцы.

«Задыхаючыся ад дыму, абгарэлая, я адчула, як нешта моцна запякло ў грудзях. На руках убачыла кроў і зразумела, што параненa. Перамагаючы боль, над прыкрыццём дыму і агню адпаўзла метраў пятнаццаць і ўпала. Навокал чуліся крыкі і стогны людзей. Недалёка шчула дзіцячы голас: «Ой, мама, жывоцік баліць!» Падняла галаву і ўбачыла, што побач курчыцца хлопчык гадоў шасці, сын Івана Гардзеевіча Стракача. Прыўзнялася і хацела ўзяць яго на рукі, але ў гэты момант зноў адчула боль у левай руцэ — другі раз была параненa. Страціла прытомнасць. Колькі я праляжала на зямлі — не памятаю...»

168 чалавек было зажыва спалена, закатавана, расстраляна ў Беразняках. З вогненнай вёскі цудам удалося выратавацца толькі васьмі чалавекам. Яны былі абгарэлымі, параненымі. Сярод іх — Ганна Стракач, Ганна Булава, Анастасія Марозька, А. Дубік. Чатырнаццаць чалавек у гэты час хаваліся ў лесе, яны таксама засталіся жывымі, амаль усе пайшлі ў партызанскі атрад Бабкова. У вёсцы не засталося ніводнага будынка.

На наступны дзень фашысты зноў наведалі Беразянкі, каб схаваць сляды злачынстваў. Яны прывезлі дзесятак чалавек і прымусілі сцягваць трупы ў яшчэ дзюючы хлеў. Закідалі іх сенам, аблілі бензінам і зноў падпалілі. Тут жа расстралялі сведкаў трагедыі — рабочых, пакідалі трупы ў калодзеж і ўзарвалі гранатамі. Хто яны былі і адкуль — выявіць не ўдалося.

Вестка пра злачынства фашыстаў маланкай разнеслася па навакольных вёсках. Жыхары Аголіч, Слабады, Смятаніч, Кащэвіч, Макарыч, Ляскавіч, Брынёва і другіх, ратуючыся ад фашысцкай расправы, пакідалі свае пажыткі і цэлымі сем'ямі перабіраліся ў партызанскі край. Толькі Міхедавічы далі прытулак амаль пяці тысячам чалавек. Значна папоўніліся партызанскія атрады. Быў створаны новы атрад пад камандаваннем Пятра Арцюха.

М. І. Шамрыла, В. М. Чарнобылец

ДЗІЦЯ БЯЖЫЦЬ РАЗОРАЮ

З успамінаў А. І. Булавы, якая ў ліку некалькіх чалавек з в. Беразянкі цудам выратавалася з вогнепатага пекла. Памерла ў 1976 г.

...У мяне і галава ўсё баліць, ды яшчэ і я сільна недачуваю...

Ну, як яно было. Там жа нашых усіх людзей пабілі. Там на другі дзень людзей столькі ляжала... А ваўкі як напрыпыкалі, дык людзей лавілі потым. Людзей напрыпыкалі есці...

Ну, абкружылі нас кругом, усю вёску. А я ў той час у хаце была. Выйшла з хаты — не бачыла, што той немец з кукардай стаіць. Ён паставіў вінтоўку — вось так во на мяне. А гэты мой хлопчык малы, што на руках у мяне быў, Сашка, мяне за шыю ды:

Ой, мамко, заб'юць нас!..

А я кажу:

— Не, не, сынок, пан не будзе біць, не, не!..

Як я так сказала, дык ён, праўда, і вінтоўку апусціў. Ды на мяне паказвае:

— Дахаты!

Увайшла ў хату я ды на сваю дзеўку кажу:

— Евачка, нас заб'юць.

— А што рабіць, мамо?

У мяне ж яшчэ і той хлопчык быў, Колька. Ужо быў, здаецца, у трэцім ці ў чацвёртым класе. Колька кажа:

— Мамко, я пабягу ў мох.

А я кажу:

— Калі можна... А мо не праскочыш, сынок?

А мы не бачым, што яны там сядзяць, у касках. Панадаявалі гэтыя каскі, як ці якія, і не відно іх. Хлопчык мой — каб чуць, дык і прарваўся б. Хацеў, бедненькі, праскочыць, а яны яго — раз! — у грудзі сюды во. Толькі крыкнуў ён: «Мамко!..»

Дык дзе там — нацярынскае сэрца! Выскачыла я ды да яго. І Еўка мая выскачыла. А я за гэтае дзіця, за Сашку свайго, ды прыгарнула да сябе. Дык ён мяне — раз! — у руку раніў. І хацеў яшчэ раз, а Еўка ашчапілася за мяне і кажа:

— Мамко, няхай нас разам б'юць! Хай і мяне б'юць з вамі!..

А я хацела ўпасці, адале думаю: «А як жа дзеўка мая? І дзіця на руках...»

Ён хацеў у Еўку папасці, ды яшчэ раз мне ў руку. І сюды во. Дык у мяне рука апусцілася. І дзіця я пусціла. Пабегла малое. А Еўка — за мною. Я кажу ёй: «Падаймо!» І вось мяне ўжо зноў ранілі, а ў дзевачку не папалі. Во сюды мяне ранілі, а куля тут во выскачыла. Ужо ў мяне ўвяла ўсё, я і сама ўпала. Упала ды кажу на дзевачку: «А цябе ранілі?» Кажа, што не ранілі. А з мяне кроў аж ціўкае, так ліецца. Жылу тут мне, бачыце, перабілі. Дык я кажу:

— Падай разам са мною. А будзеш ляжаць — не торкайся. Упадзі і ляжы на месцы. Бо, можа, я і жывая буду, а ты — ляжы. І глядзі — як-небудзь у бераг.

А я ўжо бачу, што хлопчык мой, Колька, — ляжыць нежывы...

А гэты, што малы быў, пабег разоркаю, Сашка. А ралля была высокая, дык яны і не пападалі ў гэтага хлопчыка. А кулі разрыўныя дзяцець. А хлопчык усё роўна жывы, усё роўна бяжыць разораю.

А там жанчына паўзла ровам. Ды так вось яна: «Хадзі сюды! Хадзі сюды!..» Яна за яго ды ў тую канаву. Застаўся хлопчык з тою жонкаю...

А я ляжу. І Еўка за мною ляжыць. А з мяне кроў ідзе. А яны ходзяць па дварэ, гергечуць. Павыпускалі мае каровы, дзве было, авечкі павыганялі на вуліцу, свінні. А я ляжу ды так во пазіраю. А яны падпалілі маю хату і пайшлі да суседа. А сусед той стаў на калені і просіцца. А яны яму ў грудзі — раз! А я ляжу ды сама сабе думаю: «Ну, усё». Маё дзіця пабегла, а я не ведаю — ці яно там жывое, ці нежывое... А потым, калі я ўжо бачу, што гарыць, што галавешкі ляцяць на мяне, дык я ўзялася як-небудзь уставаць. Я на адным калене, на адным калене — папаўзла ў тую канаву, дзе хлопчык мой там, з маладзіцай. Тая маладзіца снужалася і папаўзла. Я кажу: «Хадзя ты мне руку перавяжы!» А яна — папаўзла...

Еўка мая таксама тады ўцякла і недзе голая ў стозе начавала. Выбрала дзірку ды палезла ў сярадзіну, у стог, і там схавалася. Потым партызаны прыйшлі, гукалі, мо хто жывы, каб адгукнуўся, а людзі баяліся адгуквацца. На другі ўжо дзень мая дзевачка вылезла са стога і пайшла...

Ляжу я ў той канаве, а тут бяжыць яшчэ дзве, гэта Кацярыніны, дзевачкі.

— Ох, ох, цётачка, ужо нашу мамку забілі і браціка ўбілі! А мы толькі ўдвох засталіся, дзве дзевачкі!..

А ў мяне ў вачах цёмна. Кажу я:

— Донька, паўзіце вось гэтаю во канаваю ды туды ў мох. Можа, застанецеся. Калі я ўжо не буду гаварыць, то вы пасядзіце, пакуль немцы пасядуць, дык мо тады хто азавецца...

Яны пабеглі ў той мох, тым раўчуком. А я — ужо з тым малым дзіцем, з Сашкам маім. На адным калене ўскочыла — і я ў тую канаву. Ускочыла, пацямнела ў вачах, папаўзла ў той мох. Бліэнька ад хаты мох быў. Запаўзла я ў той мох, ляжу. І яны, тыя дзевачкі, палеглі ў карчах...

Ужо мы там чуем — людзі вішчаць, крычаць — ужо там людзей б'юць!.. У нас маладзёжы было многа. І, можа, ніводнага не засталося. Ні маладзёжы, ні дзевачак — усіх пабілі. Божа мой, дзеці плачуць!.. Страшна было, каб вы пачулі. Ну, просто страх! Некаторых у хаты загналі, а нас проста так білі, акружылі і так білі — на нашай вуліцы. А маленькае дзіця... Гэта Каціна — узялі ды ўбілі Кацю, а дзіцятка яшчэ жывое. Яно поўзала, а яны ўзялі ды штыхом жывоцік яму распоркаюць. А яно, бедненькае, поўзае па той мацеры, яшчэ жывое, кішачкі павылазілі. А яно поўзае...

Хлопчыка майго, Колька што быў, у сенцы ўцягнулі, і ён там згарэў. Костачкі толькі ляжалі. Як я прыйшла з бальніцы, то ўжо нікога... І там я яго костачкі ў сенцах нашла. Харошы быў хлопец...

Хоча плакаць, а я кажу:

— Не плач, бо і цябе заб'юць.

Не плача. Ляжаць яны, бедныя... Каціны дзевачкі і мой. Потым у мяне чуць вось так павесялела, ужо чую — сцихлі тыя, у сяле. Я за дзяцей ды гэта прывяла іх да канавы. Стала ў ваду і нагою іх пераваджзіла на той бок, бо вада пасярэдзіне бяжыць. Нагою пацерапягала. Пацямнела ў мяне ў вачах...

Дубікі прыйшлі, мяне забралі. Ужо як нежывую...

* * *

...Я гэта падумаю, дык мне страшна...

Я жыла ў тыя войны, як тыя войны былі. Ужо не маладая. Ну, то свіней бяруць, то што...

Ад звера, дык хоць уцячэш, на хвойку якую, ці што. А гэта ж чалавек. Чалавек чалавека трапіць, дзе ўчуе.

Ой, што ўжо гэта! — гэта ж не вайна была, а проста так... Ну, той, што на фронце, ну, таго чалавека заб'юць, дык ён жа ваяваў, праўда? А дзіця тое беднае? Хлопчык — ён жа, бедны, нідзе не быў. Таксама білі... Гэтае дзіця маленькае бяжыць — за што ж яго? Яно ж маленькае, яно ж дзіця, яно ж кацілася, як тое яблычка... А яны б'юць. Іскры скачуць!..

Што гэта, што гэта за такое было ў іх — я не ведаю.

Гэта звяры былі, а не людзі.

Гэта не людзі былі, гэта звяры былі.

А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік
«Я з вогненнай вёскі»

БРАІМ Іван (1907 г.)
БУБЕНЧЫК Аляксандр Мікалаевіч (1931 г.)
БУБЕНЧЫК Васіль Мікалаевіч (1935 г.)
БУБЕНЧЫК Іван Мікалаевіч (1929 г.)
БУБЕНЧЫК Мікалай Васільевіч (1908 г.)
БУБЕНЧЫК Пікапор Мікалаевіч (1927 г.)
БУБЕНЧЫК Пётр Мікалаевіч (1940 г.)
БУБЕНЧЫК Праскоўя Іванаўна (1908 г.)
БУБЕНЧЫК Уладзімір Мікалаевіч (1938 г.)
БУБЕНЧЫК Фёдар Мікалаевіч (1936 г.)
БУЛАВА Агапа Міхайлаўна (1922 г.)
БУЛАВА Адам Аляксандравіч (1940 г.)
БУЛАВА Адам Іванавіч (1928 г.)
БУЛАВА Алена Фёдараўна (1922 г.)
БУЛАВА Аляксандр Данілавіч (1918 г.)
БУЛАВА Аляксандр Фёдаравіч (1932 г.)
БУЛАВА Аляксандра Паўлаўна (1901 г.)
БУЛАВА Антон Паўлавіч (1920 г.)
БУЛАВА Валянціна Аляксееўна (1923 г.)
БУЛАВА Валянціна Фёдараўна (1941 г.)
БУЛАВА Вера Аляксееўна (1931 г.)
БУЛАВА Вера Кандрацьеўна (1919 г.)
БУЛАВА Вера Міхайлаўна (1909 г.)
БУЛАВА Вера Рыгораўна (1917 г.)
БУЛАВА Вольга Паўлаўна (1871 г.)
БУЛАВА Ганна Дзмітрыеўна (1883 г.)
БУЛАВА Ганна Максімаўна (1899 г.)
БУЛАВА Ганна Міхайлаўна (1926 г.)
БУЛАВА Ганна Міхайлаўна (1930 г.)
БУЛАВА Дзмітрый Фёдаравіч (1930 г.)
БУЛАВА Ева Міхайлаўна (1924 г.)
БУЛАВА Еўдакія Фёдараўна (1925 г.)
БУЛАВА Зінаіда Фёдараўна (1936 г.)
БУЛАВА Іван Міхайлавіч (1931 г.)
БУЛАВА Іван Паўлавіч (1884 г.)
БУЛАВА Іван Фёдаравіч (1938 г.)
БУЛАВА Кандрат Сцяпанавіч (1873 г.)
БУЛАВА Клаўдзія Міхайлаўна (1932 г.)
БУЛАВА Лізавета Аляксандраўна (1934 г.)
БУЛАВА Марыя Іванаўна (1899 г.)
БУЛАВА Мікалай Міхайлавіч (1930 г.)
БУЛАВА Мікалай Фёдаравіч (1940 г.)
БУЛАВА Міхаіл Данілавіч (1898 г.)
БУЛАВА Міхаіл Паўлавіч (1889 г.)
БУЛАВА Надзея Міхайлаўна (1936 г.)
БУЛАВА Соф'я Васільеўна (1890 г.)
БУЛАВА Тамара Аляксандраўна (1932 г.)
БУЛАВА Уладзімір Міхайлавіч (1929 г.)
БУЛАВА Уладзімір Міхайлавіч (1940 г.)
БУЛАВА Фёдар Паўлавіч (1894 г.)
БУЛАВА Хіма Іванаўна (1884 г.)
ВЯЧЭРА Алена Міхайлаўна (1929 г.)
ВЯЧЭРА Аляксандра Васільеўна (1861 г.)
ВЯЧЭРА Антаніна Васільеўна (1930 г.)
ВЯЧЭРА Валянціна Міхайлаўна (1941 г.)
ВЯЧЭРА Васіль Іванавіч (1884 г.)
ВЯЧЭРА Вольга Міхайлаўна (1920 г.)
ВЯЧЭРА Данііла Васільевіч (1939 г.)
ВЯЧЭРА Кацярына Васільеўна (1933 г.)
ВЯЧЭРА Леаніда Васільеўна (1927 г.)
ВЯЧЭРА Любоў Васільеўна (1882 г.)
ВЯЧЭРА Марыя Іванаўна (1891 г.)
ВЯЧЭРА Мікалай Васільевіч (1929 г.)
ВЯЧЭРА Ніна Васільеўна (1936 г.)

ВЯЧЭРА Параска Васільеўна (1937 г.)
ВЯЧЭРА Сяргей Васільевіч (1940 г.)
ГРЫНЕВІЧ Віктар Васільевіч (1878 г.)
ДЗЯЛЕЖКА Іван Макаравіч (1927 г.)
ДУБІК Алена Васільеўна (1904 г.)
ДУБІК Аляксандр Канстанцінавіч (1941 г.)
ДУБІК Геля Канстанцінаўна (1927 г.)
ДУБІК Зінаіда Васільеўна (1939 г.)
ДУБІК Канстанцін Мікалаевіч (1889 г.)
ДУБІК Кацярына Давыдаўна (1928 г.)
ДУБІК Кацярына Сцяпанаўна (1918 г.)
ДУБІК Лявон Канстанцінавіч (1932 г.)
ДУБІК Марыя Емяльянаўна (1899 г.)
ДУБІК Мікалай Канстанцінавіч (1927 г.)
ДУБІК Надзея Васільеўна (1940 г.)
ДУБІК Святлана Аляксандраўна (1931 г.)
ДУБІК Сільвестр Давыдавіч (1932 г.)
ДУБІК Тамара Аляксандраўна (1922 г.)
ДУБІК Фёдар Іванавіч (1924 г.)
ЖУКАВЕЦ Павел Піханавіч (1925 г.)
ЗЯНКЕВІЧ Кацярына Паўлаўна (1896 г.)
КАЗАРСКАЯ Вольга Міхайлаўна (1899 г.)
КАЗЛОВІЧ Вера Цімафееўна (1922 г.)
КАЗЛОВІЧ Еўдакія Майсееўна (1926 г.)
КАЗЛОВІЧ Максім Пятровіч (1883 г.)
КАЗЛОВІЧ Настасся Пятроўна (1911 г.)
КАЗЛОВІЧ Паліна Мікалаеўна (1904 г.)
КАЗЛОВІЧ Рыгор Пятровіч (1895 г.)
КАЗЛОВІЧ Сцяпан Пятровіч (1893 г.)
КРАСЮК Агрыпіна Мікалаеўна (1900 г.)
КРАСЮК Міхаліна Піліпаўна (1929 г.)
КРАСЮК Пелагея Пятроўна (1899 г.)
ЛІТНЕР Ева Мікалаеўна (1942 г.)
ЛІТНЕР Марыя Давыдаўна (1919 г.)
ЛІТНЕР Мікалай Пятровіч (1913 г.)
МАРОЗЬКА Валянціна Міхайлаўна (1925 г.)
МАРОЗЬКА Віктар Паўлавіч (1932 г.)
МАРОЗЬКА Вольга Міхайлаўна (1918 г.)
МАРОЗЬКА Зоя Аляксееўна (1939 г.)
МАРОЗЬКА Іван Міхайлавіч (1928 г.)
МАРОЗЬКА Клаўдзія Паўлаўна (1924 г.)
МАРОЗЬКА Марыя Савельеўна (1898 г.)
МАРОЗЬКА Мітрафан Міхайлавіч (1929 г.)
МАРОЗЬКА Настасся Васільеўна (1898 г.)
МАРОЗЬКА Ніна Міхайлаўна (1931 г.)
МАРОЗЬКА Ніна Паўлаўна (1930 г.)
МАРОЗЬКА Уладзімір Міхайлавіч (1939 г.)
ПЕТРАВЕЦ Кацярына Іванаўна (1918 г.)
ПЕТРАВЕЦ Ніна Аляксееўна (1940 г.)
РАЛЬЧЭНЯ Алеся Уладзіміраўна (1940 г.)
РАЛЬЧЭНЯ Настасся Пятроўна (1917 г.)
РАЛЬЧЭНЯ Уладзімір Уладзіміравіч (1938 г.)
СТРАКАЧ Алена Міхайлаўна (1914 г.)
СТРАКАЧ Аляксандра Адамаўна (1938 г.)
СТРАКАЧ Віктар Адамавіч (1920 г.)
СТРАКАЧ Марыя Мікалаеўна (1930 г.)
СТРАКАЧ Ніна Адамаўна (1939 г.)
СТРАКАЧ Рыгор Рыгоравіч (1874 г.)
СТРАКАЧ Уладзімір Фёдаравіч (1941 г.)

ВЁСКА МАЙСЕЕВІЧЫ

Расстраляны ў 1943 г.

ГОЛІК Аляксей Майсеевіч (1908 г.)
КАПЫЛОВІЧ Сцяпан Сямёнавіч (1908 г.)

ВЁСКА МАКАРЫЧЫ

Расстраляны ў 1943 г.

ГРЫБ Даніла Сцяпанавіч (1883 г.)
МАКАРЭВІЧ Алена Іванаўна (1917 г.)
МАКАРЭВІЧ Аляксандр Рыгоравіч
МАКАРЭВІЧ Андрэй Іванавіч (1925 г.)
МАКАРЭВІЧ Валянціна Іванаўна (1927 г.)
МАКАРЭВІЧ Васіль Іванавіч (1938 г.)
МАКАРЭВІЧ Вольга Рыгораўна (1941 г.)
МАКАРЭВІЧ Любоў Іванаўна (1892 г.)
МАКАРЭВІЧ Мікалай Данілавіч (1939 г.)
МАКАРЭВІЧ Мікалай Рыгоравіч (1937 г.)
МАКАРЭВІЧ Надзея Ісакаўна (1913 г.)
МАКАРЭВІЧ Анастасія Іванаўна (1923 г.)
МАКАРЭВІЧ Палікарп Іванавіч (1927 г.)
МАКАРЭВІЧ Рыгор Мікалаевіч (1907 г.)
МАКАРЭВІЧ Тамара Іванаўна (1927 г.)
ПРЫКОТА Рыгор Сцяпанавіч (1908 г.)
РЫБАЛКА Аляксей Іванавіч (1905 г.), расстраляны ў 1941 г.
ТРУХАНОВІЧ Валянціна Мікалаеўна (1943 г.)
ТРУХАНОВІЧ Марыя Мікалаеўна (1912 г.)
ХАМЕЦ Аляксандра Рыгораўна (1919 г.)
ХАМЕЦ Вера Рыгораўна (1917 г.)
ХАМЕЦ Галіна Рыгораўна (1925 г.)
ХАМЕЦ Гаўрыла Рыгоравіч (1916 г.)
ХАМЕЦ Марыя Рыгораўна (1918 г.)
ХАМЕЦ Паліна Іванаўна (1922 г.)

ПАСЁЛАК ШАСТОВІЦКІ

Расстраляны ў 1943 г.

БЫЧКОЎСКАЯ Алена Якаўлеўна (1898 г.)
БЫЧКОЎСКАЯ Антоля Піліпаўна (1924 г.)
БЫЧКОЎСКАЯ Марыя Цімафееўна (1924 г.)
БЫЧКОЎСКІ Васіль Ільіч (1891 г.)
МАКАРАВЕЦ Захар Пятровіч (1893 г.)
МАКАРАВЕЦ Фёкла Адамаўна (1870 г.)
МАРЦІНОВІЧ Аляксей Ігнатавіч (1890 г.)
МАРЦІНОВІЧ Васіль Васільевіч (1940 г.)
МАРЦІНОВІЧ Гаўрыла Данілавіч (1868 г.)
МАРЦІНОВІЧ Васіль С. (1932 г.)
МАРЦІНОВІЧ Сцяпан Іванавіч (1920 г.)
ШКУН Іван Аляксандравіч (1924 г.)
ШКУН Піліп Аляксеевіч (1926 г.)
ШКУН Хрысціна Мікалаеўна (1924 г.)

ВЁСКА ШАСТОВІЧЫ

Расстраляны ў 1943 і пачатку 1944 г.

БЫЧКОЎСКІ Адам Давыдавіч (1891 г.)
БЫЧКОЎСКАЯ Кацярына М. (1896 г.)
БЫЧКОЎСКАЯ Фядосся Л. (1924 г.)
МАРЦІНОВІЧ Адам Давыдавіч (1891 г.)
МАРЦІНОВІЧ Адам Максімавіч (1887 г.)
МАРЦІНОВІЧ Алена Пятроўна (1928 г.)
МАРЦІНОВІЧ Аляксандра Д. (1901 г.)
МАРЦІНОВІЧ Арына Іванаўна (1890 г.)
МАРЦІНОВІЧ Васіль Фядосавіч (1939 г.)
МАРЦІНОВІЧ Вольга Іванаўна (1941 г.)
МАРЦІНОВІЧ Вольга Несцераўна (1936 г.)
МАРЦІНОВІЧ Гапша Сяргееўна (1924 г.)
МАРЦІНОВІЧ Іван Навумавіч (1932 г.)
МАРЦІНОВІЧ Іван Сіманавіч (1941 г.)
МАРЦІНОВІЧ Іван Цімафеевіч (1928 г.)
МАРЦІНОВІЧ Канстанцін А. (1911 г.)
МАРЦІНОВІЧ Лукер'я Пятроўна (1906 г.)
МАРЦІНОВІЧ Марыя Іванаўна (1933 г.)
МАРЦІНОВІЧ Марыя Несцераўна (1939 г.)
МАРЦІНОВІЧ Марыя Раманаўна (1890 г.)
МАРЦІНОВІЧ Марыя Сямёнаўна (1873 г.)
МАРЦІНОВІЧ Марыя Сямёнаўна (1927 г.)
МАРЦІНОВІЧ Міхаіл Паўлавіч (1874 г.)
МАРЦІНОВІЧ Міхаіл Паўлавіч (1875 г.)
МАРЦІНОВІЧ Паліна Р. (1916 г.)
МАРЦІНОВІЧ Паліна Фядосаўна (1939 г.)
МАРЦІНОВІЧ Пелагея Іванаўна (1909 г.)
МАРЦІНОВІЧ Пётр Сцяпанавіч (1904 г.)
МАРЦІНОВІЧ Праскоўя П. (1903 г.)
МАРЦІНОВІЧ Радзівон Васільевіч (1941 г.)
МАРЦІНОВІЧ Сцяпан Міхайлавіч (1873 г.)
МАРЦІНОВІЧ Таццяна Яфімаўна (1916 г.)
МАРЦІНОВІЧ Ульяна Іванаўна (1906 г.)
МАРЦІНОВІЧ Фёдар Сіманавіч (1928 г.)
МАРЦІНОВІЧ Хіма Пятроўна (1926 г.)
МАРЦІНОВІЧ Юлій Фядосавіч (1940 г.)
МАСКАЛЕНКА Міхаіл У. (1933 г.)
МАСКАЛЕНКА Серафіма Іосіфаўна (1930 г.)
МАСКАЛЕНКА Уладзімір Пятровіч (1900 г.)
МАСКАЛЕНКА Ульяна (1902 г.)
ШКСУН Амяльян Данілавіч (1936 г.)
ШКСУН Людміла Данілаўна (1934 г.)
ШКСУН Ніна Данілаўна (1940 г.)
ШКСУН Раіса Данілаўна (1928 г.)
ШКСУН Уладзімір Данілавіч (1932 г.)
ЧЫРЫЧ Аляксандр Дзмітрыевіч (1921 г.)
ЧЫРЫЧ Васіль Сцяпанавіч (1940 г.)
ЧЫРЫЧ Праскоўя Антонаўна (1919 г.)
ЧЫРЫЧ Уладзімір Сцяпанавіч (1938 г.)

ВЁСКА ВЯЛАЎСК

Расстраляны ў жніўні 1943 г.

ДУБАВЕЦ Васіль Пятровіч
КНІГА Мікалай Рыгоравіч (1927 г.)
ШКСУН Анастасія Андрэеўна
ШКСУН Антон Аляксандравіч
ШКСУН Ануфрый Логвінавіч
ШКСУН Ануфрый Фёдаравіч (1886 г.)
ШКСУН Арсеній Іосіфавіч (1934 г.)
ШКСУН Валянціна Гаўрылаўна
ШКСУН Валянціна Мікалаеўна (1939 г.)
ШКСУН Варвара Сцяпанаўна
ШКСУН Васіль Аляксандравіч
ШКСУН Васіль Андрэевіч
ШКСУН Васіль Дзмітрыевіч
ШКСУН Вольга Максімаўна
ШКСУН Дзмітрый Дзянісавіч (1943 г.)
ШКСУН Дзмітрый Іванавіч
ШКСУН Дзмітрый Нікіфаравіч
ШКСУН Іван Захаравіч
ШКСУН Іван Рыгоравіч
ШКСУН Іосіф Дзмітрыевіч
ШКСУН Марыя Фёдараўна
ШКСУН Мікалай Фёдаравіч
ШКСУН Паліна Сцяпанаўна
ШКСУН Пётр Андраевіч
ШКСУН Праскоўя Міхайлаўна (1935 г.)
ШКСУН Рыгор Пятровіч
ШКСУН Рыгор Фёдаравіч
ШКСУН Уладзімір Гаўрылавіч
ШКСУН Ульяна Тарасаўна
ШКСУН Фёдар Цімафеевіч
ШКСУН Яўхімія Цімафеёўна
ЧЫРЫЧ Аляксей Данілавіч, загінуў у 1942 г.
ЧЫРЫЧ Андрэй Лявонавіч
ЧЫРЫЧ Ірына
ЧЫРЫЧ Васіль Пятровіч
ЧЫРЫЧ Вольга Данілаўна
ЧЫРЫЧ Данііл Міхайлавіч
ЧЫРЫЧ Захар Іосіфавіч
ЧЫРЫЧ Іван Пятровіч
ЧЫРЫЧ Кацярына Савасцееўна
ЧЫРЫЧ Якаў
ШЭВЕЛЬ Захар

ПІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАБРЭЧЧА

БІЧАН Гапша Дзмітрыеўна (1894 г.), спалена ў 1944 г.

БІЧАН Канстанцін Канстанцінавіч (1886 г.), спалены ў 1944 г.

БУЖАН Пракоп Харытонавіч (1900 г.), расстраляны ў 1942 г.

БУЖАН Пратас Сілін (1907 г.), расстраляны ў 1942 г.

БУЖАН Фёкла Васільеўна (1882 г.), расстраляна ў 1944 г.

ГЕРАСІМЕНКА Адам Кузьміч (1924 г.), расстраляны ў 1943 г.

ГЕРАСІМЕНКА Васіль Кузьміч (1926 г.), расстраляны ў 1943 г.

ГЕРАСІМЕНКА Сава Панкратавіч (1907 г.), расстраляны ў 1944 г.

ГОШКА Стэфан Сяргеевіч (1927 г.), расстраляны ў 1944 г.

ГОШКА Уладзімір Сяргеевіч (1921 г.), расстраляны ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Агапа Васільеўна (1896 г.), расстраляна ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Васіль Кананавіч (1925 г.), расстраляны ў 1943 г.
ПРАКАПЕНКА Васіль Пятровіч (1924 г.), расстраляны ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Ганна Дамітрыеўна (1890 г.), спалена ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Віктар Ягоравіч (1940 г.), спалены ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Дзмітрый Ягоравіч (1938 г.), спалены ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Іван Ягоравіч (1941 г.), спалены ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Ірына Іванаўна (1905 г.), расстраляна ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Кузьма Міхайлавіч (1895 г.), спалены ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Леанід Лаўрэнавіч (1931 г.), расстраляны ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Марыя Уладзіміраўна (1913 г.), спалена ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Матрона Іванаўна (1880 г.), расстраляна ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Матрона Іванаўна (1902 г.), расстраляна ў 1942 г.
ПРАКАПЕНКА Ніна Ягораўна (1939 г.), спалена ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Праскоўя Адамаўна (1908 г.), расстраляна ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Уладзімір Лявонавіч (1928 г.), расстраляны ў 1943 г.
ПРАКАПЕНКА Хрысціна Якаўлеўна (1884 г.), расстраляна ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Якаў Андрэевіч (1888 г.), расстраляны ў 1943 г.
ПРАКАПЕНКА Якаў Адамавіч (1910 г.), спалены ў 1944 г.
ПРАКАПЕНКА Яўгенія Ягораўна (1936 г.), спалена ў 1944 г.

ВЁСКА БАГРЫМАВІЧЫ

Расстраляны і спалены ў 1944 г.

БІЧАН Аляксандр Апанасавіч (1886 г.), загінуў ў 1942 г. каля в. Пціч.
БІЧАН Аляксей Уладзіміравіч (1926 г.), расстраляны ў 1941 г.
БІЧАН Андрэй Антонавіч (1932 г.)
БІЧАН Антаніна Аляксандраўна (1930 г.)
БІЧАН Антон Васільевіч (1930 г.)
БІЧАН Антон Мікалаевіч (1895 г.)
БІЧАН Апанас Анікеевіч (1893 г.)
БІЧАН Вольга Аксёнаўна (1918 г.)
БІЧАН Вольга Аляксандраўна (1924 г.)
БІЧАН Ганна Аляксандраўна (1890 г.)
БІЧАН Ганна А. (1905 г.), спалена з трыма дзецьмі.
БІЧАН Ганна Антонаўна (1922 г.)
БІЧАН Ефрасіння Іванаўна (1908 г.)
БІЧАН Ілья (1860 г.)
БІЧАН Кацярына (1890 г.)
БІЧАН Лідзія Апанасаўна (1930 г.)
БІЧАН Майсей (1894 г.)
БІЧАН Максім Фядосавіч (1898 г.)
БІЧАН Марфа Адамаўна (1898 г.)
БІЧАН Марыя Апанасаўна (1924 г.)
БІЧАН Марыя Рыгораўна (1890 г.)
БІЧАН Матруна Антонаўна (1926 г.)
БІЧАН Матруна Данілаўна (1870 г.)
БІЧАН Мікалай Ільіч (1940 г.)
БІЧАН Міхаіл Антонавіч (1935 г.)
БІЧАН Наталля Аляксандраўна (1922 г.)
БІЧАН Ніна Васільеўна (1932 г.)
БІЧАН Ніна Юр'еўна (1928 г.)
БІЧАН Парфірый Апанасавіч (1928 г.)
БІЧАН Пётр Антонавіч (1924 г.)
БІЧАН Рыгор Мікалаевіч (1910 г.)
БІЧАН Рыгор Цімафеевіч (1929 г.)
БІЧАН Рыгор Якаўлевіч (1864 г.)
БІЧАН Соф'я Цімафеєўна (1898 г.)
БІЧАН Сцяпан Апанасавіч (1923 г.)
БІЧАН Уладзімір (1880 г.), расстраляны ў 1941 г.
БІЧАН Уладзімір Васільевіч (1928 г.)
БІЧАН Цімафей Апанасавіч (1919 г.)
БІЧАН Цімафей Васільевіч (1928 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Акуліна Д. (1890 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Антаніна С. (1936 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Валянціна Р. (1932 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Вольга Сямёнаўна (1926 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Еўдакія Ф. (1901 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Лідзія Рыгораўна (1935 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Любоў Сямёнаўна (1914 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Матруна С. (1933 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Ніна Рыгораўна (1928 г.)
ВАЛАТОЎСКАЯ Раіса Рыгораўна (1929 г.)
ВАЛАТОЎСКІ Аляксандр С. (1930 г.)
ВАЛАТОЎСКІ Іван Сямёнавіч (1928 г.)
ВАЛАТОЎСКІ Сямён Васільевіч (1886 г.)
ГЕРАСІМЕНКА Ганна Аксёнаўна (1922 г.)
ГЕРАСІМЕНКА Еўдакія (1896 г.)
ГЕРАСІМЕНКА Марфа С. (1918 г.)
ГЕРАСІМЕНКА Мікіта (1864 г.)
ГЕРАСІМЕНКА Пелагея Д. (1923 г.)
ГЕРАСІМЕНКА Стэфан (1886 г.)
НАВІЦКАЯ Ганна Рыгораўна (1908 г.)
НАВІЦКАЯ Лідзія Рыгораўна (1934 г.)
ПАПОК Вольга Антонаўна (1919 г.)
ПАПОК Вольга Антонаўна (1920 г.)
ПАПОК Дзмітрый Мікалаевіч (1940 г.)
ПАПОК Мікалай (1910 г.)
ПАПОК Параска (1880 г.)
ПАПОК Соф'я Мікалаеўна (1943 г.)
ПАЛТАРАН Дзмітрый Адамавіч (1941 г.)
ПАЛТАРАН Ефрасіння (1910 г.)
ПАЛТАРАН Надзея Адамаўна (1930 г.)
ПАЛТАРАН Соф'я Адамаўна (1935 г.)
ПРАКАПЕНКА Барыс (1878 г.)
РАБЧАНКА Вольга Яфімаўна (1924 г.)
СІГАЙ Адам (1860 г.)
СІГАЙ Аксіння Міхайлаўна (1890 г.)
СІГАЙ Антон Мацвеевіч (1910 г.)

СІГАЙ Вольга Адамаўна (1939 г.)
СІГАЙ Галіна Адамаўна (1914 г.)
СІГАЙ Галіна Лазараўна (1934 г.)
СІГАЙ Ганна Іванаўна (1924 г.)
СІГАЙ Ганна Навумаўна (1926 г.)
СІГАЙ Дар'я (1906 г.), спалена з чатырма дзецьмі.
СІГАЙ Дзмітрый Навумавіч (1933 г.)
СІГАЙ Еўдакія (1886 г.)
СІГАЙ Кацярына Майсеевна (1888 г.)
СІГАЙ Марына Майсеевна (1880 г.)
СІГАЙ Марыя (1904 г.)
СІГАЙ Матруна Фёдараўна
СІГАЙ Матруна (1910 г.)
СІГАЙ Міхаіл Рыгоравіч (1890 г.)
СІГАЙ Ніна Яфімаўна (1935 г.)
СІГАЙ Паліна Аляксееўна (1921 г.)
СІГАЙ Фёдар Сільвестравіч (1909 г.)
СІГАЙ Яфім Клімавіч (1910 г.)
СІЛІВОНЕЦ Рыгор (1864 г.)

З 1942 г. для аховы чыгункі немцы пачалі пад пагрозай расстрэлу прыцягваць мясцовае насельніцтва. Дайшла чарга па дзяжурства і да Яфіма Клімавіча Сігая. На ўчастку, які ён «ахоўваў», партызаны падклалі міну. Нямецкі патруль заўважыў яе. Падвялі Яфіма Клімавіча. Ён зразумеў з жэстаў і пагроз ворагаў, што за дрэнную ахову павінен быць пакараны смерцю. Але можа загладзіць сваю віну, калі выкапае і абясшкодзіць міну.

Гітлераўцы схаваліся за насып, а Яфім Клімавіч узяўся за небяспечную работу. Абкапаў міну — быццам абясшкодзіў яе, і паклікаў салдат. Калі яны падышлі, мужны патрыёт ударыў па міне заступам. Узняўся клуб агню і дыму... Разам з Яфімам Клімавічам Сігаем загінулі тры варожыя салдаты.

ВЁСКА МЛЫНОК

Расстраляны ў 1944 г.

ГОШКА Уладзімір Сяргеевіч (1921 г.)
ЯКУБОВІЧ Марыя Н. (1930 г.)

ВЁСКА ПЦІЧ

АХРЭМЧЫК Антон (1912 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
АХРЭМЧЫК Варвара Мікалаеўна (1881 г.), спалена ў 1944 г.



Помнік ахвярам фашысцкага генацыду ў в. Пціч

БІСКІН Барыс (1882 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.
БІСКІН Берка, расстраляны ў снежні 1941 г.
БІСКІН Гідаль (1882 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.
БІСКІНА Ася, расстраляна ў снежні 1941 г.
БІСКІНА Іта (1886 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.
БІСКІНА Іта расстраляна ў снежні 1941 г.
БІСКІНА Рая (1885 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.
БІСКІНА Рыва, расстраляна ў снежні 1941 г.
БІСКІНА Соня, расстраляна ў снежні 1941 г.
БУРДО Майсей Рыгоравіч (1881 г.), утоплены ў р. Пціч у снежні 1941 г.
БУРДО Ціня Давыдавіч (1882 г.), утоплены ў р. Пціч у снежні 1941 г.
БУРДО Рая Майсеевна, утоплена ў р. Пціч у снежні 1941 г.
БУРДО Уладзімір Давыдавіч, утоплены ў р. Пціч у снежні 1941 г.
БУРДО Хася Давыдаўна (1904 г.), утоплена ў р. Пціч у снежні 1941 г.
ВАЛАТОЎСКІ Васіль Іванавіч (1926 г.), расстраляны ў 1944 г.

ГАРБЕЛІК Зінаіда Андрэеўна (1930 г.), закатавана ў 1941 г.

ГАРБЕЛІК Лілія Андрэеўна (1922 г.), закатавана ў 1941 г.

ГЕРАСІМЕНКА Аляксей Ільіч, расстраляны ў 1942 г.

ГЕРАСІМЕНКА Васіль, расстраляны ў 1943 г.

ГЕРАСІМЕНКА Віктар Ільіч, расстраляны ў 1942 г.

ГЕРАСІМЕНКА Ганна Піліпаўна, спалена ў 1944 г.

ГЕРАСІМЕНКА Іван Фёдаравіч, спалены ў 1944 г.

ГЕРАСІМЕНКА Марк Якаўлевіч, падарваўся на міне.

ГЕРАСІМЕНКА Мікалай Ільіч, расстраляны ў 1942 г.

ГЕРАСІМЕНКА Міхаіл Ільіч, расстраляны ў 1942 г.

ГЕРАСІМЕНКА Уладзімір Ільіч, расстраляны ў 1942 г.

ГЕРАСІМЕНКА Ульяна Ліфераўна, расстраляна ў 1942 г.

ГОРМАШ Канстанцін Фёдаравіч (1900 г.), расстраляны ў 1942 г.

ГОРМАШ Лілія Канстанцінаўна (1928 г.), расстраляна ў 1942 г.

ГОШКА Міхаіл Васільевіч (1891 г.), спалены ў 1944 г.

ГРАЛЬКА Людвіг, расстраляны ў 1943 г.

ГУТМАН Хая, утоплена ў р. Пціч у снежні 1941 г.

ГУТМАН Янкель (1892 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

ЖУРАВЕЛЬ Раіса Майсееўна (1918 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

ЗАРЭЦКІ Ісаак, расстраляны ў снежні 1941 г.

ЗАРЭЦКІ Іцхак (1898 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Арон, расстраляны ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Ганна (1892 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Гаша (1933 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Ізраіль, расстраляны ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Марыя (1908 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Міхаіл (1938 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Рыва, расстраляна ў снежні 1941 г.

ЗЯЛЁНКА Сяргей (1890 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

ІГНАЦЕНКА Надзея, падарвалася на міне ў 1944 г.

КАЛМЫКОВА Лілія Якаўлеўна (1910 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

КАРОБКА Ася, расстраляна ў снежні 1941 г.

КАРОБКА Моня, расстраляны ў 1941 г.

КАРОБКА Сіма, расстраляна ў снежні 1941 г.

КАРОБКА Хаім (1890 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

КАРОБКА Якаў (1910 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

КАЦМАН Яўгенія, расстраляна ў снежні 1941 г.

КАЦМАН Міхаіл (1938 г.), утоплены ў р. Пціч у снежні 1941 г.

КАЦМАН Моталь, расстраляны ў снежні 1941 г.

КАЦМАН Роза (1917 г.), утоплена ў р. Пціч у снежні 1941 г.

КАЦМАН Сіма, расстраляна ў снежні 1941 г.

КАЦМАН Сіма (1936 г.), загінула ў 1941 г.

КАЦМАН Уладзімір (1934 г.), утоплены ў р. Пціч у снежні 1941 г.

КНЯЗЕЎ Уладзімір Аляксандравіч (1934 г.), расстраляны ў 1941 г.

КРАМНІК Ення, утоплены ў р. Пціч у снежні 1941 г.

КРАМНІК Хатроня, утоплена ў р. Пціч у снежні 1941 г.

ЛЮЛЬЕЎ Калман, расстраляны ў снежні 1941 г.

МАРЦІНОВІЧ Міхаіл, падарваўся на міне ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКАЯ Вольга Іванаўна (1931 г.), спалена ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКАЯ Матруна Агееўна (1918 г.), спалена ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКАЯ Матруна (1918 г.), спалена ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКАЯ Наталля Фёдараўна (1890 г.), спалена ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Васіль Іванавіч (1929 г.), спалены ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Іван Сцяпанавіч (1895 г.), спалены ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Мікалай (1940 г.), спалены ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Рыгор (1910 г.), спалены ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Рыгор Іванавіч (1917 г.), спалены ў 1944 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Уладзімір Уладзіміравіч (1938 г.), спалены ў 1944 г.

ПІЛЕВІЧ Анатоль (1902 г.), расстраляны ў 1942 г.

ПРАКАПЕНКА Еўдакія, расстраляна з дзвюма дзецьмі ў 1943 г.

САМБУК Васіль Васільевіч (1926 г.), закатаваны ў 1942 г.

САМБУК Вера Васільеўна (1924 г.), закатавана ў 1942 г.

САМБУК Еўдакія Пятроўна (1895 г.), спалена ў 1944 г.

СІГАЙ Васіль Акімавіч (1920 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

СІГАЙ Павел Фёдаравіч, падарваўся на міне ў 1944 г.

СУХАДОЛЬСКІ Залман, расстраляны ў снежні 1941 г.

СЯЎРУК Лілія Аляксееўна (1939 г.), расстраляна ў 1942 г.

СЯЎРУК Матруна Васільеўна (1913 г.), расстраляна ў 1942 г.

СЯЎРУК Матруна Васільеўна (1938 г.), расстраляна ў 1942 г.

СЯЎРУК Тамара Аляксееўна (1932 г.), расстраляна ў 1942 г.

ТАРАСЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч (1939 г.), расстраляны ў 1942 г.

ТАРАСЕВІЧ Любоў (1914 г.), расстраляна ў 1942 г.

ТАРАСЕВІЧ Марыя Мікалаеўна (1937 г.), расстраляна ў 1942 г.

ТАРАСЕВІЧ Яфім Васільевіч (1912 г.), расстраляны ў снежні 1942 г.

ТАРУН, падарваўся на міне ў 1944 г.

ТУКАЙ Сяргей, спалены ў 1944 г.

УРЭЦКАЯ Ганна (1909 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

ФУРМАН Рыва, расстраляна ў снежні 1941 г.

ХУСЕНСКІ Куся (1907 г.), расстраляны ў снежні 1941 г.

ЦВАСМАН Элька (1924 г.), расстраляна ў снежні 1941 г.

ШМАТКОВА, расстраляна ў 1942 г.

ШМАТКОВА Вольга Іванаўна (1910 г.), расстраляна ў 1942 г.

ШМАТКОВА Надзея (1932 г.), расстраляна ў 1942 г.

ШМАТКОВА Святлана Паўлаўна (1933 г.), расстраляна ў 1942 г.

ШМАТКОЎ Віктар Паўлавіч (1940 г.), расстраляны ў 1942 г.

ШМАТКОЎ Фелікс (1939 г.), расстраляны ў 1942 г.

ШЫМАНЕЦ Ніна Аляксееўна (1926 г.), спалена ў 1944 г.

ВЁСКА РАДКАЎ

ГРЫНЕВІЧ Васіль Нікіфаравіч (1932 г.), загінуў у 1944 г.

ДЗМІТРОВІЧ Іван Максімавіч (1892 г.), расстраляны ў 1944 г.

ВЁСКА РОГ

ГЕРАСІМЕНКА Анастасій Елісеевіч (1926 г.), прапала без вестак у Германіі.

ГЕРАСІМЕНКА Антон Антонавіч (1864 г.), расстраляны ў 1944 г.

ГЕРАСІМЕНКА Вольга Антанінаўна (1926 г.), прапала без вестак у Германіі.

ГЕРАСІМЕНКА Малашка (1864 г.), расстраляна ў 1944 г.

ГЕРАСІМЕНКА Праскоўя М. (1874 г.), расстраляна ў 1944 г.

ГЕРАСІМЕНКА Уладзімір Кірылавіч (1870 г.), загінуў у 1944 г.

САМБУК Стэфан Сямёнавіч (1880 г.), расстраляны ў 1944 г.

ВЁСКА ХУСНАЕ

ГЕРАСІМЕНКА Сяргей (1867 г.), забіты ў 1944 г.

НІКАНОВІЧ Мікалай, расстраляны ў 1942 г.

ПАПОК Адам Кузьміч (1926 г.), расстраляны ў 1943 г.

ПАПОК Антаніна Кузьмінічна, забіта ў 1941 г.

ПАПОК Васіль Мацвеевіч (1927 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

ПАПОК Дзмітрый Мікалаевіч (1941 г.), спалены ў 1944 г.

ПАПОК Ефрасіння Дзмітрыеўна (1910 г.), забіта ў 1944 г.

ПАПОК Ісак Адамавіч (1910 г.), расстраляны ў 1944 г.

ПАПОК Кузьма (1902 г.), расстраляны ў 1943 г.

ПАПОК Мікалай Іванавіч (1914 г.), спалены ў 1944 г.

ПОЛЯК Андрэй (1860 г.), забіты ў 1944 г.

ПОЛЯК Варвара (1870 г.), забіта ў 1944 г.

ПОЛЯК Еўдакія Дзмітрыеўна (1909 г.), павешана ў 1944 г.

ПОЛЯК Іван (1922 г.), расстраляны ў 1943 г.

ПОЛЯК Любоў Максімаўна (1937 г.), спалена ў 1943 г.

ПОЛЯК Марфа (1870 г.), забіта ў 1944 г.

ПОЛЯК Марыя Васільеўна (1920 г.), павешана ў 1944 г.

ПОЛЯК Мікалай Сямёнавіч (1890 г.), спалены ў 1944 г.

ПОЛЯК Назар Мікалаевіч (1906 г.), расстраляны ў 1944 г.

ПОЛЯК Наталля (1885 г.), спалена ў 1943 г.

ПОЛЯК Наталля (1886 г.), спалена ў 1944 г.

ПОЛЯК Павел Адамавіч (1909 г.), расстраляны ў 1944 г.

ПОЛЯК Сяргей Анікеевіч (1924 г.), спалены ў 1944 г.

ПОЛЯК Уладзімір (1921 г.), расстраляны ў 1943 г.

ПОЛЯК Фядора Мікалаеўна (1915 г.), спалена ў 1944 г.

ПОЛЯК Якім Дзмітрыевіч (1918 г.), павешаны ў 1944 г.

ПОЛЯК Яўгенія (1882 г.), забіта ў 1943 г.

ПРАКАПЕНКА Елісей (1910 г.), загінуў у 1943 г.

ПЫРКО Адам Стэфанавіч (1882 г.), спалены ў 1943 г.

ПЫРКО Сава (1904 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

ПЫРКО Уладзімір Мікалаевіч (1927 г.), расстраляны ў 1944 г.

РАБЯНОК Фядора Мікалаеўна, спалена ў 1944 г.

САМБУК Ілья (1895 г.), забіты ў 1944 г.

САМБУК Праскоўя Ісакаўна (1921 г.), загінула ў канцлагеры.

СЦЯПУК Васіль Трафімавіч (1922 г.), , павешаны ў 1943 г.

СЦЯПУК Карп Майсеевіч (1893 г.), загінуў у канцлагеры.
СЦЯПУК Матруна (1860 г.), забіта ў 1944 г.
ХОДЗЬКА Ісак (1917 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
ХОДЗЬКА Павел Майсеевіч (1936 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
ХОДЗЬКА Соф'я Сямёнаўна (1925 г.), загінула ў канцлагеры.
ХОДЗЬКА Фёдар (1932 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

СНЯДЗІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЕЛІН

ГАЛЕНЯ Адальфіна Сцяпанаўна (1895 г.)
ГАЛЕНЯ Ігнат Сцяпанавіч (1890 г.)
ГАЛЕНЯ Тодар Сцяпанавіч (1894 г.)
ГОЛІК Вольга Казіміраўна (1934 г.)
ГОЛІК Марфа Яўсееўна (1915 г.)
ГОЛІК Ніна Казіміраўна (1936 г.)
ГУДУЛЬСКАЯ Ева Адамаўна (1939 г.)
ГУДУЛЬСКАЯ Ромця Ігнатаўна (1903 г.)
ГУДУЛЬСКІ Адам Васільевіч (1898 г.)
ГУДУЛЬСКІ Віктар Адамавіч (1930 г.)
ЕРМАЛОВІЧ Марта Дудзічна (1881 г.)
ЗАНКЕВІЧ Анастасія Сцяпанаўна (1900 г.)
ЗАНКЕВІЧ Марыя Яфімаўна (1924 г.)
ЗАНКЕВІЧ Таццяна Рыгораўна (1909 г.)
КОРЗУН Ганна Яўсееўна (1894 г.)
КОРЗУН Ніна Яўсееўна (1928 г.)
КОРЗУН Марыя Яўсееўна (1918 г.)
КОРЗУН Уладзімір (1941 г.)
ЛАДЗІНСКІ Адам Фёдаравіч (1895 г.)
ЛЮБІМАВА Ніна Іванаўна (1941 г.)
МАСЛА Ганна Данілаўна (1900 г.)
МАСЛА Ганна Уладзіміраўна (1929 г.)
НОВАК Аляксандр Пятровіч (1934 г.)
ПЯТРОВІЧ Марыя Ігнатаўна (1880 г.)
ХАЛЬЧЭНЯ Віктар Дзмітрыевіч (1930 г.)
ШАРУБА Ганна Людвігаўна (1904 г.)
ШАРУБА Ярмола Іванаўна (1890 г.)

ВЁСКА МАРДЗВІН

БАТАН Наталля Андрэеўна (1887 г.)
БУРАКЕВІЧ Аляксей Мікалаевіч (1929 г.)
БУРАКЕВІЧ Андрэй Адамавіч (1929 г.)
БУРАКЕВІЧ Апанас (1905 г.)
БУРАКЕВІЧ Вольга Мікалаеўна (1901 г.)
БУРАКЕВІЧ Ганна Іванаўна (1878 г.)
БУРАКЕВІЧ Канстанцін (1928 г.)
БУРАКЕВІЧ Канстанцін (1928 г.)
БУРАКЕВІЧ Матруна Фёдараўна (1867 г.)
БУРАКЕВІЧ Сава Сцяпанавіч (1899 г.)
БУРАКЕВІЧ Сыклета Юркаўна (1878 г.)
БУРАКЕВІЧ Якаў Міхайлавіч (1891 г.)
ГАЛОТА Іван Сцяпанавіч (1879 г.)
ЖУКАВЕЦ Амяльян Мікалаевіч (1896 г.)
КЛІМЕНКА Якаў Іванавіч (1902 г.)
КУЦЬКО Вольга Адамаўна (1920 г.)
ПАШУК Вольга Канстанцінаўна (1908 г.)
ПАШУК Галіна Канстанцінаўна (1928 г.)
ПАШУК Сыклета Іванаўна (1901 г.)
ШНЧУК Ганна Іванаўна (1893 г.)
ПРЫКОТА Андрэй Андрэевіч (1892 г.)
ПРЫКОТА Ганна Іванаўна (1908 г.)
ПРЫКОТА Захарыя Андрэеўна (1882 г.)
ПРЫКОТА Надзея Іванаўна (1908 г.)
ПРЫКОТА Пётр Захаравіч (1929 г.)
ХАЛЬЧЭНЯ Тэкля Савічна (1916 г.)
ХАМЕЦ Марта Нікіфараўна (1885 г.)
ХАМЕЦ Параска Васільеўна (1885 г.)
ХАМЕЦ Сямён Фёдаравіч (1922 г.)
ЮЧКО Апанас Рыгоравіч (1925 г.)
ЮЧКО Аўдоцця Якаўлеўна (1891 г.)
ЮЧКО Вольга Канстанцінаўна (1821 г.)
ЮЧКО Іван Рыгоравіч (1927 г.)
ЮЧКО Сцепаніда Данілаўна (1871 г.)
ЮЧКО Юрый Сцяпанавіч (1870 г.)
ЮЧКО Яфім'я Фёдараўна (1887 г.)
ЯЎЛАШ Алена Юстынаўна (1923 г.)

ВЁСКА СНЯДЗІН

ДАМАСЕВІЧ Валянцін Фёдаравіч (1932 г.)
ДАМАСЕВІЧ Васіль Фёдаравіч (1933 г.)
ДАМАСЕВІЧ Канстанцін С. (1927 г.)
ДАМАСЕВІЧ Лідзія Лаўрэнаўна (1909 г.)
ДАМАСЕВІЧ Надзея Пятроўна (1900 г.)
ЗАНКЕВІЧ Вольга Сцяпанаўна (1919 г.)
ЗАНКЕВІЧ Ганна Аляксандраўна (1924 г.)
ЗАНКЕВІЧ Надзея Лаўрэнаўна (1924 г.)
КАРЖАНОЎСКІ Сцяпан Якаўлевіч (1905 г.)
ЛІТНЕР Вольга Апанасаўна (1898 г.)
ЛІТНЕР Надзея Апанасаўна (1904 г.)
МАРОЗЬКА Алена Сцяпанаўна (1880 г.)
МАРЦЫНКЕВІЧ Піліп Дзмітрыевіч (1897 г.)
МАРЦЫНКЕВІЧ Ульяна Фёдараўна (1886 г.)
МАРЦЫНКЕВІЧ Юрый Пятровіч (1894 г.)
МАСЛА Яфім Пятровіч (1899 г.)
НОВАК Аляксандр Іванавіч (1883 г.)
ПЛЕЦКАЯ Юстына Рыгораўна (1887 г.)
РАДЗІНОВІЧ Іван Іосіфавіч (1901 г.)
РУБЧЭЎСКАЯ Любоў Кузьмінічна (1887 г.)
РУБЧЭЎСКІ Андрэй Каленікавіч (1895 г.)
РУЦКАЯ Ева Васільеўна (1898 г.)
РУЦКАЯ Надзея Мікалаеўна (1900 г.)
РУЦКІ Пётр Васільевіч (1897 г.)
РУЦКІ Пётр Дзянісавіч (1909 г.)
ТРАЯНОЎСКАЯ Аксенія Іванаўна (1908 г.)
ТРАЯНОЎСКАЯ Арына Іванаўна (1898 г.)
ТРАЯНОЎСКАЯ Арына Рыгораўна (1880 г.)
ТРАЯНОЎСКІ Мікалай Кузьміч (1925 г.)
ХАЛЬЧЭНЯ Віктар Рыгоравіч (1927 г.)
ШОЛКАВІЧ Іван Лук'янавіч (1930 г.)
ЯСТРЭМСКАЯ Марта Рыгораўна (1896 г.)
ЯСТРЭМСКАЯ Фёкла Іванаўна (1916 г.)
ЯСТРЭМСКІ Уладзімір Паўлавіч (1937 г.)

ВЁСКА СУДЗІВАР

ДАМАСЕВІЧ Галіна Ільінічна (1922 г.)
КАРАСЬ Ульяна (1901 г.)
МАРЦЫНКЕВІЧ Аляксандр (1932 г.)
ЯЦКА Ганна (1915 г.)

ВЁСКА ТАРГАШЫН

ДАРЫНСКАЯ Валянціна Антонаўна (1924 г.)
ДАРЫНСКАЯ Наталля Мікалаеўна (1922 г.)
РУБЧЭЎСКАЯ Надзея Васільеўна (1920 г.)
РУБЧЭЎСКІ Васіль Іванавіч (1895 г.)
РУЦКІ Апанас Пятровіч (1894 г.)
РУЦКІ Мікалай Апанасавіч (1922 г.)
САВІЦКАЯ Параска Рыгораўна (1886 г.)
САВІЦКАЯ Яўгенія Пятроўна (1908 г.)
САВІЦКІ Васіль Рыгоравіч (1882 г.)
ТРАЯНОЎСКАЯ Клаўдзія Пятроўна (1915 г.)

ЧАЛЮШЧАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЕ ПОЛЕ

МАЗАЙ Іван Кірылавіч (1903 г.)
МАЗАЙ Надзея Усцінаўна (1920 г.)
ШУРПАЧ Васіль Нічыпаравіч (1890 г.)
ШУРПАЧ Марыя Карпаўна (1910 г.)

ВЁСКА ДРУГАЯ СЛАБОДКА

АЎДЗЕЙЧЫК Аўдоцця (1902 г.), расстраляна 20.12.1943 г.
АЎДЗЕЙЧЫК Іван Адамавіч (1927 г.), забіты 20.12.1943 г.
АЎДЗЕЙЧЫК Уладзімір Адамавіч (1925 г.), забіты 20.12.1943 г.
КАРОТКІ Марцін Патапавіч (1905 г.), загінуў 10.2.1944 г.
КАРОТКІ Мікалай Амільянавіч (1928 г.), забіты 20.3.1944 г.
КАРОТКІ Сава Палікарпавіч (1869 г.), загінуў 5.3.1944 г.
КАРОТКІ Фама Амбросьевіч (1886 г.), забіты 20.3.1944 г.
МАЁРЧЫК Фёдар Піліпавіч (1927 г.)
МАЗАЙ Ганна Аляксандраўна (1900 г.), спалена 10.2.1944 г.
МАЗАЙ Ганна Лазараўна (1939 г.), спалена 10.2.1944 г.
МАЗАЙ Людвіна Лазараўна (1930 г.), спалена 10.2.1944 г.
МАЗАЙ Фядосся Савічна (1900 г.), спалена 10.2.1944 г.
ШНЧУК Марыя Сцяпанаўна (1869 г.), расстраляна 10.2.1944 г.
СІДАРЧУК Васіль Іванавіч (1926 г.), забіты 20.3.1944 г.
СКАПЕЦ Васіліса Іванаўна (1900 г.), загінула 20.3.1944 г.

ВЁСКА ДУБРОВА

АЛЬХІМОВІЧ Міхаіл Уладзіміравіч (1943 г.), загінуў 15.5.1944г.
БАТУРЭВІЧ Марыя Іванаўна (1868 г.), загінула 20.3.1944 г.
ВОРАНАЎ Леанід Пятровіч (1940 г.), загінуў у маі 1944 г.
ВОРАНАВА Ніна Пятроўна (1943 г.), загінула ў маі 1944 г.
ГОЛУБ Валянціна Пятроўна (1939 г.), загінула ў маі 1944 г.
ЖУКОЎСКАЯ Браніслава (1874 г.), загінула ў красавіку 1944 г.
ЗБОРЫНА Соф'я Мікалаеўна (1918 г.), загінула ў маі 1944 г.
МІХНЕВІЧ Еўдакія Данілаўна (1928 г.), загінула ў красавіку 1944 г.
ПЯТКЕВІЧ Паліна Мікалаеўна (1897 г.), загінула ў сакавіку 1944 г.
ПЛЫШЭЎСКІ Адам Рыгоравіч (1941 г.), закатаваны ў маі 1944 г.
РАКІЦКАЯ Марыя (1872 г.), загінула ў маі 1944 г.
РАКІЦКІ Павел (1873 г.), забіты 1.5.1944 г.
РУДЗІНСКАЯ Вольга Іванаўна (1929 г.), загінула ў маі 1944 г.
РУДЗІНСКАЯ Ганна Мікалаеўна (1894 г.), загінула ў студзені 1944 г.
СЯЎРУК Сцяпан Сяргеевіч (1894 г.), закатаваны ў 1944 г.
СКОРЫ Адам Іванавіч (1944 г.), загінуў у маі 1944 г.
ТАЛКАВЕЦ Надзея Андрэеўна (1912 г.), загінула ў маі 1944 г.
ТАРАСЕВІЧ Еўдакія П. (1892 г.), загінула ў маі 1944 г.
ТАРАСЕВІЧ Іван Сцяпанавіч (1893 г.), загінуў у 1944 г.
ТАРАСЕВІЧ Ігарыёк Гаўрылавіч (1872 г.), закатаваны ў маі 1944 г.
ТАРАСЕВІЧ Марыя Фёдараўна (1887 г.), загінула ў маі 1944 г.
ТАРАСЕВІЧ Мікалай Канстанцінавіч (1873 г.), закатаваны ў 1944 г.
ТАРАСЕВІЧ Праскоўя Фёдараўна (1892 г.), забіта ў студзені 1944 г.
ШПАК Купрыян Яфрэмавіч (1868 г.), загінуў у сакавіку 1944 г.

ВЁСКА ЗАЛЕССЕ

АСАЦКАЯ Вольга Сямёнаўна (1934 г.), закатавана ў 1944 г.
АСАЦКАЯ Еўдакія (1891 г.), загінула ў сакавіку 1944 г.
БАРАНОЎСКАЯ Аўдоцця Пятроўна (1885 г.), закатавана ў лагеры ў маі 1944 г.
БАРАНОЎСКІ Анатоль Севасцьянавіч (1924 г.), загінуў у час бамбёжкі ў 1944 г.
БАРАНОЎСКІ Міхаіл Карлавіч (1877 г.), забіты ў маі 1944 г.
БЕНЦ Усціння Рыгораўна (1882 г.), закатавана ў сакавіку 1944 г.

ГАНУСЕВІЧ Агапа Міхайлаўна (1891 г.)
ГАНУСЕВІЧ Адам Арыёнавіч (1903 г.), забіты ў 1943 г.
ГАНУСЕВІЧ Арсень Лявонавіч (1942 г.) загінуў у сакавіку 1944 г.
ГАНУСЕВІЧ Ганна (1898 г.), расстраляна ў чэрвені 1944 г.
ГАНУСЕВІЧ Ганна Іўеўна (1911 г.), забіта ў 1944 г.
ГАНУСЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч (1870 г.), расстраляны ў 1943 г.
ГАНУСЕВІЧ Мікіта Кузьміч (1906 г.)
ГАПОНЧЫК Іван Гардзеевіч (1912 г.), прапаў без вестак.
ДЗЕГЯЛЕВІЧ Іван Якаўлевіч (1881 г.), загінуў у сакавіку 1944 г.
ДЗЕГЯЛЕВІЧ Кацярына (1883 г.), закатавана ў сакавіку 1944 г.
ДЗЯГЕЛЬКА Міхаіл Іванавіч (1923 г.), загінуў у 1944 г.
ЕЎТУШЭНКА Акуліна Якаўлеўна (1884 г.), закатавана ў лютым 1944 г.
ЕЎТУШЭНКА Анісім Маісеевіч (1933 г.), угнаны ў Германію ў 1943 г., прапаў без вестак.
ЕЎТУШЭНКА Валент Маісеевіч (1935 г.), угнаны ў Германію ў 1943 г., прапаў без вестак.
ЕЎТУШЭНКА Прохар Данісавіч (1875 г.), забіты 26.6.1944 г.
ЖУКОЎСКАЯ Ганна Дзмітрыеўна (1870 г.), расстраляна ў сакавіку 1944 г.
ЖУКОЎСКІ Анатоль Аляксандравіч (1925 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
ЖУКОЎСКІ Юрый Пілімавіч (1912 г.), расстраляны ў 1944 г.
КРАСОЎСКАЯ Юзэфа (1912 г.), закатавана ў сакавіку 1944 г.
ЛОПУХ Васіль Данісавіч (1886 г.), загінуў у сакавіку 1944 г.
ЛОПУХ Іосіф Андрэевіч (1876 г.), расстраляны ў студзені 1944 г.
ЛОПУХ Марыя Іосіфаўна (1881 г.), загінула ў сакавіку 1944 г.
ЛОПУХ Кацярына Макараўна (1900 г.), закатавана ў сакавіку 1944 г.
МАЖЭЙКА Адам Міхайлавіч (1931 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
МАРГУН Афанасій Яфімавіч (1864 г.), забіты ў маі 1944 г.
МАРГУН Сяргей Рыгоравіч (1891 г.), загінуў у 1943 г.
МІХНЕВІЧ Віктар Рыгоравіч (1926 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
МІХНЕВІЧ Лідзія Рыгораўна (1935 г.), падарвалася на міне ў 1943 г.
ПЕРАГУД Вера (1870 г.), загінула ў маі 1944 г.
РАДЗІВОНАВА Агапа Іванаўна (1907 г.), закатавана ў красавіку 1944 г.
СКОРАЯ Настасся Фёдараўна (1890 г.), загінула ў маі 1944 г.
ШУМСКІ Міхаіл (1870 г.), забіты ў сакавіку 1944 г.
ШУМСКАЯ Марыя (1874 г.), закатавана ў сакавіку 1944 г.

ВЁСКА ПЕРАБІТАЯ ГАРА

БАГУК Васіль Іванавіч (1925 г.), расстраляны ў 1942 г.
ТАРАСЕВІЧ Уладзімір Аркадзьевіч (1927 г.), падарваўся на міне ў 1942 г.

ВЁСКА ЧАЛЮШЧАВІЧЫ

Ліхую гадзіну перажылі людзі 22 чэрвеня 1942 г., калі ў вёсцы лютаваў карны атрад...

АЛЕКСЕЕВІЧ Віктар Мікалаевіч (1941 г.), спалены 22.6.1942 г.
АЛЕКСЕЕВІЧ Мая Мікалаеўна (1938 г.), спалена 22.6.1942 г.
АЛЬХІМОВІЧ Антон Антонавіч (1932 г.), расстраляны ў лютым 1943 г.
АРЦЮХ Васіліна Сяргееўна (1924 г.), спалена 22.6.1942 г.
АРЦЮХ Пелагея Тодараўна (1884 г.), загінула 22.6.1942 г.
АРЫНОВІЧ Аверкій Якаўлевіч (1880 г.), спалены 22.6.1943 г.
АРЫНОВІЧ Марына Аляксандраўна (1880 г.), забіта 22.6.1943 г.
АРЫНОВІЧ Міхаіл Аверкіевіч (1905 г.), расстраляны 20.2.1943 г.
БЕЛЬСКАЯ Вольга Прохараўна (1927 г.), забіта 20.1.1943 г.
БЕЛЬСКАЯ Клаўдзія Прохараўна (1920 г.), расстраляна ў 1942 г.
БЕЛЬСКАЯ Марына Фядосаўна (1880 г.), забіта 20.1 1943 г.
БЕЛЬСКІ Аксент Прохаравіч (1919 г.), расстраляны 23.7.1942 г.
БЕЛЬСКІ Мікалай Пракопавіч (1927 г.), вывезены ў Германію і загінуў у 1943 г.
БЕЛЬСКІ Прохар Пятровіч (1878 г.), забіты 20.1.1943 г.
БЕЛЬСКІ Якаў Прохаравіч (1926 г.), загінуў у канцлагеры ў Германіі.
БУХТАРЭВІЧ Яўген Арсенцьевіч (1928 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.
ВАЛЕЖЫК Мальвіна (1900 г.), расстраляна 10.3.1943 г.
ГРУШКО Аляксей (1903 г.), забіты 10.1. 1944 г.
ГУЗАВЕЦ Георгій Лук'янавіч (1908 г.), забіты ў 1941 г.
ДЗЕНІСЕВІЧ Іван Андрэевіч (1923 г.), расстраляны 20.1.1943 г.
ДЗЕНІСЕВІЧ Таццяна (1908 г.), падарвалася на міне ў 1944 г.
ДРАБІК Станіслаў Станіслававіч (1924 г.), забіты ў 1941 г.
ЖУКОЎСКАЯ Агрыпіна Пятроўна (1900 г.), расстраляна 10.3.1944 г.
ЖУКОЎСКАЯ Віктория (1900 г.), спалена 22.6.1942 г.
ЖУКОЎСКАЯ Марына Якаўлеўна (1903 г.), расстраляна 10.2.1944 г.

ЖУКОЎСКАЯ Наталля Восіпаўна (1913 г.), расстраляна 1.3.1944 г.

ЖУКОЎСКАЯ Праскоўя Рыгораўна (1866 г.), загінула 10.3.1944 г.

ЖУКОЎСКІ Андрэй Паўлавіч (1872 г.), расстраляны 10.3.1944 г.

ЖУКОЎСКІ Мікалай Аляксандравіч (1937 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

ЖУКОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч (1924 г.), расстраляны ў 1943 г.

ЖУРАВЕЛЬ Абрам (1880 г.), спалены 22.6.1942 г.

ЖУРАВЕЛЬ Еўмель, разам з жонкай і чатырма дзецьмі спалены 22.6.1942 г.

ЖУРАВЕЛЬ Цодзік, яго жонка і дзеці — **Борух, Гірш, Любоў, Малка** спалены 22.6.1942 г.

КАЛЯДА Агрыпіна Навумаўна (1880 г.), забіта 22.2.1944 г.

КАЛЯДА Мікалай Іванавіч (1929 г.), расстраляны ў 1944 г.

КАЛЯДА Пётр Сямёнавіч (1910 г.), загінуў 24.4.1944 г.

КАРОТКАЯ Марыя Паўлаўна (1900 г.), расстраляна 10.3.1944 г.

КАРОТКАЯ Сцепаніда Марцінаўна (1904 г.), расстраляна 1.10.1944 г.

КАРОТКІ Аляксандр Андрэевіч (1880 г.), забіты ў 1943 г.

КОЗІК Маісей Ціліпавіч (1884 г.), расстраляны 15.2.1944 г.

КОЗІНЕЦ Арцём Пятровіч (1883 г.), загінуў 1.3.1944 г.

КОЗІНЕЦ Васіль Мяфодзьевіч, падарваўся на міне ў 1944 г.

КОЗІНЕЦ Дамітрый (1884 г.), забіты 22.2.1944 г.

КОЗІНЕЦ Макар Цітавіч (1893 г.), расстраляны ў 1943 г.

КОЗІНЕЦ Марта (1880 г.), расстраляна 10.3.1944 г.

КОЗІНЕЦ Рыгор Арсеньевіч (1912 г.), расстраляны 1.3.1944 г.

КОЗІНЕЦ Фядора (1910 г.), загінула 22.6.1943 г.

КУЛАКОЎСКІ Мікалай Л. (1885 г.), забіты 5.1.1944 г.

ЛАБОВІЧ Аляксандра (1922 г.), расстраляна 30.1.1944 г.

МАЕР Іван Кірылавіч (1887 г.), забіты 28.5.1944 г.

МАЁРЧЫК Ерафей Паўлавіч (1913 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

МАЗАЙ Іван Дамітрыевіч (1942 г.), расстраляны 22.6.1943 г.

МАЗАЙ Іван Іосіфавіч (1897 г.), забіты 20.2.1944 г.

МАЗАЙ Іван Лявонавіч (1888 г.), забіты 20.2.1944 г.

МАЗАЙ Ірына Фёдараўна (1900 г.), падарвалася на міне ў 1944 г.

МАЗАЙ Ісак Іванавіч (1912 г.), расстраляны 20.1.1941 г.

МАЗАЙ Малання Яфімаўна (1880 г.), забіта 22.6.1943 г.

МАЗАЙ МакрынаАнуфрыеўна (1880 г.), расстраляна 22.6.1943 г.

МАЗАЙ Сяргей Іосіфавіч (1908 г.), расстраляны 22.6.1943 г.

МАЗАЙ Сцяпан Архіпавіч (1927 г.), расстраляны 25.6.1943 г.

МАЗАЙ Якаў Паўлавіч (1908 г.), забіты ў 1941 г.

НІКАЛАЕНКА Іван (1912 г.), расстраляны 20.1.1944 г.

ПАЎЛЮЧОК Агрыпіна Якаўлеўна (1880 г.), забіта ў чэрвені 1943 г.

ПАЎЛЮЧОК Наталля Міхайлаўна (1905 г.), расстраляна з дочкамі **Марыяй і Яўдавігай** 10.1.1943 г.

ПАЎЛЮЧОК Павел Аляксеевіч (1880 г.), расстраляны 10.1.1943 г.

ПАЎЛЮЧОК Хрысціна (1918 г.), з двума дзецьмі расстраляна ў 1941 г.

ПЕРАХОЦКІ Павел Сцяпанавіч (1883 г.), расстраляны ў 1943 г.

ПЛАВІНСКАЯ Ніна Андрэеўна (1914 г.), спалена 22.6.1942 г.

ПРАХОЦКАЯ Ануся (1880 г.), забіта 5.1.1944 г.

САРОЧЫК Аўдоцця Іванаўна (1880 г.), забіта 22.6.1943 г.

САРОЧЫК Ганна Васільеўна, расстраляна ў 1943 г. у Капаткевічах.

САРОЧЫК Ганна Ігнатаўна (1904 г.), забіта 22.7.1944 г.

САРОЧЫК Данііс Юр'евіч, расстраляны ў 1943 г. у Капаткевічах.

САРОЧЫК Сямён Юр'евіч (1866 г.), забіты 8.1.1944 г.

СТАРЫНСКАЯ Марыя (1896 г.), забіта 8.8.1944 г.

ТРАПЕЗА Аркадзій Сяргеевіч (1928 г.), расстраляны 30.1.1944 г.

ТРАПЕЗА Сяргей Аркадзьевіч (1900 г.), загінуў 30.1.1944 г.

ХАНЧЭЎСКІ Пётр Сцяпанавіч (1888 г.), расстраляны 1.3.1944 г.

ХАНЧЭЎСКАЯ Ульяна Фядосаўна (1874 г.), спалена 20.2.1944 г.

ХАРЛАНЧУК Елізавета (1909 г.), загінула 22.6.1942 г.

ХАРЛАНЧУК Надзея Раманаўна (1940 г.), спалена 22.6.1942 г.

ХАРЛАНЧУК Наталля Паўлаўна (1880 г.), спалена 22.6.1942 г.

ЦЯРЭШЧАНКА Матруна Барысаўна (1917 г.), падарвалася на міне ў 1945 г.

ЧАУС Рыгор Міхайлавіч (1918 г.), расстраляны 20.1.1943 г.

ШУРПАЧ Васіль Мікітавіч (1886 г.), забіты 4.3.1944 г.

ШУРПАЧ Рыгор Мікалаевіч (1870 г.), забіты 4.3.1944 г.

ЮДЫЦКАЯ Матруна (1890 г.), загінула 7.3.1944 г.

ЯСЬКОЎ Міхаіл Лявонавіч (1880 г.), расстраляны 28.2.1942 г.

Свята са слязамі на вачах...

Восенню 1943 г. Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі. Пачалося вызваленне рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 26 лістапада воіны Чырвонай Арміі ўвайшлі ў Гомель. Воінамі 65-й і 61-й армій 14 студзеня 1944 г. вызвалены Калінкавічы і Мазыр. Баявыя дзеянні набліжаліся да граніц Капаткевіцкага і Петрыкаўскага раёнаў. Войскі ставілі мэтай выкарыстаць маразы, каб фарсіраваць рэкі, якія былі на іх шляху. Вораг з усіх сіл імкнуўся затрымацца на гэтых натуральных рубяжах. На даных партызан, у раёне населеных пунктаў Навасёлкі, Пціч, Вялаўск, Петрыкаў, Канцэвічы дыслацыравалася каля 7500 нямецкіх салдат.

Цяжкімі рубяжамі для нашых войск былі рэчкі Трэмля і Пціч. Маразы часта змяняліся адлігамі, лёд тонкі. Перад наступаючымі войскамі была пастаўлена задача фарсіраваць рэкі і працягваць наступленне. З 8 студзеня па 8 лютага 1944 г. працягвалася наступальная Калінкавіцка-Мазырская аперацыя войск левага крыла Беларускага фронту, якім камандаваў генерал арміі К. К. Ракасоўскі. На тэрыторыі раёна баявыя дзеянні вяла 61-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П. А. Бялова, партызаны Гомельскага і Пінскага злучэнняў. У выніку аперацыі савецкія войскі прасунуліся наперад на 60 км, адкінулі ворага да р. Пціч і ў раён Петрыкава.

Каб забяспечыць адыход сваіх часцей з-пад удараў нашых войск, вораг да поўдня 28 студзеня 1944 г. упарта абараняў в. Церабаў. Авалоданне гэтага населенага пункта забяспечыла б нашым часцям падыход да ракі Пціч. Бой за Церабаў вяла 76-я гвардзейская дывізія. Нашым войскам даводзілася з вялікай крывёю адваёўваць кожны метр. Немцы ў ноч на 29 студзеня падналілі заходнюю частку вёскі. У 13 гадз. часці дывізіі, пераадолеўшы супраціўленне ворага, авалодалі паўночна-ўсходняй часткай Церабава і да наступлення ночы працягвалі бой. 29 студзеня ў 2 гадз. першыя групы 237-га і 239-га гвардзейскіх стралковых палкоў пачалі фарсіраваць р. Трэмля, аўтаматчыкі завязалі вулічны бой. Да 6 гадз. вёска была поўнасцю ачышчана ад ворага. Часці дывізіі выйшлі на рубеж 2 км на захад ад Церабава і завязалі бой.

Авалоданне населеным пунктам Церабаў дазволіла нашым войскам ачысціць усходні бераг р. Пціч, правесці разведку абароны ворага, падыходаў да ракі і 31 студзеня пераправіцца і замацавацца на правым беразе Пічы. 29 студзеня ўзнавіла наступленне 81-я стралковая дывізія. У выніку наступальных дзеянняў 30 студзеня сіламі 519-га стралковага палка была ўзята в. Гарадзішча, а 467-ы стралковы полк авалодаў хутарам Усочы. З наступленнем цемры 519-ы полк фарсіраваў р. Пціч на захад ад Гарадзішча і захапіў плацдарм на заходнім беразе. 1 лютага 519-ы полк выйшаў на ўсход ад Паўлаўкі. Ноччу падраздзяленні 467-га палка таксама пераправіліся на заходні бераг Пічы.

Раніцай 2 лютага падраздзяленні двух палкоў адбілі жорсткую контратаку ворага з напрамку Паўлаўкі. На наступны дзень пасля артылерыйскай падрыхтоўкі ва ўзаемадзеянні з 15-й стралковай дывізіяй нашы войскі перайшлі ў наступленне. На працягу двух дзён, пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, часці рухаліся ў напрамку Паўлаўкі і замацаваліся ў гэтым раёне.

Успамінае ўдзельнік баёў за в. Церабаў І. Мяняйла. У канцы студзеня 1944 г. камандзір батальёна маёр Усцінаў даручыў камандзіру кулямётнай роты старшаму лейтэнанту П. Лакцёнаву перасекчы дарогу Церабаў – Капаткевічы і пры адыходзе гітлераўцаў закупорыць яе паміж непраходнымі балотамі.

— З Церабава да ракі Пціч адна дарога, дзе вы зробіце засаду. Будзьце гатовы сустрэць праціўніка. Лакцёнаў загадаў акапацца. У мокрым снезе гэта было вельмі нялёгка. З боку Церабава чулася

бесперапынная страляніна. І вось у туманнай імгле паказаліся постаці ворагаў. Кулямётчыкі першымі адкрылі агонь. Лейтэнант Д. Парашчын кіраваў боем на другім баку дарогі. Многія гітлераўцы адваяваліся ў тую раніцу на лясной дарозе ля Церабава.

Праз некаторы час ля раз'езда Малашэвічы загінуў старшы лейтэнант Лакціёнаў. Яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У лютым войскі 61-й арміі адбівалі контратакі ворага, які імкнуўся вярнуць страчаныя пазіцыі, праводзілі частковую перагрупіроўку войск, падцягвалі артылерыю, папаўнялі боезапас, вялі глыбокую разведку абароны ворага. 55-я стралковая дывізія атрымала загад перабазіравацца з раёна Церабава і заняць абарону на рубяжы Скрыгалаў — Убарцкая Рудня. Праведзена перадыслакацыя і другіх падраздзяленняў. На 5 лютага істотных змяненняў лініі фронту не адбылося. Камандуючы 1-м Беларускім фронтам К. К. Ракасоўскі ў кнізе «Солдатский долг» пісаў:

«6 февраля положение на фронте не изменилось, и лишь 7 февраля 415-я стрелковая дивизия, наступая в общем направлении Ивашковичи, овладела д. Павловка и вела бой в 1 км северо-западнее. Остальные части дивизии находились на прежних рубежах.

8 февраля 23-я стрелковая дивизия с 3.00 продолжала наступление с задачей овладеть д. Колки, которая превращена противником в опорный пункт с круговой обороной, удерживаемый подразделениями 4-й танковой дивизии. Под сильным огнем противника 225-й и 117-й стрелковые полки переправились на западный берег р. Тремля и ворвались на юго-западную окраину Колок. Противник... силами до роты пехоты с двумя танками, 4 бронетранспортерами с пехотой контратаковал подразделения 225-го стрелкового полка и потеснил в рощу, что 1,5 км юго-западнее Колок. Переправа 89-го стрелкового полка на западный берег р. Тремля сдерживалась сильным огнем противника из района д. Колки».

19 лютага 89-ы стралковы корпус на працягу ночы вёў падрыхтоўку да наступлення. У 9 гадз. 30 мін сіламі 15-й і 23-й стралковых дывізій перайшоў у наступленне з задачай авалодаць в. Колкі. Воіны 15-й дывізіі, наступаючы з рубяжа Вострава, Загрэўкі, сутыкнуліся з моцным супраціўленнем ворага. Адбіўшы тры контратакі ворага, завязалі бой на паўночны ўсход ад в. Колкі. Лыжны батальён атрымаў загад выйсці ў тыл ворага і злучыцца з партызанамі. Лыжнікі былі спынены моцным агнём ворага і ўступілі ў бой каля в. Зублішча. 23-я дывізія мела задачу авалодаць в. Колкі з поўдня і вяла бой у 2 км ад вёскі.

Не змяніўся характар баявых дзеянняў і 20 лютага. Лыжны батальён, абышоўшы в. Зублішча, выйшаў у Белае Балота (у 5 км ад Лучыц) і злучыўся з партызанамі для сумеснага наступлення. Раніцай 21 лютага батальён і партызаны былі сустрэты моцным агнём і контратакаваны, наступленне поспеху не мела, воіны вымушаны былі адысці. 22 лютага войскі арміі спынілі наступальныя дзеянні на правым флангу і прыступілі да абароны і ўмацавання займаемага рубяжа, вялі разведку. 25 лютага ў адпаведнасці з дырэктывай Стаўкі 61-я армія ўвайшла ў састаў войск 2-га Беларускага фронту. Напрамак наступлення яе быў ранейшым.

Штодзень ішлі кровапралітныя, беспаспяховыя баі. Чырвоная Армія выдыхалася, без падтрымкі артылерыі, танкаў, якія адсталі ад перадавых часцей, наступленне ў тыя студзеньскія і лютаўскія дні наогул уяўлялася бесперспектыўным, але наступала каманда: «Наперад...». На высокім заходнім беразе Пцічы праціўнік замацаваўся на загадзя падрыхтаваных пазіцыях, мясцовасць была цяжкапрахадной, балоцістай. Фронт «забуксаваў» тут амаль на доўгіх паўгода.

У сакавіку была праведзена перагрупіроўка падраздзяленняў, вялося ўмацаванне абароны, папаўненне боепрыпасамі. Лінія фронту складалася з дзвюх палос. Першую трымаў 89-ы стралковы корпус, 55-я і 23-я дывізіі. Другую паласу займаў 9-ы гвардзейскі стралковы корпус, 2-і кавалерыйскі корпус быў у рэзерве.

У другой палавіне сакавіка войскі 61-й арміі сіламі 55-й стралковай дывізіі вялі паспяховыя наступальныя баі па ачышчэнню ад ворага паўднёвага берага р. Прыпяць на ўчастку Багрымавічы — Убарцкая Рудня. Часці Чырвонай Арміі праводзілі перагрупіроўку, рыхтаваліся да наступлення. Лінія абароны заставалася амаль без змен у канцы сакавіка і ў красавіку.

У чэрвені 1944 г. у час падрыхтоўкі Беларускай наступальнай аперацыі ў састаў 1-га Беларускага фронту была ўключана 28-я армія, якая заняла лінію абароны на тэрыторыі Капаткевіцкага раёна. У задачу яе ўваходзіла не дапусціць прарыву пяхоты і танкаў ворага, а таксама перакрыць напрамкі на Колкі, Белы Бераг, Жукаўка, Першая Слабодка, Залессе.

Баявая дзейнасць працiўніка насіла характар абароны на шырокім фронце. На ўчастку Капаткевічы – Багрымавічы на заходнім беразе р. Пціч апорнымі пунктамі і вузламі супраціўлення ворага з'яўляліся Капаткевічы, Іванкавічы, Пціч, Багрымавічы. Пярэдні край меў тры лініі траншэй з добра арганізаванай сістэмай агню, з дротавымі агароджамі і міннымі палямі.

Войскі 55-й дывізіі, якой камандаваў палкоўнік М. А. Андрусенка, правялі перагрупіроўку сіл. Вялася сістэматычная разведка абароны ворага. Старшы сяржант Курдзюкоў з групай разведчыкаў неаднаразова пранікаў у тыл ворага ў раёне Багрымавіч і Конкавіч, знаходзіўся там па 3–4 сутак і прыносіў каштоўныя звесткі аб ворагу.

27 чэрвеня раніцай на камандны пункт 55-й дывізіі з'явіліся камандзір 89-га стралковага корпуса генерал-маёр Япоўскі, камандзір Дняпроўскай ваеннай флатыліі капітан першага рангу Грыгор'еў і камандзір 2-й брыгады рачных катэраў капітан другога рангу Міцін. Камандзіру 55-й дывізіі была пастаўлена задача ва ўзаемадзеянні з 2-й брыгадай рачных катэраў наступаць у паўночна-заходнім напрамку і фарсіраваць р. Прыпяць. Бліжэйшая задача – авалодаць апорным пунктам немцаў у г. Петрыкаў. Гатоўнасць да пачатку аперацыі – 6.00 28 чэрвеня. Сігнал «Дуб» на наступленне быў дадзены ў 17.00.

Пасля атрымання сігналу на наступленне брапякатэры пад прыкрыццём агню дывізіённай артылерыі высадзілі на левы бераг Прыпяці групу разведчыкаў 107-га палка і атрад маракоў у складзе звыш 50 чалавек. Дэсантнікі ўклініліся ў абарону ворага, захапілі плацдарм і двух палонных, якія далі каштоўныя звесткі аб абароне праціўніка. Яны сказалі, што салдатам загадана абараняцца да апошняга...

Камандуючы 61-й арміяй паставіў задачу перад 55-й дывізіяй у раёне Скрыгалава, перад 23-й стралковай дывізіяй у раёне Турава пачаць наступленне ў напрамку Жыткавіч. З войскамі 61-й арміі дзейнічала 2-я брыгада караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі пад камандаваннем капітана першага рангу В. Грыгор'ева. Аперацыю падтрымлівалі лётчыкі 16-й паветранай арміі генерал-лейтэнанта С. Рудэнкі. Прарыў абароны на Петрыкаўскім напрамку пачаўся 28 чэрвеня ў 17 гадзін 30 мінут ніжэй в. Конкавічы. Дэсант на левы бераг Прыпяці высадзілі маракі-дняпроўцы. Пры дапамозе катэраў флатыліі пад шалёным агнём ворага пачаў фарсіраваць Прыпяць першы батальён 107-га палка пад камандаваннем капітана В. Турчанінава. На левы бераг Прыпяці на катэрах быў перапраўлены 111-й



Камень у Дарашэвіцкім парку, устаноўлены ў 1947 г. у гонар вызвалення раёна

полк, які заняў плацдарм у раёне вв. Конкавічы і Навасёлкі. Конкавічы былі вызвалены апоўдні 29 чэрвеня. Паспяховае наступленне стралковых палкоў і маракоў Дняпроўскай флатыліі прымусіла ворага пакінуць ст. Пціч.

У гэтых баях нязгаснай славай пакрыў сябе малодшы лейтэнант М. П. Чалы. Ён камандаваў галаўным атрадам флатыліі, удзельнічаў каля Петрыкава ў чатырох дэсантных аперацыях. Дэсантнікі пераадолелі дротавыя ўмацаванні і мінныя поле, выявілі размяшчэнне варожых пазіцый, авалодалі вузлом абароны праціўніка ў в. Конкавічы, садзейнічаючы паспяховаму наступленню падраздзяленняў Чырвонай Арміі на Петрыкаў. М. П. Чалы загінуў 1 ліпеня ў баі каля в. Дарашэвічы.

Караблі флатыліі пачалі пераправуляць на захоплены плацдарм 1-ы батальён 107-га палка пад камандаваннем капітана Турчанінава. Воіны імкліва наступалі ў напрамку Конкавіч па цяжкапраходнай балоцістай мясцовасці. Іншыя падраздзяленні 107-га палка знішчылі прадмосны плацдарм праціўніка каля Шастовіч і Вялаўска і прыступілі да фарсіравання Прыпяці на поўдзень ад Навасёлак. У гэтым крывапралітным баі асабліва вызначыліся воіны 2-га батальёна пад камандаваннем капітана Нізаўца. Падраздзяленні 111-га і 228-га палкоў пераадолелі ўмацаванні ворага на правым беразе Прыпяці на поўдні ад Петрыкава і пад покрывам ночы пачалі фарсіраваць раку. Войскі атрымалі загад раніцай 28 чэрвеня авалодаць г. Петрыкаў.

Пры праследаванні ворага ў блінданжы каля в. Гараваха былі знойдзены дакументы камандзіра пункта 102-й нямецкай пяхотнай дывізіі і схема абароны ворага. Гэта значна аблегчыла задачу наступаючых войск. На ўчастку фронту па ўсходнім беразе р. Пціч на тэрыторыі Капаткевіцкага раёна ад в. Дземенка да вусця ракі часці войск вялі разведку, рыхтавалі пераправу праз раку.

У выніку паспяховых наступальных дзеянняў 55-й стралковай дывізіі і часцей 28-й арміі ў напрамку Слуцк — Баранавічы вораг, каб не трапіць у акружэнне, вымушаны быў паспешна адысці, пакінуўшы ўмацаваны рубеж абароны па заходнім беразе р. Пціч. Баі ішлі надзвычай цяжкія і крывапралітныя, у балоцістай, цяжкапраходнай мясцовасці. Ворагі абараняліся з упартасцю асуджаных. Задача па авалоданні Петрыкавам была выканана толькі 30 чэрвеня. У 23.30 у горад увайшлі часці Чырвонай Арміі.

2 ліпеня войскі 55-й Мазырскай стралковай дывізіі з баямі падышлі да в. Брынёў. Вораг аказаў моцнае супраціўленне. З п. Капцэвічы немцы кідалі аўтаматчыкаў пры падтрымцы танкаў і самаходных гармат, спрабуючы абысці 107-ы полк. У гэтых баях зноў вызначыўся першы батальён пад камандаваннем капітана Турчанінава. Амаль акружаны, ён знішчыў да роты аўтаматчыкаў, самаходную гармату, танк, некалькі павозак ворага. Правы фланг дывізіі быў узмоцнены асобным знішчальна-супрацьтанкавым дывізіёнам і групай разведчыкаў з разведроты дывізіі пад камандаваннем капітана Зіміна, які быў цяжка паранены. У 5 гадз. 3 ліпеня часці дывізіі авалодалі Брынёвам.

Загадам камандзіра дывізіі камандзір асобнай зенітнай роты старшы лейтэнант Барысаў быў прызначаны камендантам г. Петрыкаў. У яго задачу ўваходзіла арганізацыя абароны горада, прыкрыццё дзеянняў дывізіі з тылу, падтрымка парадку ў горадзе, арганізацыя мірнага жыцця насельніцтва.

Войскі 55-й Мазырскай стралковай дывізіі працягвалі наступленне і вызваленне раёна ад акупантаў. Бліжэйшай баявой задачай было авалоданне сіламі 107-га палка чыгуначнай станцыяй Старушкі. 111-ы полк праследаваў праціўніка ў напрамку Гараваха — паўночная ўскраіна Брынёва. 228-ы полк знаходзіўся ў рэзерве. 2-я брыгада рачных катэраў з вучэбнай ротай і ад-

дзяленнем сапёраў пад камандай капітана Андрэева атрымала загад дэсантнымі дзеяннямі авалодаць в. Дарашэвічы і прыкрываць дывізію злева. Задача была паспяхова выканана, у выніку ўвесь раён ачышчаны ад ворага. Шлях ляжаў далей, на захад, дзе з вялікім нецярпеннем чакалі збаўлення змучаныя гадамі няволі савецкія людзі.

А. В. Бічан

ИЗ ПРИКАЗА КОМАНДИРУ 415-й СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ

Противник из района Калинковичи — Мозырь отходит в западном и северо-западном направлении... К исходу 15.1.44 переправиться через р. Припять на участке устье р. Птичь — м. Скрыгалов и головными частями овладеть м. Птичь, Конковичи. 55-я стрелковая дивизия преследует отходящего противника вдоль железной дороги Калинковичи — ст. Птичь.

Боевое распоряжение командиру 2-го гвардейского кавалерийского корпуса.

2-му гвардейскому кавалерийскому корпусу продолжать наступление. Задача — к утру 15.1.44 г. овладеть населенными пунктами Капуры, Млынок, Беседки и, удерживая район, не допустить отход противника с востока на м. Птичь. В дальнейшем наступать в направлении на Конаткевичи, Лучицы.

БОЕВОЕ ДОНЕСЕНИЕ О ПОЛОЖЕНИИ ЧАСТЕЙ 61-й АРМИИ

16.1.44 к 20.00 части занимают следующий рубеж: 2-й гвардейский кавалерийский корпус вел упорный бой за овладение деревнями Беседки, Багримовичи. Встретив организованное огневое сопротивление противника, успеха не имел. 17-я гвардейская кавалерийская дивизия — Беседки, отм. 1208, юго-восточная окр. Багримовичи.

Несмотря на первые неудачи, войска согласно приказу командования должны очистить от противника бассейны рек Тремля и Птичь.

18 и 19 января войска армии вели наступательные бои, встретив сильное огневое сопротивление и контратаки противника, успеха в продвижении не имели.

Белов

ИЗ ОТЧЕТА О БОЕВЫХ ДЕЙСТВИЯХ 61-й АРМИИ

Войска правого фланга и центра армии продолжали преследование противника и продвинулись вперед от 4 до 9 км, овладели населенными пунктами Теребов, Городище, Хусное, Капуры, Беседки. На участке Городище — Багримовичи вышли на восточный берег р. Птичь.

9-й гвардейский стрелковый корпус к 11.00 очистил от противника Теребов и к исходу дня продвинулся до 6 км.

89-й корпус, преследуя отходящего противника, продвинулся вперед до 9 км и вышел на восточный берег р. Птичь.

15-я дивизия занимает рубеж Городище — Хусное. 356-я стрелковая дивизия — восточный берег р. Птичь на участке Хусное — хутор Горки.

415-я дивизия в результате ночного боя овладела населенными пунктами Капуры, Беседки и к исходу дня вышла на восточный берег р. Птичь. Один полк форсировал р. Птичь и ведет бой на восточной окраине д. Багримовичи.

30 января 89-й корпус к 23.00 под сильным огнем противника начал форсирование р. Птичь.

81-я дивизия переправила на западный берег реки стрелковый полк в районе отм. 119,9 800 м северо-западнее Городища (остальные части продолжают форсирование реки).

15-я дивизия форсировала к 19.00 р. Птичь юго-западнее Городища. Ведет бой за расширение плацдарма.

356-я дивизия к 17.00 форсировала р. Птичь на участке Хусное — хутор Горка и ведет бой за расширение плацдарма на западном берегу реки.

415-я дивизия с утра перешла в наступление с задачей: блокируя Багримовичи с севера, совместно с частями 356-й дивизии выйти к южной окраине м. Птичь и овладеть последним. Встретив сильное огневое сопротивление противника, успеха не имела. Ведет бой на прежнем рубеже.

17-я гвардейская кавалерийская дивизия вышла к южному берегу р. Припять в 3 км севернее Скрыгалова.

Главные силы армии вышли к р. Птичь.

ИТОГИ БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПАРТИЗАН ПЕРЕД ФРОНТОМ 61-й АРМИИ ЗА ЯНВАРЬ 1944 г.

...Партизанам в январе 1944 г. пришлось вести бой с противником по р. Птичь, где противник решил занять оборону и вытеснить партизан:

а) с 5.1.44 г. противник ввел свои гарнизоны в ряд деревень партизанской зоны северо-западнее Копаткевич;

б) в ночь на 8.1.44 г. партизаны в составе двух бригад напали на немецкие гарнизоны в деревнях Кощевичи... Филиповичи, Новоселки, выбили их, уничтожив при этом более 140 солдат и 9 офицеров противника;

в) 8.1.44 г. противник силой до батальона повел наступление из д. Михедовичи на д. Бобрик, занятую партизанами. Отряды бригады Скалобана вели бой в течение 5 ч 30 мин. Противник поджег деревню и с потерями отошел;

г) 18.1.44 г. противник, стремясь занять западный берег р. Птичь севернее д. Кощевичи, овладел д. Кашевичи, Н. Головчицы;

д) 21.1.44 г. после продолжительного боя немцы заняли Проходы, Ст. Головчицы, Белый Переезд, Лучицы.

ИЗ ЖУРНАЛА БОЕВЫХ ДЕЙСТВИЙ 61-й АРМИИ ЗА МАРТ 1944 г.

13 марта войска 55-й дивизии преследовали отходящего противника, усиленно минировавшего пути отхода на участке Балажевичи — Сколодин, заняли 15 населенных пунктов и продвинулись вглубь от 2 до 6 км.

55-я дивизия к 20.00 вышла на рубеж:

107-й стрелковый полк — западнее Балажевич на опушке леса, восточнее Шестович;

111-й стрелковый полк: Шестовичи, восточный берег озера Глиницкое, Глиница;

228-й стрелковый полк: Глиница, хутор Сколодинская Гряда, Убортская Рудня...

14 марта. Противник на участке Балажевичи — Петриков продолжал отход в северном и северо-западном направлении, прикрываясь огнем орудий и минируя пути отхода... 107-й стрелковый полк вышел на рубеж отм. 115,9 (западнее Балажевич);

111-й стрелковый полк — Шестовичи, Велавск;

228-й стрелковый полк — отм. 120,8 (3 км юго-западнее Велавска).

Дивизия ведет усиленную разведку в направлении Снядина.

23-я дивизия, обороняя прежний рубеж, ведет разведку в направлении д. Мордвин. Весь район населенного пункта минирован...

15 марта. Противник на участке Балажевичи — Петриков отвел основные силы на северный берег р. Припять. Продолжают оказывать сопротивление мелкие группы автоматчиков северо-восточнее Мойсеевич.

Части дивизии вели разведку и бой с противником. Встретив сплошные минные поля, лесные завалы, части продвинулись вперед и заняли х. Черноцкие, д. Мойсеевичи и вышли на рубеж:

107-й стрелковый полк — отм. 115,9 (западнее д. Балажевичи) — ур. Замостовье;

117-й стрелковый полк — 700 м севернее д. Шестовичи, х. Черноцкие...

16 марта. ...Частью сил 55-я и 23-я стрелковые дивизии перешли в наступление в направлениях дд. Снядин, Белин... Разведгруппы 55-й стрелковой дивизии полностью очистили от противника южный берег р. Припять на участке Балажевичи — Петриков.

356-я дивизия обороняет прежний рубеж, ведет разведку в направлении м. Птичь.

55-я дивизия силами 107-го и 111-го стрелковых полков обороняет прежний рубеж;

228-й стрелковый полк двумя стрелковыми и минометной ротой, переправившимися через р. Уборть, занял хх. Мордвин, Набедра, Долгие, ведет разведку в направлении Белина, Снядина.

20 марта. На петриковском направлении к исходу 20.03.44 г. противник удерживает рубеж: Колки, Броды, Копаткевичи, Птичь, Багримовичи, северный берег р. Припять до Петрикова...

1 апреля. Противник обороняется против правого крыла армии на рубеже: Михайловская, Колки, Копаткевичи, Млынок, Птичь, Багримовичи, Конковичи, Белановичи, Петриков, Голубица, Дорошевичи, Лясковичи...

В апреле армия наступательных действий не вела. С 15 апреля директивой Ставки войскам фронта было приказано перейти к обороне. Войска проводили частичную перегруппировку сил в целях перехода к жесткой и прочной обороне на широком фронте, продолжали укреплять прежний рубеж, вели разведку и перестрелку с противником, очищали от снега дороги, так как были снежные заносы. Непосредственная боевая деятельность войск ограничивалась отражением попыток противника к ведению разведки наших боевых порядков и ведением активной разведки противника...

...В апреле в состав 61-й армии прибыла бригада Днепровской военной флотилии под командованием капитана 1-го ранга Григорьева.

В мае войска армии продолжали оборонять прежние рубежи, производили оборонительные работы по усовершенствованию занимаемых позиций, вели перестрелку с противником. Противник вел редкий артиллерийско-минометный огонь из районов Багримовичи, Петриков...

ЗАДАЧА 55-й СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ НА НАСТУПЛЕНИЕ И ОСВОБОЖДЕНИЕ г. ПЕТРИКОВ

...Наступать в западном направлении, боевой порядок дивизии — три полка в линии, главный удар — левым флангом двумя полками в направлении г. Петриков. Правым флангом наступать во взаимодействии со 2-й бригадой речных катеров вдоль левого берега р. Припять, дав возможность подхода кораблям бригады к району г. Петриков для совместного действия с частями дивизии. Готовность к наступлению 6.00 28 июня, начало боевых действий по сигналу «Дуб»...

107-й стрелковый полк во взаимодействии со 2-й бригадой речных катеров... форсировать р. Припять и овладеть д. Конковичи, в дальнейшем наступать вдоль левого берега Припяти и обеспечить подход бронекатеров бригады к г. Петриков, для чего на бронекатерах высадить десант силой до батальона на левый берег Припяти северо-восточнее д. Скрыгалов, остальными силами полка уничтожить плацдарм противника севернее Веланска и далее форсировать Припять южнее Новоселок. Особое внимание уделить своему правому флангу.

111-му стрелковому полку форсировать Припять южнее д. Белка, наступать в направлении на восточную окраину д. Белка и во взаимодействии с 228-м стрелковым полком овладеть г. Петриков обходом его с севера, в дальнейшем наступать вдоль шоссе на Гороваху...

228-му стрелковому полку форсировать р. Припять в районе отм. 121,1, наступать на западную окраину г. Петриков с задачей во взаимодействии со 111-м стрелковым полком овладеть городом, обойдя с запада.

Командиру 2-й бригады речных катеров взаимодействовать с 107-м стрелковым полком, обеспечить высадку десанта силой до батальона на левый берег Припяти в районе северо-восточнее Скрыгалова и при поддержке артиллерийского огня бригады и катеров очистить левый берег реки от противника, подойти к г. Петриков и во взаимодействии со 111-м и 228-м полками овладеть городом; обеспечить переправу на левый берег р. Припять в районе южнее Новоселок артиллерии, штаба дивизии, обозов...

111-й и 228-й стрелковые полки, форсировав реку, оказались в болотистой местности, ввиду сильного огня противника продвигаться дальше не могли и в течение 29 июня и с утра 30 июня овладеть городом не могли...

Ввиду успешного продвижения 107-го полка часть артиллерии и штаб дивизии на плавсредствах бригады речных катеров в районе Новоселок были переправлены на левый берег реки. КП дивизии в 11.00 30 июня был развернут в Новоселках.

В 13.00 командир дивизии отдал приказ:

а) 107-му полку прикрывать действия частей дивизии справа;

б) 111-му полку на бронекатерах и плавсредствах бригады достичь д. Новоселки, высадиться на левый берег реки и наступать на Петриков обходом города с севера;

в) 228-му полку сковать противника в районе Петрикова и совместно со 111-м полком ворваться в город...

КРАТКАЯ СПРАВКА О БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ 161-го УКРЕПРАЙОНА

В 3.00 ч 3 июля 44 г. форсирована р. Птичь в районе д. Хвойня. Противник преследовался в направлении Капсевичи, Новые Головчицы, Комаровичи... За 4 дня боевых действий части укрепрайона, ведя наступательные действия по преследованию противника в направлении дд. Хвойня, Капевичи, Новые Головчицы, заняли 310 населенных пунктов, среди которых: Поречье, Капевичи, Германова Слобода, Головчицы, Комаровичи... Построено мостов длиной от 4 до 10 м — 25, отремонтировано дорог — 29 км, построено объездных дорог — 110 км, снято противотанковых мин — 1025, противопехотных мин — 795, построено паромных переправ через р. Птичь — 3, мостов через Птичь длиной 70 м — 1.

БОЕВОЕ ДОНЕСЕНИЕ 1 июля 1944 г.

Перед фронтом обороны противника нет. Подразделения батальона вели наблюдение и службу по охране рубежа на переднем участке обороны. Производилось огораживание минных полей. В 15.00 возвратилась часть разведгруппы, которая прошла по маршруту Рог — Акрыёны — ст. Коржевка — Млынок — Хусное. Противника не обнаружено. Между дд. Рог и Акрыёны взорваны все мосты (13 шт.).

Части 119-го УР, не встретив противника, 4 июля 1944 г. прошли населенные пункты Птичь, Койковичи, Мицуры, Слинки, Коржевка, Сметаничи. 5 июля 44 г. 415-й ОПАБ головной колонной прошел к 12.00 Оголичскую Рудню и к вечеру достиг выс. 134,2. 370-й ОПАБ, достигнув рубежа Жердь, преследовал противника по направлению Рябка — Б. Селютичи. 6.07.44 г. части 119-го УР прошли Концевичи и продолжали движение по маршруту в направлении Бринёва.

ЦАМО РФ, ф. 55-й СД, оп. 1, д. 22; ф. 119, оп. 1, д. 1; ф. 418, оп. 106, д. 373; ф. 1077, оп. 2, д. 49.

ИЗ СООБЩЕНИЙ СОВЕТСКОГО ИНФОРМБЮРО

30 июня 1944 г.

В районе среднего течения реки Припять наши войска вели наступательные бои, в ходе которых овладели районными центрами Полесской области городом Петриков, городом Копаткевичи, а также заняли более 20 других населенных пунктов, в том числе Кошевичи, Челюшевичи, Ивашковичи, Конковичи, Белановичи и железнодорожные станции Секеричи, Птичь...

5 июля 1944 г.

...К западу от города Мозырь наши войска заняли более 30 населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Германова Слобода, Новоселки, Бобрик, Михедовичи, Концевичи, Бринев, Дорошевичи, Лясковичи..., а также железнодорожные станции Муляровка, Концевичи.

Чырвоны сцяг над Петрыкавам

З успамінаў былога начальніка палітаддзела 55-й Мазырскай стралковай дывізіі палкоўніка М. Б. Івушкіна

У кнізе «Гісторыя другой сусветнай вайны» генерал Курт Ціпельскірх пісаў: «За кошт значнага агалення раней займаемых пазіцый, а таксама з дапамогай дзвюх дывізій, знятых з іншых участкаў фронту, 2-я армія стварыла абарону на шырокім фронце ад Петрыкава да шашы Брэст — Ковель уключна»... Наступаючыя часці Чырвонай Арміі не змаглі з ходу прарваць абарону ворага.

15 лютага камандзір 55-й дывізіі палкоўнік Андрусенка і я накіраваліся ў 2-і кавалерыйскі корпус. Дывізія атрымала загад прыняць паласу абароны, якую да гэтага займаў корпус у раёне Скрыгалаў — Убарцкая Рудня. Абарона праціўніка перад фронтам дывізіі праходзіла па паўночным беразе р. Прыпяць і яе прытоку Убарці. На правым беразе Прыпяці, на паўднёвы захад ад Конкавіч, каля Навасёлак і Петрыкава гітлераўцы трымалі перадмоставыя ўмацаванні. Частка мясцовасці ў паласе абароны праціўніка была забалочана, пакрыта чаротам і хмызняком. Па берагах фашысты выкапалі тры лініі траншэй поўнага профілю, на подступах да іх устанавілі дротавыя перашкоды і мінныя палі.

Член Ваеннага савета арміі генерал-маёр Дуброўскі рэзка крытыкаваў камандзіра дывізіі за дрэнную арганізацыю разведкі. Гэтая задача была даручана начальніку штаба палкоўніку Шмыглёву і мне. Пачалі рыхтаваць групу пошуку. Яе ўзначаліў капітан Зімін. У групу ўвайшлі лепшыя разведчыкі — сяржанты Патрыкееў, Перацягін, Скуратаў і іншыя. 21 мая ўдалося захапіць унтэр-афіцэра, казначэя аднаго з батальёнаў 102-й пяхотнай дывізіі, які даў каштоўныя паказанні.

У красавіку па Прыпяці падышлі

караблі Дняпроўскай ваеннай флатыліі з задачай прыкрыцця стыку нашай дывізіі і 119-га ўкрэпраёна. Першыя сумесныя баявыя дзеянні былі праведзены ў ноч на 23 красавіка. З мэтай разведкі абароны праціўніка на паўночным беразе Прыпяці ў раёне в. Багрымавічы на чатырох катэрах і трох паўглісерах, якімі камандаваў капітан трэцяга рангу Пяскоў, высаджаны дэсант у складзе 56 чалавек. Дэсантнікі, падтрымліваемыя агнём катэраў, правялі разведку боем, выявілі абарону праціўніка. Нам стала вядома аб перагрупоўцы часцей ворага, удакладнена схема размяшчэння агнявых сродкаў. Перад фронтам дывізіі стаялі злучэнні і часці 2-й нямецкай арміі — 102-я пяхотная дывізія, 11-я дывізійная група «Кпот», 114-ы сапёрна-будаўнічы батальён і пяць дывізіёнаў артылерыі.

25 чэрвеня наша дывізія атрымала баявы загад: на ўзаемадзеянні з 2-й брыгадай рачных караблёў флатыліі прарваць абарону на левым беразе Прыпяці, авалодаць населенымі пунктамі Конкавічы, Аціркі, Навасёлкі і горадам Петрыкаў. На падрыхтоўку да наступлення адводзілася тры дні. Першым павінен быў фарсіраваць Прыпяць 107-ы полк. Камандзір палка падпалкоўнік Смякалін рашыў нанесці галоўны удар сіламі 1-га і 2-га батальёнаў. Энергічны і ініцыятыўны камандзір 1-га батальёна старшы лейтэнант Турчанінаў пачаў дзейна рыхтавацца да наступлення. Вось як былі апісаны дзеянні турчанінаўскага батальёна ў адным з газетных артыкулаў у 1944 г.

...«Гарачае сонца, цішыня на фронце. Спакойна цякуць няхуткія воды Прыпяці. Паўднёвы бераг — наш, паўночны — у руках немцаў. Відны пустыя вуліцы сяленняў на занятым ворагам беразе. Плёскае рыба ў рацэ...

Пяць-шэсць мін, дзве-тры чаргі з кулямёта за дзень, панылы гук усім надакучыўшай «рамы» — вось і ўсё, што нагадвае аб вайне. У салдат ёсць час, каб напісаць пісьмо, пачытаць газету, нават паглядзець кінафільм у старым хляве ў паўкіламетры ад нямецкай пазіцыі.

І ўсё-такі ўсім надакучыла цішыня. Хочацца хутчэй у бой, у наступленне, бо ўсе ведаюць, што там, за ракой, фашысты робяць злачынствы, штодзённа гінуць савецкія людзі...»

180 метраў воднай прасторы, якія трэба было пераадолець, маглі ператварыцца ў зону смерці. Доўгія месяцы абароны немцы выкарыстлі не дарма, пасялі як след умацавацца... Ноччу на лодцы адпылі разведчыкі малодшага лейтэнанта Сабліна, з імі чацвёра сапёраў. Яны вярнуліся раніцай, мокрыя і стомленыя, расказалі аб размяшчэнні нямецкіх батарэй, дзотаў, траншэй і, галоўнае, аб тым, што ім удалося перабрацца праз непраходнае, як думалі ўсе, і таму неабараняемае балота на правым флангу немцаў.

Наступнай ноччу да берага падышлі чатыры бранякатэры. На першы з іх узышлі разведчыкі і стралкі малодшага лейтэнанта Карабіцына.

І вось першы катэр аддаў швартовы. Ён не мог прыстаць да супрацьлеглага берага, нельга было дапусціць, каб яго заўважылі немцы... Прыпяць у гэтых месцах глыбокая, але матросы ведалі водмель, па якой можна было дайсці ўброд да берага. Яна пачыналася амаль з сярэдзіны ракі. Да яе падышоў катэр. Трымаючы зброю над галавой, людзі ішлі па пояс і па грудзі ў вадзе. Дваццаць чалавек высадзіліся на чале з малодшым лейтэнантам Саблiным. Ад дзеянняў гэтай невялічкай групы залежаў поспех бою. Стаяла задача: выйсці праз балота ў тыл і нечакана ўдарыць, пасеяць паніку ў стане ворага.

І вось цішыня раскалолася, у перадсвітальнае неба ўзвіліся дзесяткі ракет. Загрукатала нямецкая артылерыя, ёй пачала адказваць наша.

Катэры з дэсантам немцы заўважылі на сярэдзіне ракі. На іх абрушыўся шквал агню. У адказ катэры ўдарылі з гармат, адкрылі агонь артылерысты з нашага берага. Два другія катэры кінуліся на выручку, падышлі амаль ушчыльную да нямецкага берага і пачалі біць прамой наводкай. Пад прыкрыццём іх агню частка дэсанта паспела высадзіцца, але замацавацца было вельмі цяжка.

Саблін з дзесяткам байцоў атакаваў нямецкі дзот, Курдзюкоў кінуў у дзверы дзве гранаты. Некалькі чырвонаармейцаў пад камандаваннем Карабіцына ўварваліся ў траншэю і ачысцілі ад ворагаў яе значную частку. Аднак немцы хутка апамяталіся і атакавалі дэсантнікаў. Бой быў няроўным, вораг насядаў. Здавалася, выхаду няма. Ма-

ракі пайшлі ў контратаку ў бесказырках, у паласатых цяльняшках, прама пад шквальны агонь ворага... Адчайны штурм варожых умацаванняў маракамі акрыліў пехацінцаў, яны ўзмацнілі націск, фашысты пабеглі... У іх адчувалася разгубленасць і паніка, агонь гармат слабеў. З берага данеслася «ўра». Хутка першая траншэя нямецкай абароны была ў нашых руках. Пасля бою капітан Турчанінаў аб'явіў падзяку за мужнасць малодшым лейтэнантам Сабліну і Карабіцыну, а яны дзякавалі маракам. Іх было пятнаццаць, але сваім націскам яны замянілі добрую роту...

Хутка батальён пераправіўся на катэрах на другі бераг Прыпяці. Рухаліся з баямі па балоцістай мясцовасці. Пасля цяжкага бою чырвонаармейцы занялі важны апорны пункт ворага — в. Конкавічы. Астатнімі сіламі 107-ы полк ліквідаваў перадмостны плацдарм ворага на поўначы ад Шастовіч і Вялаўска.

Паспяхова дзейнічаў над камандаваннем старшага лейтэнанта Нізаўца 2-і батальён. Ён фарсіраваў раку ў раёне в. Навасёлкі і таксама захапіў плацдарм. Сюды адразу была перакінута на катэрах артылерыя дывізіі, сапёрны батальён пачаў наводзіць пераправу праз Прыпяць. 111-ы і 228-ы палкі вялі баі ў перадмостных умацаваннях ворага на правым беразе ракі, на поўдзень і паўднёвы ўсход ад Петрыкава.

Раніца. Насцярожаная цішыня. Прыглушаныя каманды. Узвод малодшага лейтэнанта Бектыбаева скацэнтраваўся на зыходнай пазіцыі. Паўзком прабіраючыся па адкрытых месцах, па купінах балота, байцы набліжаліся да вышыні. Немцы заўважылі іх і адкрылі агонь. Паветра напоўнілася выццём мін, грукатам снарадаў, троскам кулямётаў.

Наперадзе цягнулі кулямёт азербайджанец Азіз Аліеў і яго таварышы. Яны прыкрывалі ўзвод агнём. Вакол рваліся міны і снарады. Байцы ўпарта ішлі наперад. Калі да вышыні заставалася каля 400 метраў, агонь прыціснуў іх да зямлі. Здавалася, атака захлынулася.

У гэты крытычны момант сяржант Аліеў загадаў радавым Махамбетаву і Глушэнку разабраць кулямёт, размеркаваў часткі паміж байцамі і ўзяў напрамак у бок фронту. Шлях перагарадзіла балота. Сяржант Аліеў першым уступіў у багну. Па трудзі ў гнілой вадзе, трымаючы над галовамі часткі кулямёта і каробкі з лентамі, байцы фарсіравалі балота. Ім удалося непрыкметна пранікнуць у фланг праціўніка. Выбралі пазіцыю, замаскіраваліся і, сабраўшы кулямёт, адкрылі агонь па ворагу. Вышыня была ўзята.

Артылерысты 4-й батарэі, фарсіраваўшы Прыпяць, устанавілі гарматы каля берага. Неабходна было наладзіць сувязь са стралковым падраздзяленнем. Але бераг ракі густа замініраваны, чакаць сапёраў няма калі. Заставаўся адзін выхад — цягнуць сувязь праз балота, якое не замініравана. За ім шільна назіралі нямецкія снайперы. Як быць? Радавы Клесуноў умацаваў катушку з тэлефонным дротам на камянях, каб яна магла свабодна круціцца. Затым прывязаў да нагі канец дрота і, прыціскаючыся да зямлі, папоўз... Сувязь са стралковым падраздзяленнем была ўстаноўлена.

На другі дзень наступлення камандны пункт перамясціўся на левы бераг Прыпяці. Палкоўнік Шмыглёў рашыў перакінуць 111-ы полк пры дапамозе брыгады рачных катэраў на плацдарм, захоплены 107-м палком над Навасёлкамі, і развіваць наступленне. У 228-ы полк ён накіраваў свайго намесніка палкоўніка Паляткова.

...Стаяла глыбокая ноч. Бой нарастаў, ён ішоў ужо на подступах да горада. Размешчаны на высокім беразе ракі, Петрыкаў быў выгадным апорным пунктам для ворага. Ад русла Прыпяці да ўскраіны цягнулася балота, якое знаходзілася пад агнём праціўніка. Наступаць было вельмі цяжка.

Клесуноў з рацыяй за плячыма амаль ушчыльную прабраўся да варожай траншэі. Трапным стрэлам знішчыў фашыста. Выглядзеў участак, дзе не было агнявых кропак, папоўз наперад і хутка аказаўся ў ходзе злучэння, устанавіў рацыю і пачаў карэктаваць агонь сваёй артылерыі з варожай траншэі.

Браты Міхаіл і Сяргей Помазы ішлі ў атаку побач. У ліку першых яны фарсіравалі Прыпяць, разам уварваліся ў варожую траншэю. У жорсткай схватцы быў забіты Сяргей... Упарты

бой у траншэі працягваўся. Нянавісць і гора быццам удзесяцярылі сілы Міхаіла. Ён дагнаў групу фашыстаў, адкрыў агонь з аўтамата. Восем гітлераўцаў адказалі жыццём за смерць Сяргея.

Рашучыя дзеянні 107-га палка, які захапіў плацдарм на левым беразе ракі, дазволілі іншым часцям дывізіі развіць поспех. 111-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Чарнавусенкі абышоў Петрыкаў з поўначы, перарэзаў шасэйную дарогу, а таксама дарогу Капцэвічы — Петрыкаў і, стварыўшы пагрозу акружэння гарнізона праціўніка, адцягнуў на сябе яго галоўныя сілы, 228-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Каламацкага, пераадолеўшы багну з паўднёва-ўсходняга боку, у канцы дня 30 чэрвеня ўварваўся ў горад. Петрыкаў быў вызвалены.

Узорнымі і бездакорнымі былі дзеянні брыгады рачных караблёў пры вызваленні Петрыкава. У пісьме, накіраваным камандаваннем дывізіі камандзіру 2-й брыгады капітану другога рангу Міціну і начальніку палітаддзела Маціеўскаму, гаварылася: «Камандаванне і палітаддзел 55-й дывізіі выносяць удзячнасць асабіста вам, чырванафлоцкаму і афіцэрскаму саставу 2-й брыгады рачных караблёў Дняпроўскай рачной флатыліі за паспяховыя сумесныя дзеянні ў раёне Скрыгалава — Петрыкава і жадае вам далейшых поспехаў у разгроме нямецка-фашысцкіх захопнікаў...»

НЕЗЛЫЎНАЕ

...Нашы войскі каля Петрыкава. Ідуць зацяжныя баі. Перастрэлка. Выязныя разведчыкаў. Байцам бачны разбураныя дамы горада, спустошаныя вёскі... Ноччу кулямётны разлік сяржанта Машкоўскага ўмацоўваў свой рубеж. І раптам сігнал: «Трывога!» Фашысты адкрылі моцны агонь на суседнім участку. Байцы схапілі зброю. Недзе ў цемры пад ботамі зачаўкала тканъ на балоце, пачулася чужая мова...

— Агонь! — скамандаваў камандзір разліку Машкоўскі. Струмень кулямётнай чаргі секануў па ворагу. Некалькі цёмных постацей упала, вораг адступіў.

Цяжкі бой з групай фашыстаў вытрымаў яфрэйтар Пестаў. Яго акружылі немцы, воін некалькі разоў быў паранены. І тады ён па тэлефоне выклікаў агонь артылерыі «на сябе». Гэта вельмі цяжка — весці агонь па таварышу. Пестаў быў яшчэ раз паранены асколкам, але застаўся жывым...

У канцы чэрвеня сяржанта Падкоўкіна выклікалі ў штаб. Неўзабаве ён вярнуўся, паклікаў сяржанта Бераставога і радавога Мацюніна.

— Нам загадана даставіць «языка»... Праз дзесяць мінут выходзім.

Варожыя заставы прайшлі пасяхова. У лесе цішыня. Падкоўкін раптам спыніўся, загадаў таварышам схавацца. Побач чулася нямецкая гаворка. Паказалася група фашыстаў. Спыніліся, потым адзін пайшоў направа, астатнія зніклі ў лесе. Падкоўкін пячутнай хадой кінуўся на немца. Бераставы і Мацюнін — за ім.

— Хэндэ хох! — крыкнуў Падкоўкін. Немец выхапіў гранату і шпурнуў у бок разведчыкаў. На шчасце, яна разарвалася каля сасны і нікога не параніла. Бераставы, Падкоўкін і Мацюнін навалілі на немца, скруцілі...

Вызначыліся ў баях за Петрыкаў камандзіры дывізіёнаў Віталій Сарычаў, Пётр Кудзінаў, камандзір батарэі Фёдар Бурлак, Герой Савецкага Саюза Васіль Сяменчанка і многія іншыя байцы-артылерысты.

28 чэрвеня артылерыя адкрыла ўраганны агонь. Слупы агню і зямлі ўзняліся на варожых пазіцыях. Пайшла ў наступленне пяхота. Пераправа праз Прыпяць рыхтавалася даўно. Была сабрана вялікая колькасць лодак, плытоў, распрацаваны план фарсіравання ракі. Адным з першых да берага Прыпяці падышло аддзяленне сяржанта Макрова. Але ўсе лодкі аказаліся разбітымі мінамі ворага. На чым пераправіцца? Радавы Жулдыгін паплыў на той бок. Хутка ён пераправіў дзве лодкі. Пасяхова пераправіўся праз раку малодшы лейтэнант Карабіцын з узводам аўтаматчыкаў і заняў пазіцыю блізка да пазіцый непрыяцеля. Немцы адкрылі моцны агонь па пазіцыях Карабіцына, але байцы ўзвода, хоць іх было значна менш, перайшлі ў контрнаступленне, уварваліся ў траншэю ворага. Фашысты не вытрымалі штыкавога ўдару. Чырвонаармейцы захапілі двух палонных, тры кулямёты. Вораг апамяталіся, адкрылі агонь з усіх відаў зброі. Паранены кулямётчык сяржант Калеснікаў з апошніх сіл адбіваў атакі фашыстаў. Хутка падышла падмога.

Адна за другой знішчаліся агнявыя кропкі ворага. Фашысты імкнуліся зачапіцца за любы ўзгорак, але наступальны парыў нашых байцоў быў імклівы. Ні кулямётны, ні мінамётны агонь ворага не маглі спыніць іх. Умела дзейнічаў узвод малодшага лейтэнанта Гірыча. Адважна змагаліся радавыя Дзямідаў, Ушэшаў, Анішчанка і іншыя.

Батальён залёг пад агнём праціўніка. Асабліва небяспечным быў кулямёт у дзоце. Яго чэргі не давалі магчымасці паднять галаву. Снайпер Кірыл Шыдчанка ўзабраўся на дах пашкоджанай хаты. Ён бачыў праз амбразуры кулямётчыка, і націснуў курок. Кулямёт. сціх. Але забітага ворага замяніў другі. Не паспеў ён прыпасці да прыцэлу, як куля знайшла і яго.

Гераічна змагаліся ў баях за вызваленне Петрыкава воіны В. А. Сяменчанка, В. М. Сарычаў, М. А. Малафееў, І. В. Бражнік, Ф. С. Бурлак, Е. Л. Грыцук, Устраханаў з Дагестана, Д. Алекаў, Сямён Мазур, Л. Назараў з Мардовіі і многія іншыя. Вялікія страты панеслі наступаючыя войскі. Пахавалі мы Мікалая Хлябіна з пасёлка Бераснёўка Брагінскага раёна, Васіля Бунчука і іншых баявых сяброў.

А. В. Карамышаў, гвардыі капітан,
удзельнік баёў за вызваленне Петрыкаўскага раёна.

У баях за Петрыкаў

З успамінаў палкоўніка ў адстаўцы Ф. М. Яравога, былога начальніка штаба 111-га Луніцецкага Чырванасцяжнага палка 55-й Мазырскай стралковай дывізіі.

...У бінокль быў добра бачны Петрыкаў. Не дыміліся коміны над хатамі, не было відаць людзей. Ноччу ні аднаго агеньчыка. Горад быў ператвораны ў апорны пункт, падвалы і першыя паверхі цагляных будынкаў прыстасаваны для агнявых кропак.

Мы рыхтаваліся да наступлення. Палкавая разведка пад камандаваннем лейтэнанта Мікалая Караля на світанні 14 чэрвеня ўзяла ў палон нямецкага афіцэра. Ім аказаўся камандзір роты 102-й дывізіі гітлераўцаў, які даў каштоўныя звесткі аб абароне праціўніка.

З поўначы быў чутны няспынны далёкі гул. Нашы войскі вялі баі ў раёне Бабруйска. 25 чэрвеня атрымалі баявы загад і мы: на ўзаемадзеянні з Дняпроўскай флатыліяй фарсіраваць Прыпяць і авалодаць Петрыкавам. Паўднёвы бераг ракі, заняты нашымі войскамі яшчэ зімой, быў палогі, забалочаны, густа парослы хмызняком, а паўночны, на якім умацаваўся вораг, — высокі, круты, з яго добра праглядваліся нашы пазіцыі...

Першым фарсіраваў Прыпяць 1-ы батальён 107-га палка пад камандаваннем капітана Турчанінава. Нечаканай начной атакай чырвонаармейцы выбілі фашыстаў з в. Конкавічы і авалодалі ёю. Батальён капітана Мікалая Прохіна ліквідаваў умацаванні немцаў на паўднёвым беразе Прыпяці, у раёне дарогі Скрыгалаў — Петрыкаў, перапраўіўся на паўночны бераг ракі і заняў зыходнае становішча для штурму горада. Байцы батальёнаў, якімі камандавалі Аляксандр Дзюкаў і Ягор Арлоў, выкарыстаўшы плацдарм 107-га палка,



Могила неизвестного солдата у дороги Петриков — Копцевичи

у раёне Конкавіч і Навасёлак пад прыкрыццём дымавой заслоны на браня-катэрах пераправіліся праз раку і нанеслі ўдар, адцягваючы ўвагу асноўных сіл праціўніка.

Кароткую чэрвеньскую ноч мы выкарысталі для падрыхтоўкі да рашучага штурму. Не паспела патухнуць зорка на захадзе, як на ўсходзе з'явілася светла-блакітная стужка, якая нагадвала далёкі пажар. Стала віднець. Ракеты, што бесперапынна пускаў у начное неба вораг, станавіліся ледзь прыкметнымі. Раптам над нашымі галовамі з сухім шоргатам панесліся вогненныя снарады «кацюш». Над пазіцыямі гітлераўцаў узняліся клубы агню і дыму. Прагучала каманда: «Наперад, у атаку!» Пранеслася магутнае «ўра», полк пайшоў на штурм варожых умацаванняў. Магутнага парыву воінаў нельга было ўтрымаць, і хутка вораг пачаў адступаць. Дарога Курыцічы — Петрыкаў была перарэзана, першая задача выканана.

Праз некаторы час вораг контратакаваў пры падтрымцы танкаў з боку Смятаніч. Завязаўся жорсткі бой. 2-і батальён вымушаны быў пакінуць дарогу, заняць абарону абапал яе. Танкі прагрукаталі ў напрамку Петрыкава. Кулямётчыкі — сяржант Яўсей Шчука і радавы Міхаіл Хрэшкаў адсеклі пяхоту ад танкаў, частку знішчылі, уцалеўшыя ворагі павярнулі назад. Танкі без падтрымкі пяхоты сустрэлі агнём з супрацьтанкавых ружжаў воіны 3-га батальёна. Воіны аддзялення сяржанта Грышына пачалі закідваць іх гранатамі. Падбіты першы танк спыніўся, астатнія не адважваліся абыходзіць яго. Дарога была заклінена. Разгарэўся жорсткі паядынак танкаў з нашай пяхотай. Гэта было страшна... Чырвонаармейцы не спынялі стральбу з супрацьтанкавых ружжаў, кідалі гранаты пад гусеніцы браніраваных страшыдлаў. Андрэй Пархоменка і Фёдар Залатарэнка падпаўзлі да абочыны дарогі, выкарыстаўшы «мёртвую» прастору, і кінулі супрацьтанкавыя гранаты пад пярэдні танк. Асколкам Залатарэнка быў забіты, Пархоменка паранены ў плячо... Заціснутыя агнём 2-га і 3-га батальёнаў, на дарозе былі падбіты сем варожых танкаў.

1-ы батальён у гэты час пад моцным кулямётным і мінамётным агнём наступаў па амаль непраходнай мясцовасці ў напрамку паўднёвай ускраіны горада. Гэта быў пякельна цяжкі шлях. У поўны рост ісці нельга, нельга і паўзці па дрыгве. Страты былі надзвычай вялікімі. 2-і і 3-і батальёны, пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, выйшлі на дарогу Канцэвічы — Петрыкаў, але з ходу авалодаць ёю не ўдалося. Прыйшлося зноў уступаць у жорсткі паядынак з фашысцкімі танкамі. Вялікую дапамогу пяхоце аказалі сапёры аддзялення сяржанта Андрэева, якія перанеслі некалькі супрацьтанкавых мін з міннага поля гітлераўцаў і паставілі іх на дарозе танкаў. Два з іх падарваліся, астатнія збочылі, потым павярнулі назад. Нямецкая пяхота, якая прывыкла хадзіць у атаку за танкамі, пазбавілася прыкрыцця, ворагі залеглі. Бой, не заціхаючы, ішоў да вечара.

Другая брыгада катэраў Дняпроўскай флатыліі высадзіла ў той дзень дэсант у в. Дарашэвічы. Была перарэзана дарога Петрыкаў — Жыткавічы і перакрыты шлях адступлення немцаў. Да зыходу 30 чэрвеня Петрыкаў быў акружаны. З наступленнем цемры пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі 1-ы батальён з поўдня, 228-ы стралковы полк з усходу і 2-і і 3-і батальёны 111-га палка з поўначы атакавалі гітлераўцаў. Праціўнік не вытрымаў напіску і, кідаючы тэхніку, пачаў адступаць у напрамку Жыткавіч.

...У той дзень асабліва ўрачыстай здавалася нам вячэрняя зорка. Сонца апусцілася за гарызонт. Петрыкаў быў наш... Нават у змроку было відаць, што горад ляжаў у руінах. Курыўся дым, там і сям дагаралі пажары. Воіны, якія яшчэ не ўздыхнулі з палёгкай пасля цяжкіх кровапралітных баёў, тушылі іх. Усюды былі бачны сляды нядаўняй бітвы, кінутая праціўнікам

падбітая і цэлая тэхніка. Людзей не відаць... Вельмі многа было міп, у наступныя дні аддзяленне сапёраў сяржанта Андрэева абясшкодзіла іх больш за чатырыста.

Мы не затрымаліся ў горадзе. Баявы шлях палка ляжаў далей на захад.

Дэсант з ракі Прыпяць

У канцы чэрвеня 1944 г. лінія абароны праціўніка праходзіла па правым беразе р. Пшч і па левым р. Прыпяць. На поўдні і паўднёвым усходзе в. Навасёлкі ён утрымліваў плацдарм на правым беразе Прыпяці. Тут была вялікая колькасць траншэй, бліндажоў, дотаў і дзотаў, падыходы да якіх прыкрыты некалькімі радамі калючага дроту і замініраваны. З боку ракі гітлераўцы прыкрываліся супрацьдэсантнымі перашкодамі і мінамётна-кулямётнымі кропкамі. Русла ракі перакрыта бона-фугаснымі перашкодамі.

На захад ад г. Мазыра дыслацыраваліся злучэнні 61-й і 65-й армій. На іх стыку знаходзілася 2-я брыгада рачных караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якая ўдзельнічала ў агнявых налётах па скапленнях жывой сілы і тэхнікі праціўніка, у сумесных аперацыях з армейскімі часцямі па захопу палонных, ажыццяўляла супрацьмінную абарону.

28 чэрвеня камандзір брыгады капітан другога рангу Міцін атрымаў баявы загад — высадзіць дэсант 55-й дывізіі на левы бераг Прыпяці на поўдзень ад Скрыгалава. Для высадкі выдзяляўся таксама атрад маракоў флатыліі. Пасля артабстрэлу караблі брыгады высадзілі дэсант маракоў, які замацаваўся на беразе. Услед ішлі падраздзяленні 55-й дывізіі. Праціўнік імкнуўся перашкодзіць высадцы дэсанта, падцягваў рэзервы, аднак пад шчыльным агнём гэта зрабіць было немагчыма. Дэсантнікі расшырылі плацдарм і праследавалі праціўніка ў напрамку в. Навасёлкі. Выключную мужнасць і вытрымку паказвалі маракі-дэсантнікі.

Раніцай 29 чэрвеня караблі брыгады прыступілі да пераправы войск і баявой тэхнікі на левы бераг Прыпяці каля Навасёлак. Дэсант маракоў і ўзмоцненай роты армейскага падраздзялення з баямі ішоў на паўночны захад. Караблі, якія падтрымлівалі дэсантнікаў, натыкнуліся на бона-фугасныя перашкоды, якія трымаліся на стальных тросах. Падыходы да іх былі замініраваны. Пад шквальным агнём маракі прыступілі да пераадольвання гэтага рубяжа.

Увечары камандзір дывізіі паставіў задачу брыгадзе рачных караблёў і флатыліі: артагнём і высадкай дэсантнага атрада маракоў дапамагаць войскам, якія наступалі на Петрыкаў. Для выканання гэтай задачы камандзір дывізіёна капітан трэцяга рангу Міхайлаў выдзеліў атрад караблёў прарыву з дэсантам маракоў. Караблі выйшлі ў раён Петрыкава, але на подступах да яго праціўнік адкрыў мінамётны агонь. Ноччу, не дайшоўшы двух кіламетраў да горада, дэсантнікі высадзіліся з паўднёвага ўсходу яго з задачай разведаць бераг і высветліць абстаноўку.

Раніцай 30 чэрвеня караблі брыгады прыступілі да пераправы двух стралковых палкоў. У канцы дня, удакладніўшы дзеянні з сухапутнымі часцямі і прыняўшы другі дэсантны атрад маракоў, караблі выйшлі непасрэдна ў Петрыкаў. Пад агнём праціўніка дэсант быў высаджаны на заходняй ускраіне горада. Захапіўшы плацдарм, дэсантнікі прабіваліся да цэнтра. Ноччу з 30 чэрвеня на 1 ліпеня 1944 г. часці 55-й дывізіі разам з дэсантам маракоў пры артылерыйскай падтрымцы караблёў флатыліі авалодалі Петрыкавам.

М. Волкаў, капітан першага рангу ў адстаўцы.

В бессильной злобе

Командир 511-го ж/д строительного батальона при 2-й армии. Перевод с немецкого 5.7.1944 г.

Оперативный отдел, дело № 43 Секретно

Касается: донесение о разрушениях
Ссылка: командир 2-й инженерной бригады при группе армий «Центр», оперативный отдел № 326/44 от 3.7.1944 г.

Командиру 2-й инженерной бригады

Ниже прилагается донесение о разрушениях, произведенных в период 26.6—29.6.1944 г. батальоном на ж/д линиях Старушки — Птичь, Старушки—Секеричи... на основании дневных сообщений штаба батальона.

Ж/д линия Старушки — Птичь

26.6.1944 г. Демонтировано 280 м ж/д колеи. 200 м рельсов погружено и вывезено.
27.6.1944 г. Ст. Концевичи (4-й путь): демонтировано и отправлено 240 м рельсов; демонтировано 250 шпал.
Ст. Муляровка: демонтированы и вывезены сигнальные и предохранительные устройства.
28.6.1944 г. От ст. Коржевка до ст. Концевичи ж/д полотно поднято шпаловзрывателем, погружено и вывезено.
Ст. Оголичи: демонтированы и вывезены сигнальные и предохранительные устройства.
29.6. 1944 г. Ст. Коржевка — ст. Концевичи: ж/д полотно в двух местах взорвано.
Демонтированы и вывезены предохранительные и сигнальные устройства на ст. Секеричи, Филатовка, Новоселки, Заполье, Михедовичи.
Ст. Филатовка: взорвано шпаловзрывателем 14 387 м ж/д полотна... Взорваны стрелки, 500 м ж/д ветки к лесозаводу.
Ст. Секеричи: 4670 м ж/д полотна дважды подорвано. Взорвано 8 стрелок. Здание станции и погрузочно-разгрузочная платформа сожжены... Взорвано 8 ж/д мостов.
Ст. Новоселки: взорвано шпаловзрывателем и дважды подорвано 7132 м ж/д полотна.
Подорваны 4 стрелки, сожжено здание станции, подорвана и сожжена погрузочно-разгрузочная платформа.
Ст. Заполье: взорваны 2 водонапорные башни и 2 водоразборные колонки. Уничтожено 4 ж/д моста.

Донесение о разрушениях ж/д сооружений (приложение к карте разрушений)

Ж/д линия Птичь — Старушки (одноколейная):

км. 438—445: колея взорвана на стыках и посредине;
км. 445—444: 280 м колеи демонтировано;
км. 444—450: колея взорвана на стыках и посредине;
ст. Коржевка разрушена;
ст. Концевичи: 440 м станционной колеи демонтировано, остальная разрушена;
км 450—466: колея взорвана шпалоподрывочным плугом и взорвана на стыках и посредине.

Ж/д Старушки — Бобруйск (одноколейная):

км 75—70 полотно взорвано шпалоподрывочным плугом на стыках и посредине;
км 70—65 — из-за действий противника полотно не подорвано;
км 65—61... км 61—54... 54—52... 50—42 и 41—35: полотно взорвано шпалоподрывочным плугом на стыках и посредине;
ст. Филатовка — 4670 м..., ст. Секеричи — 2280 м..., Новоселки — 2800 м колеи дважды подорвано.

Ж/д линия Старушки — Птичь (наш передний край обороны)

30.6.44. Ст. Коржевка: взорвано 480 м рельсов, 1 стрелка демонтирована и вывезена;
ст. Концевичи — Старушки: рельсы разобраны и дважды подорваны. Взорвана полевая ж/д линия до ст. Концевичи.
2.7.44. Ст. Старушки: 1029 м рельсов выездного пути на Секеричи, 800 м рельсов выездного пути на Птичь, 1950 м рельсов запасного пути на Секеричи и 7 стрелок подорвано.
3.7.44. Подорвано 15 стрелок, 1 водокачка, водонапорная башня, водонапорная колонка. Здание диспетчерской службы сожжено.

Ж/д линия Старушки — Секеричи:

ст. Заполье: разобрано 5120 м рельсов;
ст. Михедовичи: км 28—14... 13—2: разобрано 28 697 м рельсов. Взорвано 22 стрелки, 3 погрузочно-разгрузочные платформы, водонапорная станция, 4 крана. Сожжены здания станций. Взорвано 7 ж/д мостов...

Командир батальона майор *Нивелингер*
НИА Беларуси, ф. 4683, оп. 3, д. 967, л. 109—129, 135—136.
Подготовил к печати *В. И. Лемешонок*

ИЗ ТЕЛЕГРАММЫ НАЧАЛЬНИКА ПОЛИТОТДЕЛА 1-го БЕЛОРУССКОГО ФРОНТА ГЕНЕРАЛ-МАЙОРА С. Ф. ГАЛАДЖЕВА НАЧАЛЬНИКУ ГЛАВНОГО ПОЛИТУПРАВЛЕНИЯ РККА ГЕНЕРАЛ-ПОЛКОВНИКУ А. С. ЩЕРБАКОВУ

Наступающие в районе среднего течения Припяти части 55-й дивизии... освободили от немецкого плена 5650 мирных граждан Петриковского района, согнанных немцами в специальные лагеря для отправки в Германию.

Рота, якой камандаваў капітан Рыжкоў, у складзе 12-й гвардзейскай дывізіі прымала ўдзел у вызваленні Петрыкаўскага раёна. Загінуў 28 студзеня 1944 г. у руканашным баі за в. Церабаў. Пахаваны ў г. Мазыры на брацкіх могілках.

Шлях праз вайну

Кароль Рыгор Якаўлевіч (н. у 1922 г. у в. Турок) закончыў дзесяць класаў і працаваў у мясцовым калгасе. У 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію, вайну сустрэў курсантам палкавой школы. З першага да апошняга дня вайны — на фронце. Узнагароджаны пяццю ордэнамі і васьмю баявымі медалямі, у тым ліку іншаземнымі.

Пасля вайны Р. Я. Кароль служыў у Савецкай Арміі, дэмабілізаваўся ў 1974 г. у званні маёра.



Р. Я. Кароль

Давучваццa курсанту палкавой школы артылерыстаў Рыгору Каралю давялося ў баях. Датэрмінова прысвоілі званне сяржанта — і на фронт. «Навука перамагаць» давалася вельмі цяжка — вораг пераўзыходзіў і па ўзбраенні, і па тэхніцы, і ў жывой сіле...

Баявое хрышчэнне давялося прыняць пад Арлом. Артылерыйскі разлік гаўбіцы, якім камандаваў Кароль, знаходзіўся на самым небяспечным участку, па напрамку танкавага прарыву. Некалькі варожых машын падбілі артылерысты, танкі пайшлі ў другім напрамку, але і самім хапіла: пашкоджана гаўбіца, двоіх байцоў параніла... Камандзір палка выказаў падзяку артылерыстам за стойкасць і рашучасць пры адбіцці танкавай атакі.

У неймаверна цяжкіх баях адстаялі восенню 1941 г. Маскву. Сяржант Кароль быў ужо вопытным, загартаваным у баях артылерыстам. Ён прымаў удзел ва ўсіх галоўных аперацыях на гэтым напрамку, яго гаўбіца наносіла немалы ўрон ворагу. Але і сам быў паранены ў адным з баёў. Вярнуўся ў артылерыйскі полк пасля шпіталю напярэдадні Сталінградскай бітвы — і адразу ў бой... Такіх напружаных і кроваправітных, якія адбываліся на беразе Волгі, яшчэ не было: баі не заціхалі ні працягу сутак, гарматныя ствалы накаляліся да чырвані, і хаваць загінуўшых не было ні часу, ні магчымасці... Выстаялі, перамаглі і, цяжка пераваляючыся, з надрыўным рэвам і скрыпам ваенная каляснiца пакацілася назад, на захад... Пякельная Курская дуга, баі пад Прохараўкай — зноў гарматны разлік Рыгора Караля ў гушчыні страшнай бойкі. Адзін за другім грозна супуліся праслаўленыя фашысцкай прапагандай «тыгры». Адзін снарад адрыкашэціў, другі не ўзяў магутную браню страшыдла. Экіпаж танка заўважыў смельчакоў, гармата пачала пагражальна паварочвацца ў іх бок, яшчэ імгненне... Артылерысты на долю секунды апярэдзілі — варожы танк спыніўся, бразнуўшы гусеніцай, з яго паваліў чорны дым... У дывізіёне засталася адна гармата — Рыгора Караля, астатнія былі падбіты. Ёй давялося трымаць пазіцыю за ўсіх. «Тыгры» набліжаліся. Раніла наводчыка Трыгубава. Аблiваліся крывёю два другія байцы разліку. Снарады падаваў камандзір дывізіёна капітан Гурэеў, наводчыкам быў Кароль. Тры гітлераўскія танкі назаўсёды спыніліся перад пазіцыяй артылерыстаў, якую ўтрымлівала адна гармата. Усю сваю агнявую мощ фашысты накіравалі на ўпартую агнявую кропку. Гурэеў і Кароль, схапіўшы параненых, кінуліся ва ўкрыццё, і ў гэты момант узрывы пахавалі гармату. Але варожая атака захлынулася, гітлераўцы, якія ўцалелі, вярталіся да ранейшых пазіцый...

Колькі было іх, баёў — не злічыць... Усюды разлік гарматы пад камандаваннем Рыгора Караля дзейнічаў смела і ўмела. На грудзях камандзіра гарматы сярод іншых узнагарод ужо ззялі два ордэны Славы.

Перад пачаткам наступлення ў студзені 1944 г. артылерысты пад камандаваннем Караля атрымалі заданне абяскшодзіць агнявыя кропкі праціўніка. На світанні загрымелі залпы, разлік гарматы знішчыў два станковыя кулямёты, нанёс значны ўрон жывой сіле ворага. Шлях пяхоце быў расчышчаны... Вызвалена Польшча, шлях ляжаў да Берліна. Старшына Кароль камандаваў ужо агнявым узводам. У красавіку 1945 г. артылерысты вялі баі ў прыгарадзе сталіцы фашысцкай Германіі. Тут, дзе вораг знаходзіўся дома, тры-

маў агнявыя кропкі ў кожным акне, сярод руін, дзе ў крэпасць быў абсталяваны кожны квартал, асабліва патрэбна была наступаючай пяхоце артылерыйская падтрымка. Артылерысты пад камандаваннем Рыгора Караля заўсёды былі наперадзе, яны сталі ў гэтых апошніх баях сапраўднымі снайперамі: біць трэба было хутка і дакладна, займаць усё новыя рубяжы... Квартал за кварталам прасоўваліся байцы. І вось ён, у дыме пажарышчаў — рэйхстаг, да якога Рыгору Каралю давялося трымаць шлях праз усю вайну. У наградным лісце запісана: «У цяжкіх баях у горадзе Берліне з 22 красавіка па 2 мая 1945 г. Р. Я. Кароль прамой наводкай гармат падтрымліваў штурмавыя групы пяхоты, знішчыў 1 гармату, 4 станковыя і 7 ручных кулямётаў, да 50 салдат ворага, падавіў дзве мінамётныя батарэі і падбіў тры аўтамашыны». За праяўленую мужнасць і гераізм быў прадстаўлены да ўрадавай узнагароды — ордэна Славы I ст.

І хоць зусім не зорным быў шлях воіна праз вайну, Р. Я. Кароль адзначаны за мужнасць і гераізм трыма зоркамі Славы — ордэнамі вышэйшай салдацкай доблесці...

В. Р. Ферапц

Зоркі ветэрана

Мотуз Уладзімір Іванавіч (н. у 1924 г. у в. Бяланавічы) прызваны ў Чырвоную Армію ў 1942 г., быў разведчыкам страляковага палка. Не раз паказваў узоры мужнасці і гераізму пры выкананні заданняў камандавання. Узнагароджаны трыма ордэнамі Славы, многімі іншымі баявымі ўзнагародамі.

Напярэдадні вайны хлопец з палескай вёскі Валодзя Мотуз вучыўся ў рамесленым вучылішчы ў Ленінградзе. Славуты горад на Няве зачараваў яго, ён хадзіў па вуліцах і плошчах і не мог налюбавацца іх прыгажосцю і велічнасцю. Ніхто не ведаў, што пройдзе некалькі месяцаў — і ён запалыхае ў агні, пакрыецца дымам пажарышчаў... Многія навучэнцы, сябры Валодзі, загінулі ў блакаду. Малалетнія, яны не былі прызваны ў армію, але праца на заводзе ў лютыя маразы, на працягу большай часткі сутак, была ненамнога лягчэйшай, чым франтавыя будні. Валодзя зусім аслабеў, сілы пакідалі яго, калі па лёдзе Ладажскага возера ён быў эвакуіраваны з блакаднага Ленінграда. Крыху акрыяў, паздаравеў — і адразу ў ваенкамат:

— Прашу накіраваць на фронт.

Падыходзіў прызыўны ўзрост, і хутка Мотуз быў прызваны ў Чырвоную Армію. Папрасіўся ў разведку, і яму пашанцавала — просьбу задаволілі. У арміі гэта бывае не заўсёды...

І вось першае заданне. Камандзір палка схіліўся над картай:

— Трэба даведацца, дзе знаходзіцца ў гэтай вёсцы штаб нямецкага камандавання. І тады слова за артылерыяй... Задача ясная?

Разведчыкі пачалі рыхтавацца да вылазкі ў варожы тыл. Разам з Мотузам праз лінію фронту накіраваліся яго баявыя сябры Рыгор Яўсееў, Васіль Арлоў, Міхась Піцык, Уладзімір Ківа. Цёмнай ноччу перайшлі варожыя ўмацаванні, раніцай залеглі на ўзвышанай мясцовасці. Адсюль было відаць, што да аднаго з найбольш дыхтоўных дамоў адзін за другім падкатваюць матацыклы, побач стаіць некалькі легкавых аўтамашын.

— Гэта і ёсць штаб, — вырашылі разведчыкі.

Схаваўшыся ў невялікім пералеску, правялі ўвесь дзень. Без руху ляжаць было холадна, скончылася вада ў біклажках... Калі сцямнела, падышлі ўшчыльную да штаба. Вартавы адвярнуўся ад ветру, прыкурваючы цыгарэту, тут яго і «заспакоілі» разведчыкі... Ледзь скрыпнуўшы, расчыніліся дзверы дома. Пісар спаў за сталом, паклаўшы галаву на рукі. Схапіць яго, засунуць кляп у рот і скруціць было справай хвіліны. Іншыя ў гэты час запіхвалі ў мяшок штабныя дакументы. Разам з нялёгкай ношай — звязаным пісарам — накіраваліся да лініі фронту, і тут гітлераўцы заўважылі развед-

чыкаў. Яны кінуліся наўздагон, завязалася перастрэлка. Выручыў змрок, чорная, як чарніла, ноч: ворагі страцілі арыенціры, прынялі разведчыкаў за сваіх і накіравалі пагоню ў іншы бок. З «языком» і важнымі дакументамі яны хутка былі сярод сваіх...

У тыя дні ў газетах быў надрукаваны Статут вышэйшага знака салдацкай доблесці — ордэна Славы. Усе шасцёра разведчыкаў — удзельнікаў смелай вылазкі ў тыл ворага — былі прадстаўлены да гэтага ордэна — першыя ў дывізіі, і першым значылася прозвішча Уладзіміра Мотуза.

Такіх аперацый на ліку палкавых разведчыкаў многія дзесяткі. Заўсёды сяржант Мотуз дзейнічаў рашуча і смела. Так было і на Украіне ў пачатку 1944 г., калі па дарозе назад разведчыкі вымушаны былі грымаць няроўны бой. Цяжка параніла камандзіра разведузвода лейтэнанта Зыранава. Камандаванне ўзводам узяў на сябе Мотуз, сам паранены ў нагу. Не кінулі камандзіра на полі бою, вынеслі і паспяхова адышлі да сваіх. На грудзях Уладзіміра Мотуза з'явіўся другі ордэн Славы.

Пад Бендэрамі адважны разведчык гранатамі знішчыў фашысцкі кулямёт разам з немцамі. Адбіваў атакі апалелых ад прадчування блізкага канца гітлераўцаў у Югаславіі. Ваяваў і зноў вызначыўся ў разведцы ў Венгрыі. Адтымі з першых разведчыкі там аказаліся перад умацаваным пунктам ворага, перарэзалі сувязь, захапілі склад з боепрыпасамі. Яшчэ раз паранены быў Уладзімір Мотуз у адным з цяжкіх баёў у Чэхаславакіі... У дваццаць гадоў ён быў поўным кавалерам ордэна Славы.

Не менш гераічна і самаадданa былы воін працаваў у мірныя дні. Прафесія яго была вогненная і тут — газазваршчык. Яго ведаюць і паважаюць усе не толькі ў Мулярaўцы, дзе жыве Уладзімір Іванавіч Мотуз, але і ва ўсім раёне.

...У час святкавання 50-годдзя вызвалення Петрыкаўскага раёна жвавы газетчык запытаў у ветэрана:

— Раскажыце, калі ласка, за якія подзвігі вы ўзнагароджаны гэтымі знакамі доблесці?

Уладзімір Іванавіч адвёў убок мікрафон і сказаў:

— Хіба галоўнае ў жыцці — зоркі, што на грудзях? Не за іх я ваяваў, і ў дзень свята не пра іх хачу гаварыць!.. Галоўнае — каб зорка гарэла ў грудзях, у самой душы...

В. Р. Ферапц

Ганаровыя грамадзяне г. Петрыкава

Канарэеў Уладзімір Рыгоравіч (н. 2.6.1915 г. на ст. Сафіеўка Запарожскай вобл.). З 1929 г. працаваў на заводзе ў г. п. Чырвонаармейск (цяпер Вальнянск), з 1938 г.— на заводзе ў Свярдлоўску. На фронце з 1942 г. — камандзір аддзялення, прайшоў з баямі ад Сталінграда да Берліна.

Асабліва вызначыўся старшына У. Р. Канарэеў у чэрвені 1944 г. у час наступлення Дняпроўскай ваеннай флатыліі па Прыпяці, за вызваленне вёсак Бялановічы, Дарашэвічы, горада Петрыкава...

У баях за Петрыкаў узорна арганізаваў наступленне свайго аддзялення. Чырвонаармейцы ўкліняліся ў абарону праціўніка, знішчылі пяць дзотаў, чатыры кулямётныя кропкі, захапілі тры кулямёты, знішчылі каля 70 гітлераўскіх салдат, адзінаццаць узялі ў палон. Смелымі і рашучымі дзеяннямі У. Р. Канарэеў забяспечыў поспех наступлення.

За ўмелае кіраўніцтва баявымі апераціямі і асабістую мужнасць, праяўленую пры вызваленні населеных пунктаў Петрыкаўскага і Пінскага раёнаў, У. Р. Канарэеву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны мічман У. Р. Канарэеў да 1968 г. служыў ва Узброеных Сілах СССР.

Памёр 26.10.1973 г.

Чыльнікін Васіль Пятровіч (н. 20.1.1924 г. у в. Коршава Варонежскай вобл.) у 1942 г. прызваны ў рады Ваенна-Марскога Флоту. У 1943 г. за-

кончыў вучэбны атрад, атрымаў спецыяльнасць артылерыста. Быў накіраваны для далейшай службы на плаўбатарэю, якая затым увайшла ў састаў Дняпроўскай ваеннай флатыліі. У саставе яе экіпаж вызваляў Беларусь.

Выключную мужнасць і адвагу праявіў В. П. Чыльнікін пры вызваленні Петрыкава ў чэрвені 1944 г. Ён выявіў назіральны пункт ворага, артылерыйскую і кулямётную крошкі, якія былі знішчаны агнём плаўбатарэі. У баях за Петрыкаў на баявы рахунак бранякатэра, на якім служыў Чыльнікін, былі занесены падбіты танк, знішчаныя 18 мінамётных і кулямётных кропак, каля сотні нямецкіх салдат.

Пасля вайны В. П. Чыльнікін быў накіраваны ў вучэбны атрад Ваенна-Марскога Флоту ў якасці выкладчыка ваенна-марской справы.

В. П. Чыльнікін узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна».

Толькі жыла б Радзіма...

Скалабан Іван Васільевіч (н. у 1910 г.) — адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Палессі. Да вайны працаваў настаўнікам, у 1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію. З сакавіка 1942 г. змагаўся з ворагам на акупіраванай тэрыторыі, быў камісарам 125-й Капаткевіцкай брыгады, у ліпені 1943 г. прызначаны камандзірам 130-й партызанскай брыгады, са жніўня 1943 г.— сакратар Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б, член бюро Палескага падпольнага абкома КП(б)Б. Прымаў удзел у многіх баявых аперацыях 125-й і 130-й партызанскіх брыгад па падрыве мастоў і чыгункі, разгроме гарнізонаў.

Загінуў у баі на Чорным балоце ў красавіку 1944 г.

* * *

Кудравец Фёдар Дзям'янавіч (н. у 1907 г. у в. Ванюжычы) да вайны працаваў старшынёй калгаса «Чырвоны партызан», быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падпольнай барацьбы з ворагам. У студзені 1942 г. створаны першы на тэрыторыі раёна партызанскі атрад, і Ф. Дз. Кудраўца прызначаюць яго камісарам, затым камандзірам. З ліпеня 1943 г. ён — камісар 125-й Капаткевіцкай партызанскай брыгады. Фёдар Дзям'янавіч неаднойчы сустракаўся з легендарным героем славацкага народа Янам Палецкай і схіліў яго да пераходу на наш бок. Не выпадкова прозвішча партызанскага камісара занесена ў спіс ганаровых грамадзян г. Трэнчын. Ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I ст., медалямі.

Пасля вызвалення раёна Ф. Дз. Кудравец працаваў сакратаром Капаткевіцкага райкома КПБ, інструктарам Палескага абкома партыі, прымаў удзел у арганізацыі калгасаў у Заходняй Беларусі.

Памёр у 1979 г.

* * *

Дубік Іван Васільевіч (н. у 1914 г. у в. Аголічы) восенню 1941 г. прабіраўся з акружэння да родных мясцін. У вёсцы не затрымаўся, шукаў сувязі з партызанамі, а ў кастрычніку 1942 г. разам з М. Ф. Бабковым арганізавалі атрад. І. В. Дубік стаў яго камісарам, а потым — камандзірам 138-га атрада 130-й Петрыкаўскай партызанскай брыгады. Гэта было адно з найбольш баяздольных падраздзяленняў, на рахунку якога многа баявых спраў.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I і II ст., Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», многімі медалямі.

Памёр у 1986 г.

* * *

Гардзіенка Мікалай Іосіфавіч — першы камандзір Капаткевіцкага атрада, створанага ў жніўні 1941 г. З мая па лістапад 1943 г. быў начальнікам штаба 39-га атрада імя В. Н. Бажанкі, са снежня 1943 да красавіка 1944 г.—

начальнікам штаба 150-й брыгады імя Ф. М. Языковіча. Ён удзельнічаў у падрыве чыгуначнага маста праз р. Пціч у лістападзе 1942 г., у разгроме фашысцкага гарнізона ў в. Лучыцы вясной 1943 г. і ў многіх іншых баявых аперацыях.

* * *

Маставы Іван Іонавіч — кадравы афіцэр Чырвонай Арміі. У пачатку вайны служыў у Беластоку, вайсковая часць трапіла ў акружэнне. І. І. Маставы паранены дабраўся да роднай вёскі, захварэў тыфам. Калі выздаравеў, пайшоў у Капаткевіцкі партызанскі атрад, з якога быў выдзелены 45-ы атрад. Камандзірам яго быў прызначаны І. І. Маставы. У сакавіку 1944 г. ён загінуў у баі пры выхадзе атрада з блакады каля в. Сасноўка. У аператыўным данясенні брыгады паведамлялася: «Камандзір атрада Маставы наблізіўся з байцамі ўшчыльную да немцаў, ва ўпор расстрэльваў іх. Куля трапіла яму ў правую руку, другое раненне аказалася смяротным...» Байцы прарвалі акружэнне і вынеслі свайго камандзіра з поля бою.

* * *

Герасіменка Назар Яўстратавіч (н. у 1903 г. на ст. Пціч) — актыўны ўдзельнік Мінскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у Мінску на фабрыцы «Камунарка», затым быў на савецкай і партыйнай рабоце. У маі — верасні 1942 г. — сакратар падпольнага райкома КП(б)Б у Мінску, на яго кватэры на вул. Няміга была канспіратыўная яўка, дзе праходзілі сустрэчы і сходы падпольшчыкаў, захоўвалася зброя, медыкаменты. У пачатку кастрычніка 1942 г. Н. Я. Герасіменка, яго жонка і 12-гадовая дачка Люся былі схоплены гітлераўцамі і пасля зверскіх допытаў у снежні закатаваны.

Іменем Н. Я. Герасіменкі названа вуліца ў Мінску, на доме, дзе ён жыў, установлена мемарыяльная дошка.

* * *

Кулак Уладзімір Іосіфавіч (н. у 1916 г. у в. Мышапка) вайну сустрэў курсантам Арлоўскага ваенна-палітычнага вучылішча. Датэрміновае прысваенне звання — і фронт. Уладзімір Кулак трапіў у акружэнне, і хутка стаў байцом атрада А. Міхайлоўскага. Былога вайскоўца прызначаюць начальнікам штаба атрада, затым 130-й партызанскай брыгады. За баявыя заслугі ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны II ст., некалькімі медалямі.

У паслявасенныя гады У. І. Кулак займаў адміністрацыйныя і гаспадарчыя пасады ў раёне і вобласці, на працягу больш 20 гадоў кіраваў калгасам імя Леніна. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума — «Знак Пашаны».

У. І. Кулак неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага, абласнога і Вярхоўнага саветаў. Ён і сёння ў страі, з'яўляецца старшынёй раённага савета ветэранаў вайны і працы, вядзе вялікую выхаваўча-патрыятычную работу.

* * *

Вялікую Айчынную вайну, якая прынесла вялікія выпрабаванні Г. І. Бажку, восем раненняў і тры кантузіі, ён сустрэў курсантам ваеннага вучылішча ў Мінску. Нядоўга працягвалася абарона беларускай сталіцы, акружэнне, выхад з яго... Герасім Бажок прабіраўся ў родныя мясціны на Петрыкаўшчыну, дзе сустрэў восенню партызан. Уступіў у атрад Міхайлоўскага, ваяваў у складзе 125-й, затым 130-й брыгад.

На фронце Герасім Бажок быў камандзірам узвода. Беларусь, Польшча, Германія... Каля рэйхстага давялося пабываць, калі ён ужо дагараў ‘і быў увесь у роспісах пераможцаў. Баявы шлях Г. І. Бажка адзначаны трыма ордэнамі Айчыннай Вайны, Аляксандра Неўскага, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, дзесяццю медалямі.

* * *

...Той жорсткі бой каля в. Чарнушкі на світанні 23 лютага 1943 г. увайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны і назаўсёды застаўся ў памяці Д. Л. Ганцэвіча. Нябачны кулямётчык паліваў з дзота агнём нашы наступаючыя часці, атакі захлёбваліся адна за другой. Малодшы сяржант Ганцэвіч бачыў, як наперадзе каля дзота хіснуўся цень, дзот заціх... Ужо пасля бою стала вядома, што гэта радавы Аляксандр Матросаў з іх роты закрыў сваім целам амбразуру дзота.

Д. Л. Ганцэвіч, настаўнік Міхедавіцкай сярэдняй школы, быў узнагароджаны за мужнасць у тым баі медалём «За адвагу».

* * *

Тры ордэны Айчыннай Вайны, ордэн Славы III ст., шматлікія баявыя і працоўныя медалі ўпрыгожваюць у дні свят грудзі Пятра Сцяпанавіча Герасіменкі... Гэта — сціплая адзнака яго заслуг на франтах мінулай вайны, нялёгкіх калгасных будняў.

Ваенная біяграфія ветэрана пачалася раней за працоўную. У 18 гадоў ён трымае сувязь з партызанамі, а хутка і сам становіцца байцом партызанскага атрада. Пасля злучэння яго з часцямі дзеючай арміі — разведчык 21-й кавалерыйскай дывізіі. Вызваляў Беларусь, Польшчу, пераможныя залпы ў маі 1945 г. прагучалі для яго ў ваколіцах Берліна.

Амаль паўстагоддзя аддаў Пётр Сцяпанавіч роднай гаспадарцы ў Мышанцы, дзе яго заўсёды паважалі за добрасумленнасць, стараннасць, сціпласць...

* * *

Плавінскі Франц Андрэевіч перад вайной узначальваў рыбгас «Трэмля». Райком партыі накіраваў яго для арганізацыі партызанскай барацьбы ў тыле ворага, і смелы патрыёт не сядзеў склаўшы рукі. Удзельнічаў у разгроме варожага гарнізона ў Капаткевічах, у нападзе на ст. Муляраўка, дзе ў час бою было забіта звыш 30 гітлераўцаў. Франц Плавінскі ўзяў у палон двух немцаў.

У верасні 1942 г. ён быў прызначаны сакратаром падпольнага райкома камсамола і адначасова — намеснікам камісара 125-й брыгады. Камсамольская арганізацыя пад кіраўніцтвам Ф. А. Плавінскага выросла з 18 да 482 чалавек. І словам, і справай камсамольскі важак змагаўся з ворагам, набліжаючы дзень Перамогі.

За мужнасць і адвагу ў барацьбе з ворагам Ф. А. Плавінскі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., Чырвонай Зоркі, медалямі, за мірную працу — ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі і іншымі ўрадавымі ўзнагародамі.

* * *

Глушко Іосіф Нікіфаравіч (н. у 1905 г. у в. Бабунічы) да вайны працаваў старшынёй калгаса, дырэктарам МТС. У пачатку вайны над псеўданімам Балотнікаў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі партызанскай барацьбы, у маі 1942 г. быў накіраваны ў Петрыкаўскі раён, узначаліў партызанскі атрад. І. Н. Балотнікаў прымаў удзел у падрыве чыгуначных мастоў на Пцічы і каля Аголіцкай Рудні, у баях за Міхедавічы і Бабунічы, на Чорным балоце і ў многіх другіх баявых аперацыях. У ліпені 1943 г. створана 130-я Петрыкаўская партызанская брыгада, ён быў прызначаны яе камандзірам. Пасля вызвалення раёна І. Н. Глушко да 1946 г. працаваў першым сакратаром райкома партыі.

Памёр 23.7.1986 г.

* * *

Калі пачалася вайна, Міхаіл Губар не дасягнуў прызыўнога ўзросту. Юнак знайшоў дарогу да партызан і ў ліпені 1942 г. стаў байцом атрада. Удзельнічаў у многіх баявых аперацыях — хадзіў на дыверсіі на чыгунку і гра-

міў варожыя гарнізоны, выходзіў з блакады ў 1943 г. і кідаўся ў атаку на ўмацаваныя пазіцыі гітлераўцаў...

У арміі М. І. Губар быў стралком, снайперам. Закончыў вайну ў Кёнігсбергу. На грудзях маладога салдата былі два знакі вышэйшай салдацкай доблесці — ордэны Славы, Айчыннай Вайны I ст., многія баявыя медалі.

А 24 чэрвеня 1945 г. М. І. Губар прымаў удзел у парадзе Перамогі ў Маскве. У такім страі ён яшчэ раз ішоў па Краснай плошчы ў 1990 г. — удзельнічаў у парадзе ветэранаў, прысвечаным 45-годдзю вялікай Перамогі.

Памёр 20.4.1992 г.

* * *

Чатыры разы быў паранены ў гады Айчыннай вайны Васіль Іванавіч Дрыня, былі такія раненні, што, здавалася, больш не стане ў строй... Але малады арганізм і імкненне біць ворага кожны раз перамагалі. Франтавы шлях ветэрана цяжка вымераць — ад абароны Масквы да вызвалення Кіева, ад баёў за Львоў да штурму Берліна, дзе ён быў паранены ў апошні раз. Двума ордэнамі Славы, Айчыннай Вайны I ст., Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу» і іншымі баявымі ўзнагародамі адзначаны шлях Васіля Іванавіча па вайне. Пасля шпіталю былы танкіст вярнуўся ў разбураныя Камаровічы і адразу прыступіў да мірнай працы, якой аддаў амаль палову пасляваеннага стагоддзя.

Памёр 15.11. 1993 г.

* * *

Не думаў Герман Карульскі, адпраўляючыся ў 1938 г. на тэрміновую службу ў рады Чырвонай Арміі, што вернецца ў родны Петрыкаў толькі амаль праз 10 гадоў — афіцэрам, ардэнаносцам... І шлях гэты ляжаў праз усю будучую вайну, ад абароны Масквы восенню 1941 г. і Курскай дугі гарачым летам 1943 г. Прайшоў Мінск, Варшаву, Кёнігсберг — да самага Берліна... У вялікую Перамогу ўнёс і свой уклад артылерыст, камандзір дывізіёна Г. У. Карульскі. Яго ратныя подзвігі адзначаны чатырма ордэнамі Айчыннай Вайны, Аляксандра Неўскага II ст., шматлікімі медалямі.

Памёр 3.2.1995 г.

* * *

Кузьміч Ефрасіння Мікітаўна (н. у 1914 г. у Канаткевічах) да вайны працавала аграномам Канаткевіцкай МТС. Прымала актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, з дня арганізацыі першага партызанскага атрада з'яўлялася сувязной, а затым стала яго байцом. Неаднаразова прымала ўдзел у аперацыях па разгрому нямецкіх і паліцэйскіх гарнізонаў, у дыверсіях на чыгункі. Пасля вайны на працягу 25 гадоў узначальвала выканком Канаткевіцкага сельскага савета дэпутатаў працоўных.

Узнагароджана ордэнамі Айчыннай Вайны II ст., Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» II ст.

Памерла 28.12.1993 г.

* * *

Многа разоў быў паранены за гады вайны камандзір мінамётнай роты Васіль Кузняцоў. Апошняе цяжкае раненне, пасля якога стаў інвалідам, атрымаў незадоўга да перамогі, 24 красавіка 1945 г. Вайна пачалася для яго яшчэ зімой 1940 г., калі ён служыў на фінскай граніцы і з першага дня канфлікту прымаў удзел у баях. Вогненныя дарогі па франтах Вялікай Айчыннай цягнуліся з кастрычніка 1941 г., калі В. С. Кузняцоў, макчы бронь, добраахвотна пайшоў у дзеючую армію, і да таго апошняга бою ў Германіі... Трыма ордэнамі Айчыннай Вайны, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі адзначаны яго подзвігі.

Памёр у 1985 г.

* * *

Ні адна вайна не мінула Пятра Курловіча — паход у Заходнюю Беларусь і савецка-фінляндская, Вялікая Айчынная з першага да апошняга дня, вайна з японскімі мілітарыстамі... Ён быў кулямётчыкам, вялікі ваенны вопыт дазволіў яму камандаваць супрацьтанкавай батарэяй. А ў мірным жыцці Пётр Сцяпанавіч быў радавым калгаснікам, пастухом і даглядчыкам малочнага статка ў роднай вёсцы Вышалаў.

Узнагароджаны ордэнам Славы III ст., Айчыннай Вайны I і II ст., двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Памёр у 1988 г.

* * *

Мінчук Алег Аксенцьевіч (н. 1.3.1922 г. у пас. Капаткевічы)—удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. працаваў настаўнікам матэматыкі Капаткевіцкай сярэдняй школы, загадчыкам аддзела народнай асветы, намеснікам старшыні райвыканкома, старшынёй Петрыкаўскага раённага камітэта народнага кантролю, дырэктарам Капаткевіцкай сярэдняй школы.

У 1984 г., напярэдадні Дня Перамогі, Алег Аксенцьевіч правёў у школе ўрок мужнасці. А праз некалькі дзён яго не стала...

Баявыя і працоўныя заслугі Алега Аксенцьевіча Мінчука адзначаны ордэнамі Славы III ст., Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі і ганаровымі граматамі.

* * *

На ўсё жыццё засталіся ў целе І. І. Стракача пямецкія асколкі. Вайну сустрэў у далёкім Запаляр'і, дзе ён праходзіў тэрміновую службу. Потым былі Смаленск і Масква, вызваленне Украіны, Беларусі, Польшчы, штурм Берліна... Дэмабілізаваўся капітан І. І. Стракач у 1947 г., працаваў на розных адміністрацыйных пасадах у Пінскай і Палескай абласцях. Доўгі час узначальваў калгас імя Чкалава ў Брыневе.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны I ст., Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Запаляр'я», «За доблесную працу» і іншымі.

* * *

Мазуркевіч Васіль Паўлавіч (н. у 1914 г. у в. Міхедавічы) — капітан I рангу, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. На пасадзе камандзіра зенітнай батарэі вызначыўся ў шматлікіх баях з ворагам на Чорным моры. У пасляваенны час В. П. Мазуркевіч працаваў выкладчыкам Каспійскага Вышэйшага Ваенна-марскога вучылішча, затым — намеснікам начальніка вучылішча імя П. С. Нахімава. У Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узначальваў аддзел навукі і падрыхтоўкі навуковых кадраў.

Баявы і працоўны шлях В. П. Мазуркевіча адзначаны 22 урадавымі ўзнагародамі, сярод іх — два ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I і II ст., Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За абарону Адэсы», «За абарону Севастопаля», «За абарону Каўказа».

* * *

Цылько Ніна Аркадзьеўна перад вайной працавала наборшчыцай у друкарні Капаткевіцкай раённай газеты «Большавік». Пасля акупацыі раёна пайшла ў партызанскі атрад, набірала падпольныя рэспубліканскія газеты «Звязда» і «Чырвоная змена».

Н. А. Цылько ўзнагароджана ордэнам Айчыннай Вайны II ст., медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» I ст. Ёй уручана Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР. Газета «Звязда» ўзнагародзіла яе залатым імянным гадзіннікам.

Памерла ў 1988 г.

Воіны Чырвонай Арміі — землякі, якія загінулі і прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны

БАБУЙЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАБУНІЧЫ

БАРДЫГА Захар Максімавіч, н. у 1926 г., рад., загінуў у снежні 1944 г. пад Варшавай.

ГЛУШКО Інат Нікіфаравіч, н. у 1919 г., загінуў 17.8.1943 г. каля г. Волхаў.

ГЛУШКО Пётр Рамашавіч, н. у 1909 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў 6.5.1945 г. у Германіі, у г. Тангермюндэ.

ГЛУШКО Сяргей Іванавіч, н. у 1918 г., настаўшік, загінуў 18.12.1944 г.

ГЛУШКО Яўхім Раманавіч, н. у 1908 г., рад., загінуў у снежні 1944 г. пад Варшавай.

ЖУРАЎЛЕВІЧ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1918 г., загінуў 17.5.1943 г. каля в. Бобрык.

ЗАГОРАЦ Міхаіл Фамін, н. у 1926 г., рад., загінуў у лютым 1945 г. у Польшчы.

КЛЯЎЦОЎ Фёдар Карнеевіч, н. у 1919 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў 14.11.1941 г. у Ленінградзе.

НАЛЕЦЬКА Аляксандр Арыёнавіч, н. у 1904 г., загінуў 12.11.1942 г. у Сталінградзе.

НАЛЕЦЬКА Данііа Антонавіч, н. у 1906 г., рад., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

НАЛЕЦЬКА Іван Трафімавіч, н. у 1920 г., лейтэнант, прапаў без вестак у красавіку 1944 г. пад Рагачовам.

НАЛЕЦЬКА Фёдар Арыёнавіч, н. у 1903 г., мал. сяржант, загінуў 14.1.1943 г. у станцыі Верхняя Бузінаўка каля Сталінграда.

ПАНЦЮК Андрэй Аляксеевіч, н. у 1895 г., удзельнік грамадзянскай вайны, загінуў у красавіку 1944 г.

ПАНЦЮК Андрэй Астапавіч, н. у 1923 г., партызан 130-й брыгады, з жніўня 1944 г. у Чырвонай Арміі, рад., прапаў без вестак у студзені 1945 г. у Польшчы.

ПАНЦЮК Васіль Сцяпанавіч, н. у 1904 г., у Чырвонай Арміі з кастрычніка 1941 г., ст. лейтэнант, загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАНЦЮК Іван Ігнатавіч, н. у 1905 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў у 1945 г.

ПАНЦЮК Мікалай Іванавіч, н. у 1904 г., партызан 130-й брыгады, з ліпеня 1944 г. у Чырвонай Арміі, рад., памёр ад ран 24.11.1944 г. у г. Пскоў.

ПАНЦЮК Мікалай Ігнатавіч, н. у 1909 г., загінуў у снежні 1942 г. у Варашылаўградскай вобл.

ПАНЦЮК Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1913 г., рад., загінуў 23.2.1945 г. у Латвіі.

ПАНЦЮК Павел Міхайлавіч, н. у 1912 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАНЦЮК Сцяпан Мацвеевіч, н. у 1924 г., рад., загінуў 16.12.1944 г. у Польшчы.

ПАНЦЮК Уладзімір Мацвеевіч, н. у 1926 г., загінуў у лютым 1945 г. пад г. Сувалкі ў Польшчы.

ПАЛТАРАН Астап Савельевіч, н. у 1920 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАЛТАРАН Васіль Мікітавіч, н. у 1925 г., загінуў 7.8.1942 г. у Ленінградзе.

ПАЛТАРАН Іван Макаравіч, н. у 1894 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ПАЛТАРАН Леанід Іванавіч, н. у 1926 г., памёр ад ран 27.2.1945 г. у палявым шпіталі № 2295 ва Усходняй Прусіі.

ПАЛТАРАН Пётр Аляксеевіч, н. у 1908 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў 1.11.1941 г.

ПАЛТАРАН Пётр Мікітавіч, н. у 1903 г., рад., загінуў 28.2.1943 г. каля г. Ленінград.

ПАЛТАРАН Рыгор Трафімавіч, н. у 1909 г., прапаў без вестак у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАЛТАРАН Сцяпан Данілавіч, н. у 1913 г., рад., прапаў без вестак у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАЛТАРАН Сямён Данілавіч, н. у 1905 г., рад., загінуў 10.7.1941 г.

ПРЫМАК Міхаіл Трафімавіч, н. у 1912 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, прапаў без вестак у снежні 1941 г. пад Масквой.



Помнік воінам-землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Бабунічы

ПРЫМАК Сава Аляксеевіч, н. у 1917 г., загінуў у снежні 1944 г. пад Варшавай.

ПРЫМАК Фёдар Васільевіч, н. у 1920 г., рад., прапаў без вестак у чэрвені 1941 г.

ПРЫМАК Якаў Ільіч, н. у 1926 г., рад., загінуў 20.1.1945 г. у Польшчы.

РАЖАЛЮК Сямён Данілавіч, н. у 1891 г., удзельнік імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў. У Чырвонай Арміі з ліпеня 1941 г., рад., загінуў у сакавіку 1944 г. пад Віцебскам.

СТРАЛЬЧЭНЯ Барыс Васільевіч, н. у 1925 г., партызан 130-й брыгады, потым у Чырвонай Арміі, рад., загінуў у верасні 1944 г. у Польшчы.

СТРАЛЬЧЭНЯ Міхаіл Васільевіч, н. у 1909 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў 21.8.1943 г. пад Харкавам.

СТРАЛЬЧЭНЯ Нікіфар Васільевіч, н. у 1920 г., танкіст, загінуў 13.7.1944 г. у п. Рось Ваўкавыскага р.

СЫЦЬКА Якаў Ільіч, н. у 1912 г., загінуў у сакавіку 1944 г. у Быхаўскім р.

ТАКУН Аляксей Ільіч, н. у 1913 г., прапаў без вестак у снежні 1941 г. пад Масквой.

ТАКУН Захар Сцяпанавіч, н. у 1910 г., рад., загінуў 8.7.1942 г.

ТАКУН Сцяпан Данілавіч, н. у 1913 г., рад., прапаў без вестак.

ТАКУН Сямён Ільіч, н. у 1900 г., загінуў у красавіку 1944 г. каля г. Роўна.

ТАКУН Трафім Іванавіч, н. у 1907 г., сяржант, камандзір аддзялення, загінуў на савецка-фінляндскай вайне 26.12.1939 г. пад Выбаргам.

ФЕЛЬКІН Аляксандр Карлавіч, н. у 1904 г., рад., загінуў 15.12.1945 г. у Латвіі.

ХМЯЛЁЎСКІ Іван Сямёнавіч, н. у 1912 г., загінуў у сакавіку 1944 г. каля г. Роўна.

ЦІМАШЫШЫН Мікалай Пятровіч, н. у 1919 г., сяржант, загінуў 8.7.1944 г. у Ковельскім р. Валынскай вобл.

ЦФАСМАН Моўша Ёселевіч, н. у 1925 г. У ліпені 1941 г. добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію, рад., прапаў без вестак у снежні 1941 г. пад Масквой.

ШАБАЛТАС Сцяпан Пятровіч, н. у 1905 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ЯРЫГА Данііл Цімафеевіч, н. у 1918 г., памёр ад ран 25.1.1943 г. на х. Туравым Сталінградскай вобл.

ЯРЫГА Мікалай Якаўлевіч, н. у 1905 г., загінуў у кастрычніку 1942 г. пад Сталінградам.

ЯРЫГА Павел Аляксеевіч, н. у 1914 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г. у Драгобыцкім р.

ЯРЫГА Раман Данілавіч, н. у 1909 г., рад., прапаў без вестак у сакавіку 1944 г.

ЯРЫГА Сяргей Цімафеевіч, н. у 1915 г., сяржант, удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў у сакавіку 1944 г. у Рагачове.

ЯРЫГА Яўхім Лявонцьевіч, н. у 1920 г., настаўнік, капітан, загінуў у студзені 1945 г. пад Варшавай.

ВЁСКА БАРЫЧАЎ

АРХІПЕНКА Пётр Іванавіч, н. у 1918 г., дырэктар Бабуніцкай школы, сяржант, загінуў у 1941 г.

КОРБУТ Іван Фаміч, н. у 1907 г., рад., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

КОРБУТ Серафім Фаміч, н. у 1920 г., прапаў без вестак у чэрвені 1941 г.

КРУКОЎСКІ Павел Іванавіч, н. у 1902 г., рад., памёр ад ран 3.11.1944 г. у Літве, у Елгаўскім р.

КРУКОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў 3.3.1943 г. у Харкаўскай вобл.

КУЛАКОЎСКІ Міхаіл Васільевіч, н. у 1921 г., сяржант, загінуў 3.3.1942 г.

НЕКРАШЭВІЧ Аляксандр Раманавіч, н. у 1911 г., загінуў у кастрычніку 1944 г.

НЕКРАШЭВІЧ Антон Андрэевіч, н. у 1913 г., загінуў 23.8.1942 г.

НЕКРАШЭВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1904 г., рад., прапаў без вестак у жніўні 1944 г.

НЕКРАШЭВІЧ Пётр Паўлавіч, н. у 1915 г., падпалкоўнік, загінуў 26.1.1946 г. у Румыніі.

Ён быў маладым і прыгожым, поўным сіл і жыцця... Нарадзіўся Пётр Некрашэвіч у беднай, сялянскай сям'і ў в. Барычаў. Закончыў школу ў Бабунічах, яго накіравалі на курсы настаўнікаў у Мазыр. 18-гадовы юнак быў прызначаны дырэктарам Аголіцкай сямігадовай школы, вучыўся завочна ў Мазырскім настаўніцкім інстытуце. А ў верасні 1940 г. Пятра Некрашэвіча выбіраюць першым сакратаром Петрыкаўскага райкома камсамола.

За некалькі дзён да пачатку вайны Пятра Некрашэвіча прызвалі ў армію, ён быў накіраваны ў ваенна-палітычнае вучылішча. Закончыў яго пад гул кананады і адразу пасля выпуску — фронт... Баявое хрышчэнне давялося трымаць на Курскай дузе. У франтавых буднях расло майстэрства і аўтарытэт палітрука,



П. П. Некрашэвіч

памесніка камандзіра палка. Пры фарсіраванні Дняпра восенню 1943 г. ён ужо маёр. Беларусь, Польшча, Чэхаславакія... У канцы вайны Пётр Некрашэвіч быў адазваны з палка і накіраваны на вышэйшыя курсы ўдасканалення палітсаставу Чырвонай Арміі. Пасля заканчэння іх у 1945 г. у якасці памесніка начальніка ваеннага аддзела Саюзнай Кантрольнай камісіі падпалкоўнік Некрашэвіч накіроўваецца ў Бухарэст. Тут 26 студзеня 1946 г. яго падпільнавала бандыцкая куля...

Узнагароджаны П. П. Некрашэвіч ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., двума — Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі.

Пахаваны ў г. Петрыкаў.

НЕКРАШЭВІЧ Трафім Міхайлавіч, н. у 1908 г., загінуў 12.1.1940 г. на р. Ханко (Гангут).

РЭВУТ Павел Сямёнавіч, н. у 1919 г., загінуў 23.6.1941 г.

РЭВУТ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1919 г., настаўнік Бабуніцкай школы, загінуў 6.8.1941 г. каля г. Харкаў.

ЦІШКЕВІЧ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1907 г., загінуў у верасні 1944 г.

ЦІШКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1909 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў у сакавіку 1944 г. пад Віцебскам.

ВЁСКА КАСПІЧА

ГЛУШКО Фёдар Мікітавіч, н. у 1919 г., сяржант, загінуў 14.11.1941 г. у Ленінградзе.

ДУБІК Фёдар Антонавіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў 10.7.1941 г. пад Оршай.

ПАЛТАРАН Аляксандр Прохаравіч, н. у 1921 г., рад., загінуў 24.6.1941 г. у Брэсцкай крэпасці.

ПАЛТАРАН Васіль Максімавіч, н. у 1912 г., рад., загінуў 18.6.1945 г.

ПАЛТАРАН Дзмітрый Прохаравіч, н. у 1910 г., сяржант, загінуў 29.11.1941 г. у Мажайскім р. Маскоўскай вобл.

ПАЛТАРАН Васіль Максімавіч, н. у 1892 г., удзельнік імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў, загінуў у жніўні 1943 г. у Курскай вобл.

ПАЛТАРАН Іван Іосіфавіч, н. у 1903 г., загінуў у чэрвені 1944 г.

ПАЛТАРАН Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1913 г., танкіст, загінуў 2.7.1944 г. каля г. Мінск.

ПАЛТАРАН Рыгор Міхайлавіч, н. у 1919 г., сяржант, загінуў 8.7.1943 г. у п. Фацеж Курскай вобл.

ПАЛТАРАН Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1903 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ПАЛТАРАН Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1926 г., мал. сяржант, загінуў 2.2.1945 г. ва Усходняй Прусіі.

ПАЛТАРАН Фёдар Прохаравіч, н. у 1926 г., загінуў 14.2.1945 г. пад Будапештам.

ВЁСКА МІХЕДАВІЧЫ

АКУЛІЧ ГерманАнуфрыевіч, н. у 1922 г., загінуў 20.5.1942 г. у Ленінградскай вобл.

АКУЛІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1914 г., ст. лейтэнант, загінуў 3.7.1944 г. каля Турава.

АКУЛІЧ СевасцьянАнуфрыевіч, н. у 1919 г., рад., загінуў 14.12.1941 г. каля г. Вадакаламск.

БРАНАВІЦКІ Сцяпан Андрэевіч, н. у 1911 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, лейтэнант, загінуў 17.8.1943 г. у Арлоўскай вобл.

БУЛАВА Міхаіл Васільевіч, н. у 1899 г., рад., загінуў 7.1.1942 г. у в. Масюкоўшчына пад Мінскам.

БУЛАВА Уладзімір Андрэевіч, н. у 1918 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў 18.8.1943 г. у г. Шчыгры Курскай вобл.



Помнік воінам-землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, у в. Міхедавічы

ВЯРЭНІЧ Сцяпан Васільевіч, н. у 1923 г., партызан, потым у Чырвонай Арміі, загінуў 22.12.1943 г. у Даманавіцкім р.

ГАНЦЭВІЧ Аляксандр Васільевіч, н. у 1925 г., рад., загінуў 28.9.1944 г. у Латвіі.

ГАНЦЭВІЧ Антон Сцяпанавіч, н. у 1924 г., партызан 130-й брыгады, з чэрвеня 1944 г. у Чырвонай Арміі, рад., загінуў 5.1.1945 г. каля Варшавы.

ГАНЦЭВІЧ Дамітрый Міхайлавіч, н. у 1915 г., загінуў 2.9.1944 г. у Літве.

ГАНЦЭВІЧ Мікалай Іосіфавіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў у красавіку 1944 г.

ГАНЦЭВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1911 г., загінуў у жніўні 1944 г.

ГЛУШКО Аляксандр Адамавіч, н. у 1923 г., рад., загінуў 15.10.1944 г. у Польшчы, каля Бяла-Падляскі.

ГЛУШКО Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1922 г., рад., загінуў 24.4.1945 г.

ГЛУШКО Іван Андрэевіч, н. у 1915 г., загінуў 18.3.1945 г. у Польшчы.

ГЛУШКО Ігнат Трафімавіч, н. у 1890 г., рад., загінуў 16.1.1945 г. пад Варшавай.

ГЛУШКО Канстанцін Адамавіч, н. у 1918 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, капітан. Загінуў 23.11.1941 г. у в. Бобрыкава Варашылаўградскай вобл.

ГЛУШКО Леанід Іванавіч, н. у 1924 г., рад., памёр у шпіталі 17.3.1945 г.

ГЛУШКО Мікалай Аляксандравіч, н. у 1921 г., памёр у шпіталі 18.9.1944 г. у Пінску.

ГЛУШКО Пётр Аляксандравіч, н. у 1923 г., партызан 130-й брыгады, з ліпеня 1944 г. у Чырвонай Арміі, сяржант, загінуў 29.1.1945 г.

ГЛУШКО Пётр Іванавіч, н. у 1914 г., партызан 130-й брыгады, затым у Чырвонай Арміі, рад., загінуў 20.10.1944 г. у Польшчы.

ГЛУШКО Уладзімір Мікітавіч, н. у 1911 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ГЛУШКО Фёдар Піліпавіч, н. у 1908 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ГРЫГАРЭВІЧ Дамітрый Іванавіч, н. у 1904 г., загінуў 21.8.1944 г. каля Варшавы.

ДЗЯГЕЛЬКА Мікалай Іванавіч, н. у 1921 г., сяржант, загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ДУБІНА Піліп Пятровіч, н. у 1920 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г. пад Віцебскам.

ДУБІНА Сцяпан Пятровіч, н. у 1923 г., рад., загінуў 17.2.1945 г. у Польшчы, у г. Кельцэ.

ЕРМАЛІНСКІ Іван Віктаравіч, н. у 1910 г., рад., загінуў 17.10.1944 г. у Польшчы.

ЕРМАЛІЦКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў 14.10.1944 г.

ЕРМАЛІЦКІ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1922 г., сяржант, загінуў 3.7.1944 г. у г. Полацк.

ЖУРАЎСКІ Уладзімір Канстанцінавіч, н. у 1917 г., галоўны бухгалтар Мулярайскай МТС. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў 18.8.1943 г. у г. Абаянь Курскай вобл.

КНІГА Міхаіл Васільевіч, н. у 1905 г., рад., разведчык, загінуў 23.2.1943 г.



А. І. Мазуркевіч



А. Д. Найдзён

КНІГА Міхаіл Мітрафанавіч, н. у 1910 г., старшына, загінуў 15.7.1943 г. каля г. Курск.

КОЛЬ Аляксандр Барысавіч, н. у 1918 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў у 1943 г. у Сталінградзе.

КОЛЬ Аляксандр Кузьміч, н. у 1916 г., партызан 130-й брыгады, з ліпеня 1944 г. — у Чырвонай Арміі, рад., загінуў 6.1.1945 г. у Польшчы.

КУДРАВЕЦ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1924 г., рад., загінуў 27.9.1944 г. у Латвіі, у г. Даўгаўпілс.

КУЧЫНСКІ Адам Казіміравіч, н. у 1924 г., рад., загінуў 6.1.1945 г. каля Варшавы.

ЛЕАНОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў у снежні 1941 г.

ЛЕАНОВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1905 г., сяржант, загінуў у маі 1945 г. каля Берліна.

МАЗУРКЕВІЧ Адам Мітрафанавіч, н. у 1924 г., рад., загінуў 16.8.1944 г. у Польшчы, каля г. Бяла-Падляска.

МАЗУРКЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1922 г., сяржант, загінуў 16.4.1945 г. на р. Одэр.

МАЗУРКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1909 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў 6.7.1943 г. у г. Болхаў Арлоўскай вобл.

МАЗУРКЕВІЧ Мікалай Паўлавіч, н. у 1902 г., настаўнік, сяржант, загінуў 16.8.1943 г.

МАЗУРКЕВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1923 г., партызан 130-й брыгады, з ліпеня 1944 г. — у Чырвонай Арміі, рад., загінуў 3.12.1944 г. у г. Даўгаўпілс.

МАКСІМОВІЧ Сцяпан Трафімавіч, н. у 1910 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў 26.10.1944 г.

МАРГУН Піліп Яфімавіч, н. у 1906 г., загінуў 8.10.1943 г. у г. Лёзна Віцебскай вобл.

МАРГУН Фёдар Іванавіч, н. у 1917 г., рад., памёр у шпіталі 27.10.1944 г. у Польшчы, у г. Парчаў.

НАВІЧЭНКА Улас Антонавіч, н. у 1911 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

НАЙДЗЁН Адам Майсеевіч, н. у 1921 г., рад., загінуў 16.2.1942 г. у Ленінградскай вобл.

НАЙДЗЁН Андрэй Дамітрыевіч, н. у 1910 г.,

старшыня калгаса, лейтэнант, загінуў каля в. Мышанка.

НАЙДЗЁН Іван Сцяпанавіч, н. у 1923 г., сяржант, загінуў 10.2.1945 г. у Германіі.

НАЙДЗЁН Ігнат Мінавіч, н. у 1922 г., загінуў 21.12.1944 г. пад Варшавай.

НАЙДЗЁН Мікалай Якаўлевіч, н. у 1902 г., сяржант, загінуў 19.2.1944 г. у Рагачоўскім р.

НАЙДЗЁН Пётр Ціліпавіч, н. у 1922 г., загінуў 5.8.1943 г. у Краснадарскім краі.

НАЙДЗЁН Сцяпан Іванавіч, н. у 1904 г., загінуў 18.8.1943 г. на Курскай дузе.

НАЙДЗЁН Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1922 г., загінуў 22.6.1944 г. каля г. п. Шуміліна.

НАЙДЗЁН Фёдар Адамавіч, н. у 1915 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў у лютым 1944 г. у Рагачоўскім р.

НАЛЕЦЬКА Дзям'ян Лукіч, н. у 1922 г. У маі 1941 г. скончыў Мінскае ваеннае вучылішча, лейтэнант, загінуў 26.6.1941 г. у Брэсцкай крэпасці.

НАЛЕЦЬКА Рыгор Арцёмавіч, н. у 1900 г., рад., загінуў 30.10.1944 г. у г. Даўгаўпілс.

НЕКРАШЭВІЧ Андрэй Сямёнавіч, н. у 1915 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў 3.7.1941 г. пад Оршай.

НЕКРАШЭВІЧ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1908 г., сяржант, загінуў 12.7.1943 г. каля г. Губкін Белгарадскай вобл.

ПРЫМАК Фёдар Васільевіч, н. у 1920 г., рад., загінуў у чэрвені 1941 г.

РАКІЦКІ Леанід Данілавіч, н. у 1910 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў 7.7.1943 г. у Курскай вобл.

РОС Павел Антонавіч, н. у 1903 г., рад., загінуў у маі 1945 г. у Германіі.

СЕРАПІН Рыгор Іванавіч, н. у 1918 г., малодшы лейтэхнік, загінуў 14.9.1941 г.

СЯЎРУК Аляксандр Васільевіч, н. у 1901 г., рад., загінуў 3.12. 1941 г. пад Масквой.

СОКАЛ Адам Фёдаравіч, н. у 1922 г., рад., загінуў 3.1.1945 г. у Польшчы.

СОКАЛ Алісей Ігнатавіч, н. у 1908 г., сяржант, загінуў 27.10.1944 г. у Польшчы.

СОКАЛ Андрэй Іванавіч, н. у 1922 г., рад., загінуў 14.2.1945 г. у Польшчы.

СОКАЛ Антон Акулавіч, н. у 1909 г., рад., загінуў 15.10.1943 г. у Брагінскім р.

СОКАЛ Іван Васільевіч, н. у 1920 г., партызан 130-й брыгады. У лістападзе 1944 г. добраахвотна пайшоў на фронт, рад., загінуў 3.2. 1945 г. у Польшчы.

СОКАЛ Іван Мікалаевіч, н. у 1926 г., загінуў 6.11.1944 г. у Польшчы.

СОКАЛ Канстанцін Мікалаевіч, н. у 1922 г., рад., загінуў 26.7.1943 г. у Андрэеўскім р. Харкаўскай вобл.

СОКАЛ Канстанцін Прохаравіч, н. у 1920 г., загінуў 14.1.1944 г. каля Даўгаўпілса.

СОКАЛ Максім Фёдаравіч, н. у 1907 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

СОКАЛ Мікалай Акулавіч, н. у 1913 г., сяржант, загінуў 16.10.1942 г.

СОКАЛ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў 23.6.1941 г. у Беластоцкай вобл.

СОКАЛ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1902 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

СОКАЛ Мікалай Цімафеевіч, н. у 1907 г., загінуў у верасні 1944 г. каля г. Біла Падляска ў Польшчы.

СОКАЛ Міна Мікалаевіч, н. у 1910 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, ст. сяржант, загінуў 7.7.1943 г. у Курскай вобл.

СОКАЛ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1910 г., загінуў у сакавіку 1944 г. у Рагачоўскім р.

СОКАЛ Піліп Іванавіч, н. у 1911 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

СОКАЛ Сцяпан Андрэевіч, н. у 1920 г., рад., загінуў 11.10.1944 г. у Польшчы, у г. Ольштын.

СОКАЛ Сямён Рыгоравіч, н. у 1910 г., загінуў у кастрычніку 1944 г. у Брэсцкай вобл.

СОКАЛ Уладзімір Іванавіч, н. у 1922 г., партызан 130-й брыгады, потым у Чырвонай Арміі, сяржант, загінуў 18.10.1944 г. каля г. Даўгаўпілс.

СОКАЛ Цімафей Данілавіч, н. у 1890 г., удзельнік грамадзянскай вайны, загінуў у баях з белагвардзейцамі ў студзені 1919 г.

СОКАЛ Яўстрат Іванавіч, н. у 1900 г., удзельнік грамадзянскай вайны, рад., загінуў 12.7.1943 г. каля г. п. Залатухіна Курскай вобл.

СТАНКЕВІЧ Мікалай Кузьміч, н. у 1923 г., рад., загінуў 23.12.1943 г. у Думанавіцкім р.

СТАНКЕВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1920 г., лейтэнант, загінуў 8.5.1942 г. у паветраным баі над Ленінградам.

СТАНКЕВІЧ Піліп Міхайлавіч, н. у 1909 г., рад., загінуў 15.12.1943 г. у г. п. Стрэшын Жлобінскага р.

СТАНКЕВІЧ Сямён Міхайлавіч, н. у 1902 г., загінуў 15.10.1943 г. у Брагінскім р.

СТАНКЕВІЧ Фёдар Кузьміч, н. у 1911 г., рад., загінуў 22.11.1941 г.

СТРАКАЧ Андрэй Андрэевіч, н. у 1907 г., рад., загінуў у студзені 1945 г. у Польшчы.

СТРАКАЧ Андрэй Васільевіч, н. у 1899 г., загінуў 11.10.1944 г. у Польшчы.



М. Р. Станкевіч



П. М. Шамрыла

ТАРАСЕВІЧ Рыгор Аляксеевіч, н. у 1900 г., загінуў у кастрычніку 1944 г. пад Люблінам.

ТАРАСЕВІЧ Сямён Паўлавіч, н. у 1910 г., настаўнік Слабадской школы, сяржант, загінуў 10.7.1941 г. у Рагачоўскім р.

ШАМРЫЛА Мікалай Іванавіч, н. у 1920 г., сяржант, загінуў 9.7.1941 г. каля в. Азяраны Рагачоўскага р.

ШАМРЫЛА Пётр Міхайлавіч, н. у 1900 г., сяржант, загінуў 21.8.1943 г. каля г. Хатынец Арлоўскай вобл.

ШАМРЫЛА Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1926 г., загінуў 31.1.1945 г. ва Усходняй Прусіі.

ШУМСКІ Браніслаў Людвігавіч, н. у 1914 г., лейтэнант, загінуў 19.8.1943 г. у Курскай вобл.

ШУРЫНОК Уладзімір Анучфрыевіч, н. у 1914 г., сяржант, загінуў 14.7.1943 г. у г. Ваўчанск Харкаўскай вобл.

ЯНОВІЧ Пётр Фаміч, н. у 1898 г., рад., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ЯРЫГА Аляксандр Антонавіч, н. у 1918 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў 21.12.1944 г. пад Варшавай.

ЯРЫГА Ілья Пятровіч, н. у 1908 г., старшына калгаса «Пераможац», лейтэнант, загінуў 16.1.1945 г. у Варшаве.

ЯСІНСКІ Леў Васільевіч, н. у 1926 г., рад., загінуў 12.1.1945 г. у Варшаўскім ваяводстве.

ВЁСКА ПАДОЗЫН

БАРДЫГА Аляксей Іванавіч, н. у 1896 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

БАРДЫГА Васіль Анісімавіч, н. у 1901 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, загінуў 4.3.1940 г.

БАРДЫГА Васіль Фёдаравіч, н. у 1912 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., прапаў без вестак у красавіку 1944 г. пад Віцебскам.

БАРДЫГА Віктар Фёдаравіч, н. у 1922 г., танкіст, загінуў у сакавіку 1942 г. у Сталінградскай вобл.

БАРДЫГА Мікалай Фёдаравіч, н. у 1904 г., рад., загінуў у красавіку 1942 г. у Ленінградскай вобл.

БАРДЫГА Раман Міронавіч, н. у 1919 г., мал. сяржант, загінуў 23.6.1944 г. у Парыцкім р.

БАРДЫГА Яфім Дзмітрыевіч, н. у 1922 г., настаўнік, загінуў у 1945 г.

СЫЦЬКА Рыгор Іванавіч, н. у 1913 г., рад., загінуў 21.8.1943 г. пад Харкавам.

ТАКУН Аляксей Герасімавіч, н. у 1919 г., сяржант, загінуў у кастрычніку 1943 г. у Днепрапятроўскай вобл.

ШАБАЛТАС Аксэнт Карнеевіч, н. у 1914 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, рад., загінуў у верасні 1944 г. у Полыпчы, у г. Седльцэ.

ШАБАЛТАС Антон Нікіфаравіч, н. у 1904 г., загінуў у верасні 1943 г.

ШАБАЛТАС Іван Пятровіч, н. у 1906 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ШАБАЛТАС Пётр Мікалаевіч, н. у 1922 г., загінуў у верасні 1944 г.

ШАБАЛТАС Сямён Канстанцінавіч, н. у 1915 г., ст. лейтэнант, загінуў 23.6.1941 г. у Брэсцкай крэпасці.

ШАБАЛТАС Фёдар Пятровіч, н. у 1901 г., танкіст, рад., загінуў у жніўні 1943 г. на Курскай дузе.

ШАБАЛТАС Цімох Канстанцінавіч, н. у 1900 г., удзельнік грамадзянскай вайны, рад., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ВЁСКА ПАЛЕССЕ

АГЕЙЧЫК Антон Васільевіч, н. у 1910 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў у сакавіку 1944 г.

ДУБІНА Уладзімір Цімафеевіч, н. у 1924 г., мал. сяржант, загінуў 11.1.1945 г.

НЕКРАШЭВІЧ Мікалай Ніканоравіч, н. у 1921 г., сяржант, загінуў 13.12.1942 г. у Ленінградскай вобл.

НЕКРАШЭВІЧ Фёдар Ніканоравіч, н. у 1919 г., сяржант, загінуў 22.4.1945 г. у Германіі.

ПАНЦЮК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1916 г., рад., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАНЦЮК Васіль Аляксеевіч, н. у 1908 г., сяржант, загінуў у снежні 1941 г.

ПАНЦЮК Дзмітрый Паўлавіч, н. у 1903 г., старшыня калгаса «Чырвонае Палессе», ст. сяржант, загінуў у снежні 1944 г. у Полыпчы.

ПАНЦЮК Пётр Паўлавіч, н. у 1915 г., сяржант, загінуў 16.2.1945 г. у Познанскім ваяводстве.

ПАНЦЮК Рыгор Іванавіч, н. у 1911 г., сяржант, загінуў 14.7.1944 г. у Латвіі.

ПАЛТАРАН Мікіта Антонавіч, н. у 1905 г., загінуў у студзені 1945 г. у Полыпчы.

ПАЛТАРАН Фёдар Іосіфавіч, н. у 1908 г., загінуў у снежні 1941 г. пад Масквой.

ПАЛТАРАН Фядос Іосіфавіч, н. у 1909 г., загінуў у студзені 1945 г. у Полыпчы.

ТАКУН Сцяпан Данілавіч, н. у 1900 г., удзельнік грамадзянскай вайны, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1944 г. у Бранскай вобл.

ТАКУН Сямён Іларыёнавіч, н. у 1910 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, сяржант, загінуў 16.11.1944 г. у Латвіі.

ТКАЧУК Іван Пятровіч, н. у 1919 г., загінуў 6.12.1941 г. у Тульскай вобл.

ТКАЧУК Уладзімір Цятровіч, н. у 1924 г., сяржант, загінуў 18.1.1945 г. у Варшаўскім ваяводстве.

ЯРЫГА Іван Барысавіч, н. у 1924 г., сяржант, загінуў 16.1.1945 г. у Познанскім ваяводстве.

ВЁСКА САСНАВЕЦ

ЖАЎРЫД Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1918 г., удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі і савецка-фінляндскай вайны, мал. сяржант. Загінуў 14.7.1944 г. каля в. Мачульна Ваўкавыскага р.

